КАРОЛЬ ВАНЭК

ПРЫГОДЫ ЎДАЛАГА ВАЯКІ ШВЭЙКА

Пераклад з расійскае мовы К. Чорнага

ЧАСТКА ШОСТАЯ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1931

Закаэ № 999. 5.000 экз. (IV). Галоўлітбел № 1045.

Друкарня імя Сталіна.

1

ДОБРАЕ СЭРЦА ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ

Задачы абаіх радоў, задачы мужчыны і жанчыны не аднолькавыя ў ва ўсім, што здараецца на белым сьвеце. Там, дзе мужчына робіць зьверскія ўчынкі, або загадвае іншым рабіць іх, жанчына бярэ на сябе ролю Міласэрднасьці, бярэцца за ролю ціхага анёла-уцяшальніка, які спускаецца з неба ў бялюткім як сьнег адзеньні, да ўкрытых крывёю і брудам пакутнікаў. Калі дзеля інтарэсаў мужчыны зроблены жорсткія раны, тады зьяўляецца жанчына, каб залізаць іх сваім кашэчым язычком. Мужчынскае змаганьне з-за якіх-небудзь выгад стварае пакуты і боль, і, каб прымусіць забыцца на іх, жанчына сыходзіць да таго, што дакранаецца да няшчаснага, якога ў іншых ўмовах яна не кранула-б нават кончыкам свайго чаравічка, і лашчыць яго сваімі далікатнымі, выпешчанымі, «незямнымі» рукамі.

Грунула ўсясьветная вайна, і ўласьнікі панскіх маёнткаў, банкаў і фабрык пачалі фотографавацца няйначай як у афіцэрскіх мундзірох, або з ордэнамі ў штрыфлях, каб паказаць сьвету, што яны стаяць на баку ўраду, які распачаў дзеля іх гэтую вайну. А іх жанкі, паважныя, ганаровыя кабеты, панацягвалі на сябе адзежу Міласэрднасьці, пазакрывалі свае, вельмі ці ня вельмі цудоўныя зачоскі белымі ці чорнымі хусткамі, прышпілілі да грудзей чырвоны крыж і пашлі гуляць па шпіталях, каб паказаць салдатам, што вайна ёсьць ня толькі страшэннае пекла і найлепшы выпадак без усялякае адказнасьці рабіць якія сабе хочаш самыя ганебныя злачынствы, але і дае шырокія мажлівасьці ўзяцца за дабрачыннасьць: паправіць у раненага падушку, прамыць яму загноеныя вочы, папытацца колькі ў яго дзяцей, і пацяшаць яго тым, што яму, у выпадку сьмерці, няма чаго за іх не-

пакоіцца, бо ўсё ў руках божых, які ня дасьць загінуць ні нам, ні тым пакаленьням, што будуць пасьля нас. Але з тэй прычыны, што ў арміі ёсьць і больш чулыя душы, якіх не задавальняюць духоўныя ўцехі і папраўленыя пад галавою падушкі, і што гэтакія душы, як вядома, сустракаюцца сярод афіцароў і дактароў,—«шляхэтнай» сястры міласэрднасьці даводзіцца ахвяроўваць сябе ім яшчэ больш дзейна: яна як мае быць «аддаецца» ім, і тады гэтакі шпіталь не падобны да публічнага дому толькі тым, што на яго дзьверах не паблісквае ветлівы чырвоны ліхтарык...

Гэтакім парадкам, адны чапляюцца на вайне за сёньнешняе, а другія жывуць толькі надзеямі на будучыню...

Слова «заўтра» ператвараецца ў нейкі цудоўны элексір. Яно прымушае людзей ня брацца сёньня ні за што гэтакае, што магло-б скончыць іхнія рахункі з жыцьцём, і надае ім сілы сёньня і кожны дзень верыць і чакаць, што «заўтра» спыняцца ўсе іхнія пакуты і жыцьцё зноў вернецца на шлях «чалавецкага» існаваньня. Цікава, што дактары гавораць пра нейкае загартоўваньне, пра нейкае падмацаваньне нэрваў на вайне, бо што сярод салдат і ваеннапалонных наглядалася, параўнальна, ня шмат выпадкаў самагубства. Але трэба памятаць, што ўсіх, хто не палез ў пятлю, ці ня кінуўся так як ёсьць у невядомую сібірскую рэчку, захавала дзеля іх сем'яў адно ўсяго слова—славечка «заўтра».



Баронэса Аустэрліц і графіня Таксіль, камандыраваныя аўстырыйскім Чырвоным Крыжам у Расію на абгляд лягераў ваеннапалонных, належалі да вышэйшых колаў венскага грамадзтва. Не спалохаўшыся вялікае дарогі, абедзьве дамы выказалі сваю згоду паехаць у Расію і прынесьці ўцеху людзям, якія або пралівалі кроў, або не пашкадавалі яе праліваць дзеля таго, каб у Аўстрыі падарожалі хлеб, вугаль, жалеза, цукер, сьпірытус.

Графіня Таксіль паехала ў Расію, думаючы, што як мае быць выканае намеры тэй установы, якая паслала яе, а таксама і сваю чалавекалюбівую місыю тым, што будзе раздаваць ваеннапалонным рублі і сваей далікатнай, мацерынай рукою сьціраць з іх

вачэй сьлёзы суму па прыгожай Аўстрыі. Гэта была старая, зморшчаная падла, ханжа, і клерыкалка, якая ўяўляла сабе, што знойдзе ўсіх ваеннапалонных на каленях; яны сумна накіравалі вочы свае на захад і па вушы ўплылі ў малітву да найвышшага бога, каб ён хаця не забыўся даць перамогі аўстрыйскай зброі...

Баронэса-ж Аустэрліц была маладая, стройная і наогул цудоўная. У ёй выяўлялася паўднёвая кроў, і ў яе згодзе праехацца ў Расію не малую ролю адыграла гарачая натура, якая пачынала бушаваць у ёй і не давала ёй спаць. Праўда, палонных ёй таксама было шкода, аднак больш прыхільнасьці, чымся да іх, яна мела да расійскіх афіцэроў, якія гэта адразу заўважалі, хадзілі да яе гайнямі і стараліся перавысіць адзін аднаго ўсялякімі далікацтвамі.

Тых, хто вельмі выяўляўся ў гэтым кірунку, яна нараджала от як: дазваляла вячэраць разам з сабою ў гасьцініцы, а пасьля памагаць ёй разьдзявацца перад сном. Цалюткую ноч яна тады ўпрошвала сваіх выбраньнікаў быць з палоннымі аўстрыякамі гэтакімі-ж мяккімі, далікатнымі і ўважлівымі, як і да яе самой. Надаваўшы гэтакіх дырэктыў, яна кожны раз даходзіла да вываду, што раніцаю яна адчувае ў сабе куды больш прыемную ўтому, чымся ў Вене, калі поплеч яе ляжаў яе муж, што пасылаў фураж на сэрбскі фронт і ўтрымліваў, апроч свае жонкі-баронэсы, яшчэ некалькі балерын і адну статс-даму, якая была за пасярэдніцу ў яго справах з інтэндантствам.

Вядома адразу, што прыезду гэтых венскіх арыстакратак чакалі з вялікаю цікавасьцю і што навокал яго круціліся ўсе гутаркі ў бараках. Выказваліся ўсялякія здогадкі, што гэтыя дамы скажуць, што будуць раздаваць, ці прывязуць лісты з радзімы, якія захады ўжывуць у інтарэсах ваеннапалонных і ці здолеюць стварыць да сябе павагу з боку расійцаў.

— Абы адно не прыслалі да нас якой-небудзь старое ведзьмы,—глыбока ўздыхаючы, заявіў аднойчы ўвечары Худзечак.— Браткі, ці паверыце, што я паўгода ўжо бязвыходна знаходжуся тут у лягеры і ня бачыў аніводнае бабы... Эх...

— Нічога, яны табе паддадуць іншых думак, як прыедуць,— спагадна заўважыў Швэйк. Знай надзейся і ня сумуй.

— Яны прыедуць, пройдуць па бараку і зноў згінуць к чорту,—сказаў Марэк.—Не чакайце, каб яны хоць на каго-небудзь зірнулі.

— А як-жа!—дадаў Пісклявы.—Камісія-ж павінна знайсьці ўсё ў поўным парадку. Але, трасца іх матары,—і яго голас сарваўся ад узбуджанасьці,—я ім тут пакажу. Я ім, сволачам, не паддамся. Я ім пакажу!—злосна прашаптаў ён.

— Ня хопіць-жа ў цябе, я думаю, нахабства пакрыўдзіць жанчыну,—паціскаючы плячыма, заўважыў Швэйк. — Слухай, браце, я табе гавару, што й ты будзеш рад таму дабру, якое яны нам зробяць. Гэтакія дамы на ўзьвей-вецер нічога ня робяць, і калі ўжо за што-небудзь возьмуцца, дык забываюцца на ўсё. Вось, калі я быў у гарнізонным шпіталі, у суседнім пакоі ляжалі параненыя, а сярод іх—нейкі Пазьдзерка з Бжаўнова. У яго была рана ў жываце, але яе пасьпелі зашыць, так што ён ужо думаў пра тое, куды смальнуць яму другі раз, калі ён накіруецца з маршавай ротай зноў на фронт. Санітараў тады не хапала і прыходзілі даглядаць параненых таксама гэткія вось дамы з чырвонага крыжу. Нейк надвечар зьяўляецца навенькая, якое я яшчэ ня бачыў, і садзіцца каля Пазьдзеркі на ўслон. Дамачка—проста анельскага хараства, і глядзіць на яго гэтак добранька і пытае: «Што, салдацік, ці ня трэба вам чаго-небудзь?» А ён злуе, што з ранай у жываце нельга паварушыцца, нават калі побач яго сядзіць гэтакая дзяўчына, і толькі матае галавою, што, значыцца, нічога ня трэба. Яна глядзіць яшчэ дабрэй: «Можа вам падушку паправіць?» А ён зноў—ня трэба, значыцца. Так у яе ад пачуцьця нават сьлёзы заблішчэлі, і яна шэпча ледзь чуваць, як на скананьні: «Можа-ж вам хацелася каб я абмыла вам твар?» Яму, Пазьдзерку, значыцца, стала таксама шкода яе, і ён кінуў галавою: «Але, але, будзьце ласкавы». Тады яна закасала рукавы, намачыла кавалак ваты і давай яго гладзіць сюды-туды па абліччы. Пасьля абцерла яго сухою ватай і ўсьміхнулася яму як анел: «Ну што, салдацік? Лепш вам цяпер? Асьвяжыліся?» А ён скрывіў твар заместа ўсьмешкі, каб не падумалі, што ён недалікатны, і гаворыць; «Але, сястрыца, я й вельмі задаволен, што вы задаволены. Бо мне не хацелася сапса-

ваць вам асалоду, але толькі вы сёньня ўжо трынаццатая, якая мяне абмывае».

Прайшло яшчэ некалькі дзён, і палонныя зьнішчылі яшчэ некалькі абедаў, што складаліся з полўкі, у якой сярод гарохавага лушпавіньня сумна плавалі разварапыя галоўкі сьмярдзючых тараноў, а на другую патраву—пратухлая грэцкая ці пшонная каша. Нарэшце зьявіліся адзнакі блізкіх вялікіх падзей. Унтэр-афіцэры, што служылі пры бараках, пачалі пільна пералічваць палонных, якія былі пад іх аховаю. У бараках паставілі бочкі з надпісам: «Гатаваная вада, з кухні нечакана прыслалі як мае быць вымытыя і вычышчаныя бачкі, а на двор прывезьлі цэлы воз ялінак, якімі расійскія салдаты ўпрыгожылі ўсе сьнегавыя намяці навакол баракаў. Тады-ж быў загад, каб ніхто з палонных ня сьмеў разьдзявацца дагала і лавіць на сабе вошай, бо ад гэтага магло сапсавацца ўсё ўражаньне ад вялічэзных клопатаў расійскага ўраду.

— Бо мы ня ведаем ні дня ні гадзіны!—продэклямаваў Швэйк, нацягваючы на сябе, пасьля чытаньня гэтага сакрэтнага загаду, страшэнна брудную фуфайку.

— Браткі, яны прыяжджаюць сёньня, з хвіліны на хвіліну,—паведаміў на другі дзень Гаршына.—Швэйк, давай зьбегаем па гарбату, а я захаплю ў крамцы булак. Можа давядзецца частаваць гасьцей.

Не пасьпелі паслаць дваццаць чалавек палонных у кухню чысьціць рыбу на полўку, як да брамы падкаціў на санях увесь штаб, з якім зьявілася ў лягер аўстрыйская місія.

Наперадзе ішла баронэса Аустэрліц у элегантным манто з коцікаў. Каля яе зьлева пакручваўся ад'ютант Гаўрыла Міхайлавіч; справа папстрыквала ў высокіх боціках камэндантава жонка і распытвала, што цяпер робіцца ў Вене. Побач з графіняй Таксіль ківаўся, апіраючыся на кій, камэндант, а за імі шпарыў даўжэзны хвост афіцэроў, дактароў і вайсковых чыноўнікаў з портфэлямі.

— Ці ня хочаце раней агледзець кухню, баронэса? Ці загадаеце пачаць з лазарэту?—павярнуўся ад'ютант да свае спадарожніцы, што абдумвала якраз, што ёй сказаць палонным.

На кухні, за вялікімі сталамі, ваеннапалонныя, сярод якіх быў і Швэйк, патрашылі і чысьцілі рыбу, высякаючы яе з лёду, бо, пакуль вязьлі яе, яна ў бочках зусім прамерзла. Баронэса так і ўзгарэлася ад захапленьня.

— Ма chere, ах, паглядзеце, рыба! Яна ўся нібы залатая, а зьнізу яна зусім срэбная!—аж крыкнула яна.

Ваеннапалонныя заўзята скраблі рыбу нажамі, ня ўзьнімаючы вачэй і нават, ад павагі да гасьцей, сьцяўшы грудзі, каб ня дыхаць моцна. Увесь штаб схлупіўся навокал іх, гледзячы на іх спрытныя рукі, а Швэйк, журботна накіраваўшы вочы на пачырванелыя ад куханнае цяплыні шчокі баронесы, адказаў панямецку на яе пытаньне, ці няма ў яго якіх-небудзь жаданьняў:

— Тут, у Расіі, з рыбаю справа стаіць вельмі добра. Яе ня трэба лавіць, з яе ня робяць ральмопсаў, або венджаных сушак, як пан Куціна ў Карліне, з ёю ня трэба важдацца ўлетку, а ёй проста даюць замерзнуць зімою ў рацэ. Пасьля яе выломваюць, колькі каму трэба, цэлымі вазамі, даюць лёду растаць у катле, і калі ласка—вось вам і верашчака гатовая. Нас тут вельмі любяць,—гаварыў ён далей, заўважыўшы, што і старая графіня яго слухае,—і даюць нам усё самае лепшае, што толькі ёсьць.

— А што парабляе яго імпэратарская вялікасьць, наш монарх? Ён усё яшчэ не памёр?—запытаў ён пасьля з вялікаю цікавасьцю, калі скончыў сваю лекцыю пра рыбнае багацьце расійскіх рэк.

— Ён моліцца за вас, салдаты, у аўгусьцінскім кляштары,—шпарка і задаволеным тонам уставіла свае слова графіня Таксіль, расчуленая шчырасьцю і бясхітраснасьцю пытаньня ўдалага ваякі Швэйка. Так што ён узрадаваўся.

— Дык вось што. Значыцца, ён моліцца? Што-ж, ён іншага нічога больш і ня можа. Толькі адзіны гэты вар'ят Худзечак, у нас у бараку, кажа, што нібы яго прыходзіць трэць начамі нейкая актрыса, а адзін хлопец з анархістаў, што з пісклявым голасам, дык той нядаўна расказваў, нібы дзеля нашага монарха трымаюць пры двары швэйцарскую мамку, каб ён не памёр ад слабасьці. А тымчасам, стары ягомасьць жыве сабе. Гэта вельмі ласкава з яго боку.

— Што ён гаворыць?—запытаў Клягэн.

— Ён—верны салдат,—абазвалася старая графіня.—Ён распытвае пра здароўе нашага старэнькага монарха.

Камэндантаў зірк ласкава ляжаў на сумленным, адкрытым і шчырым Швэйкавым твары. Паляпаўшы Швэйка па плячы, ён сказаў:

— Добра, вельмі добра. Добры чалавек.

— Можа вы жадаеце папробаваць яду ваеннапалонных?—запрапанаваў ад'ютант.

— Вы вельмі ласкавыя,—адказала баронэса, паблісквваючы вочкамі, і дзяжурны на кухні, схапіўшы раней нарыхтаваны цынкавы чарпак, кінуўся ў куток да катла, не заўважаючы зьбянтэжаных кашаваравых позіркаў. Ён падняў накрыўку, боўтнуў туды чарпак і пачаў разьмешваць. Кашавары ў поўнай роспачы пераглядваліся паміж сабою. Нарэшце адзін з іх ня выцярпеў і паспрабаваў шапнуць дзяжурнаму:

— Пятро Іванавіч, Пятро Іванавіч, вазьмеце з іншага катла.

Але той, захапіўшыся сваёю справаю, ня чуў. Ён наліў повен бачок, падаў яго дамам і паказаў на драўляныя лыжкі. Ад'ютант скланіўся.

— Паспрабуйце, зрабеце ласку.

Баронэса Аустэрліц узяла ў рот некалькі кропель дзіўнае жыжкі і адразу-ж выплюнула яе. Старая глынула з паўлыжкі. Яе ўсю страсянула.

— Рэдка і прэсна... Найкі адмысловы смак...—зьбянтэжана прамармытала яна.

— Вядома, гэта не француская кухня!—засьмяялася камэндантава жонка, а камэндант, заўважыўшы на паверхні поліўкі сала, дадаў:

— Нашы салдаты ядуць тую-ж самую яду, і поліўка—вельмі спажыўная рэч.

Доктар пастараўся як найхутчэй пацьвердзіць яго словы, і дамы рушылі далей. Дзяжурны з урачыстым выглядам правёў іх да дзьвярэй, а ўсьлед ім чуўся пераплоханы шэпт кашавараў:

— Езус-Марыя! Яны, браткі, нават крупніку распазнаць ня могуць. А гэты вар'ят дзяжурны даў ім паспробаваць замест поліўкі брудную ваду з катла, у якім мы ўчора выварвалі нашы вашывыя споднікі і кашулі.

*

Калі ваеннапалонныя, скончыўшы чысьціць рыбу, прыбеглі ў барак і паведамілі, што перад канцылярыяй выгружаюць вялізныя, адзначаныя чырвоным крыжам, скрыні, у якіх місыя прывезла, відаць, падарункі, усіх ахапіла нэрвовая дрыготка ад радаснага чаканьня. Адразу-ж на мароз былі высланы з барака разьведвальнікі, каб паведамляць пра ўсё, што адбываецца на дварэ, і як разьвіваюцца падзеі. Яны паведамілі, што расійскія салдаты распакоўвалі скрынкі і цягалі ў барак, што служыў за склад, шмат ботаў на шнурках, коўдраў і цёплага верхняга адзеньня. Было таксама заўважана, што фэльдфэбель Пятро Осіпавіч уласнымі рукамі пераносіў самыя лепшыя рэчы да сябе ў канцылярыю і прыбіраў іх пад свой ложак.

Нарэшце прымчаўся, задыхаўшыся, адзін з канвойных і гукнуў, што дамы ўжо зусім блізка ад барака. Расійскі фэльдфэбель скамандаваў: «Сьмірна!» а пасьля выбег і шпарка адчыніў дзьверы перад працэсіяй.

Ваеннапалонныя сядзелі адзін над другім па краёх нар, як куры на седале. Першая ўвайшла графіня Таксіль з камэндантам. Пасьля пачуўся звонкі сьмех баронэсы, сьледам за якою ў даволі цёмны барак улілася і рэшта кампаніі, што цяглася за ёю. Старая арыстакратка адным вокам акінула шэрыя постаці, і з вуснаў яе зьляцела:

— Жах, жах! Якое цяжкае паветра, якая задуха! Няўжо-ж тут няма ніякае вэнтыляцыі?

Баронэса дастала з кішэні маленькую надушаную хустачку і прыціснула яе да носу, робячы выгляд, што вось-вось упадзе ў няпрытомнасьць. Уважлівы да ўсяго, што належала да яе, ад'ютант стаў назадзе ў яе, гатовы ва ўсялякую хвіліну ўзяць яе ў свае абдымкі.

— Божа мой, як тут брыдка пахне! Ад чаго гэта, пане палкоўнік?—цягнула баронэса праз хустачку, шукаючы вачыма Клягэка. Той паціснуў плячыма.

— Цяснота, бачыце, салдаты, пах цел і тытуню...

— Кожны з гэтых людзей напіхае сабе жывот хлебам,—радасна растлумачыў Швэйк,—і тады тут пачынаецца страляніна

як пад Пярэмышлем. Сапраўдны навальнічны агонь! Я ім колькі разоў гаварыў: «Хлопцы, не налягайце гэтак на хлеб, бо пасьля дыхнуць нельга будзе!» Але затое вы, пані, дазвольце далажыць, пахнеце гэтак цудоўна, як француская курыльная папера.

— Салдаты, да мяне!—урачыста высокім голасам гукнула графіня, і на ўсіх нарах узьняўся страшэнны шум. Ваеннапалонныя зьлезьлі з сваіх седалаў, схлупіліся навокал дам і натапырылі вушы, чакаючы вестак з радзімы.

— Салдаты!—сказала прадстаўніца чырвонага крыжу, стараючыся гаварыць па-чэску.—Мы на вас не забыліся! Вы ўсе таксама сыны Аўстрыі, нашы сыны, і наш чырвоны крыж усё таксама клапоціцца пра вас.

Яна сьціхла, шукаючы чэскіх слоў.

— Салдаты! Мы ўспамінаем вас, мы молімся за вас! Вы шчасьліва вернецеся ў вялікую, непераможную Аўстрыю. Яшчэ гэтым летам мы прагонім ворага за нашы граніцы, і наша дзяржава атрымае верх у змаганьні. У Францыі наш саюзьнік бязупынна прасоўваецца наперад, у Італіі наш наступ з посьпехам разьвіваецца, на расійскім фронце мы дасягнулі буйных посьпехаў, і наша войска, нашы непераможныя салдаты, укрываюць нашы сьцягі новай славай, выраблячы цуды сьмеласьці і не шкадуючы свайго жыцьця для нашага роднага монарха, імпэратара Франца-Юзафа. І імпэратар, і айчына не забываюць вас, цьвёрда памятаюць, колькі вы пакутвалі і што ахвяроўвалі, і айчына за ўсё ўзнагародзіць вас у сто столак. Салдаты, мацуйцеся! Цярплівасьць, цярплівасьць і яшчэ раз цярплівасьць!

Графіня Таксіль змоўкла, чакаючы апплёдысмэнтаў і спачуваньня; але натоўп абшарпаных людзей не падаваў аніякага гуку, і цішыня была гэтакая, што чуваць было, як у некаторых людзей хрыпела ў лёгкіх. Раптам хтосьці пачаў усхліпваць. Гэта плакаў на верхніх нарах добры ваяка Швэйк.

— Мы будзем мацавацца тут да канца вайны, калі трэба будзе, ваша яснасьць,—плакаў ён, моцна чмыхаючы носам.—І мы зробім дзеля яго імпэратарскае вялікасьці ўсё, што толькі льга. Толькі-б нам атрымліваць тут хлеб і цукар... І перадайце нашаму імпэратару, што ён можа ўскласьці сваю надзею на мяне і на маіх таварышоў.

Тут Швэйк, не пакідаючы абліваццa сьлязьмі, спусьціўся з нар і пацалаваў старой графіні руку. Расчуленая адданасьцю гэтага простага салдата, яна пацiснула яму руку, і калі з швэйкаўскага носа скаціліся на яе дзьве гарачыя кроплі, яна пагладзіла яго па валасох. Пасьля яна адчыніла портфэль і працягнула яму дзесяцірублёўку, якую ён адразу-ж спусьціў у кішэню. Пасьля гэтага ён, усё яшчэ плачучы, палез назад на нары.

Гэтакая нагарода Швэйка за выяўлены ім патрыётызм зрабіла тое, што тры дзесяткі хлопцаў пачалі заядла смаркацца і адкашлівацца і з вышчарынымі зубамі лавіць графініну руку, як ваўкі, што нападаюць у полі на самотнае жарабя. Але графіня зачыніла портфэль і пачакала, пакуль Швэйк не супакоіўся, што адбылося даволі такі шпарка. Тады яна гаварыла далей:

— Салдаты! Мы прывезьлі вам прывітаньні ад вашых жонак і дзяцей, а таксама і ад вашых таварышоў. Мы вельмі рады, што бачым вас здаровых і задаволеных. Мы прывезьлі вам, салдаты, абмундзіраваньне, боты, коўдры і ўсялякія іншыя падарункі, і заўтра мы іх вам раздамо... Ці няма ў каго-небудзь з вас якіх-небудзь адмысловых просьбаў або скаргаў, салдаты?

Цяпер натоўп навокал яе захваляваўся, загуў, і сотні ратоў загаварылі ўсе адразу. Адзін скардзіўся, што не даходзяць лісты і пасылкі, другі пытаўся, якая цяпер у Аўстрыі цана на жывёлу, трэці цікавіўся, ці не папаў у палон або ці не пасаджаны ў турму той ці іншы яго зямляк, а ззаду, заўзята пракладваў сабе дарогу захудалы пяхотны салдацік і, прыклаўшы руку да казырка, адчыкануў:

— Так што дазвольце даведацца, ці знаходзіцца яшчэ мой брат у шпіталі ў Вене?

І калі графіня стала даводзіць яму, што яна гэтага ня можа ведаць, бо што ў Вене ёсьць тысячы параненых і хворых ваяк, ён з пагардаю аглядзеў яе з ног да галавы і стаў прасоўвацца назад, мармычучы:

— Падумаеш—з чырвонага крыжу, а нічога ня ведае! Чаго-ж яна сюды прыцягнулася, калі яна нічога ня ведае пра нашага Францышка! Бо калі ён забіты, або памёр ад ран, дык я павінен атрымаць пасьля яго спадчыну.

Старую гэтак затузалі ўсялякімі пытаньнямі, што баронэса палічыла патрэбным прысьці ёй на дапамогу. Яна прыбрала хусточку ад рота і пачала таксама адказваць, дадаючы да словаў усьмешку пульхных губ і паблісквацьне белых зубоў.

Нарэшце старая адчыніла портфэль, дастала пачак трохрублёвак і, трымаючы яе над галавою, гукнула:

— Салдаты, жадаем вам добрага здароўя. Нам трэба ісьці далей, да вашых таварышоў. Вось, салдаты, тут кожнаму па аднэй паперцы, каб вы бачылі, што Аўстрыя на вас не забылася.

Яна пачала раздаваць трохрублёўкі правай рукою, працягваючы яе ў той-жа час для пацалунку.

— На папяросы, салдаты, на хлеб!—І вашывыя байцы «непераможнай» аўстрыйскай арміі, расчуленыя як малыя дзеці, бралі гэтыя грошы і выцiралі рукавом кроплі з сваіх насоў.

І тут таксама памагла баронэса. Яна дастала з свайго портфэля другі пачак і пачала раздаваць грошы тым, хто схлупіўся навокал яе; пры гэтым, аднак, яна ня соўвала гэтак заядла руку дзеля пацалунку.

Скончыўшы раздачу грошай, дамы запыталі, ці няма яшчэ якіх-небудзь скаргаў. Камэндант з свайго боку запатрабаваў, каб ваеннапалонныя выказалі свае прэтэнзіі. Выявілася, што людзі нездаволены хлебам, у якім было зашмат ужо высевак і атрубоў. Баронэса ўзяла пададзены ёй акраец у рукі, адламала ад яго маленькі кавалачак і сунула яго ў рот. Тое-ж самае зрабіла і графіня. Пасьля іх паспытаў хлеб доктар, вядомы сярод палонных сваімі гліцарынавымі лекамі; ён надзьмуў шчокі і прачытаў цэлую лекцыю.

— З пункту гледжаньня тонкага гастранома,—гаварыў ён,—можна было-б, бадай, сёе-тое сказаць супроць гэтага хлеба. Але з пункту гледжаньня доктара і наогул мэдыцынскай навукі супроць яго нічога нельга сказаць, бо яго зусім даволі дзеля абмену сокаў у організмах ваеннапалонных. Гэты хлеб мае ў сабе, ня гледзячы на тое, што ён гэтакі цяжкі...

— ... што ім льга карміць толькі сьвіней!—ціха заўважыў хтосьці з ваеннапалонных.

— ... У ім даволі патрэбных дзеля спажыўнасьці організму вітамінаў, бялковых элемэнтаў і вугляводаў,—гаварыў далей ша-

ноўны эскулап, трымаючы перад сабою хлеб.—Шаноўныя панове! Нашаю мэдычнаю навукаю было як мае быць даведзена, што дзеля спажыўнасьці чалавеку на працягу сутак даволі восемдзесят грамаў бялкоў, дзесяць грамаў тлушчаў і трохсот грамаў вугляводаў. Вельмі цікавая тая акалічнасьць, што нават хлеб, які складаецца не на трыццаць пяць, а на ўсе пяцьдзесят процантаў з хваёвага пілавіньня, можа падтрымліваць сілы чалавечага організму. Гэтакі якраз хлеб пачалі спажываць у Нямеччыне, і калі гэты спосаб выпечкі хлеба пашырыцца ў нас, дык перамога няйначай будзе на нашым баку, бо лясныя багацьці хваёвых парод у Расіі і Сібіры нявычэрпныя і, такім чынам, харчаваньне армії і тылу зусім забясьпечана.

Доктар скончыў сваю лекцыю і перадаў хлеб Швэйку. Той, бяручы акраец, узяў пад казырок і весела сказаў:

— Так што дазвольце далажыць, яно сапраўды так. Але вось які выпадак быў з панам Маршалэкам у Янавіцы, які задумаў зрабіць у сябе ўзорную фэрму дзеля гадоўлі сьвіней. Гэта быў вучоны чалавек, ён скончыў аграномічны інстытут і гаварыў, што ў цяперашні час да ўсяго трэба дапасоўваць навуковыя мэтоды. Ну дык вось, ён пачаў наглядаць, колькі парасята зьядаюць малака, кашы і бульбы, і заявіў: «Гэтулькі-ж спажыўных рэчаў, колькі ўва ўсім гэтым, ёсьць у палавіне курынага яйца. Дык на якое ліха паліць дровы і цягаць ваду, калі тое-ж самае можна даць, так сказаць, у аблатцы». І ён стаў варыць сьвіням яйца,— па поў яйца ўсьмятку парасятам і па цэлым яйцу вялікім сьвіням. Што-ж вышла! Парасяты ўсе падохлі, а сьвіньні з голаду выперлі дзьверы ў сьвінушніку і здрасавалі ў яго ўвесь агарод.

Старая графіня дала Швэйку яшчэ адну трохрублёўку, за якую той ёй ужо больш не цалаваў у руку. Заўважыўшы галуны на Марэкавай жыкетцы, яна зьбянтэжана сказала:

— Ах, вольнапісаны, я вам яшчэ нічога не дала! Калі ласка, вазьмеце.

Яна дастала з пачка дзьве паперкі і працягнула іх Марэку. Той не паварушыўся, а Пісклявы злосна прашыпеў за яе сьпінаю:

— Не бяры, не бяры. Няхай самі жаруць у Аўстрыі. Няхай удавяцца сваімі грашыма.

Марэк, стараючыся стрымліваццa, упарта глядзеў сабе пад ногі. Баронэса, зьбянтэжыўшыся ад таго, што знайшла сярод ваеннапалонных чалавека, які трымаўся незалежна і нават горда, дастала дзесяцірублёўку і, дадаючы да сваіх словаў самую цудоўную ўсьмешку, сказала:

— Вось, вазьмеце і ад мяне. Гэта не падачка. Гэта—выказваньне падзякі. Я ведаю, вы заслужылі шмат больш. Але бацькаўшчына ўзнагародзіць вас, калі вы вернецеся. Доўга чакаць цяпер ужо вам не давядзецца. Наша войска ўсюды адкінула ворага за дзяржаўныя межы.

— За якія? За якія гэтакія межы!—перапытаў Марэк, нібы ў сьне.

Усьмешка баронэсы стала больш чым цудоўная.

— Ну, так, за межы,—яшчэ раз сказала яна.

— Якія, трасца матары, межы!—гукнуў раптам Марэк, вырываючы з рук дам грошы.—Якія гэтакія межы, пытаю я? Няма ніякіх меж! У Бродах, я гэта бачыў сваімі вачыма, як ляжаў ля пагранічнага слупа! Сам я ляжаў у Аўстрыі, а перада мною Расія. У гэтым месцы сыходзіліся тры дзяржавы, і іх уладаньні аддзяляліся «граніцай». І вось перада мною вылез з зямлі на аўстрыйскай тэрыторыі дажджавы чарвяк і цераз пяць сантыметраў зноў урыўся ў зямлю. Гэтакім чынам палавіна чарвяка была ў Аўстрыі, а другая ў Расіі. Што-ж, на чалавека ёсьць межы, нейкія граніцы, а на чарвяка—няма? Зайцу ёсьць толькі адзін лес, жаўранку—толькі поле! І толькі людзі стварылі сабе на зямлі перагародкі і межы! Граніцы? Няма ніякіх граніц! Усё гэта адно ашуканства, якое вы самі выдумалі! Ёсьць толькі адзін неабдымны, прыгожы сьвет!

Марэк зьмяў грошы і кінуў іх старой графіне ў твар. Усе навокал пабялелі і адчулі сябе вельмі няёмка. Толькі Пісклявы крыкнуў тонкім голасам:

— Брава!

Першы адумаўся пасьля зьбянтэжанасьці камэндант. Ён павярнуўся да расійскага фэльдфэбеля:

— Канвойных сюды!—і, калі тыя падбеглі з стрэльбамі, ён загадаў, паказваючы на Марэка:—Пад арышт! Заўтра прывесьці яго пад канвоем да мяне!

Місыя пакінула барак у вельмі прыгнечаным настроі, і графіня з горнасьцю сказала палкоўніку Клягэну:

— Ваеннапалонныя павінны быць адданы пад больш цьвёрдую дысцыпліну; вам трэба было-б трымаць іх у абцугох, а вы з імі цацкаецеся. Чаму, напрыклад, вольнапісаны трымаецца ў адным бараку з радавымі? Інтэлігенцыю заўсёды трэба лепш карміць і саджаць асобна ад простага народу, каб яна адчувала сваю перавагу над ім і ня мела прычыны ставіць сябе з ім на адну дошку. Няўжо вы не разумееце, якую небясьпеку стварае гэтакі лятуценьнік.

А палкоўнік Клягэн, якому Марэк стаў здавацца сымпатычным, з тэй прычыны што старая, якая нагаварыла на яго, была яму вельмі праціўная, бурклiва адказаў:

— Гэта не мая справа. Ма chere,—зьвярнуўся ён да жонкі, раптам штосьці ўспомніўшы,—ты-ж хацела знайсьці сярод палонных якога-небудзь краўца. Дык вернемся назад у барак да чэхаў. А вы, Гаўрыла Міхайлавіч, правядзеце тымчасам гэтых дам усюды, куды яны захочуць.

І палкоўнік, далікатна казырнуўшы, узяў сваю жонку пад руку і падаўся назад.

Калі палкоўніца выказала свой намер узяць да сябе дадому краўца, спрактыкаванага майстра, знаёмага з усялякай, у тым ліку і з ангельскай работай, у бараку, які быў усхваляваны нядаўнымі падзеямі, спачатку запанавала глыбокая маўчанка. А пасьля таварышы пачалі падштурхваць і падгаворваць тых, якія, наколькі было вядома, умелі абыходзіцца з іголкаю і з нажніцамі.

Нарэшце з нар спусьціліся тры чалавекі і запрапанавалі свае паслугі. Палкоўніца ў нерашучасьці глядзела то на іх, то на свайго мужа, пакуль яны расказвалі, што яны ўмеюць рабіць і ў якіх гарадох працавалі. Калі яны скончылі, яна сумна сказала:

— Усё гэта не артысты свае справы. А мне патрэбна дзеля майго веснавога гарнітуру якраз артыст. Я-ж хачу падабацца!—закончыла яна, сьмяючыся, па-француску.

Тады Піскляўы, пачухаўшы ў сябе за вухам, шпарка, як маланка, спусьціўся з нар, адказыраў палкоўніку і адмахнуў глыбокі

ўклон палкоўніцы, а пасьля на самай чыстай французскай мове адрапартаваў:

— Можа быць, madame, вы дазволілі-б мне прапанаваць вам свае паслугі? Я працаваў у Вене, быў за закройшчыка ў Брусэлі, пасьля за старэйшага закройшчыка ў Лёндане, а апошні час працаваў на Пуарэ ў Парыжы. Гэта паказвае, што я якраз той, хто вам патрэбен.

— Я згадаю выдаць яму новае абмундыраваньне, калі ён табе якраз спатрэбіцца,—вырашыў палкоўнік.—Ты-ж у адзін дзень убачыш, што ён умее.

З хвілінку ён задумаўся, гледзячы ўгару, дзе сьвяціла на ўвесь барак дабрадушнае Швэйкава аблічча. Пасьля ён дадаў:

— А я вазьму сабе якога-небудзь аўстрыяка за дзяншчыка, каб краўцу ня было аднаму сумна.

Ён паклікаў да сябе Швэйка і, калі той стаў перад ім, запытаў:

— Якая ў цябе профэсія? Хочаш быць у мяне за дзяншчыка?

— Так што дазвольце далажыць, што я хачу,—пачуўся ўрачысты Швэйкаў адказ,—і што я ўжо служыў за дзяншчыка ў пана фэльдкурата Каца, і што я буду служыць вам вераю і праўдаю, пакуль мяне ад вас не адарвуць, як ад пана паручніка Лукаша.

— Добра! У суботу прыгоніш гэтых двух пад канвоем да мяне!—коратка загадаў комэндант фэльдфэбелю.

— Выгадную ты зрабіў справу, таварыш, няма чаго казаць!— заўважыў адзін з суседзяў Пісклявага. —Жыць табе там будзе ня кепска. Але толькі вось якая можа здарыцца справа. Напрыклад, томскі камэндант прапанаваў нам, сталяром, адрамантаваць яму ўсю як ёсьць кватэру, і восем чалавек нашых працавалі ў яго каб траха дык паўгода. Калі ўсё было гатова, ён кажа: «Прыходзьце праз тыдзень, тады парахуемся». Ну, мы праз тыдзень зьяўляемся, а ён на нас як закрычыць: «Што! Грошай вам? За што? Хіба вы ня пілі ў мяне, хлеба майго ня елі? Га? Значыцца, павашаму, камэндант павінен плаціць ваеннапалонным?!» Гэтак і выгнаў нас вон, ды яшчэ рэвальвэрам пагражаў. А пасьля загадаў нас пасадзіць і перавезьці сюды, каб мы ня ўчынілі сваруў у Том-

ску... Так, так, браце, тут трэба хадзіць, аглядаючыся. Тут што ні пан, дык і круцель.

— Ды ёй зусім не патрэбен гэтакі кравец,—абазваўся Піскьлявы,—яна шукае і ўцехі. Езус-Марыя, хіба-ж гэтага ня відаць па яе вачох? Адразу відаць.

Худзечак сеў на нарах, абхапіў калені рукамі і забубніў, гледзячы на Піскьлявага чырвонымі, заплаканымі вачыма:

— Я, браткі, не зайздросны чалавек, але ўсё-такі павінен запытацца: чаму гэтакае шчасьце не прываліла да мяне? Ах ты, божа мой! Так-бы сябе, здаецца, і закалоў-бы на месцы з прыкрасьці. І што гэта ў мяне быў за бацька, што ён не навучыў мяне за краўца!.. Слухай, браце, калі ты будзеш мець шчасьце папасьці да яе на пасьцель, дык успомні пра мяне. Я ў думках увесь час буду з табою.

— Усё гэта таму,—спачувальна прамовіў Швэйк,—што табе аніяк не ўдалося яе распаліць. Ты-ж далёка ня прыгожы, дый час цябе такі здорава пакамячыў. Вось каб ты зьявіўся да яе, калі табе было паўтара месяцы ад нараджэньня, і цябе толькі што выкупалі ў начоўках, ты-б здолеў яшчэ выклікаць захапленьне з яе боку. А жанчыну, калі яна маладая, трэба няйначай зацікавіць, каб...

— Або прымусіць яе шкадаваць цябе,—паправі Піскьлявы.

— ... каб льга было з ёю што-небудзь зрабіць, — гаварыў далей Швэйк.—У нашага брата, мужчыны, нават калі мы пастарэем, сэрца застаецца маладым і хавае ў сабе жар. Так што мужчына здольны захапляцца па тры разы кожны дзень, абы толькі зашумела ля яго якая-небудзь спадніца. А жанчына, як толькі яна крыху пачне засыпаць, хоць і льле ў сябе кофе без канца і бяз меры, дык нават і ня гляне на цябе, хоць-бы ты быў як веснавы пупшачак,—ня гляне, ні то каб яшчэ панюхала. На гэты конт ёсьць нават сэксуальна-псыхолёгічныя курсы, як расказваў нам адзін фэльчар у тракціры «Шэнфлек». Так што такая баронэса на выгляд можа і маладая, а душа ў яе, можа, ужо даўно патухла.

Швэйк сьцягнуў з сябе боты і цяжка ўздыхнуў, разьвешваючы мокрыя анучы.

— Вось вам прыклад, што бывае, калі ў жанчыны раней як трэба састарэе сэрца. У аднэй вёсцы пад Бэроўном жыла ўдава,

Марыя Коцман. Гэта была сапраўдная ведзьма, якая пасьля сьмерці мужа так узьненавідзела ўсіх і ўсё, што не цярпела ля сябе нават сабакі. Убяжыць, бывала, у пакой яе сабачка, а яна зараз-жа гукне на дачку: «Выгані яго вон, падлу. Ён тут хвастом віляе і толькі хату студзіць!» А нявестку сваю, прыгожую, ціхую гэтакую жанчыну, якая, праўда, была з беднай сям'і і апроч свайго незаконнага дзіцяці, якога яна мела яшчэ як была дзяўчына, ня прынесла ў сям'ю аніякага пасагу, гэтая сьцерва давяла сваімі ўчынкамі да таго, што тая ў адну нядзелю, прышоўшы з царквы, засекла яго сякераю, а труп закапала ў кучы гною. Труп знайшлі ў гнаі толькі праз тыдзень, а маладзіцы далі тры гады. Цяпер яна ў жаночай турме ў Празе.

Худзечак на хвіліну задумаўся, перабіраючы пальцамі бараду, а пасьля заўважыў:

— Так, усялякая драбяза лезе ў галаву, калі ня ведаеш куды падацца—ні наперад, ні назад. Жаданьне каго-небудзь біць, ці задушыць зьяўляецца тады, як муха на сыры. Вось мне сёньня раптам захацелася спаць з баронэсай, а Марэку ўзбунтавацца. І напэўна-ж сядзіць ён цяпер у карцары і зразумець ня можа, як гэта яму ўсё ўздумалася.

— Вольнапісаны зрабіў вялікае глупства,—рашуча заявіў Гаршына.—Якое тут к чорту рыцарства! Нашто было гаварыць ёй, што ён думае пра граніцы? Яна-ж дала яму цэлых шаснаццаць рублёў. Я-б іх проста ўзяў, дзесяць з іх праеў-бы і прапіў, а шэсьць паслаў-бы ў Кіеў якому-небудзь земляку, які ваюе супроць Аўстрыі. Яна ад гэтых грошай не абяднела-б, а мы нагэтулькі-ж былі-б багацейшыя.

— Што-ж, язык мой—вораг мой!—уставіў сваё слова Швэйк.—Марэк разважае, бо ён студэнт. Ды як-жа яму й не разважаць, калі яму ўбілі ў галаву ўсялякія разважаньні. Кожны, хто ня зусім дурань, павінен разважаць. А начальства павінна наглядаць, пра што людзі разважаюць. Да чаго-б мы дажылі, каб кожны пачаў разважаць, як яму на думку ўзбрыдзе, і каб у нас ня было цьвёрда пастаўлена нагляданьне над гэтымі разважаньнямі? Тут гэтак-бы наразважалі, што і прокурор-бы ня мог разабраць. Ну, а Марэк чалавек гарачы; у яго гэтае разважаньне зьявілася так раптам, як фокус, і ён не здагадаўся, што лепш бы-

ло-б яго ня выказваць. Бываюць гэтакія людзі на сьвеце, якія ніяк ня могуць зразумець, што да чаго можа давесьці.

— Кожны, хто бачыць, як брыдка абыходзяцца з людзьмі, ня можа не разважаць,—хвалюючыся сказаў Пісклявы.—Разважаць людзям ніколі не забароніш. Тут ніякі эрцгэрцаг Фрыдрых не паможа. І там у нас яшчэ ня мала будуць дзівіцца, адкуль у людзей зьявіліся гэтакія разважаньні, якія выклікае вайна.

— Вядома, будуць,—падхапіў Швэйк.—Зусім, можна сказаць, адурнеюць, як пасьля шлюбнае ночы той настаўнік, які ажаніўся з Анеляю Пржэскачыль. У гэтай Анелі была ў Кладне замужняя сяброўка, а сама яна завяла знаёмства з адным настаўнікам рэальнага вучылішча, які да таго-ж быў яшчэ і поэт. Знаёмства было сталае, і яна ўжо рыхтавала сабе пасаг. Але от аднойчы раніцаю яна прыбегла ўся ў сьлёзах да сяброўкі і кажа: «Ацылія, я за яго не пайду, я яго больш не хачу, бо ён мяне заб'е, і я буду з ім вельмі нешчасьлівая». А Ацылія ёй на гэта ў адказ: «Ну, ну, можа быць усё гэта і ня так страшна. Хіба ён табе што-небудзь гэтакае сказаў, ці выцяў цябе, дык гэта-ж глупства. Гэта з кожным бывае. А тым больш калі ён поэт, дык ты павінна яму дараваць. Дзе-ж ты яшчэ знойдзеш гэтакага дурня, які быў-бы настаўнікам, чалавекам з грашыма і ўздумаў-бы цябе ўзяць замуж. Тут Анеля яшчэ горш заплакала. «Ты сабе толькі падумай,— кажа яна,—учора ён раптам заявіў, што чакае ад шлюбнае ночы нязвычайнага ўражаньня, якое зробіць яго шчасьлівым на ўсё жыцьцё. Ён стаў перада мною на калені, выцягнуў рэвольвэр і прымусіў мяне прысягнуць, што я чыстая як лілея і нявінная як ягня. Але ты-ж ведаеш, Ацылія, колькі ў мяне ўжо было абортаў». «Нічога, Анеля,—адказвае ёй Ацылія.—Я твая сяброўка, таварышка, і я цябе не пакіну. Перад вясельлем прыдзі да мяне, я цябе навучу, што рабіць».

— Настаўнік,—ня спыняў свайго расказу Швэйк,—сапраўды неўзабаве ўгаварыўся з Анеляю, калі зрабіць вясельле. Маладая, як было ўмоўлена, прышла да таварышкі, а тая ёй кажа: «Загадай служанцы зьняць пляву з цяляціны і падкінь кавалачак гэтай плявы ўвечары ў пасьцель. Спадзяюся, ты даволі разумная, так што больш мне ня трэба будзе табе нічога растлумачваць. Ты-ж будзеш мець справу з поэтам». Ну, увечары Анеля ўсё гэтак і зра-

біла, як яе вучылі. А муж яе ўсю ноч цешыўся і складаў вершы. Заснуў ён толькі пад раніцу, а калі прачнуўся, бачыць—фіранкі на вокнах спушчаны, цёмна ў пакоі, хоць на гадзіньніку ўжо восем. Раптам ён заўважае, што ў яго штосьці прыліпла да лыткі. Ён зьняў гэта, падышоў да вакна і пачаў разглядаць, а пасьля падыходзіць да шлюбнага ложка й пытае жонку: «Анеля, дарагая мая, сонейка маё, скажы мне, што гэта? Як гэта папала да нас у пасьцель?» Тая стараецца саромліва пачырванець і, ледзь дыхаючы, шэпча: «Ах, я-ж табе гаварыла, каб ты ня быў гэтакі гарачы, я-ж цябе прасіла пашкадаваць мяне, прасіла ня быць гэтакім жорсткім і бязьлітасным, каб мне ня трэба было плакаць ад болю, а ты ня браў гэтага на ўвагу. А калі што-небудзь парвуць, ці адарвуць, яно выпадае, бо яно ўжо больш ня трымаецца... Разумееш?» Ён быў страшэнна шчасьлівы, але падышоў яшчэ раз да вакна—разглядзець бліжэй. І раптам акамянеў,ператварыўся ў саляны слуп, і кажа: «Добра! Усё гэта я добра ведаю. Але растлумач мне, якім парадкам на ёй апынулася кляймо кладнянскай разьніцы?».

А ў той-жа час, калі ўдалы ваяка Швэйк разьвіваў сваю цудоўную аналёгію наконт дзіўнага паходжаньня пэўных поглядаў і разважаньняў, да Марэка падселі ў карцары расійскія салдаты і сталі распытваць яго, за што яго пасадзілі, а калі даведаліся, што за справа, пачалі ўпікаць і сарамаціць аўстрыяка:

— Эх, ня трэба было табе гэтага рабіць. Гэтыя-ж пані панавозілі падарункаў—страх! Ты мог-бы прадаць шынель, бялізну і боты на рынку і купіць сабе за гэтыя грошы бутэльку сьпірытусу або гарэлкі, а старым падлам гэтым даць у рыла потым, калі быў-бы ўжо выпіўшы. А так ты, браце, зрабіў усё шыварат-навыварат. Толькі бяз дай рацыі людзей пакрыўдзіў.

На другі дзень Гаршына, вярнуўшыся з гораду, паведаміў, што ўдзень пачнуць раздаваць падарункі, што ў горадзе фармуецца «праваслаўная» дружына з палонных сэрбаў, русін і тых чэхаў, што перайшлі ў праваслаўе і што ён другі раз прыме хрышчэньне, каб вольна цягацца па рэсторанах і не баяцца паліцэйскіх. Над гэтаю навіною глыбей ад усіх задумаўся Худзечак, і калі Гаршына яму яшчэ раз пацьвердзіў, што ваеннапалонныя, якія лічацца ў праваслаўнай дружыне, карыстаюцца воляй дзеля

таго, каб хадзіць вольна і быць на заработках, ён рашуча заявіў:

— Так і быць, я таксама перайду ў праваслаўе. Калі я буду паказвацца ў людзях, дык можа якая-небудзь дзяўчына або закахаецца ў мяне, або пашкадуе мяне з прычыны свае добрасьці. А то я дальбог больш ня выцерплю, браткі.

На гэтыя дабрачынныя і шляхэтныя жаданьні, ўдалы ваяка Швэйк адгукнуўся коратка:

— Ну, дык валяй!

2

ПРЭЧ КАТАЛІЦТВА!

Айцец Іоакім, настаўнік закону божага ў Омскай жаночай гімназіі, быў багабаязны, адданы справе праваслаўя і здольны захапляцца чалавек.

Гэта ён узьвёў на думку ваеннага камэнданта трымаць праваслаўных салдат асобна ад іншых; ён езьдзіў з дэпутацыяй ад папоўства да губарнатара, каб выклапатаць ваеннапалонным, асабліва чэхам, якія выракліся хлусьлівага вучэньня каталіцкай царквы, дазвол перайсьці ў праваслаўе. І як толькі пасаджанае ім і старэнна дагледжанае дрэва зацьвіло, дакляруючы даць багатыя плады, у галаве гэтага папка зарадзілася неадступная думка, што на ім ляжыць абавязак перавярнуць усіх славян на праўдзівы шлях, гэта значыцца вырваць салдат іншай веры, салдат недавяркавай аўстрыяцкай монархіі з кіпцюроў каталіцтва і далучыць іх да расійскае дзяржаўнае царквы.

Да Гаршыны, які выказаў ахвоту, каб яго прынялі ў лона праваслаўя, ён паставіўся з шчырым захапленьнем. Пачуўшы, што ў лягеры некалькі чалавек ваеннапалонных прышло да перакананьня, што між аднэй і другой верай вялікая розьніца і што праваслаўная вера—самая прыемная богу, ён горача абняў Гаршыну і сказаў:

— Цудоўна, цудоўна! Пагавары з тваімі таварышамі, на якіх сышоў сьвяты дух, а пасьля зноў прыходзь да мяне. Мы вас усіх адразу ў царкве й ахрысьцім. Тут непадалёку—сталярная майстэрня Мікалаенкі, Кузьмы Іванавіча. Схадзі да яго і папрасі яго

ад мяне быць за твайго хрышчонага бацьку. А таварышам скажы, каб яны адпрасіліся ў камэнданта ў горад—таксама падшукаць сабе хрышчоных бацькоў.

Калі Гаршына вярнуўся ў лягер і пераказаў гэтыя словы сваім, там панавала не малая ўзбуджанасьць. Перад складам наперадзе былі выстраены немцы, а за імі мад'яры, румыны і італьлянцы. Яны па чатыры ўваходзілі ў барак, і калі выходзілі адтуль, кожны з іх трымаў у руках клунак з бялізнаю, новы шынель, коўдру, боты, пачак запалак, тутунь і папяросы.

Навокал гэтых шчасьліўцаў шпалерамі стаялі расійскія салдаты, каб да іх ня ўбіўся як-небудзь хто з сэрбаў ці чэхаў. «Браты-славяне» схлупіліся тут-жа, з зайздрасьцю паглядаючы на немцаў, і, пераступаючы ад нецярплівасьці з нагі на нагу, з выглядам знаўцаў аглядалі падарункі і падхвальвалі:

— Добры тавар. Пацьдзесят рублёў на рынку за яго заўсёды дадуць.

Прапанова Гаршыны, каб як мага больш народу перайшло ў праваслаўе, не спаткала ніякага водгуку ў гэтых хаосе, і, калі Гаршына, не шкадуючы фарбаў, пачаў расхвальваць, як добра жывецца праваслаўнай дружыне, як яе кормяць пірагамі з капустай і гуляшом, і што кожны новахрышчаны атрымлівае ад свайго хрышчонага бацькі, апроч запрашэньня на гарбату і піражкі, яшчэ прынамсі тры рублі, яму гукнулі:

— Добра, браце, сьціхні. Бачыш, у нас іншыя клопаты, апроч твайго бога. Глядзі што тут даюць, дурань. Вось гэта дык падарункі!

Выдача адбывалася вельмі шпарка, хоць было ясна, што шмат-хто заносіў рэчы ў барак і зноў прыходзіў, каб, згаварыўшыся, відаць, з расійскімі салдатамі, прадаць ім тое, што атрымае другі раз. Палкоўнік Клягэн запрапанаваў быў выдаваць рэчы згодна сьпіскаў ваеннапалонных пад іх расьпіску. Але дамы з чырвонага крыжу з усьмешкай адхілілі гэтую прапанову, кажучы:

— Усё гэта людзі нашы, і ўсе атрымаюць роўна.

— От бачыце, хлопцы,—гаварыў хтосьці ў натоўпе ля барака.—Гэтакая штука, як чырвоны крыж,—найлепшая рэч. Яму дапамагаюць нэўтральныя дзяржавы, а тыя могуць не баяцца

гаварыць праўду і ўсіх контраляваць. Кажуць, з імі прыехаў швэцкі консул... А от мне, напрыклад, жонка ўжо тры разы прысылала грошы, якія ніяк не дайшлі да мяне. Цяпер яна мне напісала, што дала дваццаць крон на чырвоны крыж, і за тэта мяне адзенуць з галавы да ног. Што-ж, у гэтакіх графіняў усяго даволі, ім ня трэба красьці.

— Заўтра мы ўсе будзем выглядаць як жаніхі,—дадаў Швэйк, а Пісклявы, здагадаўшыся, што народу чакала больш, чым было тых падарункаў, шапнуў яму:

— Унь ідзе палкоўнік, які неўзабаве будзе наш начальнік. Зьвернемся да яго; зьесьці ён нас ня зьесьць, а ў лепшым выпадку дасьць памордзе.

Яны дагналі камэнданта і, стаўшы ў фронт, гэтак ляснулі абцасамі, што палкоўнік са зьдзіўленьнем узьняў вочы. Выцягнуўшыся ў струнку, Пісклявы адрапартаваў:

— Ваша высокаблагародзьдзе, пане палкоўнік!—сказаў ён па-нямецку.—Я той самы кравец, які будзе шыць вашай жонцы. Майго таварыша вы зрабілі ласку ўзяць сабе за дзяншчыка. Пане палкоўнік, з пакораю просім вас, загадайце паставіць нас сёньня з мад'ярамі, якія атрымліваюць падарункі.

— Вы-ж чэхі, хіба ня праўда?—з непаразуменьнем запытаў палкоўнік.—Чаму-ж вы хочаце стаць з мад'ярамі.

— Дазвольце далажыць, пане палкоўнік, толькі таму, што чэхі нічога не атрымаюць,—адказаў з хітравай усьмешкай Пісклявы.—А нам, пане палкоўнік, ваша ласка сама бачыць, няйначай трэба новае абмундыраваньне.

— Дамы ўпэўніваюць, што ўсім давядзецца роўна,—з прыкрасьцю заўважыў палкоўнік. З хвіліну ён хістаўся, а пасьля рашуча павярнуў назад.—Хадзем. Я зараз даведаюся.

Ён увайшоў у барак, прыпыніўся ў дзьверах і, паказваючы расійскаму фэльфэбелю на Пісклявага і Швэйка, загадаў:

— Паслухай, браток. Гэтых дваіх паставіш у першы шэраг.

— Слухаю, ваша высокаблагародзьдзе!—адчыканіў фэльдфэбель, абхапіўшы кожнага за стан і паставіўшы іх непорадзе мад'яр. Праз пяць хвілін пасьля гэтага яны вышлі з цэлым бярэмем рэчаў і, прышоўшы да сябе ў барак, Пісклявы заўважыў:

— Усё гэта толькі нам адным. Так загадаў палкоўнік, бо мы будзем у яго служыць.

— Мы, так сказаць, належым цяпер да каманднага складу.— сказаў Швэйк таварышам, якія абкружвалі іх цяпер шчыльнай сьцяной і разглядвалі рэчы.—Эй, ты, пакладзі фуфайку на месца, каб яна ў мяне не загубілася... Усё гэта нам павінны былі выдаць, але што будзе далей, я, браткі, ня ведаю. А ты там чаго шкарпэткі ў кішэню хаваеш? Думаеш, ня бачу, дурань!.. Ну, боты мне якраз на нагу? Я баронэсе так і сказаў, што мой памер—сорак трэці нумар. Бач, кавалачак мыла і мазь ад вошай... Слухай, браце, пакінь спаднікі, не чапай,—пакінь, кажу я!.. Жадаю вам, браткі, каб і вам давялося атрымаць гэтак, але толькі здаецца мне, што з вамі, чэхамі, ні чорта ня выйдзе.

Калі тыя, што так сабе прастоялі ля складу, вярнуліся й паведамілі, што румын таксама адзелі, і італьлянцаў, але што раздача на сёньня ўжо скончана, прычым апошнія румыны атрымлівалі ўжо толькі адну пасылку на дваіх, і хто атрымліваў шынель, той ужо не атрымаў коўдры, і наадварот,—барак стаў падобен да развярушанага кіем асінага гнязда. У ва ўсіх кутках шумела, гуло, на нарах стварыліся групы, і хоць прамоўца, што расхвальваў нядаўна працу чырвонага крыжу, запэўніваў цяпер, нібы ён уласнымі вушыма чуў, што рэчы чэскаму бараку адкладзены асобна, усё-ж было вырашана паслаць раніцаю дэлегацыю да камэнданта з просьбаю ўжыць захады да больш правільнага разьмеркаваньня падарункаў. Палкоўнік Клягэн выслухаў скаргу, а пасьля, пацісnуўшы плячыма, сказаў:

— Ну вось, вы-ж сталыя людзі. Скажэце-ж мне, што я магу тут зрабіць! Дамы прыехалі з Аўстрыі, рэчы прысланы з Аўстрыі, вы ўваходзіце ў склад аўстрыйскае арміі... Я, вядома, разьмеркаваў-бы рэчы ня гэтак, але я ня маю ніякага права ўмешвацца ў распараджэньні дэлегатак чырвонага крыжу.

Тут палкоўнік успомніў, што ён не разгледзеў яшчэ Марэкавае справы ў тым, што той дазволіў сабе ў яго прысутнасьці брыдкі ўчынак на словах супроць гэтых дэлегатак.

— Я, здаецца, загадаў даставіць да мяне з самае раніцы таго вальнапаложнага, якога я накіраваў учора пад арышт,—ска-

заў ён да старэйшага пісара.—Чаму гэта дагэтуль яшчэ ня выканана?

Калі Марэка прывялі, яму быў зроблены вельмі кароткі допыт з вельмі доўгім пасьля яго эпілёгам. Гутарка ішла на нямецкай мове, але пад канец палкоўнік прачытаў Марэку, дапытліва гледзячы яму ў вочы, цэлую казань па-расійску:

— Нядобра, нядобра, малады чалавек. Тое, што вы зрабілі, было недалікатна. І з вашага боку зусім не па-геройску выходзіць, калі вы парушаеце прысягу і неахвотна ваюеце на нашым баку супроць вашых-жа братоў. Я-б гэтага не дапусьціў. Я ведаю, наш урад мае тут пры гэтым адмысловыя палітычныя мэты, але ад гэтага зьмяншаецца дысцыпліна ў нашым войску. Гэтакі салдат ня лічыцца тады ўжо ані з якай прысягай... Ну, а вы каталік ці праваслаўны? Я скажу айцу Іоакіму, каб ён прыняў вас у сваю праваслаўную дружыну. Там вы будзеце вольны. Вы чалавек з асьветаю і можаце знайсьці сабе заняткі ў горадзе.

Тымчасам чэхі атрымалі ў лягеры падарункі: па пачку запалак, па шасьці папярос і па бляшанцы зялёнага мыла, ці па мяшэчку сьмярдзючага парашку ад блох. Прадстаўніцы чырвонага крыжу ўжо паехалі і ўвесь барак роў ад злосьці. Таго, хто хваліў гэтую ўстанову, лаялі на чым сьвет стаіць, і, нарэшце, запатрабавалі, каб ён зараз-жа выносіўся з барака. Калі ён задумаў протэставаць і стаў даводзіць, што ён таксама чэх, і мае права заставацца з сваімі землякамі, яго агульнымі сіламі выкінулі на мароз. Галава ў яго пасьля гэтага была чамусьці ўся ў гузох, і, падняўшыся на ногі, ён злосна гукнуў:

— А ну вас к д'яблу. Вы хочаце быць землякамі чэхамі? Вы хочаце быць адукаванымі? Падлы! Шэльмы! Гады вы, вось што! Каб вы былі паважныя людзі ды з асьветаю, дык у вас-бы і ўчынкі былі іншыя. Што? Узялі? Глядзеце, як я пайду да немцаў. Галадранцы! Пацалуйце мяне ведаеце куды?

Убачыўшы, што ніхто ня мае намеру карыстацца яго запрашэньнем пацалаваць яму туды, куды ён сказаў, ён панура пайшоў, раз-по-разу аглядаючыся назад, на барак, на якім была дошчачка: «Аўстрыйская армія: Немцы».

Швэйк і Пісклявы, узьдзеўшы новенькую форму, раздавалі свае транты тым, хто найбольш меў у іх патрэбу; Піскляны жур-

ботна разглядваў пляшачкі і пушачкі, раздумваючы, што яму рабіць з гэтай колекцыяй.

— З сабою ўзяць я не магу яе,—вырашыў ён нарэшце,—а галадам марыць іх таксама шкада... Браткі, хто мяняе парашок ад блох на хлеб?

Дваццаць рук падалі яму ўверчаны ў паперу «падарунак» і пацягліся па хлеб. Пісклявы разарваў пакуначак, адкаркаваў пляшачкі і трагічным голасам сказаў:

— Прападайце-ж, няшчасныя! Я атручу вас, як труцяць салдат на фронце ядавітымі газамі.

Ён насыпаў парашку ў пляшачкі і скалыхнуў іх. Вошы весела заскакалі ў ва ўсе бакі, клапы пацягваліся соладка, нібы іх толькі што пабудзілі... Пісклявы пачаў лаяцца, але Швэйк яму парадзіў:

— Паспрабуй узяць вош у рукі і сунуць ёй парашку ў горла. Разумееш, тут забыліся дадаць тлумачэньне, як гэтай штукай карыстацца... Вось пабачыш, што вош здохне.

Пісклявы злосна накінуў на сябе шынель і, сабраўшы свае пляшачкі, мармынуў:

— Пайду я адно і выкіну ўсё гэта ў сарціp.

У другім канцы барака Гаршына размаўляў пра тое, як добра жывецца ў праваслаўнай дружыне, і запісваў у адмысловы сьпіс усіх, хто дайшоў да канчатковага вываду, што тут, у гэтым лягеры, вельмі кепска і што трэба шукаць сабе новага бога, бо стары ўсемагутны і ўсюды даступны каталіцкі бог не клапаціўся пра іх нават і нагэтулькі, каб ім выдалі новыя фуфайкі і споднікі.

— Дзевяноста сем,—падлічыў кандыдатаў Гаршына.—Давай, хлопцы, яшчэ трох. Каб была круглая сотня... Ну, хто яшчэ хоча хрысьціцца?

— Добра, пішы ўжо й мяне,—пачуўся чыйсьці голас з нар.—А нам за гэта пасьля нічога ня будзе?

— Ды хто-ж гэта ў нас ведаць будзе!—сказаў яго сусед і адразу-ж загаварыў далей:

— Ну, тады пішы: Ян Пакорны. Я буду хрысьціцца пад чужым прозьвішчам.

— Трэба яшчэ дваіх. Весялей, хлопцы, весялей!—паддаваў ён жару.

— Ну, добра, пішы й мяне. Кажуць, у іх і цукар выдаюць. Пішы: Венцаслаў Захацеў.

— А мяне запішы апошняга: Франц Поллак. Я тут на рынку украў кавалачак сала, дык мяне здорава адкалацілі. А праваслаўных, чуў я, ня гэтак моцна б'юць, калі зловяць, бо яны іхнія.

З вартаўнічата памяшканьня прышоў расійскі салдат і патушыў лямпу. У цемені хтосьці запрапанаваў:

— Хлопцы, давайце засьпяваем. Толькі што?

— Што-небудзь рэволюцыйнае,—пачулася з розных кутоў.

І праз пяць хвілін шыбы задрыжэлі ад прыпеву:

Бэрлін і Вену няхай зямля глыне,
Аўстрыйская дынастыя няхай згіне,
А праскіх паліцэйскіх перадушым...

3

ШВЭЙК СЛУЖЫЦЬ У СІБІРЫ

У суботу канвойны адвёў Пісклявага і Швэйка на кватэру да камэнданта. У сенцах іх спаткала палкоўніца, падаравала ім рубель і ветліва ўсьміхнулася.

— Схадзеце перш за ўсё ў лазьню,—сказала яна ім,—і вымыйцеся як найчысьцей. Пасьля паведамеце мяне праз пакаёўку,—зьвярнулася яна да краўца,—а вы, як вас завуць? Ёсіф? Зьявецеся да дворніка, ён вам пакажа вашу работу. Сёньня, вядома, ужо ня прыдзецца працаваць. А я толькі пакажу, што мне трэба будзе перашыць і зрабіць.

Палкоўніца, шамечучы спадніцаю, пашла ў пакоі, пакінуўшы за сабою пах моцных духоў.

Дворнік Сымон быў яскравы тып ханжы і п'яніцы ў аднэй асобе. Сваю жыцьцёвую мэту ён бачыў у тым, каб маліцца перад абразамі і цягнуць усё, што дрэнна ляжала, на рынак дзеля ператварэньня яго ў грошы на выпіўку.

— Значыцца, галуба, ты падаўся да нас, значыцца, да пана нашага ў дзяншчыкі?—паважна сказаў ён Швэйку, калі той явіўся да яго.—Служыць, значыцца, будзеш пану нашаму? Ну

от, давядзецца табе чысьціць яму боты, выглянцоўваць іх, каб яны, значыцца, блішчэлі як шкло; адзеньне яму будзеш выбіваць і чысьціць, самавар ставіць, у печах паліць, ваду насіць... Шмат работы ў цябе ня будзе. Хіба што яшчэ карыдор падмесьці ды падлогу памыць.

І добры Сымон пералічыў усю работу, якую, уласна кажучы, павінен быў рабіць ён сам і іншыя яго памагатыя. Пасьля ён пачаў уводзіць Швэйка ў таемнасьці ўнутранага жыцьця гэтага дому і яго насельнікаў.

— Кухарка Марыля—дрэнь баба. Ані-ні мяса яна ня дасьць табе больш, чым табе вызначана, а выпіўкі ад яе ні кроплі не атрымаеш. Сама дык яна, сьцерва, горла гарэлкаю палошча... Госьці ў нас часта бываюць, і калі захочаш, дык у пляшцы заўсёды што-небудзь у дне знойдзеш. Тады, глядзі, незабудзься, што, хоць ты ёсьць аўстрыяцкі сабака, я табе друг і прыяцель, і цягні ўсё сюды. Бо лішні раз глынуць, ніколі не зашкодзіць—душа вільгаць любіць. Охо-хо-хо, адпусьці, божа, грэх!.. Затое пакаёўка Поля—тонкая штучка! Эх, братка ты мой, добрая дзеўка! Ёй-бы якраз з афіцэрамі шуры-муры разводзіць. З ёю, глядзі, не сварыся... Ну, а таварыш твой будзе шыць на нашу паню? Яна ў нас фарсуха. Калі ён спрытны і бог яму паможа, дык яму ўдасца і панскага мяса паспрабаваць. У галаве ў яе вецер... А цяпер хадзем, я табе пакажу, дзе ты будзеш жыць.

Ён павёў Швэйка ва ўнутраны флігель. У маленькім змрачнаватым пакойчыку стаялі два паходныя ложкі, столік, два крэслы і ўслон з міскаю што мыцца. Швэйк распакаваў свае рэчы і пачаў ужо разьбіраць рэчы свайго таварыша, калі той увайшоў разам з пакаёўкаю.

— Дзяўчына гэтая—проста адно хараство,—сказаў ён, задуменна расчэсваючы сабе грабянцом валасы,—але ад нашае пані ў мяне проста галава круціцца. Божа ты мой, што ёй усё трэба. Работы тут будзе да-чорта, браце ты мой.

— Гэта праўда,—згадзіўся Швэйк, расьцягнуўшыся на паходным ложку і вяла разглядваючы столь.—Работы ў цябе будзе па горла... Дворнік казаў мне, што пані ў сім-тым разумее смак... Так што калі ты маеш намеры заняцца яшчэ і пакаёўкаю...

— Я зусім ня гэта меў на ўвазе,—адказаў Пісклявы.—Але чаго-чаго яна мне не паказвала! Летнія сукенкі, блюзкі, бялізну, гарнітуры, манто, футры... Тут хопіць работы ні то што да канца вайны, а год на дзесяць. І яшчэ яна сказала, што будзе памагаць мне, бо ёй сумна, калі палкоўнік у канцылярыі. Гэта значыцца: шый без перадышкі, працуй, як апошні нявольнік.

Швэйк адно памоўчваў. Пісклявы адвёў душу некалькімі смачнымі словамі лаянкі, але калі Швэйк і на гэта маўчаў, ён запытаў:

— Што з табою? Ці ня хворы ты? Чаму ты не адказваеш?

— Я ўспомніў Марэка,—сумна сказаў Швэйк.—Чаму наш добры таварыш ня з намі? Ён мог-бы табе ў сім у тым памагчы... І хто ведае, ці не павесілі ўжо яго!..

— Што-ж, і мне шкада хлопца,—абазваўся Пісклявы.—Але я спадзяюся, што ён проста сядзіць у карцары. Ведаеш, браце (тут кравец загаварыў шэптам), я ўжо, так і быць, скажу табе пад сакрэтам: гэтак, як ён, ня робяць рэволюцыі, гэтак не змагаюцца з буржуазіяй.

Пісклявы наблізіў свае губы да самага швэйкавага вуха:

— От вазьмі, напрыклад, мяне: я сам прапанаваў свае паслугі гэтым сволачам, і той, хто ведае, што я—анархіст, мог-бы падумаць, што я прадаў свой сьцяг. А я гэта зрабіў сьвядома. Ведаеш, што кажа лёзунг кожнага сумленнага ваякі. «Усялякімі спосабамі зьнішчаць ворага і ўчыняць яму як мага большую шкоду». Палкоўніца думае, што яна, дзякуючы мне, будзе мець апчаднасьць у сваёй гаспадарцы, але калі мне ўдасца дабрацца да яе, я ствару ёй і Клягэну добранькую шкоду.

На гэтую дэкляраціыю Швэйк адказаў:

— А я буду далей трымаць твой баявы фронт і натвару ім шкоды цераз іх пакаёўку ці кухарку, гледзячы на тое, дзе будуць менш працівіцца.

І от Швэйк распачаў выкананьне сваіх службовых абавязкаў і выконваў іх гэтак, што палкоўнік быў зусім задаволены.

Боты як шкло блішчэлі, пакой аж зіхацеў ад чыстаты; і калі пасьля суботняе прыборкі палкоўнік паляпаў Швэйка па плячы і заявіў, што гэтакага малайца-дзяншчыка ў яго яшчэ ня было, той сьціпла адказаў:

— Так што дазвольце далажыць, пане палкоўнік, што я ў гэтакіх паноў, як вы, пане палкоўнік, ужо служыў. Напрыклад, пан фэльдкурат Кац—гэта была гэтакая п'яная сьвіня, які часта біў і псаваў усё, што пападалася яму пад рукі; ну, а пан паручнік Лукаш—той, зноў-жа, больш цікавіўся бабамі чым выпіўкаю. У пана фэльдкурата мне вельмі цяжка было трымаць дом у парадку і чыстаце. Але я такі чалавек, што да ўсяго ўмею прынараўіцца.

Праз некалькі дзён, калі Швэйк настаўляў на двары самавар, разьдзьмухваючы яго ботам, дворнік гукнуў яму:

— Ёсіф Швэйкавіч, да цябе знаёмы прышоў.

У сенцах стаяў Марэк. Швэйк правёў яго да сябе ў пакой і запытаў:

— Значыцца, ты ўцёк? Цябе хацелі павесіць ці расстраляць.

— Ні тое, ні другое,—сьмяючыся адказаў вольнапісаны.— Я цяпер у праваслаўнай дружыне. Заходзь да нас як-небудзь.

Калі Швэйк падаў паном самавар, Марэк расказаў, што ў іх робіцца ў лягеры.

— Ты, браце, і ўявіць сабе ня можаш, што вытварае Гаршына. Гэта проста такі трынаццаты апостал. Ён завербаваў у праваслаўе траха не паўлягеру, і ў нядзелю першая сотня нашых хлопцаў будзе хрысьціцца ў расійскай царкве. Хлопцы загадоўваюць сабе валасы, шукаюць хрышчоных бацькоў, каб атрымаць падарункі, і вучацца падпісвацца па-расійску. Калі мы атрымаем аўтономію, дык нам давядзецца заклікаць з Расіі папоў у Чэхію больш, чым наш легендарны продак засадзіў чэскіх дзяцей у гару Жып. Праваслаўе прымаюць усе, хто толькі ўздумае, каб як найлатвей прыстроіцца ў палоне. Што-ж, яно, як мне здаецца, ня горш за іншыя рэлігіі.

— Я, браце, таксама гатоў хрысьціцца,—адазваўся Швэйк,— але мне хацелася-б знайсьці сабе хрышчоную матку, або яшчэ найлепш сястру, каб яна, як будзе адбывацца таінства, трымала мяне на руках.

Айцец Іоакім лічыў сябе ў той час за гэтакага духоўнага пастыра, малітвы якога мелі не абы якое значэньне перад прастолам усявышняга. Сьвяты дух сышоў на ваеннапалонных,

асьвяціўшы іх нібы яснае сонца, і барак стаў неўзабаве вельмі цесны дзеля ўсіх, што імкнуліся ў лона праваслаўнае царквы. Усе прахвосты, гультаі, жулікі і ўрвіцелі, якія лічылі палон за вымушанае прыемнае гультайства, ішлі да яго па протэкцыю да расійскага бога. І ён верыў якраз гэтак, як доктар Крамарж, што надышла эра панславізму, што чэхі гатовы далучыцца да расійцаў і што, калі палякі адпадуць ад Рыма, створыцца Ўсеславянская дзяржава на грунце агульнай веры. Ён быў як мае быць захоплены гэтай ідэяй. Ён каваў жалеза, пакуль яно было гарачае. Кожны дзень у яго адбываліся духоўныя гутаркі з ваеннапалоннымі, прычым ён шмат гаварыў пра адзінае вялікае славянскае царства, згрупаванае навакол матушкі-Масквы. Ён вышукаў недзе кнігі пра Гуса і Коменскага і перасыпаў цытатамі з іх свае пропаведзі. Але на кожным слове ён усё блытаў чэхаў з чорнагорцамі, і каралеўства Чэхія апынулася ў яго дзесьці на Адрыятычным моры, і гэтая блытаніна разуменьняў і падзей заўсёды была ў яго пропаведзях. А пасьля гэтакае пропаведзі выступалі фанатыкі з ліку самых большых прайдзісьветаў у дружыне і запэўнівалі, што ніхто ня ведае гісторыю гэтак добра, як айцец Іоакім, а шавец Пістора, спрытны жыжковек, крычаў, б'ючы сябе ў грудзі:

— Хлопцы, прысягаю богам, што ў вызваленай Чэхіі іх рэлігія павінна стаць нашай казённай, так сказаць—дзяржаўнай рэлігіяй. Мы выберам цара за нашага праскага архіепіскапа. Я перагавару пра гэта з братам Клофачам. Я-ж з ім знаёмы, мы з ім хадзілі ў адзін рэсторан. Хто за тое, каб айцец Іоакім зрабіўся ў нас у Празе за пратайярэя сабору сьв. Віта.

Нядзеля, калі цэлая сотня аўстрыякаў перайшла ў праваслаўе, была для Омску вялікаю падзеяй. На царкоўны парад быў выведзены ўвесь гарнізон, і сабор быў абкружаны вялічэзным натоўпам цікаўных і абібокаў. Новахрышчоных, па чатыры ў рад, спаткалі гукам «ура!» і гучнымі аплёдысмэнтамі. А калі айцец Іоакім сказаў урачыстую пропаведзь пра чэхаў, якія стогнуць пад турэцкім прыгнечаньнем, калі ён сказаў, што яны шукаюць абароны на грудзях матушкі-Расіі, якая, моцная давер'ем сваіх сыноў, няйначай, пераможа пры дапамозе свае непераможнае арміі, у царкве народ пачаў плакаць. Стопяцідзесяцімільённы

народ плакаў ад шчасьця, што ў яго веру перайшло сто чалавек, якія любілі есьці на абедзе сьвежае мяса, замест гнілое бульбы...

Палкоўнік Клягэн сказаў гарнізону невялікую прамову, у якой выставіў ваеннапалонных як прыклад высокага патрыётызму, разумна замоўчаўшы, што тое, што яны тут рабілі, было ў Аўстрыі за дзяржаўную здраду, і выказаў упэўненасьць, што расійскія ваякі будуць біцца на ваенным полі за радзіму і за свайго бацюшку-цара якраз гэтак, як калісьці «чудо-богатыри» пад кіраўніцтвам нябожчыка Суворава.

У задніх шэрагах натоўпу плакаў удалы вояка Швэйк, прымаючы ад людзей грыўні і пятакі, булкі і сланечнік, і ўпэўніваў, што салдату няма нічога лепш, як даць сябе забіць на фронце. Калі-ж у яго пачалі мерзнуць ногі, ён з поўнымі кішэнямі пабег дадому.

У доме, здавалася, ня было ні душы. Усе слугі пашлі ў царкву, і толькі дворнік, пасьпеўшы ўжо з самага ранку напіцца, хроп у сваёй каморцы. Швэйк зайшоў у палкоўніцкі габінэт і пачаў выціраць там пыл.

Раптам ён пачуў стук швэйнай машыны. Гэта працаваў Піскілявы, сьпяшаючыся закончыць элеганцкае ўбраньне, якое палкоўніца павінна была адзець на вечар, куды яе запрасілі. Пасьля пачуўся палкоўнічышын голас, яе сьмех, стук дзьвярэй у спальню, усхваляваны голас Піскілявага і шуршэньне матэрыі. Нарэшце да Швэйка дайшлі словы: «Мерсі... Добра... Расшпіліце, калі ласка...», за якімі пачуўся незразумелы, па-француску, шэпт краўца. Матэрыя зноў зашуршэла, і разам з гэтым чуваць стала, як хтосьці моцна раптам стаў дыхаць... І раптам— страшны грукат, штосьці грунула на падлогу, штосьці пакацілася, і ўвесь гэты хаос быў прыглушаны роспачным крыкам палкоўніцы:

— Ah, mon dieu!

Швэйк не раздумваў доўга. Шпарка, як маланка, ён адчыніў дзьверы і кінуўся на дапамогу. Сярод кавалкаў разламанага ложка ляжала палкоўніца, адзетая толькі ў самае неабходнае, а за ёю, ля адламанага біла, падымаўся з матраца ўвесь чырвоны як бурак кравец.

— Вы, пані, ня прыбіліся?—заклапочана запытаў Швэйк, памагаючы ёй устаць на ногі, нібы той стан, у якім ён яе застаў, ня мог быць іншым і сам сабою зразумелы.

— А з табою таксама нічога ня здарылася?—павярнуўся ён да таварыша.—Ты нічога сабе не зламаў? Ні рукі, ні нагі? Бо не заўсёды, калі ўпадзеш, удала сыходзіць. Вось на мосьце Полацкага ўпаў у галялёдзіцу адзін саветнік юстыцыі, дык той зламаў сабе левую нагу ніжэй калена, правую—у сьцягне, а бяда-ж ніколі ня прыходзіць адна, дык ён струшчыў яшчэ ў сябе ў кішэні чатыры дарагія цыгары. і...

— Прэч!—як няпрытомная запішчала палкоўніца, затупаўшы нагамі.—Прэч! Прэч!

— Прэч? [1])—перапытаў Швэйк, падымаючы адламанае біла і разглядаючы пагнутыя змацаваньні.—Чаму? Ды таму, што на ложак лёг раптам вялікі цяжар, вось ложак і падагнуўся. Калі ложак кароткі, дык ня можна ўпірацца нагамі ў біла, або, што яшчэ горш, пхаць у біла. Вось я ведаў аднаго—Кроўпа, студэнта, які кожную нядзелю хадзіў гуляць у футбол, а пасьля ўночы яму ўсё сьнілася, што ён адбівае мяч. Дык той, бывала, разоў шэсьць на ноч правальваўся з сваім ложкам, так што яго кватэрная гаспадыня нарэшце ўзяла дый...

— Вон! Вон!—зноў крыкнула палкоўніца, паказваючы на дзьверы.—Вон! Вон!

Ад злосьці яна зьмянілася ў твары, то бялеючы, то адліваючы ўсялякімі колерамі, ад ясна-чырвонага, да самага зеленюсенькага. А Швэйк, не здагадваючыся, што яна яго выганяе, бо па-чэску «вон» значыцца «ён», не бяз прыемнасьці паглядаў на яе грудзі, дзе пад белым як сьнег гафтаваньнем кіпела навальніца, і ахвотна падаўся ў далейшыя тлумачэньні:

— Не, ня вон. Так што дазвольце далажыць, што пан палкоўнік гаварыў на саборным пляцы прамову. Вон—дык ужо мусіць налаўчыўся спаць на гэтым ложку, а вось гэты дык яшчэ ня прывык. Але, але, гэты, гэты,—паказаў ён на краўца, які стараўся давесьці да ладу сваё адзеньне.

[1]) Па-чэску „прэч" („проч") значыць „чаму".

— Каб духу твайго тут больш ня было!—заенчыла палкоўніца высокім, нязвычайным голасам.—Вон, гад, паскуднік, пашоў вон!

Яна выпусьціла з рукі гафтаваныя лямоўкі сарочкі і паказала на дзьверы. Раптам яна нейк заенчыла, хапілася за галаву і ў няпрытомнасьці павалілася на абломкі ложка.

У дзьвярах стаяў палкоўнік Клягэн.

Ён не сказаў ні слова. Моўчкі падышоў да яе, з пачарнелым тварам глянуў на навакольны непарадак, на вячорнае адзеньне, на параскіданую бялізну... Пасьля падскочыў да краўца, смальнуў яму справа і зьлева па твары, хапіў яго за горла, з нечаланую сілай падняў угару, паднёс да дзьвярэй і нагою выпхнуў вон.

Тады ён перавёў ускаламучаны зірк на Швэйка. Той зразумеў, што Клягэн чакае ад яго тлумачэньняў, і сказаў сваім чароўным голасам:

— Жонка ваша спалохалася, што пад ёй праваліўся ложак, і ўпала ў няпрытомнасьць. Мы, гэта значыцца, я прыбег да яе на дапамогу. Бо нядобра, калі хто ляжыць у няпрытомнасьці. Я думаю, што з ёю нічога страшнага ня здарылася.

Спакойны тон вярнуў палкоўніка да сталасьці. Ён разам з Швэйкам падняў палкоўніцу, паклаў яе на другі ложак і, пакуль Швэйк складаў разбураны ложак і раўнаваў на ім матрацы, стаў, не бяручы на ўвагу прысутнасьць Швэйка, называць жонку самымі ласкавымі імёнамі, націраючы ёй каля вушэй одэкалёнам і цалуючы ёй рукі. Нарэшце яна расплюшчыла вочы, але, заўважыўшы Швэйка, зноў упала ў няпрытомнасьць.

— Ідзі ў мой габінэт,—хрыпла сказаў палкоўнік Швэйку, выліваючы на галаву жонцы каб траха дык цэлую пляшку одэкалёну.

Неўзабаве Швэйк, раздумваючы ў габінэтнай цішыні пра падзеі дня, пачуў горкі плач палкоўніцы, за якім пашло абвінавачваньне краўца ў тым, нібы ён, калі прымерваў ёй адзеньне, спрабаваў ганебна пакарыстацца яе бездапаможнасьцю; нарэшце яна пачала лаяць Швэйка, «гэтага паскудніка, у якога няма аніякага разуменьня пра жаночую саромлівасьць», а пасьля да Швэйка дайшоў ласкавы, угаворлівы голас палкоўніка.

Прыйшоўшы праз некаторы час у габінэт, палкоўнік дастаў з шуфляды ў пісьмовым стале рэвальвэр і паказаў яго Швэйку.

— Ведаеш што гэта? Ведаеш нашто яно?

— Так точна, дазвольце далажыць, я гэта ведаю,—шчыра адказаў Швэйк.—У нас гэта завецца «браўнінг». Гэтакаю штуччкаю налётчык Вочак перастраляў агентаў паліцыі, калі тыя прышлі яго арыштаваць, а анархіст Прынцып забіў у Сараеве нашага Фэрдынанда. Відаць, ня кожныя прынцыпы добрыя.

Сунуўшы Швэйку рэвальвэр пад нос, Клягэн холадна сказаў:

— Маўчаць! Адно толькі слова з твайго боку, самы найменшы намёк—і я пушчу табе кулю ў лоб. Зразумеў? Ня выходзь! Аставайся тут!

Швэйк пачуў тэлефонны званок і голас палкоўніка, які камусьці загадваў: «Зараз-жа, хутка!» а пасьля палкоўнік зноў вярнуўся ў габінэт. Крыху пачакаўшы, пастукала ў дзьверы пакаёўка і паведаміла:

— Там прышоў фэльдфэбель з салдатамі.

— Хадзем!—суха загадаў Клягэн Швэйку,—завядзі салдат да твайго таварыша.

Пакойчык быў пусты. На швэйкавым ложку была параскідана брудная бялізна, і валяліся скарынкі хлеба і старыя боты. Пісклявы зьнік разам з сваім ранцам, і дворнік Сымон, п'яны да страшэннае моцы, кляўся і бажыўся, што кравец пашоў яшчэ зранку, яшчэ з цямна і больш ня прыходзіў. Салдаты так і пашлі без усялякага скутку; а Клягэн, кусаючы з прыкрасьці губы, заявіў па тэлефоне ў паліцыю, што яго абакраў адзін аўстрыяк і што ён з гэтае прычыны просіць прыводзіць у камэндантуру дзеля пазнаньня ўсіх ваеннапалонных, якія будуць затрыманы ў бліжэйшыя дні.

Палкоўніца нагэтулькі паправілася, што магла пайсьці на вечарыну. Удалы ваяка Швэйк паказаў Марэку, які прышоў да яго ў госьці, запісачку; там было напісана: «Бывай, Ёсіф, будзь здароў. Можа калі-небудзь мы з табою яшчэ спаткаемся і тады я табе раскажу, як была справа. Драцяныя загарадзі я перарэзаў, але ў самым акопе была засада... Кланяйся ўсім. Твой І. П.». І. памятаючы дадзенае палкоўніку абяцаньне, ён сказаў:

— Як бачыш, Пісклявы ўцёк. Здарылася прыкрае непаразуменьне. Ён прымерваў нашай пані гарнітур і, каб лепш бачыць, як ён сядзіць, паклаў яе на ложак. Можа гарнітур крыху памяўся і яго трэба было папрасаваць... Ну, а ложак, вядома, ня дошка да прасаваньня, узяў і праваліўся... Як на тое ліха тут якраз наскочыў палкоўнік... Такім чынам, мне асталіся пасьля Піскляваага ў спадчыну ўсе гэтыя рэчы.

Швэйк згарнуў фуфайку і пару споднікаў, схаваў іх у свой ранец і растлумачыў далей цікавы інцыдэнт:

— Божа ты мой, які яна гвалт справіла, калі я ўвайшоў да іх! А сам палкоўнік таксама штука! Ануча нейкая, а не афіцэр, ні то што палкоўнік. Ён павінен быў агрэць яе як належыць, а не гаварыць ёй: «Анёлачак, сонейка маё, красуня мая». Яна, сьцерва, бачыць, што ён яе кахае, і езьдзіць на ім як хоча. Сама краўца й спакусіла, а муж, заместа таго, каб правучыць яе, ёй рукі ліжа, нібы яны з цукру. Ну, скажы сам, хіба гэта мужчына? А пасьля лезе яшчэ з рэвольвэрам да мяне. Значыцца, калі жонка яму рогі наставіла, ён ад дзяншчыка адмысловае павагі патрабуе, на мне злосьць спаганяе! Гэта якраз таксама, як з Барпатрабуе, на мне злосьць спаганяе! Гэта якраз таксама, як з Бартунэкам у Страконіцы, які мне часам дастаўляў сабак дзеля мае справы. У таго таксама была жонка—ні аднаму сабаку я-б не пажадаў выцярпець таго, што выцярпеў ён ад яе. От ужо была ведзьма, дык ведзьма! Лупцавала яго, калі толькі не лянавалася. Нейк раз ён піша мне, што ў яго ёсьць добры сэн-бэрнар, і ня дорага. Ну, я паехаў да яго паглядзець, а ў іх, відаць, толькі што адбывалася хатняя сутычка. Яна—разгарачаная тэтакая, растрапаная, а ён сядзіць пад сталом... «Што гэта ты там робіш?» пытаю я ў яго, як-бы вельмі зьдзівіўшыся. А ён мне на гэта горда: «Я—тут гаспадар, і дзе хачу, там і сяджу!» Ну, а ў вас што новенькае, Марэк?

— У нас?—павольна працягнуў той.—Ды нічога такоўскага. Ад швэцкага чырвонага крыжа мы атрымалі крыху нейкае драбязы, і цяпер нашы хлопцы гандлююць ёю на рынку. А Худзечака айцец Іоакім, бачачы яго набожнасьць, угаварыў вывучаць багаслоўе і нават згадзіўся плаціць за яго ў сэмінарыю.

Калі Марэк выходзіў, Швэйк затрымаў яго ля дзьвярэй і журботна сказаў:

— Марэк, мы-ж з табою прыяцелі змалку. Калі здарыцца што-небудзь з табою, дык паведамі мне, таксама і я паведамлю цябе, калі палкоўнік мяне ненарокам застрэліць... Я адчуваю сябе тут, як у яме, і мне здаецца, што я ня вытрымаю тут да канца вайны...

*

Адчуваньне не ашукала Швэйка, яго думкі спраўдзіліся. Палкоўніца старалася ўсялякімі спасабамі ахаладзіць прыхільнасьць свайго мужа да Швэйка, якога той лічыў за сумленнага салдата, і Швэйку нарэшце прышлося разьвітацца з гэтым домам.

Яна праводзіла кампанію чыста па-жаноцку. То ёй здавалася, што вада ў самавары сьмярдзіць тутунём, то яна знаходзіла на мундзіры свайго мужа чыйсьці волас, то яна ўпікала яго, нібы ён ня сочыць за сваёю чыстатою і боты яго ня блішчаць больш гэтак, як раней. Яна загадала, каб кухарка пасылала Швэйка на рынак па продукты, а, абедаючы, яна ўзьнімала гвалт, што масла горкае або яйца ня сьвежыя і клікала кухарку. Тая, паціскаючы плячыма, кожны раз адказвала ўсё адно-ж:

— Гэта аўстрыяк купляў. Я была занята, а вы загадалі, каб на рынак хадзіў аўстрыяк.

Над Швэйкаваю галавою зьбіраліся навальнічныя хмары. Дворнік больш нічагуткі не рабіў, звальваючы ўсю работу на дзяншчыка, а палкоўніца пад'юджвала. Так, паказваючы адзін раз на дзірку ў дарагім дыване, які толькі што выбівалі ад пылу. Яна заявіла:

— Гэта твой аўстрыяк наўмысьля зрабіў. Няўжо ты сабе ня можаш дастаць добрага расійскага дзяншчыка. Навошта трымаць у доме ворага. Глядзі, падкажа яшчэ хто на цябе губарнатару.

Назаўтра пакаёўка прынесла Швэйку чысьціць гарнітур на конную язду свае пані: высокія лякаваныя боцікі, чаркеску, папаху і белыя замшавыя нагавіцы. Швэйк звыклымі спосабамі вычысьціў усё шчоткай, launched ператварыў боцікі пры дапамозе белага парашка ў адзін бляск, але на нагавіцах знайшоў плямы, якія ніяк ня ўдалося вычысьціць.

Магнэзія не дапамагла, бэнзін—таксама, а крэйда не забяліла іх. Палкоўніца вярнула Швэйку нагавіцы, знайшоўшы, што яны дрэнна вычышчаны.

Тады Швэйк паспрабаваў вымыць іх у халоднай вадзе. Але як толькі яны высахлі, плямы зноў зьявіліся.

— Я адно выварy іх у мыльнай вадзе,—падумаў Швэйк, кладучы іх у кацёл з цёплай вадой. Ён разлажыў на двары агонь, паставіў кацёл з нагавіцамі на цэглы над агнём, накрышыў туды мыла і, разьмяшаўшы ваду чыстай шчоткай, даў ёй закіпець.

Пасьля ён яшчэ раз добра намыліў нагавіцы, вельмі здаволены, што плямы нарэшце зьнікалі, паклаў іх назад у гарачую ваду, другі раз даў ім пракіпець і панёс да сябе ў пакой. Адтуль яго паклікала кухарка, і перадала яму загад ад пані купіць білеты ў кіно. Ён схадзіў па білеты, а пасьля кухарка затрымала яго да абеду ў кухні. Тымчасам палкоўнік вярнуўся з службы.

— Калі хочаш дарагая, мы можам сёньня паезьдзіць конна,— сказаў ён пасьля абеду, і жонка яго радасна запляскала ў ладкі:

— Паедзем, паедзем! «Зьмейка» ужо асядлана?—І паэваніла пакаёўцы:—Прынясі мне ад дзяншчыка мае нагавіцы.

— Яны яшчэ мокрыя, — заклапочана сказаў пакаёўцы Швэйк.—Я-ж іх толькі нядаўна вымыў. Няхай пані адзене сёньня якія-небудзь іншыя. Замша гэтак шпарка ня сохне.

На гэткі адказ палкоўніца гнеўна затупала ножкамі і крыкнула:

— А я хачу гэтыя, гэтыя і ніякіх іншых! Няхай ён тады верне іх мне брудныя.

Швэйк зьбегаў да сябе ў пакой і палез рукою ў кацёл, каб выцягнуць адтуль нагавіцы. Але замест замшы ў яго між пальцамі завязла штосьці ліпкае і густое.

— Яны разварыліся на жур!—жахнуўшыся закрычаў Швэйк, паказваючы пакаёўцы на кацёл. Але тая, не разўмеючы, што здарылася, упарта гаварыла ўсё адно, што ёй загадала пані:

— Давай іх тэтакія, якія ёсьць. Іншых яна ня хоча.

Палкоўніца ледзь ня ўпала ў няпрытомнасьць, калі Поля шырока адчыніла дзьверы ў сталовую і за ёю зьявіўся ўдалы ваяка Швэйк з катлом ад бялізны ў руках, які ён паставіў на стол, а пасьля, выцягнуўшыся ў ва фронт, адрапартаваў:

— Так што дазвольце далажыць, яны ў мяне зусім разварыліся. Ніколі яшчэ ў жыцьці ня было са мною гэткага выпадку, каб я з нагавіц рабіў бланманжэ. Калі-б я, дазвольце сказаць, паклаў туды цукру і ваніля, іх льга было-б есьці.

— Прэч, вон!—крыкнула палкоўніца, паказаўшы на дзьверы, як у тую памятную нядзелю, а Швэйк узяў кацёл і задаволеным тонам адказаў:

— Чаму з гэтых нагавіц вышла гэтакая штука, я ня ведаю. Тут, мусіць, працуе нячыстая сіла. А вон вынясьці я іх магу. Раз я сюды іх прынёс, дык чаму-ж-бы мне іх і ня вынясьці вон!

Прайшло дзьве гадзіны. Поля паведаміла, што палкоўніца прыбірае свае рэчы і заявіла мужу патрабаваньне: або яна, або аўстрыяк! З чалавекам, які толькі і думае, як-бы яе забіць, яна ні хвіліны не застанецца пад аднэй страхою.

Калі сьцямнела, Швэйк пачуў у сенцах цьвёрдыя палкоўнікавы крокі. Вось яны пачуліся ля самых дзьвярэй. Ён адчыніў дзьверы і запытаў:

— Так што, дазвольце даведацца, пане палконўік, ці ня будзе якога загаду?

— Не, загадаў ніякіх няма, Ёсіф,—нерашуча пачаў палкоўнік. Пасьля ён набраўся сьмеласьці:—Мая жонка ня можа цябе цярпець. Ты робіш ёй адны толькі няпрыемнасьці... Прыдзецца табе цяпер вярнуцца ў лягер, Ёсіф. Вось табе пропуск у канцылярыю, каб цябе не затрымалі па дарозе. І вось табе за тваю службу. Зьбяры рэчы і ідзі зараз-жа.

Палкоўнік сунуў ў Швэйкаву руку дзьве дзесяцірублёўкі, пачакаў, пакуль той ня ўскінуў ранца на плечы, і сказаў:

— Ты—салдат. Я спадзяюся, ты ня будзеш гаварыць нічога лішняга... Калі табе што трэба будзе, можаш зьвярнуцца ў маю канцылярыю.

— Пане палкоўнік,—ледзьве выгаварыў Швэйк,—дазвольце далажыць, што я вашае дабраты ніколі не забуду. Вы-ж першы афіцэр у Расіі, які падобен на майго пана паручніка Лукаша.

Швэйк у апошні раз азірнуўся ў сваёй каморцы і хутчэй зашаптаў, чым сказаў уголас:

— Так што, пане палкоўнік, дазвольце далажыць, калі я вярнуся да сябе ў Аўстрыю, я прышлю вам з Прагі адкрытку.

Калі ля васьмі гадзін вечару Клягэн з жонкаю імчаўся ў парных санях у кіно, яны ля чайное ледзь не задушылі ваеннапалоннага аўстрыяка, які толькі што вышаў адтуль, з цесна напханым ранцам за плячыма. Аўстрыяк шмаргануў убок, а калі палкоўнікавы сані схаваліся за рогам вуліцы, ён зноў бадзёра закрочыў па заваленай сьнегам вуліцы, ціхутка высьпеўваючы:

Ў лягеры жывецца сумна,
У жываце й кішэні пуста.
Толькі хто дзе лепш прыстане,
Шчасьця лепшага дастане.
Ад палонных сухамяткі,
Я уцёк-бы без аглядкі.
Мне дадзела думаць дзе-бы
... Гламянуць скарынку хлеба.
Ў вёсцы ходзячы за плугам,
Ня было там гэтак туга:
Есьці лепш там мне давалі,
Ў жываце не пуставала.
У буржуя было горай:
Крупнік голы—адно гора.
Жыжкай горкаю закусвай,
Мне ўсё гэта не да густу.

Гэта, перашкаджаючы сваёю грузнаю постацьцю вулічнаму руху, наш удалы ваяка Швэйк варочаўся ў лягер...

4

ШТО РАБІЦЬ?

За той кароткі час, які Швэйк праслужыў у палкоўніка, жыцьцё ў лягеры зусім зьмянілася. Калі ён прайходзіў на сваё старое месца на нарах і некаторыя з ранейшых таварышаў яго пазналі, яны адказалі на яго вітаньне і запытаньне: «як справы» гэтак:

— Халера-б іх падушыла! Цяпер, браце, тут усё-адно як на катарзе!

Гэтак яно і было. Камэндант наведваў баракі цяпер штодзенна, але ні на тое, каб выслухваць скаргі і просьбы ваеннапалонных і ўжываць захады да палепшаньня іхняга жыцьця, а каб зьбіваць стэкам кожнага, хто падвернецца яму пад злосную

руку. Ён біў людзей з усялякіх прычын: за непарадак у лазьні, за тое, што не даволі было чыста ў клазэтах, за дрэннае паветра ў бараку. Ён ужо больш не гаварыў з людзьмі па-нямецку, а толькі па-руску, і калі яго не адразу разумелі, пускаў у ход свой стэк.

Вышаў новы загад, каб ваеннапалонных выкарыстоўвалі на працы дзеля ачысткі гораду, дзеля дастаўкі дроў з лесу і дзеля капаньня магіл на могілках. З барака павінны былі кожны дзень пасылацца на работу пяць-шэсьць чалавек, якія варочаліся вечарам змучаныя, галодныя, зьмерзлыя, з адмарожанымі пальцамі на нагах, насамі, вушыма.

Ад працы звальняліся толькі тыя, у каго ня было зусім у што абуцца.

З прычыны практычнасьці расійскіх салдат і выгоднасьці рыначных апэрацый, было тое, што заўсёды то адзін, то другі з ваеннапалонных, калі канвой зганяў іх раніцаю на работу, зьнімаў з сябе абутак і перадаваў яго канвойнаму, гаворачы:

— На, дай мне за іх рубель.

Канвойны ахвотна браў боты і плаціў грошы, а ваеннапалонны зноў узлазіў на нары і крычаў адтуль дзяжурнаму фэльдфэбелю, які пералічваў тых, што выходзілі на работу:

— Ты-ж бачыш, што я босы! Як-жа я пайду на работу!

Тыя, у каго было ў што абуцца, не разбуваліся на ноч, каб уночы ня ўкралі ў іх абутку. Дык расійскія салдаты рабілі абход ужо ўночы і будзілі сонных:

— Эй, ты! Заўтра на работу! Пакажы адно як у цябе справы?

З гэтае прычыны, калі хто меў боты, дык на яго клаўся абавязак мучыцца на рабоце цэлы дзень. І аўстрыяк накіроўваў свае боты на біржу яшчэ з вечару, і цэны зьнізіліся гэтак, што пару рускіх ботаў лёгка можна было праесьці за адзін тыдзень. Цукер пакінулі выдаваць, хлебны паёк зьменшылі. На абед давалі толькі рыбу. Стары, які быў прыстаўлены да катла гатаваць ваеннапалонным ваду, быў нясусьветны хабарнік і не дазваляў ім браць гарачую ваду, калі яму не плацілі па капейцы; дык ваеннапалонныя пачалі збываць на рынку й сваю бялізну і ўсё, што толькі было ў іх у запасе. Лягер шпаркаператва-

рыўся ў збор нейкіх абадранцаў, і аднойчы, калі палонных выстраілі на паверку, Швэйк сказаў:

— Ну, чым мы ня басяцкая вашывая каманда?

У гэтае пекла бядоты і гразі добры Пятро Осіпавіч, фэльдфэбель з канцыляры[і], кожны дзень прыводзіў сялян з блізкае вёскі, якія шукалі парабкоў. Тыя, глянуўшы на запрапанаваны ім матэрыял, пачухвалі ў сябе за вухам і заяўлялі:

— У нас-жа холадна—марозы, і зноў-жа, сьнегу шмат... Гэтакія, браце, у нас адразу памерзнуць. Зайду я лепш вясною, калі льга хадзіць босаму.

Аднойчы ўвечары, падсьцілаючы пад сябе на голыя дошкі вопратку, Швэйк пабажыўся, што не застанецца больш у лягеры, а пяройдзе ў праваслаўе. Нейкі ваеннапалонны, перачытваючы можа ў соценны раз лісты, якія ён атрымаў на фронце, ледзь ня плачучы, сказаў:

— Гэта не паможа, адсюль мы ўсё-адно ня выберамся. Я ўжо і дэклярацыю напісаў: усё, што пасьля нас астанецца, забярэ чырвоны крыж і пашле нашым сем'ям, каб у нашых дзяцей захавалася хоць што-небудзь на памятку пра сваіх небаракаў бацькоў. Вось тут я запісаў ім шмат вершыкаў пра вайну, каб яны ведалі, што ў іх бацька ня дурань быў.

— Ну, пакажы,—сказаў Швэйк, працягваючы руку па блёкнот.—Люблю часамі пачытаць гэтакую драбязу.

— Вось гэтыя—самыя лепшыя,—сарамяжа заявіў аўтар, перагарнуўшы некалькі балонак.

ВАЙНА

Як прышоў год вайны праклятай
Сталі ўсіх вабіраць у салдаты.
І бацька ваш пашоў з войскам
Абараняць аўстрыйскі сьцяг.
Ах, здавалася, разьмяк-бы камень,
Калі дзеці абвілі рукамі
Бацькаўскую шыю ў жалобе—
Бацьку ісьці ня пускалі.
За імпэратара з сьмеласьцю львінай
Байцы на ворага рынуліся лавінай,
Але пасыпаліся градам расійскія кулі
І шмат каго да зямлі прыгнулі.
Бывайце-ж, жонка і дзеці.

— Здорава!—пахваліў яго Швэйк і аўтар зноў сарамяжа сказаў:

— Гэта ня я адзін зладжыў, а мне дапамагаў адзін настаўнік, калі мы разам з ім стаялі ў вёсцы. У таго былі запісаны гэтакія прыгожыя рэчы, што мы ўсе плакалі, калі ён нам іх чытаў.

На другую ноч з страшэнным шумам у барак уварвалася чарада людзей і палезла цёмначы на нары. На запытаньне, адкуль яны, людзі, сьмяючыся, адказалі:

— Мы—праваслаўныя. Гэта праваслаўная дружына да вас варочаецца.

— Алё, алё! Марэк, Гаршына, Худзечак!—моцным як труба голасам гукнуў Швэйк у цемень.

З цемені зьявіліся дзьве постаці і моцна абнялі яго. А пасьля, на Швэйкава запытаньне, чаму яны вярнуліся ў лягер, ды яшчэ ўночы, Гаршына коратка адрэзаў:

— З-за Худзечка. Нас разагналі гадзіну таму назад.. Вечарам у нас здарыўся гвалт. Худзечак зрабіў жывот дачцэ... нашага камандзіра... Цяпер ён сядзіць у карцары.

— Грэх ды бяда каго ня знойдуць,—уздыхнуў удалы ваяка Швэйк.—З богам пачынай, З богам і канчай. Канец завяршае ўсялякую справу.

— Ня варта было і прыходзіць сюды,—адазваўся Гаршына.—Увесь горад гаворыць, што неўзабаве мір. З фронта прыехалі казакі, дык яны кажуць, нібы ў іх белыя сьцягі над акопамі і два тыдні ўжо ня чуваць было аніводнага стрэлу. А яшчэ кажуць, што мы паедзем на работу ў Расію. Але гэта, мусіць, пустая балбатня. Нас проста давядуць да граніцы, а там разам пераврядуць на той бок, каб не карміць нас больш, як нашы будуць карміць іхніх.

Праз тыдзень палонных раней як заўсёды выгналі з барака на двор, дзе яны прастоялі амаль да самага абеду. Нарэшце зьявіўся доктар, некалькі афіцэраў і пісары. Хтосьці з начальства зьвярнуўся да палонных з невялікаю прамоваю:

— Вы будзеце накіраваны на работу ў Расію. Там вам будзе ня кепска. Хворыя і слабасільныя павінны зьявіцца да доктара на агляд. Яны астануцца тут, у лягеры, і ім таксама

будзе ня келска. Так, што падходзь па чарзе да доктара. Але раней вас пазапісвае пісар.

— Хлусіць ён, браткі. Мы паедзем дадому!

Гэтыя словы, што былі пушчаны невядома кім, зрабілі сваю справу. Ваеннапалонныя, што ад раматусу ледзь маглі поўзаць, прайшлі цырыманіяльным маршам паўз пісара і доктара, нібы вымуштраваныя коні ў цырку, а сухотныя, што звычайна толькі скрыпелі лёгкімі, раўнулі сваё: «Здароў! Годэн!» доктару у вуха, нібы фанфары страшнага суду. А доктар, гледзячы на цудоўна вылечаных, думаў:

— Бач, як я іх усіх вылечыў! Я-ж ведаю, што няма нічога лепш за націраньне гліцарынаю.

Пісары скрыпелі пер'ямі, а фэльдфэбель падганяў палонных, прыгаворваючы:

— Жыва, шпарчэй. Атрымаеш новую абмундзіроўку. Ну, жыва, а то зусім сьцямнее!

Ад барака да канцылярыі ў шарэнгу выстраіліся канвойныя. Там стаяў фэльдфэбель Пятро Осіпавіч ля вялізарных куч старых ботаў і ўсялякіх трантаў і паказваў кожнаму палоннаму, што каму атрымліваць, бо кучы павінны былі зьмяншацца роўнамерна.

— Шапку давай!—крычаў ён, бо рэчы былі складзены ў яго паводле альфабэту.—Шапку яму, авечая твая галава!

І босага, якому далі шапку, другі салдат выпраўляў у суседні пусты барак, у той час, як на дварэ чуўся абураны фэльдфэбеляў голас:

— Не раздражняй мяне, галубок, не раздражняй, кажу табе! Бяры анучы, чуеш? Нашто табе нагавіцы?! Чым я вінен, што ў цябе нагавіц няма! Бяры анучы і адыходзь. Дальбог, замучаць яны мяне зусім! Я яму кажу выдаць боты, а ён патрабуе кашулю! Ня бойся, хлопцы, начальства пра вас клапоціцца!

Тут ужывалася тая-ж сыстэма, як і пры задаваленьні арміі на фронце. Замест набояў, туды везьлі сена, замест сена— боты, замест ботаў—у пяхотную часьць пасылаліся цяжкія набоі, а ў артылерыю замест патрэбных набояў трапляла партыя цёплае бялізны...

Гвалтоўны лямант добрага Петры Осіпавіча дзейнічаў на

палонных гэтак, што яны ўжо, не пярэчачы, бралі рэчы, якія кідалі ім салдаты, і бегам уцякалі далей.

Кучы зьменшваліся, і калі перад імі апынуліся Швэйк і Марэк, фэльдфэбель загадаў:

— Давай аднаму кашулю, а другому боты! Ну? Кашулю! Жыва!

Салдат сунуў Швэйку боты, а Марэку кінуў дэзынфэктаваную кашулю. Да яго падышоў фэльдфэбель.

— Памяняйцеся паміж сабою, чуеш? Як ня гэтак сказаў! Табе боты, а яму кашуля! Ах ты, божа мой! Праваслаўнаму чалавеку проста хоць вар'яцей ад гэтай аўстрыяцкай сволачы. Ну? Вон з вачэй маіх! Каб духу вашага тут ня было—аць, два!

— З такім не пагаворыш,—заўважыў Швэйк, разглядаючы ў суседнім бараку кашулю, што прышлася яму.—Што-ж, я яе вымыю і двазлотку за яе на рынку ўтаргую. А за боты табе дадуць рублёў два...

Пакуль зьмеркла, палонныя былі ў бараках, з якіх нікога не выпускалі. Пасьля іх разьлічылі па чатыры, выстраілі ў доўгую колёну і павялі на вагзал, дзе ўжо быў пададзены, складзены з цяплушак, цягнік.

Уздоўж шэрагаў аўстрыякаў прайшоў палкоўнік Клягэн, дапытліва зазіраючы ў вочы кожнаму палоннаму...

Было ўжо зусім цёмна, калі іх разьбілі на групы чалавек па сорак і, падганяючы прыкладамі, рассадзілі па цяплушках. Раўнуў паравік і цягнік крануўся.

Не пасьпелі яны праехаць некалькі крокаў, як хтосьці адчыніў знадворку дзьверы другое цяплушкі, адным махам ускочыў у сярэдзіну і кінуўся ля печкі на калені. З усіх бакоў узьняліся спалоханыя галасы:

— Што такое? Хто гэта? Што здарылася?

І незнаёмец, стогнучы ад болю, вісклівым голасам крыкнуў:

— Браткі, вось і я! Я заўважыў, у якую цяплушку вас пасадзілі. Я ўвесь час прыхоўваўся ў горадзе. Учора я пачуў, што падпісаны мір і што нас накіроўваюць на радзіму. Уночы я пашоў на вагзал і чакаў вас у качагарцы. От баяўся я, браткі, што вы паедзеце без мяне! Што-б я рабіў у Омску! Так, шчасьце мне здрадзіла, Швэйк!

Кравец глыбока ўздыхнуў, спрабуючы няпрыметна прабраццa на нары, адкуль яго зараз-жа сапхнулі чатыры пары моцных рук. А Швэйк, падтрымліваючы яго, ласкава заўважыў:

— Ну, здароў, браце. Клягэн таксама быў тут. Ён шукаў цябе, каб з табою разьвітацца.

— Я яго бачыў,—уздыхнуў Пісклявы.—Ах, божа мой, калі ён мяне калі-небудзь знойдзе, ён прыб'е мяне да паўсьмерці... Але цяпер, браткі, канец усім бядотам. Праз тры тыдні мы будзем дома, у сваіх пасьцелях.

Цягнік грымеў па рэйках. У цяплушцы самотна памігвала сьвечка ў разгойданым ва ўсе бакі ліхтары. Усе ўжо спалі. Швэйк падсунуўся і даў Піскляваму крыху месца, а сам падсеў бліжэй да печкі і стаў падкідаць у яе паленьні, каб яна не патухла. За сьценкамі цяплушкі панавала поўная цемень... Цягнік імчаўся па простай, як страла, чыгунцы... Аблягчаючы ў прычыненыя дзьверы свой пухір, Швэйк ненаўмысьля добра такі пырскануў ля маленькай станцыі, дзе ня было прыпынку, начальніку станцыі ў твар, які вышаў спатыкаць цягнік. З змроку чулася адборная лаянка... А пасьля цягнік зноў праглынула ноч, бязьмежны стэп і глыбокая цішыня.

А на распаленай печцы шыпеў і пляваўся кіпучы імбрычак, і над галовамі сонных, сярод хрыпу і сьвісту, плаваў прыемны Швэйкаў голас. Швэйк сьпяваў:

Што, цывільны, мусіць, часта марыць звыклі вы аб тым,
Як-бы з дзеўчынай пад ручку прагуляцца удваіх.
Лепш прыходзьце к нам, салдатам, там—усе дзеўкі, цэлы рой;
Прыхіліцца можна сьмела тут да кожнай, да любой.
На парад калі мы крочым, дзеўкі на рагу стаяць.
Трэба сьпераду і звзаду ім агледзець кожны рад.
І піхне адна другую, і хіхікне, і шапне:
„Паглядзі якія хлопцы, на падбор! А як ідзе!?"
А пасьля, пасьля параду, праіграюць тра-та-тый.
Ў Чэхію—паходным маршам, ўсе на родныя мясты.
І тут хтосьці запытае: можа часам нават знаў
Іх каханага сыночка, што у Будвэйсе стаяў.
Ну, а як-жа, памятаю! Ваш сыночак мне сваяк:
Ў карцары на голых дошках разам спалі. Яшчэ й як!
Ў карцары, бо ў байцы сьмелай ня стрымалі мы рукі.
І цывільных дурняў вялых мы паскублі за бакі.

Пасьля поўначы да Швэйка спусьціўся з нар Марэк, каб напіцца з ім гарбаты. Калі Швэйк пацьвердзіў яму, што нават у горадзе гавораць пра мір, Марэк недаверліва патрос галавою.

— З чаго ты ўзяў? Тады наконт гэтага больш-бы было відаць і чуць! Проста, вайна, і мы з ёю ўваходзім у новую стадыю.

— У што мы ўваходзім?—перапытаў Швэйк, і Марэк з сілаю адказаў:

— У новую стадыю.

На адзінаццатыя суткі цягнік спыніўся; раніцаю, яшчэ да сьвітаньня, дзьверы ў цяплушках адчыніліся, і жорсткія галасы гукнулі:

— Падымайся на работу!

Выявілася, што гэта Віцебск. Далёка бухалі гарматы... Швэйк ускінуў на плечы ранец і з цікаўнасьцю сказаў:

— Страшна цікава, як выглядае тая новая стадыя? Што яна гэтая стадыя з намі яшчэ зробіць?

5

ПРАЦА НА АБАРОНУ

Ніколі яшчэ ня было вайны, якая-б вялася з прычыны нізкіх або нясумленных імкненьняў. Ніколі яшчэ ня было наступальнай вайны, ці разбойнага нападу. Кожная дзяржава вядзе вайну толькі дзеля абароны, ні адна дзяржава ніколі не нападала першая, а толькі абаранялася ад нападу. На Аўстрыю напала Сэрбія, на Нямеччыну—Бэльгія, на Сэрбію—Нямеччына, на Бэльгію—Аўстрыя, на Англію—Баўгарыя, на Францыю—Турцыя, на Турцыю—Францыя; і ўсе іншыя дзяржавы, што паслалі на бойню свае вялічэзныя арміі, зрабілі гэта толькі з тэй прычыны, каб перамагла ідэя справядлівасьці, чалавекалюбства і прогрэсу. З гэтых меркаваньняў Баўгарыя далучылася да цэнтральных дзяржаваў, а Румынія да Антанты.

Дзеля прынцыпу самавызначэньня вяла вайну Расія, дзе палякі ня сьмелі нават падаць свайго голасу. За прынцып самавызначэньня пралівалі сваю кроў Аўстрыя, дзе чэхам была дадзена воля вымірацць, і Вэнгрыя, што жорстка душыла славакаў. Дзеля таго-ж прынцыпу ўзялася за зброю Нямеччына, што пры-

гнечвала пазнанскіх палякоў, і за права малых народаў улезла ў вайну Англія, якая душыла салдацкім ботам Ірляндыю. Словам, усе гэтыя дзяржавы ўзьнялі меч за вызваленьне малых народаў.

Зьмяшаньне моваў было горшае як пры бабілёнскім зьмяшаньні, і выклікала поўнае зьмяшаньне разуменьняў. Нямеччына ваявала ў імя абароны нямецкай культуры, а Расія павінна была пры дапамозе вайны выратаваць сьвет ад нямецкага барбарства; палякі ў Нямеччыне стварылі лёгіёны супроць Расіі, а палякі ў Расіі—дзеля змаганьня з Нямеччынай. Так што справа, сапраўды, была горшая, як пад бабілёнскаю вежаю, бо там у утрапеньне ўпалі толькі муляры і падзёншчыкі, тады як будаўнікі і кураўнікі захавалі яснасьць розуму, зразумелую ім мову і добра выпрацаваныя пляны.

Грандыёзны размах ідэі права і справядлівасьці, за якую змагалася кожная дзяржава, сьцьвярджаючы, што яна абараняе гэтую ідэю ад ворага, які сьцьвярджаў якраз адваротнае,—захоплівaў усё большыя і большыя колы насельнасьці, што непасрэдна, або стараною, удзельнічалі ў вайне. Праўда, да гэтага ўдзелу насельнасьць часта прымушалі жандары, але ў афіцыяльных органах усё-ж са задаваленьнем адзначалася, што захапленьне насельнасьці вайною ўзмацняецца і што народ няспынна гатовы да вялікіх ахвяр за айчыну.

Да адбываньня вайсковых павіннасьцяй былі сьпярша ўзяты няздольныя насіць зброю мужчыны, за імі пашлі жанчыны, а пасьля ўзялі ў работу і дзяцей; але калі выявілася, што і гэтага мала, дзяржава пачала пасылаць на работу дзеля ўмацаваньня яго моцы—салдат тых дзяржаў, якія ваявалі з імі, каб тыя дапамаглі ёй абараняць тую самую ідэю справядлівасьці, за якую яшчэ зусім нядаўна ваявалі супроць гэтае дзяржавы.

Праўда, кожная дзяржава карала парушэньне ваеннае прысягі бязьлітаснымі расстрэламі, кожная дзяржава трымала на сваіх грамадзян, якія асьмеліліся-б чым-небудзь спрыяць на карысьць варожае дзяржавы, нарыхтаваную вяроўку, але гэта не перашкаджала ёй выкарыстоўваць ваеннапалонных дзеля вырабу фугасаў, на якіх павінны былі-б узарвацца іх-жа браты, дзеля абточкі знарадаў, якімі павінны былі быць падпалены іх вёскі, або

дзеля капаньня акопаў, з якіх іх бацькі і браты павінны былі быць перастраляны, як курапаты. Тут ня лічыліся ні з якай сьвятасьцю прысягі, бо тут былі зачэплены іншыя інтарэсы, і ў пытаньні пра чалавечнасьць карысталіся іншымі маштабамі, чым у мірны час, або ў дачыненьні да сваіх падданых.

Усялякае злачынства можна было апраўдаць, бо кожная-ж дзяржава толькі абаранялася, ваявала, каб абараніць найвышшае шчасьце чалавецтва. Дык няўжо-ж урады гэтых дзяржаў не павінны былі даць палонным варожым салдатам гонар удзельнічаць у гэтакай «вялікай» справе? Хіба не адбывалася ўсё гэта ў вялікім XX веку?

У 1916 г. Расія эвакуявала ўсіх ваеннапалонных з сібірскіх лягераў і разьмеркавала іх у гарадох на сваім заходнім фронце.

У першую чаргу перавезьлі туды чэхаў і славакаў, бо кіеўская газэта «Чехо-славяне» і пецярбурская «Чехо-словак» у кожным нумары горача пераконвалі расійскі ўрад, нібы ваеннапалонныя славянскага паходжаньня да канца адданы Расіі і нібы, калі выкарыстаць іх на шанцавых работах і на капаньні акопаў, яны аддадуць усе свае сілы на службу Расіі. Дык іх сьпешна і падвязьлі, босых, голых, адразу пасьля новага году, амаль да самага фронту. Калі ваеннапалонных славян з лягеру выявілася мала, іх зьнялі з усіх работ у сялян, у рамесьнікаў і на фабрыках па ўсёй Расіі і Сібіры і замянілі немцамі. А пасінелым ад холаду на казарменных дварох чэхам расійскія афіцэры растлумачылі, што матушка-Расія мае да іх бязьмежнае давер'е і што яны павінны мець сабе за вялікі гонар, калі ім дазваляюць спрыяць перамозе расійскае зброі, і не забываць, што славяне ствараюць адзіную сям'ю і што ў сям'і заўсёды шчыра памагаюць адзін аднаму.

Гэтакія растлумачэньні канчаліся звычайна паведамленьнем, што на гэты дзень ня будзе выдадзена хлеба, бо яго не пасьпелі нарыхтаваць, і ня будзе абеду, бо не чакалі, што гэтая партыя ваеннапалонных прыедзе гэтак рана. І сваяцкія дачыненьні да славян выяўляліся ў гэтакія дні найбольш у тым, што палонны, які ў часе прамовы на дваццацігградусным марозе ў сваіх разьбітых казённых ботах пераступаў з нагі на нагу, атрымліваў ад афіцэра раз або два кулаком у твар.

Генэрал Чарэднікаў, што загадваў тылавымі інтэнданцкімі складамі ў Віцебску, прымаючы прывезеных з Омску ваеннапалонных, абмежаваўся тым, што сказаў ім прамову пра значэньне солідарнасьці ўсяго славянства. Абвясьціць, што яны будуць без яды, ён даў свайму ад'ютанту.

Ваеннапалонныя павінны былі падмяніць расійскіх салдат, якіх накіроўвалі на фронт, на разгрузцы транспортаў абмундыраваньня, ботаў, мясных кансэрваў і цукру і на разьмеркаваньні ўсяго гэтага па магазынах і цэйхгаўзах, а таму нахіл красьці, адзнакі чаго перасмыквалі іх твары, непакоілі генэрала, бо ён і яго ад'ютант самі расьцягвалі казённае дабро—спачатку разам, а пасьля—па адным, каб ня гэтак льга было гэта заўважыць.

— Можа я памыляюся, ваша правасхадзіцельства, але мяне непакоіць, што гэтыя людзі гэтакія разьдзетыя,—заўважыў ад'ютант.—Ці ня лепш было-б іх раней адзець як належыць? Калі ім даць адзін раз, яны ня ўкрадуць тры разы.

— Вы ўгадалі мае думкі,—сказаў у глыбокай задуме генэрал.—Няйначай сёньня-ж выканаць тое, што вы прапануеце. Не адмоўце выдаць ваеннапалонным пасьля абеду па дзьве зьмены бялізны, пару ботаў, абмундыроўку і шапку. Каб адрозьніць іх ад нашых салдат, на сьпінах давядзецца намаляваць ім нумары. Загадайце, каб пісары падрыхтавалі сьпісы іх па-ротна і каб кожнаму быў дадзены нумар.

— Слухаю, ваша правасхадзіцельства!—адчыканіў ад'ютант.

Калі-б генэрал паглядзеў яму ўсьлед, ён заўважыў-бы, як той, накіроўваючыся да цэйхгаўзу, паціраў сабе рукі. Палонных было тысяча шэсьцьсот чалавек; з іх шэсьцьсот павінны былі астацца ў Віцебску, а рэшта ішлі далей на фронт. Дык вось, гэтай тысячы чалавек ён нічога ня дасьць, а тысяча пар ботаў і дзьве тысячы пар бялізны застануцца ў цэйхгаўзе, каб папоўніць пакражу, якая яго самога пачала ўжо непакоіць. Ён адразу-ж загадаў адстукаць на машынцы загад падрыхтаваць тысячу шэсьцьсот пар дзеля экіпіроўкі ваеннапалонных.

Палонных расквартаравалі на другім канцы гораду, у драўляных бараках. «Старыя», што жылі тут ужо цэлы год, абкружылі новых сібіракоў, закідваючы іх пытаньнямі, адкуль яны і што чулі добрага ў дарозе, і ці няма сярод іх землякоў і аднапалчан.

— А што, з 91-га палка ў вас тут нікога няма?—запытаў Швэйк.—Ведаеце, хлопцы, гэта—жалезны полк! Ніхто з яго не здаваўся ў палон. Я-ж і сам з таго палка. У нас усе адборныя салдаты.

— Што ты хлусіш!—абазваўся хтосьці з «старых».—Расійцы забралі ў палон цэлы батальён 91-га палка, нават без аніводнага стрэлу. У нас іх людзей, як сабак нярэзаных! Батальён здаўся расійцам разам з афіцэрамі і абозам. Наш доктар таксама з іхніх.

— От як? У вас тут ёсьць свой доктар? Дык я-ж яго напэўна ведаю. Дзе ён? Хадзем, пакажы мне яго.

— Ён, праўда, не сапраўдны доктар, але тут ён паказвае сябе за сапраўднага,—паведаміў Швэйку новы знаёмы.—Ты-ж ведаеш, што тут кожны можа паказваць сябе за каго хоча. Ну, добра, хадзем, я цябе завяду да яго. Ён загадвае лазарэтам і цэлы дзень на працы.

Ён пацягнуў Швэйка да барака, на якім быў намаляваны чырвоны крыж. У бараку былі пастаўлены зьбітыя з дошчак ложкі. Яны стаялі далекавата адзін ад аднаго, і на іх, на чымсьці, што льга было назваць сяньнікамі, калі-б у гэтых «сяньнікох» было хоць крыху саломы, ляжалі хворыя. У праходах паміж ложкамі хадзіў чалавек у белым халаце, прыпыняўся ля хворых, мацаў у іх пульс і гаварыў санітарам, што даваць хвораму.

— Ён якраз робіць абход... Нам прыдзецца пачакаць, а то ён зазлуе,—шапнуў Швэйку яго таварыш у той час, як Швэйк прыслухоўваўся да глыбокага басу, якім доктар даваў загады: «Асьпірын... Natrum bicarbonicum... Oleum terpentine!.. Tinctura iodi!..» і напружваў сваю памяць, стараючыся ўспомніць, чый гэта такі знаёмы голас.

Доктар дайшоў да канца пакою і павярнуў назад, і Швэйк глянуў яму ў твар. Чалавек у белым халаце таксама кінуў вока на палонных, што стаялі перад ім, як-бы чакаючы яго дапамогі, і шпаркімі крокамі падышоў да іх.

— Што ў вас баліць?—сказаў ён Швэйку. Той ня доўга думаючы, адказаў:

— У мяне баліць горла. Я не магу ні гаварыць, ні есьці ні сьпяваць.

— А ну, разьзяў рот!—загадаў доктар, дапытліва ўглядваючыся ў Швэйка і дастаючы з кішэні драўляную лапатачку.— Разьзяўце рот шырэй, каб я мог паглядзець ваша горла... Скажэце: «а»... Яшчэ раз: «а»...

— А-а-а-а,—зароў Швэйк.

— Не, ня трэба,—раптам дадумаўся доктар.—У вас ўпgi is grandulosa. Алоіз, дайце яму natrum gipermanganicum. Вам ладуць чорныя крупінкі адмысловай бактэрыолёгічнай солі,—гаварыў ён, ня опускаючы вачэй з Швэйка.—Вы разьмяшаеце крыху яе ў гарачай вадзе і будзеце паласкаць горла тры разы ў дзень. Ня піць, ня глытаць, бо гэта атрута! А дзён праз тры вы зноў прыдзеце да мяне. Вы з Омску? Якога палка?

— Мне здаецца, пане Ванэк, што паласканьне мне не паможа,—сумна зацягнуў Швэйк.—У мяне, напэўна, запаленьне сьляпое кішкі.... А ў нас у 91 палку я ведаў нейкага каптэнармуса Ванэка з Кралуп, які быў да прызваў за драгіста і як дзьве кроплі вады падобнага да вас, пане доктар.

— Я гэтак і думаў, што вы Швэйк,—шпарка прагаварыў «доктар», палахліва азіраючыся на хворых, што ляжалі на ложках.—Ну, вядома-ж, гэтак яно і ёсьць. А тут яшчэ з вамі хто?

— Так што, пане, каптэнармус, дазвольце далажыць, тут яшчэ вольнапісаны Марэк,—сказаў Швэйк, а Ванэк, нахмурыўшыся, зашыпеў:

— Ня клічце мяне каптэнармусам і нікому не кажэце, што я драгіст. Цяпер я—доктар. Марэк, наколькі мне вядома, перайшоў да расійцаў пад Дубно. А мяне ўзялі ў палон на другі дзень з усім батальёнам і з яго начальнікам.

— Значыцца, пан паручнік Лукаш таксама тут?—радасна гукнуў Швэйк.

— Але, пан капітан Лукаш таксама тут,—з націскам яшчэ сказаў Ванэк, скідаючы халат, і Швэйк заўважыў на яго жыкетцы срэбныя нашыўкі і чорныя аксамітавыя абшлагі, а на рукаве нашыўкі з чорным крыжам. Ванэк злавіў яго зьдзіўлены позірк і нехаця сказаў:

— Я прайду з вамі да вольнапісанага. Тут будуць фармаваць рабочыя дружыны на работу на складах, дык я вам раю запісацца туды, бо там льга красьці, колькі хочаш. А Марэку я

скажу, каб ён пашоў па мэдычнай галіне. Тут патрэбен будзе другі доктар; я адзін не магу з усімі ўправіцца. Апроч таго, тут ня кепская прыватная практыка,—дадаў ён, калі яны вышлі з дзьвярэй.—Марэк ведае лаціну, а двум-тром адмысловым тэрмінам я яго навучу, так што ніхто не здагадаецца, што ён ні доктар. Ну, хадзем да яго, каб папярэдзіць яго.

Неўзабаве яны сядзелі ўтраіх у кутку, наводдалек ад усіх. Марэк трымаў на каленях блёкнот і запісваў тое, што дыктаваў яму «доктар» Ванэк.

— Пухліну мазаць ёдам, шкіпінарам або гліцарынаю... Усе хваробы, якія ты ня можаш распазнаць, завуцца—«інфлюэнца»... А вэнэрычныя хваробы ты ведаеш. Можа здарыцца, што цябе што-небудзь запытае тутэйшы доктар. Калі ён зьбянтэжыць цябе якім-небудзь пытаньнем, пачні расказваць яму пра мэдычныя выдатнасьці. Я табе дам адну кніжачку, з яе можаш сёе-тое вычытаць. Зайдзі па яе ўвечары. У мяне ёсьць і сьпірытус на кампрэсы; але я раблю з яго гарэлку.

Праз дваццаць чатыры гадзіны нашы знаёмцы пачалі хадзіць у старых расійскіх салдацкіх мундырах, перад гэтым пачысьціўшы з іх гніды цьвёрдай шчоткай. Яны ўжо ведалі, што ўвайшлі ў склад 208-е рабочай дружыны. У кожнага гэтага нумар, а таксама парадкавы нумар, пад якім палонны лічыўся ў дружыне, быў выведзены чорнай фарбаю на сьпіне. У Марэка ў кішэні быў загад, якім ён прызначаўся за малодшага доктара ў лазарэце для ваеннапалонных, і які даваў яму волю вольна хадзіць у раёне Віцебску. Гаршына пранюхаў, што ў суседнім квартале была цэлая вуліца, дзе палонныя і расійскія салдаты маглі збываць у крамках крадзеныя рэчы і тут-жа або прапіць грошы, або ўскласьці іх на алтар якой-небудзь таннае служкі Вэнэры. І Пісклявы рашучым тонам выкладыў свае пляны:

— Раз Марэк цяпер «доктар», ён выдасьць мне пасьведчаньне, што я хворы, а я пайду ў горад працаваць, шыць. У горадзе гэтых самых прастытутак для паноў афіцэраў—процьма, і я бачыў. От на іх я і буду шыць.

Калі ўвечары Марэк за сьвечкаю засеў за «Кароткі падручнік для ваенных фэльчароў», каб набрацца ўмельства даваць дапамогу хворым ці параненым, ён прызнаўся Швэйку, што яму

ўсё-ж страшна распараджацца здароўем і жыцьцём людзей, ня маючы на гэта аніякіх ведаў. Швэйк засыпашаўся падбадзёрыць яго:

— Дык-жа й я буду грузіць цукер, а ніколі ў жыцьці гэтым не займаўся. Усё на сьвеце нейк само сабою робіцца, а ў мэдыцыне каб вельмі, дык напсаваць ты ня можаш. Атручваць людзей ты ня будзеш, а каму трэба памерці, той памрэ і без дактарскае дапамогі. А пасьля проста выяўляецца, што навука выпрабавала ўсе сродкі, і, значыцца, ты не вінаваты. Вось, напрыклад, у нашым доме дзяўчынка ў пані Кубат глынула срэбную крону. Маці пабегла з ёю ў амбуляторыю гарадзкой больніцы. Там ёй кажуць: «Глупства. Зварэце ёй ячменнае кашы і дайце вось гэты парашок. Яе пройме вольнасьцю, і крона выйдзе ззаду». Маці гэтак і зрабіла, але крона ня вышла. Тады яна пабегла з дзяўчынкай у дзіцячую больніцу, а там доктар кажа: «Напойце яе гарачым малаком з дзесяцьцю кроплямі з гэтай бутэлечкі. Дзяўчынку вырве, і крона выйдзе сьпераду». Ну, маці зрабіла гэтак, як казалі, ало кроны ўсё няма. А ўвечары дзяўчынку раптам праняло і вырвала. І як-бы ты падумаў! Пяцьдзесят хэльлераў вышла ў яе сьпераду і пяцьдзесят ззаду! Гэта таму, што абодва дактары далі ёй гэтакае лякарства, якое павінна было памагчы.

Але Швэйкавы развагі здаваліся Марэку непераканальнымі. Усю цалюткую ноч ён праваляўся на ложку, можна сказаць зусім не заплюшчыўшы вачэй і ляскаючы зубамі са страху. Яму прысьнілася, нібы надышоў дзень страшнага суду. І над змрочнаю зямлёю летаюць анёлы і арханёлы, адзетыя ў вайсковую форму і трубяць у ваенныя трубы трывогу. А зямля правальваецца, з магіл выходзяць мерцьвякі і нескончонымі шэрагамі выстройваюцца ля божага прастолу. І вось бог кажа Марэку: «Тыя, што направа, памерлі сваею сьмерцю. Тыя, што поруч з імі, загінулі ў руднікох, на заводах, за працаю. Вось гэтыя памерлі ад рукі сваіх дактароў, калі апэрацыя «ўдавалася бліскуча». А тыя там, якіх яшчэ больш, забіты на вайне. Але от пра гэта нескончоны натоўп я нічога ня ведаю. Гэй, вы, хто гэта накіраваў вас на той сьвет?» Гэтак сказаў бог. І Марэк убачыў, што з натоўпу вышаў страшны скілет, падышоў да божага прастолу і, узяўшы

пад казырок, Швэйкавым голасам адказаў: «Вольнапісаны Марэк з 91-га пяхотнага палка».

Пасьля гэтых словаў усе шкілеты ўзьнялі ўгару касьцьлявыя рукі і, ляскаючы зубамі, пачалі цягнуцца да Марэка сваімі страшнымі ратамі. Марэк у роспачы заварушыўся і закрычаў, а над ім пачуўся дабрадушны Швэйкаў голас:

— Ну, ну, ты-ж гэтак усю гарбату разальлеш. Пара на работу. Пі, пакуль гарачае. Бачыш, ты ўвесь упацеў. Хадзем на абарону бацькаўшчыны.

На двор вышаў да іх генэрал Чарэднікаў з некалькімі малодшымі афіцарамі і ўнтэр-афіцарамі. Ён зноў сказаў палонным прамову, у якой выказаў, што ад іх шчырасьці, ад іх сумленьня, іх прыхільнасьці да работы залежыць перамога расійскай арміі, якая б'ецца за вызваленьне славянства, і што яны павінны паказаць сябе вартымі гэтакага давер'я. А хто выявіцца як нявартым яго, той на першы раз атрымае дваццаць пяць лазовых дубцоў ніжэй сьпіны, на другі раз будзе расстраляны, а на трэці раз—гэта нават палоннаму салдату лічыцца ганебнаю сьмерцю—будзе павешаны.

І пад цяжкімі ўражаньнямі гэтай пагрозы, палонныя разышліся па магазынах і складах, дзе хаваліся багацьці расійскае арміі.

6

РАБУЙ І НЕ САРОМСЯ

Па-мойму страшэнны ўпадак недатыкальнасьці казённага дабра ў часе вайны тлумачыцца тым, што гэтае дабро зьнішчаецца, ня даўшы нікому непасрэднай карысьці і ніякае асалоды. Усё, што пападала ў салдацкія рукі, было ў іхніх вачох накіравана на зьнішчэньне, пры якім людзі пакутавалі і пазбаўляліся самага неабходнага. Адгэтуль зьявілася імкненьне зьнішчаць гэтыя багацьці гэтак, каб зьнішчэньне было зьвязана з якім-небудзь прыемным перажываньнем.

Нахіл красьці—ёсьць ад прыроды ў чалавека. Людзі цягнуць усё, што могуць узяць: у полі—хлеб, у лесе—дровы, у банку—грошы, і ніколі яшчэ ня было, каб касір крэдытнае ўстановы папаўся ўночы ў пакражы снапоў з чужога поля, або каб дрыва-

сек рабіў падлогі і краў грошы з банку. Большасьць людзей сумленныя проста таму, што ім не даводзілася быць у гэтакім стане, калі варта было-б траціць сваю сумленнасьць або ў іхніх руках ня было гэтакіх сум, якія варта было-б схапіць. Чалавек— продукт усяго навакольнага, і нішто ня зьменваецца гэтак шпарка, як чалавечая і грамадзкая мараль. І салдат, які ў сваім гарнізоне лічыў за нясумленнасьць і немагчымасьць узяць чужы пачак запалак, праз суткі, выступіўшы з маршавай ротай на фронт, не саромеўся цягнуць у чалавека апошні акраец хлеба, або рэч, якую ён усёадно кідаў па дарозе.

Вось чаму я і думаю, што калі ў часе вайны і пасьля яе красавалася крадежніцтва, дык гэтакі ўпадак маралі быў вынік таго, што заўсёды бывае прыямней украсьці і выкарыстаць прызначаную да зьнішчэньня рэч, чым чакаць, каб яе ўкраў іншы, а самому застацца з пустымі рукамі.

*

Праца на складах, на якую былі пасланы Швэйк, Гаршына і Пісклявы, была вельмі простая: на склад падаваліся вагоны, у іх, колькі трэба было, нагружаўся матэрыял, а пасьля вагоны шчапляліся і накіроўваліся на фронт.

Значыцца, і тут усё было прызначана на зьнішчэньне, дык партыя палонных, што нагружала цукар, з першага-ж дню ня лічыла за грэх распорваць мяшкі і напіхаць сабе кішэні рафінадам. Тое-ж самае рабіла партыя, што грузіла мясныя кансэрвы; не ставаліся ад яе і тыя, што падавалі бялізну, дый усе іншыя. А ўвечары ў бараку адбываўся рухавы абмен таварамі, і самыя сьмелыя нават рызыкавалі выходзіць з украдзенымі кашулямі на вуліцу.

Размах крадзежніцтва ўсё павялічваўся. Шынкары трымалі ў сваіх скляпкох ня толькі дрэннае віно і яшчэ горшую гарэлку, але і піва моцнае, цёмнае, добрае; аднаму толькі богу вядома хто і як яго зварыў, гэтае піва. За бутэльку бралі кашулю, і калі хто хацеў пражыць хоць дзень, як жывуць багатыя, ён павінен быў красьці бялізну тузінамі, бо жрыцы каханьня былі больш схільны да тых, хто больш даваў. Такім чынам, крадзежніцтва дасягнула вялікіх размахаў, і ад'ютант генэрала загадаў ператра-

саць рабочых, спадзяючыся асьвяжаць гэтай простай працэдурай прывялую сумленнасьць і захаваць яе ад канчатковай пагібелі.

Але неўзабаве пракіткія людзі, што ішлі на работу зранку зусім голыя, толькі ў адным шынялю, апаўдні варочаліся адзетыя, пасьля абеду ішлі зноў голыя, а ўвечары ішлі з работы зноў адзетыя. І ў гэтых труках яны дасягнулі гэтакага ўмельства, што людзі, ня досыць буйнага складу, спрактыкаваліся адзяваць на сябе нават па тры пары бялізны і па дзьве абмундыроўкі, не наводзячы выглядам свае постаці падазронасьці ў фэльдфэбеля, які іх аглядаў.

Старая прымаўка кажа: «Да пары збан ваду носіць». Не прайшло і некалькі дзён, як прышла пара і на віцебскія збаны. Ад'ютант, капітан Байкоў, заўважыў, што не хапае казённага дабра куды больш, чым ён сам украў, і адразу западозрыў у гэтай справе ваеннапалонных, за камплекцыяй якіх ён узяўся пільна наглядаць. І вось аднойчы перад абедам ён спакойна даў пайсьці партыі, што нагружала спажыўныя продукты, а партыю, што нагружала толькі што прывезеную бялізну, загадаў адвесьці ў вартавое памяшканьне і цьвёрда скамандаваў:

— Давай сюды тры лаўкі!

Прынесьлі лаўкі. Капітан з усьмешкай сказаў фэльдфэбелю:

— У цябе ў канцылярыі стаіць лаза. Прынясі яе сюды.

Фэльдфэбель зьбегаў у канцылярыю і вярнуўся з пукам гнуткае лазы ў палец на таўшчыню. Капітан разьвязаў пук, паклаў на кожную лаўку па лазіне і, не пакідаючы ўсьміхацца, зьвярнуўся да прыціхлых ад чаканьня палонных:

— На кожным сумленным салдацэ надзета адна кашуля і адзін камплект абмундыроўкі. Вошам і ў адным камплекце добра. А на кім будзе больш бялізны або іншых рэчаў, той іх украў, і таму мы ўвальлём дваццаць пяць гарачых, каб ён памятаў загад начальства.

Людзі нехаця пачалі разьдзявацца, сьцягваючы з сябе кашулю за кашуляй. Толькі двайм удалося зьняць усе тры кашулі засаб. Капітан Байкоў сачыў за імі рысінымі вачыма, а пасьля загадаў таксама холадна, як і далікатна:

— Ну, галубочкі, а цяпер скідай боты! І нагавіцы таксама! Ды разам ужо і споднікі. Холадна ня будзе!

Неўзабаве ў канцылярыі выстраіліся трыццаць голых людзей. Капітан штосьці шапнуў фэльдфэбелю, які адразу-ж вышаў і прывёў восем здаровых салдат з вяроўкамі і яшчэ адной лаўкаю. Тады капітан скамандаваў:

— Па дваіх на лаўку! Ну, жыва, хлопцы, а то абед выстыне!

Палонных расклалі на лаўцы па адным з кожнага канца, зьвязалі ім пад дошкаю рукі і ногі, і капітан, раздаючы лазу, загадаў:

— Бі чысьцей! Хто будзе біць без адцяжкі, таго самога ўзгрэем! Пачынай. Раз, два, тры!

Лаза сьвістала ў паветры і ляскала, сьцёбаючы аўстрыяцкія зады, а капітан, ахоплены асалодаю і ўвесь паружавеўшы, не пакідаў лічыць:

— Чатыры, пяць, шэсьць, сем, восем, дзевяць! Яшчэ разок! Стой!

А пасьля запытаў павольна і далікатна:

— Што, галубочкі, будзеце яшчэ красьці? Ці, можна, пасаромееццеся?

— Ня будзем, ваша высокаблагародзьдзе,—заенчылі з падлогі восем галасоў.

— Гэ, ды яны папраўіліся ўжо!—радасна абазваўся капітан.—Ну што-ж, галубочкі, давайце яшчэ крыху, каб лепш памяталі.

Ён адлічыў яшчэ дзесяць разоў, і загадаў пакараным адзявацца. За імі на лаўкі ляглі другія, якім таксама адлічылі два разы па дзесяць, з адпаведным навучаньнем, за што гэта робіцца, а калі яны адзеліся, капітан саркастычна заўважыў:

— Раскажэце сваім таварышам, як я караю зладзеяў. Пакажэце ім свае бітыя зады. Расстраляць—я вас не расстраляю, вяроўкі на вас мне таксама шкода, але калі я яшчэ аднаго злаўлю, я яму ўсыплю пяцьдзесят гарачых гэтак, што ў яго задніца і сьпіна зробяцца на катлету. Хоць можаце пра гэта не гаварыць,—як сабе хочаце. На работу вам больш сёньня iсьці ня трэба. Лепш пасядзеце на сьнезе.

У той брыдкі дзень Швэйку давялося з другой партыяй нагружаць скуры ў гатовыя да адпраўкі вагоны. Праўда, яму ўдалося адрэзаць кавалак скуры сабе на падноскі, але затое фэльд-

фэбель затрымаў яго да пасьляабеду, узяў яго з сабою абедаць з расійскімі салдатамі, так што Швэйку ня было як папасьці да сябе ў барак. Пасьля іх партыю паслалі на прыборку прывезенага абмундыраваньня, і Швэйк, які за ўвесь дзень нікога ня бачыў з сваіх і нічагуткі ня ведаў пра тое, што здарылася, да самага вечару ўдваіх з фэльдфэбелем прыбіраў склад.

Фэльдфэбель адно пасьпеў зьбегаць у клязэт, як Швэйк ужо нацягнуў на сябе тры кашулі і сунуў за халяву лішнюю паруануч у боты. Пасьля ён пачаў з нецярплівасьцю чакаць званка, каб хутчэй пературарыць сваю здабычу на піва. Нарэшце празьвінеў званок; уся партыя высыпала на двор і выстраілася ў адну шарэнгу. Ля каравульнай будкі стаяў капітан Байкоў і, калі партыя прайходзіла паўз яго, паказаў рукою і сказаў:

— У каравульню! Разьдзявайся!

Усе адразу паскідалі шынялі і курткі.

— Не-е-е, хлопцы,—засьмяяўся капітан.—Паднімай адны кашулі. У кожнага-ж толькі па аднэй кашулі і па аднэй пары споднікаў, хіба ня так?

Задаволены з свае рэвізыі, ён самаздаволена цмокнуў языком.

— Маладцы, хлопцы! Відаць, лаза дапамагла! Можаце йсьці!

У найлепшым настроі, ён падышоў да фэльдфэбеля, які замыкаў склад. Ён хацеў яму штосьці сказаць. А тут Швэйк, што замарудзеў дзесьці, проста такі самахоць папаўся яму ў лапы.

— Ты дзе быў? Адкуль?—запытаў яго капітан, кладучы яму руку на плячо. Нават праз шынель ён абмацаў, што на плячах у палоннага больш палатна, чым трэба было.

— Я працаваў, ваша высокаблагародзьдзе,—спакойна адказаў Швэйк. Капітан злосна скрыгануў зубамі.

— Чаму-ж ты не пашоў разам з іншымі? І чаму ты гэтакі тоўсты, сьвіня аўстрыяцкая?

— Так што гэта я па бацьку пашоў, ваша высокаблагародзьдзе,—падаў адказ Швэйк, стоячы рукі па швох.—У нас уся сям'я тоўстая. Так што, дазвольце далажыць, ваша высокаблагародзьдзе, калі-б мне ўсё есьці адну толькі бульбу з вяндлінаю, я быў-бы яшчэ таўсьцейшы. Гэта ў нас у Швэйкаў, гэтакая парода, што...

— Маўчаць!—раўнуў на яго капітан.—Што ты за лухту вярзеш! Я цябе, галубка, сам агледжу, што ты за гэтакі тоўсты! Я з цябе, шэльма, от гэтымі сваімі рукамі сала выпушчу, я цябе...

Капітан задыхаўся са злосьці, пхаючы Швэйка перад сабою ў канцылярыю. Замкнуўшы дзьверы, ён узяўся ў бокі і гукнуў:

— Раздзявайся! Жыва!

— Мусіць лепш не сьпяшаць,—заўважыў Швэйк, расшпільваючы куртку.

У капітана пачарнеў твар і вочы наліліся крывёй. Ён пачаў зрываць з Швэйка рубашку і дзіка зароў:

— Адна, дзьве, тры, чатыры. Чатыры кашулі на ім, шэльме! Значыцца, тры крадзеныя! Пачакай, я цябе правучу! Заб'ю да сьмерці, гада!

І, нічога не памятаючы ад злосьці, капітан Байкоў скінуў шапку і шынель, а пасьля і гімнасьцёрку.

— Спускай нагавіцы! Кладзіся на стол! Сваімі рукамі засьцёбаю цябе нагайкай, выпішу табе божы запавед на с... Пачакай, маць тваю! Я цябе вымуштрую! Ты ў мяне больш красьці ня будзеш!

Ён замахнуўся на Швэйка кулаком. Швэйк поўным заклапочанасьці голасам пачаў угаворваць яго:

— Можа, дазвольце далажыць, ваша высокаблагародзьдзе, вы-б лепш прыселі? Ня добра гэтак злавацъ. Яшчэ, гатоў паляруш хапіць. У вас сэрца здаровае, ваша благародзьдзе? А то вам шкодна, няздорава... Можа, вам падаць вады шклянку? У Жыжкаве вось таксама адзін дамаўласьнік раззлаваўся, бо кватаранты не плацілі яму грошай; ну, яго кандрашкі і хапілі, раней чым пасьпеў доктар... Так ён і памёр бяз споведзі, без...

Капітан кінуўся да дзьвярэй, адамкнуў іх і паімчаўся, як стаяў, у цэйхгаўз па забытую там нагайку. Пасьля, усё гэтак-жа бягом, ён вярнуўся, але цераз двор, бо ля брамы была выклікана варта, і схаваўся ў памяшканьні, дзе палонны чакаў экзэкуцыі.

У памяшканьні было цёмна, лямпа патушана. Капітан замкнуў за сабою дзьверы і ўрачыста крыкнуў:

— Не, браце, не ўцячэш! Я цябе знайду!.. А ну, вылазь з-пад стала!

Ён чыркнуў запалку і запаліў сьвятло. У канцылярыі нікога ня было. На стале ляжала брудная кашуля, але палонны як у ваду згінуў.

— Пачакай, за гэта табе яшчэ таксама будзе! Усёроўна, варта цябе ня выпусьціць, а на дварэ я цябе знайду!—прашыпеў ён, шукаючы вачыма свае тімнасьцёркі, шыняля і шапкі.

Але нічога гэтага ня было відаць. Капітан кінуўся на двор і закрычаў:

— Каравул! Каравул! Трымай злодзея, лаві яго, не выпускай яго, гада, за барму.

З каравульні выбеглі перапалоханыя салдаты і пачалі шукаць злачынца ў праходах паміж магазынамі. Капітан паімчаўся ў каравульнае памяшканьне і накіўуўся на старшага:

— Палоннага ня выпусьцілі? Ён мяне абакраў! Напаў на мяне ў канцылярыі і аграбіў!

— Вінават, ваша высокаблагародзьдзе, вы тут?—заікаючыся, пралепятаў каравульны начальнік.—Вы-ж... вы-ж з хвіліну перад гэтым вышлі з брамы?! Каравул-жа вам і чэсьць аддаваў, я сам бачыў, як вы выходзілі. Як-жа гэта вы цяпер тут, у канцылярыі? Як гэта вы ваша высокаблагародзьдзе, вярнуліся? Я-ж сам на свае вочы бачыў, што вы вышлі і мы вам яшчэ і чэсьць аддавалі...

Замест адказу капітан жудасна раўнуў:

— Дурань, маць тваю! жывёліна! Аўстрыяк апрануў мой шынель і шапку, а ты тут дзеля гэтага разбойніка, дзеля гэтае сволачы каравул выклікаў! Што-ж вы—афіцэра ад палоннага адрозьніць ня можаце? Цьфу! Абармоты, жывёліна шэрая, размазьня, а не салдаты! Толькі слаўную расійскую армію ганьбіце!

Ён загадаў заняць ўсе выхады, каб ніхто ня мог уцячы. Расійскія унтэр-афіцэры, пад загадам якіх былі баракі, пацьвердзілі, што усе ваеннапалонныя на месцы,—пацьвердзілі вельмі ахвотна, бо тыя, хто сядзеў вечарамі ў шынкароў, або цэлымі начамі быў з дзеўкамі, не забываліся прыносіць ім за гэта пляшку гарэлкі. Пасьля ён загадаў насельнікам баракаў выстраіцца ў шарэнгу і крок за крокам абышоў усіх, уядаючыся ў кожнага вачыма. Але таго, што вырваўся з яго рук, ня было сярод іх.

Капітан Байкоў вельмі ўтаміўся. Злосьць яго ўжо сьцішэла; ён халадней пачаў глядзець на гэтае здарэньне, а пад канец у ім абудзілася нават захапленьне розумам і спрытам палоннага. Цяпер бачачы гэтакую масу незнаёмых, падобных адно на адно абліччаў, ён быў ужо ўпэўнены, што ня знойдзе і не пазнае вінаватага, і разьлічваў толькі на выпадак, які адзін мог навесьці яго на правільны сьлед.

Яму нават было шкода, што ён патрывожыў сон у гэтулькіх сумленных людзей, і ён спыніўся ля аднаго палоннага, у якога страшна апухлы, аж квадратовы ад пухліны, твар і ўся галава былі абкручаны мокрымі ручнікамі. Ён ледзьве стаяў на нагах, прытрымліваючы аднэй рукою нагавіцы, а другою падпіраючы бараду.

— Ну, што з табою? Зубы баляць?—спагадліва запытаў капітан.

Пакутнік штосьці прамармытаў, ківаючы галавою і паказваючы пальцам на рот. Капітан гаварыў:

— Але, гэта страшны боль. Знаёмая штука. У доктара быў?

Перавязаная галава зноў безнадзейна кіўнула, і постаць яшчэ больш сагнулася. Капітан сказаў узводнаму:

— Пры чырвоным крыжы ёсьць зубалячэбная амбуляторыя. Пашлі заўтра хворага туды, і няхай ён скажа, што гэта я прыслаў яго.

І, паляпаўшы хворага па плячы, ён ласкава сказаў:

— Кладзіся спаць. Пацярпі яшчэ да раніцы, а заўтра доктар табе зуб заплёмбуе.

Згорбленая ад болю постаць, пагойдваючыся, пашла да нараў. Двое таварышаў памаглі ёй узьлезьці нагару і самі палезьлі туды сьледам за ёю. Капітан пакінуў барак, узводны зачыніў за ім дзьверы, і сьвіставаты голас каля самае галавы хворага сказаў:

— Паляжы яшчэ. Можа ён яшчэ вернецца. З гэтакімі людзьмі трэба асьцярожна.—У адказ на гэта чалавек з хворымі зубамі прахрыпеў:

— Ды я ўвесь мокры, як мыш. Я ўжо думаў, што ён мяне пазнаў. Проста да сьмерці спалохаўся... Гаршына, колькі далі за ўсё?

— Я, ведаеш, хацеў за ўсё пяцьдзесят рублёў,—адказаў цiхавата Гаршына, нагiнаючыся да мокрых ручнiкоў.—Шапка-ж, можна сказаць, новая, ну, а новая каштуе сто шэсьцьдзесят. Нiчога, пан капiтан неўзабаве накрадзе сабе на новую... А Моўшка даваў толькi трыццаць, бо, кажа, яна крадзеная, а ён гандлюе толькi сапраўдным таварам. Так што прышлося спусьцiць за трыццаць пяць рублёў i бутэльку гарэлкi ў прыдачу. І пашанцавала-ж табе, Швэйк, што мы з табою спаткалiся!.. Ну, а цяпер можаш дастаць коркi з рота, i давай закусваць.

Чалавек з хворымi зубамi ўсадзiў два пальцы сабе ў рот, i, калi дастаў назад, шчака адразу апала. Гэтакiм-жа парадкам зьменшылася i другая, калi ён выплюнуў корак, i Пiскдявы моцна сказаў:

— Ручнiкоў пакуль што не чапай. Лiха яго ведае, гэты д'ябал можа яшчэ вярнуцца. Коркi—дык ты заўсёды пасьпееш у рот усунуць. Ну, от табе нож. Гаршына, дастань кiлбасу й бутэльку.

І неўзабаве, калi ўсё сьцiхла i асталiся адно групы карцёжнiкаў, што заядла рэзалiся ў карты, Гаршына пачаў скакаць з бутэлькаю ў руках на нарах, у той час як Пiскдявы абсмактваў скуру з кiлбасы. А пасьля тыя, што спазьнiлiся i цяпер як тхары шылiся ў барак, чулi швэйкаў голас:

Вiцебск—горад нiштаваты
Не забудзеш аж да хаты.
Многа ёмкiх тут дзяўчат,
Бо тут казармы для салдат.

Калi Швэйк расказаў зранку свае прыгоды Ванэку i Марэку, «доктар» Ванэк хмурна пакiваў галавою:

— Ува ўсякiм разе, цяпер ты ня можаш выходзiць на работу. Табе прыдзецца ляжаць тут, i я буду запiсваць тваю тэмпэратуру. Калi ён цябе пазнае,—а ён яшчэ доўга будзе шпiёнiць,—дык табе—каюк. Капiтан Байкоў сьвiня, жывёлiна, якая куды ня трэба суне свой лыч, хоць нiчога i ня ведае. Ён-жа нават i ў выдачу лякарства ўмешваецца. Ён загадаў, каб з аптэкi не выдавалi чыстага сьпiрытусу, а рабiлi хворым кампрэсы з дэнатурату. Няўжо-ж я гэтак апусьцiўся, што з-за нейкага там iдыёта пачну пiць дэнатурат, або падлiваць сабе ў гарбату карболь?!

І тут на Швэйка тхнула гэтакім густым букетам, што ён ня ўтрымаўся ад заўвагі:

— Гэта ў цябе ў роце ці ў жываце нядобра? Можа ў цябе кіндзюк распух, што з цябе сыпрытусавымі кампрэсамі патыхае? Ты што-ж гэта, іх у сярэдзіну прымаеш, ці што?

— Табе гэтакі кампрэс не памог-бы,—адказаў Ванэк, а пасьля зьвярнуўся да Марэка:—колега, зьмерайце яму, калі ласка, тэмпэратуру. Зьмерваньне тэмпэратуры мае вялікае значэньне пры пастаноўцы дыягнозу.

І ўдалы ваяка Швэйк, сьцішыўшыся на сяньніку, у якім асталося яшчэ некалькі саломін, акінуў ласкавым зіркам апраненага ў белы халат «доктара» Марэка, што падсеў да яго, узяў яго руку ў сваю і пачаў лічыць пульс.

— Зьбегай, будзь таварышам, у барак,—зашаптаў Швэйк,— і скажы Гаршыну, каб ён купіў мне на вечар кілбасы і пару піва, бо я хворы і мне гэтак доктар загадаў.

Якраз у лазарэт нечакана зайшоў расійскі доктар. Ён ласкава прывітаўся з сваімі аўстрыйскімі колегамі і заклапочана запытаў:

— Ці шмат у вас хворых? Ці ня было цяжкіх выпадкаў? Я ўжо два тыдні не атрымліваў ад вас рапартоў пра хаду хвароб і пра санітарны стан ваеннапалонных.

Трэба сказаць праўду, што кожнага, хто, як здавалася Ванэку, быў сапраўды хворы, а ня толькі сымуляваў хваробу, каб ухіліцца ад работы, ён накіроўваў у расійскі лазарэт, і доктар Карповіч не забыўся тэта падкрэсьліць:

— Так, так, вы ўсё шляцё на нашу шыю. Самому—абы збыць з рук, а колегу—на шыю... А асыстэнт у вас па якіх спэцыяльнасьцях? Колега, вы спэцыяліст па якіх хваробах?

Марэк разьзявіў быў ужо рот, але Ванэк папярэдзіў яго:

— Ён спэцыяліст па вэнэрычных хваробах. Лаурэат Парыскай акадэміі. Вялікі знаўца і па нэрвовых захворваньнях.

Доктар Карповіч конфідэнцыяльна схіліўся да Марэка і запытаў:

— А вы васэрманаўскую добра рабіць умееце, колега? У мяне яна штосьці дрэнна ўдаецца. А тымчасам, мне і самому яна згадзілася-б.

Ванэк убачыў, што гутарка пашла ў гэтакі бок, які, ня гледзячы на ўсю іхную эрудыцыю, мог быць ім не пад сілу, дык ён сьпешна запрапанаваў:

— Дарагі колега, ці не хацелі-б вы глянуць на нашых пацыентаў? Праўда, у гэты момант вам тут ня знойдзецца нічога цікавага, але ваша клапатлівасьць узрадуе маіх хворых.

І ён пачаў хадзіць з пахваленым расійскім доктарам паміж ложкамі, каля кожнага гаворачы ўсё адно і тое-ж:

— Інфлуэнца, інфлуэнца, інфлуэнца.

Доктар павярнуўся да аднаго з ложкаў, з якога чуваць былі глухія енкі. На ложку круціўся і кідаўся ў бакі чалавек, закрываючы абедзьвума рукамі твар. Пасьля ён скінуў з сябе коўдру і пачаў страшэнна дрыгаць нагамі.

— Што з ім?—запытаў доктар Карповіч, адыходзячы ад яго далей.

— Эпілепсыя, злучаная з маніяй страху, што яго хтосьці ловіць,—спакойна адказаў Марэк.

— Пры высокай тэмпэратуры? І часта ў яго бываюць гэтакія прыпадкі?—з цікавасьцю запытаў доктар Карповіч.

— Не, ня вельмі. Але затое яны вельмі небясьпечныя, бо ён тады буяніць,—хлусіў, не чырванеючы, Марэк. Падышоўшы блізка да хворага, ён памацаў яго лоб, адвёў яго рукі ад твару, зірнуў яму ў вочы і шапнуў:

— Ён цябе ня ведае. Ня бойся.

— Якім чынам вам удалося яго сьцішыць?—з цікавасьцю запытаў доктар Карповіч.—Гіпнозам?

І Ванэк зноў папярэдзіў Марэкаў адказ:

— Я-ж казаў вам, што ён найлепш спраўляецца з душэўнахворымі.

Доктар Карповіч сам падышоў да Швэйка і, узяўшы яго за руку, стаў глядзець на гадзіньнік.

— Пульс паскораны,—сьцьвердзіў ён. Пасьля ён дастаў з кішэні градусьнік, уставіў яго Швэйку пад паху, паглядзеўшы яму ў вочы:

— Зрэнкі пашыраны. У вас часта баліць галава? Вы яе адчуваеце?

— Я з самага маленства адчуваю, што ў мяне ёсьць галава,— плаксіва абазваўся Швэйк.—Я яе вельмі часта адчуваў. Найбольш тады, калі атрымоўваў па ёй кулаком. І адчуваў яе нават на другі дзень, калі напіваўся. Я так думаю, што чалавеку было-б без галавы куды лепш, бо тады-б яе нельга было-б прабіць бутэлькай або конаўкай ад піва. Вось цяпер я яе ўжо не адчуваю. Дзякуй богу, цяпер мне зусім добра. Мне стала куды лягчэй.

— Вы кожны раз сьцішваеце яго гіпнозам?—зьвярнуўся доктар да Марэка.—Капітан Байкоў вельмі цікавіцца оккультызмам, гіпнозам і іншымі падобнымі навукамі. Я вас пазнаёмлю з ім і як-небудзь прывяду яго сюды.

Не пасьпеў ён скончыць гэты сказ, як Швэйк зноў выкаціў вочы і стаў калаціцца ў яшчэ большым прыпадку, чым перад гэтым.

Калі доктар Карповіч нарэшце вышаў, Швэйк зьлез з ложка, адзеўся і заявіў:

— Не, я тут не астануся. Тут гэтак і пахне мардабойствам і нагайкаю, і тут лёгка можа здарыцца памылачка ці, праўдзівей сказаць, непаразуменьне маленькае. Са мною ўжо быў адзін гэтакі выпадак у «Ступарце». Зайшоў гэта я туды, а там усе гавораць пра злачынства, зусім непадалёку ад Крча, дзе знашлі труп зарэзанае і абрабаванае жанчыны, і стараюцца здагадацца, хто забойца. А я гляджу на аднаго пана, і ён здаўся мне вельмі знаёмы, так што я яго запытаў: «Слухайце, я тут павінен спаткацца з адным чалавекам, ці ня вы гэта той самы Мазурэк, якога я чакаю?» Ён як ускочыць, ды як смальне мне аплявуху, аж уваччу ў мяне ўсё ўскаламуцілася, ды як гукне: «Я табе пакажу, паскуднiку, які я мазурык! Будзеш ты ў мяне памятаць, як зьняважаць добрага рамізьніка». А я-ж толькі запытаў, ці ня пан ён Мазурэк з Збраслава, бо ён на яго вельмі-ж падобны. Я і не падумаю аставацца тут дзеля якіх-небудзь гіпнозаў,— крыкнуў Швэйк абодвым «дактаром».—Я буду прыходзіць сюды толькі на ноч. Пісклявы падаўся шыць да аднаго краўца, а я з Гаршынай буду рабіць у яго пярсьцёнкі.

І Швэйк накіраваўся шукаць шчасьця на новых занятках.

7

НЕКОНЦЭСЫЙНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ

Каб ня было пасьля вайны помнікаў, удоваў, сірат, сухотных і сіфілітыкаў, новых дзяржаваў і рэволюцый, бядоты і раскошы, экономічнага хаосу і агульнага сусьветнага крызісу, мыліц і штучных рук, забруджанага жыцьця і дэмаралізаваных жанчын, дык, ва ўсялякім выпадку, памяць пра яе захавалі-б дзьве рэчы: салдацкія запісныя кніжкі з вершыкамі і песьнямі і пярсьцёнкі-сувэніры.

У той час, як у тылу людзі, што багацелі з кожным днём вайны, здымалі з пальцаў залатыя, упрыгожаныя дарагімі каменьнямі, пярсьцёнкі і абменьвалі іх дзеля карысьці Аўстрыі на жалезныя, з надпісам: «Золата за жалеза», салдат на фронце падбіраў алюміневую галоўку шрапнэлі, якая разарвала на шматкі галаву яго таварыша, каб расплавіць яе пасьля ў зьлёгку выдзяўбленай цэгле і зрабіць з яе пярсьцёнак. І, пакутуючы ў акопах, ён стругаў і абточваў гэты пярсьцёнак і вырэзваў на ім дату: 1914 год.

Пасьля салдаты набылі напільнікі і пачалі рабіць пярсьцёнкі сваім родным і знаёмым, каб прывезьці ім што-небудзь з фронту, нібы з кірмашу або з фэсту. Дату ставілі тады ўжо гэтакую: 1914—1916.

І от у гэтым апошнім годзе салдаты пачалі выраблядь пярсьцёнкі на продаж, а каб не абясцэньваць тавара няправільнай датай, яны пакінулі яе вырэзваць. Тэхніка вытворчасьці ўдасканалілася: з алюмінію выліваліся цэлыя трубкі, якія расьпілоўваліся пасьля на пярсьцёнкі, у іх рабілася медзяная пракладка, яны выпілоўваліся ў выглядзе гадзюк, гадзюка трымала ў роце мёртвую галаву і косьці, а нарэшце пярсьцёнкі пачалі ўпрыгожваць каляровымі каменчыкамі з цэльлюлёіду і чырвонымі сэрцайкамі.

Шрапнэльных галовак на гэтакую шырокую вытворчасьць пачало не хапаць, і давялося карыстацца горшым матэрыялам, што ня быў непасрэдна апырсканы чалавечымі мазгамі і крывёю. У справу былі пушчаны валавяныя гузікі, алюміневыя лыжкі, невялікія часткі ўсялякіх прыладаў, усялякі мэталёвы лом... І на-

рэшце пачалі купляць матэрыял у насельнасьці, калі нельга было яго проста ўкрасьці.

І, падобна да таго, як салдат на фронце цягаў на сабе стрэльбу, дзьве сотні патронаў і ранец, ваеннапалонны нёс на плячох мяшок, у якім былі імбрычак, лыжка, конаўка, кавалачак алюмінію і абломак шкла, каб шліфаваць пярсьцёнкі, што пазвоньвалі на шнурочку ў яго бакавой кішэні.

*

Калі Швэйк увайшоў у пакой, дзе ўжо два яго таварышы займаліся рамястовом, Пісклявы сядзеў ля акна за краўцоўскаю машынаю і зарубліваў сурдут. Гаршына стаяў на каленях перад печкаю і трымаў абцугамі лыжку, у якой павалі раставаў кавалачак волава.

— Гэта льга зрабіць,—сказаў ён, калі Швэйк паведаміў пра свае намеры.—Пярсьцёнкаў тут купляюць шмат, і я ведаю, дзе іх выгодна прадаваць. Але вось бяда: матэрыялу няма. Нідзе не знайсьці ні кавалачка алюмінію. Я адліваю ўжо з волава.

— А як толькі гэтая падла ў нас у бараку, старшы унтэрафіцэр Галаваценка, пранюхае, што ты ня ходзіш на работу, а зарабляеш на старане, ён захоча атрымліваць ад цябе па рублю ў дзень,—заўважыў Пісклявы.—З мяне ён запатрабаваў нават два, калі я заняўся вось гэтаю справаю. А калі ня даць яму, ён пагражае, што пашле цябе нагружаць шпалы на станцыі. От сволач!—дадаў ён, брыдка вылаяўшыся і смаркануўшы на падлогу.

— Як? Ты ўжо навучыўся мацюгацца?—зьдзівіўся Швэйк.— Але алюмінію я як-небудзь дастану. Унь колькі з фронту вязуць разьбітых немцамі самалётаў. Ля вагзалу яны стаяць часамі ўсю ноч, і алюмінію на іх колькі хочаш.

Гаршына натапырыў вушы і вочы ў яго блісьнулі.

— Што-ж, гэта добра. А іх вартуюць?

— Як калі,—адазваўся Швэйк, і Гаршына яшчэ больш задумаўся.

— Ну, тады мы дастанем. Справа добрая.

— Калі нас зловяць, дык справа сапраўды будзе добрая,— нявінным тонам заўважыў Пісклявы.—Яна вам праз бок выйдзе, як мне омская палкоўніца.

Гаршына выліў расплаўленае волава ў гатовую форму і пачаў рахаваць, калупаючы ў носе:

— Вось каб мець з кілё гэтакага алюмінію! У мяне многа гэтых прастытутак заказалі пярсьцёнкі. Ксюша возьме тузін, Жэня таксама; Нюша бярэ адразу дваццаць штук, а пасьля яшчэ Лідка, Кацька, Саша, Фрося і д'ябал іх ведае, хто яшчэ заказваў!

— Добра, я з вечару пагляджу, а ўночы мы з табою туды накіруемся,—вырашыў Швэйк.—Што з намі можа здарыцца?! «Рабі сваю справу, а бог табе паможа»—гаварыла мая бабуня, і яшчэ: «Бяз божае волі аніводзін верабей не спадзе з страхі». Хоць праўда, гэта гаварыў наш поп, калі дахоўшчык зваліўся з царкоўнай званіцы.

Калі сьцямнела, Швэйк прасунуў галаву ў барак. Нічога ня кажучы, ён пазваў Гаршыну. Той схапіў мяшок, адным махам саскочыў з нар і апынуўся за дзьвярыма.

— Ну, што? Ёсьць? Прывезьлі?—шэптам запытаў ён Швэйка на вагзале.

— Але, але, некалькі вагонаў.

Яны ўважліва агледзелі ўвесь цягнік. Апроч машыніста і качагара—ні душы. Яны вярнуліся да адкрытых пляцформаў, на якіх ляжалі адчэпленныя крыльлі і іншыя часткі самалётаў, і палезьлі на адну з іх, абмацваючы, з чаго зроблены тыя, ці іншыя часткі.

— Гэта не старыя машыны, а новыя!—шэптам сказаў Гаршына, адкруціўшы кавалак алюміневай штангі. Але Швэйк адказаў на гэта:

— Што-ж з таго! Ці ня ўсёроўна? Ці немцы іх разаб'юць, ці мы.

Ён націснуў нагою і адламаў нейкую вылітую частку. І ў тую-ж хвіліну хтосьці ціха гукнуў з другое пляцформы:

— Ня лазь туды, там ужо хтосьці ёсьць. Унь ззаду яшчэ адна пляцформа.

Гаршына так і ўмлеў. На ўсіх пляцформах гаспадарылі людзі, якія штосьці адкручвалі, адломвалі, ці адбівалі малатком. А нейкі чалавек, набраўшы ўжо з поўмяшка дарагога матэрыялу з сапсаванага гэтакім парадкам апарату, гаварыў ім:

— Хлопцы, сьпяшайцеся! Цягнік зараз пойдзе. Ну што за дурні расійцы! Пакідаюць гэтакую маемасьць без аховы!

І, поўны моральнага абурэньня, гэты чалавек ускінуў свой мяшок на плечы і зьнікнуў у змроку. Рэшта ўсе пашлі за ім.

Калі Пісклявы разгледзеў раніцаю здабычу ночнае экспэдыцыі, і даведаўся, што ўсё гэта зьнята з новых, назначаных на фронт самалётаў, ён пляснуў далонямі і сказаў:

— Вось гэта сапраўды сабатаж вайны: зьнішчэньне ваенных матэрыялаў!

Ён пачаў падрабязна разьвіваць сваю тэорыю пра вайну і заявіў, што адзіны сродак зрабіць вайну немагчымай, гэта— украсьці ўсю казённую маемасьць. У канцы ён сказаў:

— Гэтакім спосабам расійцы яе ня выграюць.

— Вядома ня выграюць,—радасна падхапіў Швэйк.—Але й ніхто яе ня выграе, бо ўсюды крадуць. Вось у нас у палку быў адзін салдацік, дык той пасылаў дадому казённую бялізну, боты, адзежу і што прыдзецца. Я яго запытаў, чаму ён крадзе, а ён адказаў: «Аўстрыя—гнілая дзяржава і павінна быць зьнішчана!» Я яшчэ ў той раз даў яму па мордзе, бо і ў мяне прапала пара казённых ботаў.

І ў ціхім пакойчыку, гаспадар якога Мойшка, афіцыйна гандляваў гарбузікамі, булкамі і яблыкамі, а, неафіцыйна, скупліваў крадзенае ўночы і збываў яго кудысьці на старану, да стуку краўцоўскай машыны далучаўся скрып двух напільнікаў і сухое шорганьне сталёвага дроту, што ішоў на паліроўку пярсьцёнкаў. нае працы і пусьціліся ў дарогу. У цёмным завулку Гаршына заявіў:

— Сёньня мы ня будзем працаваць. Мы пойдзем здаваць заказы.

Яны пазьбіралі нанізаныя на шнурочкі вынікі шасьцідзённае працы і пусьціліся ў дарогу. У цёмным завулку Гаршына зайшоў у нейкую крамку і запытаў гаспадара:

— Што, Лідка, дома? Адна, можна да яе?

— Сыпіць яшчэ,—прагугніў той.—Але добра, заходзьце.

На старым жалезным ложку ў невялічкай каморцы, дзе цяжкае паветра змагалася з водырам одэкалёну і таннае пудры, ляжала красуня няпэўнага тыпу, якая пачала ўжо старэць. Калі

рыпнулі дзьверы, яна расплюшчыла вочы і сонным голасам працягнула:

— Ах, цэлых два аўстрыякі адразу! А ці ёсьць у вас грошы, хлопчыкі?

— Мы прынесьлі пярсьцёнкі, мадам,—сказаў Гаршына, прывітваючыся далікатна з ёю.

Дамачка ажывілася.

— Выбачайце, гэтакіх рэдкіх гасьцей я не чакала. Пакажэце пярсьцёнкі. Добрыя, га? Пачом штука? А ну, скажы,— усьміхнулася яна Швэйку,—колькі ты хочаш за пярсьцёнак?

— З вас, мадам, толькі паўрубля,—засьпяшаўся сказаць Гаршына, зноў далікатна скланіўшыся. Але дамачка, пакруціўшы пярсьцёнак у руках, гультаявата сказала:

— Гэта дорага. Аддай за сорак, я вазьму дзесятак. Другія таксама прыносяць за сорак.

Швэйк кіўнуў галавой у адзнаку згоды. Гаршына адлічыў пярсьцёнкі, і красуня, памахваючы імі, паклала іх сабе на калені. Пасьля яна гульліва засьмяялася.

— Ну, добра. А я бяру з гасьцей па два рублі. Значыцца, тут якраз на вас абодвых. Хто-ж будзе першы? Ты, галубок? За гэтакія добрыя пярсьцёнкі і работа будзе добрая.

І, паклаўшы пярсьцёнкі на коўдру, яна зноў легла на пасьцель.

— Здорава!—сказаў Швэйк, весела зацікавіўшыся.—Калі ва ўсіх гэтакі звычай, дык нам сёньня ўсіх пярсьцёнкаў нават і ня збыць.

— Не мялі языком!—пхнуў яго ў бок Гаршына, а жанчыне ён адразу сказаў:—Мадам, дазвольце атрымаць грошы. Нам належыць чатыры рублі.

Тая гэтак-жа гультаявата ўстала і села.

— Няма ў мяне грошай, галубок ты мой, няма. Ні капейкі! Калі хочаш, адкахай за ўсе. Тавар за тавар!

— Каб цябе разарвала, сьцерва!—пачаў лаяцца Гаршына, забіраючы свае пярсьцёнкі.

— А што? Панове засталіся нездаволеныя паненкаю? Яна не дагадзіла паном?—затарахцеў гаспадар, калі яны, раззлаваныя, прайходзілі праз крамку, і пабег у задні пакойчык, каб як мае быць прабраць сваю белую нявольніцу.

— Хадзем да Ксюшы!—скамандваў Гаршына, крочучы па вуліцы.—Пачнем з іншага канца.

— Мы ходзім, нібы члены дабрачыннага камітэту,—заўважыў праз паўгадзіны Швэйк, выходзячы ад трэцяй жрыцы кахання, якая прапанавала ім за пярсьцёнкі пляшачку одэкалёну, пачачак крэму «Мэтамарфоза» і стары гарсэт з некалькімі зламанымі костачкамі. Гаршына злосна плюнуў.

— Больш я нікуды не пайду. Марш цяпер на рынак і эбудзем гэтыя д'яблавы пярсьцёнкі салдатам і бабам.

У панядзелак раніцаю салдаты і паліцыя ўтварылі ў горадзе аблаву і сагналі ўсіх ваеннапалонных, што папаліся ім у рукі, у баракі. Усюды былі пастаўлены вартавыя пасты, так што ніхто ня мог выбрацца на вуліцу. Вечарам іх накіравалі, абкружыўшы казакамі, на вагзал.

Сам генэрал Чарэднікаў, разам з сваім ад'ютантам, быў пры тым, як казакі заганялі палонных па трыццаць пяць чалавек у цяплушкі. Пры тэтым ён самаздаволена заявіў:

— Нават георгіеўскі крыж ня ўзрадаваў-бы мяне гэтак, як тое, што адсюль прыбіраюць гэтую банду. Я вам ужо расказваў, Васіль Пятровіч, што галоўнакамандуючы заходнім фронтам проста намякае, што прысланыя на фронт аэропляны былі сапсаваны ў Віцебску. Палкоўнік Клімаў аддадзены з-за гэтае справы пад суд. Ён быў камэндант станцыі. А сапсаваў іх ніхто іншы, як вось гэтая сволач. Што-ж, у гэтых людзей ёсьць патрыятызм!

Да цяплушкі, дзе сядзелі Ванэк і Марэк, Швэйк наўмысьля прыбіў навязку з чырвоным крыжам, «каб немец не падстрэліў», і, калі цягнік крануўся і іх цяплушка пракацілася паўз ад'ютанта, ён высунуўся з-за дзьвярэй і гукнуў:

— А ну, шукай мяне цяпер!

8

ЗА ЛІНІЯЙ ФРОНТУ

Перакідка вялікіх мас людзей у часе вайны, і знаёмства з імі, нікому не далі гэтулькі асалоды, як абывацелям гарадоў і мястэчак, што апынуліся раптам у цэнтры ваенных падзей.

Часамі хаціны гэтых абываталяў па чатыры разы ў суткі бывалі занятыя новымі салдатамі, у тым ліку часта і варожымі. І гэтыя няпрошаныя госьці зусім не саромеюцца, а трымаюць сябе «зусім як дома».

Афіцэры зусім ня думаюць, што парушаюць сямейныя правы, калі кладуцца ў пасьцель з жонкаю якога-небудзь мірнага грамадзяніна, таксама, ня лічыцца за парушэньне сямейных правоў, калі дзесятак салдат асталююцца ў спальні гаспадаровай дачкі, або ў пакоі, дзе з-за печы вызіраюць дзьве жаночыя і тры дзіцячыя галавы. Гэта, як кажуць, робіцца ў інтарэсах нацыі, дзеля абароны бацькаўшчыны, і ўсе зробленыя за ноч гвалты, прыгнечаньні і крыўды ліквідуюцца адным—адзіным стрэлам у бок ворага.

Вайсковы чыноўнік Аляксей Пятровіч Баранаў, пад загадам якога была 208-я рабочая дружына, што была накіравана з Віцебску на фронт, яшчэ ў цягніку прышоў да перакананьня, што шчасьце камандаваць рабочай дружынай з ваеннапалонных і быць іхнім неабмежаваным гаспадаром не паўторыцца больш ніколі ў жыцьці і таму яго трэба як мае быць скарыстаць. Паводле гэтых меркаваньняў ён ужо ў Маладзечне, дзе давялося стаяць, чакаючы на якое месца фронту назначыць іх штаб, прадаў спэкулянтам палову рыдлёвак, лапат і матыкаў, якіх, як ён думаў, было залішне шмат нагружана ў Віцебску.

Ён атрымаў за іх восемсот рублёў. Але ён любіў круглыя лічбы, дык ён даў у прыдачу да іх яшчэ два мяшкі рафінаду і пакунак чаю, пасьля чаго спэкулянты абкруглілі ўсю суму роўна да тысячы.

Вельмі задаволены сабою, што ён гэтак шпарка асвойтаўся з роляю начальніка, ён расходжваў узад і ўперад па пэроне, чакаючы канвою, які павінен быў праводзіць іх у Маладзечна.

Канвой явіўся, заглянуў у цяплушку і заявіў, што бязьлітасна будзе расстрэльваць кожнага, хто зробіць хоць найменшую спробу ўцякаць. Гэта былі апалчэнцы з Сібіру, якія амаль што першы раз убачылі чыгунку, калі іх павезьлі на фронт, і проста гакі баяліся палонных.

Сьледам за гэтым быў атрыманы загад, каб дружына зараз-жа накіравалася ў Будслаў на пабудову чыгункі. Начальнік

дружыны набраўся быў добрага намеру пасылаць у той дзень у інтэнданцтва па хлеб, але загад быў катэгарычны; раздача хлеба затрымала-б дружыну прынамсі на гадзіну, дык ён скамандаваў:

— Выходзь з вагонаў! Зьбірайся ў дарогу!

Адначасна ён загадаў раздаць рабочыя прылады. Выявілася, што іх хапала ня больш як аднэй траціне рабочых. Дык начальнік пачаў суцяшаць тых, хто астаўся з пустымі рукамі:

— Нічога, хлопцы! Вы панясеце прыладзьдзе наперамену. І каб ніхто ня ўздумаў адмаўляць таварышу, калі ён захоча нясьці сякеру ці лапату, або калі яны спатрэбяцца яму на рабоце!

Гэты загад ні разу ня быў парушаны, бо за ўвесь чатырохдзенны пераход ніхто ня выказаў ахвоты цягнуць на сябе дзесяцікілёвыя ламы на ламаньне каменьня. Дый пазьней, у часе работы, ня было аніводнага выпадку бойкі з-за струманта, бо тыя, якім яго не хапала, апраўдваліся перад усімі:

— Мы тут не дзеля работы. Мы можам, у лепшым выпадку, даваць вам парады.

Значыцца, рабочая дружына гультаявата пацягнулася ў дарогу, як караван вярблюдоў у Сахары.

Была адлега. Сакавікоўскае сонца прэла з веснавою сілай і пад скібамі сьнегу сям-там журчэла ўжо вада. Чацьвёра сутак ішлі палонныя ў Будслаў, спыняючыся начаваць у перапоўненых вайсковымі часьцямі вёсках. Людзі ішлі, не атрымоўваючы ні гарбаты, ні абеду, ні хлеба, і трацячы на сваё харчаваньне тыя капейкі, якія дала ім пакража ў Віцебску. Начальнік дружыны з задаволеным выглядам паціраў сабе рукі.

— Дальбог, лепшага шчасьця мне і чакаць ня трэба. Гэтыя дурні нічога не патрабуюць, нічога не ядуць, і я ўсё магу апчадзіць.

Ён пакінуў сваіх людзей на вуліцы, а сам рашуча ўвайшоў у барак, дзе быў штаб. Тымчасам палонныя разьбегліся хто куды шукаць чаго-небудзь паесьці.

Начальнік штабу нават і ня ведаў, што тут меркавалася будаваць чыгунку і што на работу прысланы палонныя аўстрыякі.

Ён пачаў званіць у ва ўсе канцы па тэлефоне, а пасьля безнадзейна пацінуў плячыма:

— Ніхто нічога ня ведае. Рабеце, што хочаце. Грошы вам на іх у Віцебску выдалі?

— Але, на два тыдні!—адказаў начальнік дружыны.

Гэты адказ, відаць, задаволіў начальніка.

— Што-ж, добра!—сказаў ён.—Ведаеце што? Адвядзеце сваю дружыну ў Вілейку. Гэта будзе вёрст за дваццаць адгэтуль. Там стаіць батальён Цывярскога палка, які праз тыдзень ідзе на фронт, і вы так ці іначай можаце там асталявацца. А я пашлю ў Віцебск тэлеграму, што мне з вамі рабіць.

Ледзь ідучы па расталым сьнезе, яны ўночы дабраліся да Вілейкі. Гарадок быў да адказу поўны войскам, што прышло сюды напярэдадні на адпачынак.

— Яблыку няма дзе ўпасьці!—заявіў афіцэр, якому начальнік дружыны паведаміў, што яму прапанована разьмясьціцца тут з сваімі людзьмі.—Але за сорак вёрст адсюль ёсьць вёска Астраўкі. Можа вы нават праз яе пераходзілі. Яе ніхто не займае, хіба што адна рота чыгуначнага батальёну. А вам будзе адтуль блізка да месца работы, бо чыгунка пройдзе ад Будслава ў заходнім кірунку на фронт.

— Ну, хлопцы, нам прыдзецца прайсьці крыху назад,—узрадаваў начальнік сваю змучаную дружыну.—А пасьля я вам дам адпачываць цэлы тыдзень.

І ў страшэнным цемрыве людзі паклыбалі назад, пакуль не дацягнуліся да Астраўкоў. Гэтая вёска таксама была занятая, але начальнік расійскай рабочай дружыны, якая стаяла там, выказаў згоду да раніцы як-небудзь сьцісну́цца, каб палонныя маглі выспацца.

— Да раніцы вам давядзецца пачакаць,—соладзенька заявіў ім начальнік дружыны, выходзячы з хаты на вуліцу.

Замест адказу, ён пачуў трэск драўлянага плоту, які ламалі на дровы, каб раскласьці агонь, і роспачныя енкі і крык баб і мужыкоў, што ратаваліся ад чумы, якую пан бог зноў на іх наслаў.

*

За той тыдзень, калі адны ўпэўнівалі што ў Будславе будзе будавацца чыгунка, а другія гэтак-жа сама рашуча з імі не згаджаліся, Баранаў, начальнік 208-й рабочай дружыны, зрабіў вялікія посьпехі ў справе клопату пра сваіх людзей. Ён атрымаў ім у выглядзе пазыкі ў расійскае дружыны сутачную порцыю хлеба, дастаў іржавы кацёл на ваду і паказаў ім копію накіраванага ў Маладзечна тэлеграфнага патрабаваньня прысланць паходную кухню, а таксама чаю і цукру. Няхай яны толькі яшчэ крыху пацерпяць; яны ўсё атрымаюць, і ён нікога ня хоча крыўдзіць.

Вядома пры гэтакіх умовах сякеры і рыдлёўкі як бачыш апынуліся ў мужыкоў, ад якіх палонныя атрымоўвалі бульбу і хлеб. Калі, нарэшце, у вёсцы зьявіліся інжынэры і дзесятнікі і зрабілі агляд гэтае жывое сілы, што была прыслана на пабудову, дык выявілася, што людзі былі вельмі кепска падрыхтаваны да работы і явіліся сюды амаль з пустымі рукамі.

— Вам-жа павінны былі выдаць у Віцебску прыладзьдзе,— злаваў старшы інжынэр, а Баранаў, не хвалюючыся, хлусіў:

— Павінны былі, але не далі. А я нават і ня ведаў, на якую работу нас паслалі.

Але назаўтра па хатах хадзілі канвойныя салдаты і крычалі:

— Уставай, хлопцы, на работу! Вось гвалт выйдзе!

У канцы вёскі палонных чакаў Баранаў з дзесятнікамі і адлічыў кожнаму колькі яму трэба было людзей. У руцэ яго была запісная кніжка, куды ён штосьці запісваў; на папрузе вісела тоўстая раменная нагайка.

— Што, хлопцы, пасьнедалі?—весела гукнуў ён.—Чай з цукрам пілі? Ну, а цяпер мы крыху папрацуем!

— А вы што за людзі? Чэхі?—запытаў адзін стары дзесятнік, і калі ў адказ сказалі моцна: «чэхі», ён цмокнуў языком і гаварыў далей:—А рамесьнікі сярод вас ёсьць?

— Ёсьць!—адказала яму адразу дваццаць галасоў.

— Рамесьнікі, выходзь наперад!

Усе вышлі наперад, і толькі Швэйк астаўся стаяць. Да яго падышоў начальнік дружыны і запытаў:

— А што ты ўмееш рабіць?

— Я цырульнік,—з нявінным абліччам адказаў Швэйк.

Начальнік пхнуў Швэйка да іншых і заявіў:

— Кожную нядзелю ты будзеш галіць мяне і паноў інжынэраў, і за гэта будзеш добра атрымоўваць на чай. А вы, галубчыкі, хоць вы і рамесьнікі, будзеце капаць зямлю, біць каменьні і асыпаць пясок. Але, але мы будзем будаваць чыгунку,—раптам разззлаваўся ён. І, стаўшы на пальчыкі, скамандаваў:—Ну, упярод! Пашлі!

Дзіўную работу давялося ім рабіць, калі ім выдалі прыладзьдзе. З станцыі прыходзілі інжынэры і працягвалі шнуры, а дзесятнікі адразу-ж выстройвалі ўздоўж гэтых шнуроў палонных і прымушалі іх капаць зямлю і насыпаць насыпы. Але як толькі праца гэтая пачынала даваць свае вынікі, інжынэры працягвалі свае шнуры ў іншым кірунку, спрачаючыся і лаючыся паміж сабою. Дзесятнікі пераводзілі палонных на іншае месца.

— Вось тут капай, жыва! Хіба ня бачыш, што начальства праводзіць чыгунку ў выгодным месцы!?

— Што за карысьць з гэткае работы,—сказаў Гаршына, усоўваючы рыдлёўку ў зямлю.—Пайду я адно пагляжу, ці няма якіх навін на станцыі.

Праз паўгадзіны ён вярнуўся і няпрыметна зрабіў Швэйку і Піскляваму знак ісьці за ім. Яны ціха зьніклі, у той час як усе іншыя церабілі праход у бярозавым гайку, і прабраліся на станцыю. Гаршына паказаў на вялічэзную парусінавую будку.

— Што гэта? Цырк?—зьдзівіўся Швэйк.

— Куды лепш!—сьмяючыся абазваўся Гаршынка.—Харчавальны пункт.

І цьвёрдым крокам ён павёў іх у будку, у якой стаялі сталы. Ён прыпыніўся ля акна, дзе сядзела ў скуранай куртцы сястра міласэрднасьці, і працягнуў руку. Яна ўсьміхнулася і дала яму тры бляшаныя міскі. Нейкі барадач у кутку наліў ім туды густога крупніку з локшынамі і мясам і паказаў на сталы. Гаршына зноў падышоў да акна і прынёс дзевяць кавалкаў цукру. Пасьля ён прыцягнуў імбрычак гарбаты і сказаў:

— Пасядзімо тут. Работа ня воўк, у лес не ўцячэ.

На змроку, калі наша тройца вярнулася да сваіх таварышоў, што выстраіліся ў колёну, каб ісьці назад у вёску, да іх пад'ехаў конна начальнік і гукнуў:

— Хлопцы, радуйцеся! Кухня прыехала! Заўтра вам будзе абед!

Пабудова чыгункі шпарка ішла наперад. Сотні навакольных сялян, сагнаныя паліцыяй, вазілі пясок. Насып зрабілі проста так бяз рыштко на працягу двух кілёмэтраў; на яе адразу-ж паклалі шпалы, на якіх умацавалі рэйкі. Інжынэры кудысьці згінулі, а праз два тыдні зьявілася другая партыя, і пачала рабіць яшчэ адну лінію.

Зноў пачаліся маразы. Пасьля пашлі дажджы, сьнег сышоў і на полі зьявіліся вазёры. Ля насыпу зрабілася запруда, вада ля якое ўсё большала. Цэлую ноч дождж ліў як з вядра, а на раніцу палонных, ня гледзячы на надвор'е, пагналі на работу. Калі яны прышлі на месца, дзе ўчора яшчэ быў насып, усе разьзявілі раты ад зьдзіўленьня, а Швэйк шчыра сказаў:

— Вось гэта дык якраз!

Вынік працы шмат тысяч людзей і коняй за ноч зьнік бяз сьледу—насыпу больш не існавала. На полі сумна тырчэлі з гразі змацованыя пагнутымі рэйкамі шпалы, а навокал гэтых шкілетаў паяжджалі на конях расійскія афіцэры і гукалі на палонных:

— Сукіны дзеці, не зрабілі рыштко! Сволачы, не пакінулі праходаў, каб магла зьбягаць вада!

І сьцёбалі палонных нагайкамі па сьпінах, абвінавачваючы іх у здрадзе расійскай арміі і пагражалі расстрэлам.

Аднак нічога гэтага ня здарылася. За два бліжэйшыя тыдні быў пабудаваны новы насып, у якім ужо былі праходы вадзе, а з Будславу павінен быў прайсьці па ланава пракладзенай калеіне паравік і некалькі парожных вагонаў.

Але цягнік ня мог сысьці з месца. Выявілася, што пад'ём чыгункі вельмі вялікі, бо насып усюды быў аднолькавы на вышыню. Прыехаў нейкі генэрал з інжынэрскімі цэшкамі, аглядзеў кавалак чыгункі, аблаяў яе будаўнікоў «ідыётамі і шэльмамі» і загадаў разьвярнуць увесь насып і замест яго зрабіць спробную каляіну.

У дружыне распаўсюдзілася новая, недасьледжаная хвароба. З захадам сонца людзі трацілі зрок, сьлеплі і не маглі дайсьці дадому. Абодвы «дактары» зусім зьбянтэжыліся.

Гэта быў вынік нясупыннага голаду. Нейкі вочны нэрв, аслаблены голадам, ня меў сілы пры малым сьвятле пашырадь зрэнку, каб пусьціць у яго колькі трэба сьветлавых праменьняў. Хвароба гэтая апаноўвала аднаго за другім, і здавалася, нібы яна набывае форму пошасьці.

Дык, калі ўночы два чалавекі адразу зваліліся ў равок і ледзь не захлынуліся ў нечыстаце, Ванэк пашоў да Баранава і далажыў яму, што стан здароўя ў людзей дружыны вельмі пагоршаў і што ам'аль усе пасьлеплі.

— Ну, што-ж я мага зрабіць?—сказаў той.—Я-ж стараўся захаваць дыету і не карміў людзей салам. Наадварот, ім давалі сьвежую капусту, і я загадаў класьці туды пабольш цыбулі. Давядзецца паслаць рапарт у Віцебск.

Хвароба гэтая была ўжо вядома ў расійскай арміі. Вярнуўшыся нейк з Будслава, начальнік выклікаў да сябе абодвых «дактароў» і сказаў:

— Ну от, я прывез лякарства. Даваць сьляпым па сталовай лыжцы кожны дзень. Гэтая хвароба завецца «курыная сьлепата». Чалавек пачынае тэтак-жа сама бачыць у цемені як і куры. Але, паводле досьледаў мэдычнае навукі, зрок пасьля зноў аднаўляецца.

Ён аддаў ім пляшку страшэнна сьмярдзючае рыбінае тлушчы і загадаў:

— Няхай хворыя прыдуць увечары да паходнае кухні, я паспрабую яшчэ адзін сродак. Кашавар будзе варыць валовую пячонку, і хворыя павінны будуць прапарыць сабе параю з яе вочы. Гэта доктар гэтак парадзіў, а наш доктар—самы вучоны чалавек!

Першы спосаб лячэньня сьлепаты быў адразу-ж ужыты. Людзі курчыліся ад аднаго толькі смуроду гэтае рыбінае тлушчы; іх рвала, і ў іх разьлівалася жоўць, але, баючыся, каб зусім не асьлепнуць, яны пакорліва глыталі прыкрае лякарства.

Швэйк, з прычыны адмысловае пратэкцыі, атрымаў дзьве лыжкі адразу. Праз пяць хвілін Марэк убачыў, што Швэйк здымае з сябе ля хаты боты.

— Ты нашто гэта боты здымаеш?—запытаў Марэк.

Швэйк не адказаў. Ён шпарка паставіў боты на калоду, прытрымваючы іх рукою. Пасьля ён пачаў душыцца і храпці, і яго вырвала проста на боты. І паміж двума прыступамі бляваньня, ён, заікаючыся, прызнаўся Марэку, які глядзеў пільна на яго:

— Боты ў мяне злубянелі, як з дрэва сталі. Я хацеў быў папрасіць і ў цябе крыху рыбінае тлушчы, каб памазаць іх, але пабаяўся, што хлопцы лаяцца будуць, нашто я іхняму здароўю пагражаю. А так—дык ніхто ня будзе лаяцца. Боты я цяпер вымазаў. Я выпіў тлушчу нашча.

І, размазваючы гэты варволь па ботах анучкаю, Швэйк, бачачы, што Марэк адно сумна паківае галавою, самаздаволена дадаў:

— Чалавек павінен быць спрытны. Трэба старацца ўсім карыстацца і нічога з рук не выпускаць.

Увечары прышоў у акалодак салдат і перадаў начальнікаў загад усім, хто захварэў на курыную сьлепату, ісьці пасьля дзесяці гадзін на кухню. Кашавар паставіў там тры вараныя пячонкі ў катле на гарачае вугальле, каб яны не астылі, і начальнік загадаў:

— Станавіся на калені ля гэтае пасудзіны і накрыйся паверх галавы коўдраю, каб пара ішла ў вочы. А ты падрыхтуеш мне пасьля пячонку з цыбуляю на вячэру,—зьвярнуўся ён да кашавара, і пашоў.

Палонныя зьмяняліся па дзесяць чалавек за гэтаю валаводзінаю. Сьляпыя вылупілівалі вочы, і на пячонку капала сьліна, што цякла ў гэтых небаракаў з роту, як у галодных сабак. Кашавар, бачачы, што яны ня гэтакія нясумленныя, каб сьцягнуць з пасудзіны сваё нязвычайнае лякарства і ня даць такім чынам сваім таварышам палячыцца, паехаў па ваду, жорстка загадаўшы ім не чапаць пячонкі, пакуль ён ня вернецца.

— Ён хоча зьесьці яе адзін,—сумна сказаў Піскляві, страсянуўшы пад коўдраю спацелаю галавою.

— Што-ж, пячонка з цыбуляю ня так ўжо і кепска,—уздыхнуў Гаршына.—Порцыя каштавала раней трыццаць хэльлераў. А ўрэшце, яе можна есьці і бяз цыбулі.

— Шкада толькі, што яна ня зусім гарачая,—умяшаўся ў дэбаты Швэйк.—Глядзеце, пара з яе ўжо больш ня ідзе. Вочы мы ўжо ня можам падсунуць да яе яшчэ бліжэй, так што цяпер застаецца толькі падсунуць яе бліжэй да вачэй. Мы-ж—апошні дзесятак, і пасьля нас нікога няма.

Ён працягнуў руку ў кацёл, дастаў кавалачак пячонкі, прыклаў яго да вока і радасна гукнуў:

— Вось гэтак яно дзейнічае як ня трэба лепш! Я бачу, бачу як мае быць!

— А я бачу, што і мне трэба зрабіць тое-ж самае, каб захаваць вочы!— абазваўся Пісклявы.—Чаго ты гэтак чаўкаеш, Швэйк?

— На пячонцы быў кавалачак сала,—адказаў Швэйк,—і гэта можа пашкадзіць на вочы. Так што я сала зьлізаў.

— Зьлізаў і глынуў,—паправіў яго Гаршына.—Па-мойму, браткі, нам усім варта было-б прыкласьці па кавалачку пячонкі да вачэй.

Пад коўдраю пачаўся прыхільны да гэтае прапановы шэпт. І галовы стукнуліся лбамі адна аб адну—гэтак нізка нагнуліся сьляпыя над катлом. А калі Швэйк неўзабаве пасьля гэтага зноў уздумаў узлагодзіць вочы пячоначным цяплом, і сунуў руку ў кацёл, яго рука спаткала там дзевяць іншых рук, якія, растапырыўшы пальцы, зьбіралі на дне катла апошнія астаткі пячонкі.

— Гэта зусім як на банкеце ў мадам Хрдлічкі,—з прыкрасьцю заўважыў Швэйк.—Гэта, ведаеце, была шляхетная, выхаваная жанчына, адно што крыху скупаватая. У пакоях у яе была паркетная падлога, але, каб яе не псаваць нагамі, яна ўкрыла яе лінолеўмам, а каб не псаваць лінолеум, купіла дыван. А на дыван паслала дзяругу, на дзяругу—пакавальную паперу, а на паперу—старыя газэты, каб ня драпаць паркетную падлогу.

— Даволі лухту вярзьці!—засьмяяўся Пісклявы.

— Не, яна сапраўды была гэтакая,—ня ўнімаўся Швэйк,— хоць яе нельга было раўнаць да якоесьці мадам Бразды ў Страканіцы, якая падсьцілала газэты пад свайго мужа, каб ён ня пэцкаў сяньніка і прасьціраддлаў. Яна выпісвала тры газэты, і ўся папера ішла на пасьцілі, бо мадам Бразда вельмі шанавала чыстату і парадак.

— А што-ж здарылася з тваею мадам Хрдлічкаю?

— Гэта вы зараз пачуеце,—заявіў Швэйк, варочаючыся да свае ранейшае тэмы.—Яе мужа выбралі ў члсны гарадзкое рады, і з гэтага выпадку яна ўздымала наладзіць дзеля гасьцей абед. Запрасілі дзесяць чалавек гасьцей, а яна купіла дванаццаць шніцаляў і дала кухарцы, каб тая прырыхтавала іх на вячэру з бульбяною прыправаю. З запрошаных зьявілася толькі дзевяць чалавек, так што кожны ўзяў сабе за сталом па шніцалю, а дванаццатым сіротліва астаўся ляжаць на талерцы. Гаспадыня запрашае, каб госьці яго елі, але тыя, вядома, як людзі далікатныя, дзякуюць і адмаўляюцца, хоць, ясна, былі яшчэ галодныя, самі ведаеце, якія апэтыты ў «бацькоў гораду»... Словам, яны і выгляду не паказалі і пачалі гаварыць пра тое, як яны будуць старацца падняць гарадзкі дабрабыт і дамогуцца адмены мастаўшчыны. І раптам—трынк!—патухла электрычнасьць, бо на электрастанцыі штосьці папала ў машыну. Мадам Хрдлічка загадала, каб служанка прынесла лямпу з газаю, а пакуль што кампанія сядзіць у цемені. Раптам у сталовай хтосьці закрычаў ад болю і ў тую-ж хвіліну запалілася электрычнасьць. І перад вачыма ўсіх адкрываецца жудасны малюнак. Гаспадыня прыкрывае рукою на талерцы шніцель і ў гэтую руку ўколана дзесяць відэльцаў. Вось якія справы адбываюцца ў цемені! Дык як-жа ім ня здарыцца і ў нас, калі цёмна і мы, да таго яшчэ, сьляпыя! А цяпер, браткі, пара нам і драла даваць.

Ледзь пасьпелі яны вярнуцца ў барак, як начальнік дружыны падзякваў кашавара параю аплявух, калі той паведаміў яго, што пячонка зьнікла і што іншага нічога няма на вячэру. Каб уцешыць начальніка, ён сказаў:

— Дык яна-ж і была ўся запляванa, ваша высокаблагародзьдзе!

Гэтая аплявухі былі—канец дзейнасьці Баранава ў 208-й рабочай дружыне. Кашавар паскардзіўся начальніку ў Будславе. Начальства знайшло, што палонныя мелі права есьці пячонку пасьля сканчэньня працэдуры, і накіравала адпаведны рапарт вышэйшаму начальству ў Віцебск. У выніку, Баранава перавялі на іншую пасаду, а на яго месца назначылі палкоўніка Галаваценку.

9
ПАД НОВЫМ НАЧАЛЬНІКАМ

Новы начальнік, якім лёс ашчасьлівіў 208-ю дружыну, быў чалавек, якому ў жыцьці не пашэньціла. Прымушаны дваццаць год таму кінуць службу ў арміі з прычыны нейкіх грашовых няпрыемнасьцяй, ён жыў невядома як, і таму, калі ў часе першае мобілізацыі яго прынялі на службу ў чыне падпалкоўніка, ён з радасьці ахвяраваў на царкву таго сяла, каля якога ён тады жыў, новы абраз.

Але гэта было ў першы і апошні раз, што шчасьце ўсьміхнулася яму на старасьці год. Полк, якім ён камандваў, быў узяты немцамі ў палон без аніводнага стрэлу, а яму, камандзіру, што выратаваў сваю волю дзеля інтарэсаў Расіі, давялося адказваць за гэта перад ваенным судом. Пасьля яго назначылі за начальніка нейкага кансэрвнага заводу, з якога ў той час, калі ён ім кіраваў, на фронт ішлі толькі напалову напакаваныя бляшанкі кансэрваў, а цягнікі з мясам кудысьці гінулі; такім чынам, яму зноў давялося езьдзіць у Пецярбург і апраўдвацца. Суд і гэты раз прызнаў яго нявіннасьць, і ў выглядзе компэнсацыі, яму павысілі чын на палкоўніка і назначылі за начальніка двух сотняў абарванцаў—ваеннапалонных, што працавалі на пабудове чыгункі. У Астраўкі ён прыехаў уночы, адразу-ж прыняў камандваньне і выкінуў небараку Баранава з яго кватэры, а назаўтра зранку яго дзяншчык шукаў ужо па ўсёй вёсцы цырульніка, каб пагаліць яго высокаблагародзьдзе яшчэ перад тым, як ён зьявіцца перад сваёю дружынаю.

Дарэмна Швэйк ратаваўся, гаворачы, што ён голіць толькі самога сябе, дарэмна стараўся ўпэўніць, што стрыгчы ён наогул ня ўмее зусім. Калі ён рашуча адмовіўся ісьці, дзяншчык схапіў яго за каўнер і пацягнуў за сабою, злосна прыгаворваючы.

— Ведаем, браце: ты ня пойдзеш, а мне палкоўнік усю морду расквасіць!

У вызначанай пад канцылярыю хаце Швэйк застаў новага начальніка за працаю. Швэйк спыніўся ля дзьвярэй і з пашанаю ўзяў пад казырок.

— Здароў!—ласкава сказаў палкоўнік.

— Так што, дазвольце далажыць, маю гонар зьявіцца пагаліць вас!—адрапартаваў Швэйк з лісьлівою ўсьмешкаю, на што палкоўнік жорстка глянуў на яго і куды халадней сказаў яшчэ раз:

— Здароў!

— Так што я магу вас і пастрыгчы, ваша высокаблагародзьдзе,—адказваючы кіўком на прывітаньне, дадаў Швэйк.—Гэта я ўмею. У Празе мне даводзілася часта стрыгчы сабак, але я больш люблю стрыгчы нажніцамі, бо машынка часамі моцна скубе.

— Здароў!—трэці раз сказаў палкоўнік, а пасьля раўнуў:— Вон! Увайдзі яшчэ раз, як належыць!

За фіранкаю, што закрывала ў кутку палкоўнікаў ложак, штосьці заварушылася. Хтосьці пазяхнуў, а пасьля адтуль высунулася рука—жаночая, як адразу заўважыў Швэйк. Ён нейк адразу павярнуўся ў той кутак, але палкоўнік яшчэ раз раўнуў:

— Вон! Аглух, ці што! І ўвайдзі як чалавек!

За дзьвярыма Швэйк аглядзеў свой туалет. Усё як-бы ў парадку: брытва ў футарале, мыла ў кубачку, нажніцы цэлыя, не зламаныя... Але, можа, палкоўнік чакаў, каб да яго ўвайшлі з сарвэткаю? Швэйк зьбегаў да сябе і прынёс ручнік. Перад дзьвярыма ён яшчэ раз уважліва аглядзеў сябе зьверху да нізу, паглядзеўшы ў люстэрку і памацаў падэшвы.

— Ці ня ўступіў я ў якое-небудзь паскудзтва?—падумаў ён пра сябе і далікатна пастукаў.—Ну, маці божая, выратуй!

— Увайдзеце!—пачуліся з сярэдзіны адначасна бас і сопрано.

Швэйк увашоў. Палкоўнік сядзеў на ложку, на якім ляжала маладая жанчына з растрапанымі валасамі і голымі грудзьмі. Швэйк выцягнуўся ў фронт і ўзяў пад казырок, а палкоўнік зноў добразычліва сказаў:

— Здароў!

Швэйк выцягнуўся як струна.

— Так што, пане палкоўнік, ваша высокаблагародзьдзе, дазвольце далажыць, што я явіўся згодна вашаму загаду пагаліць і пастрыгчы ваша прэвасхадзіцельства.

— Назад за дзьверы!—зноў раўнуў палкоўнік, і Швэйк вылящеў з пакою, з непаразуменьнем пытаючыся сябе:

— Чаго яму, старому хрэну, трэба?

Ён пачысьціў ногі, зноў пастукаў і зноў увайшоў, калі пачуў адказ: «увайдзеце». І зноў яго спаткала халоднае: «Здароў», за якім амаль адразу пашло зноў: «Вон! Марш за дзьверы!»

— Гэтак мы да вечара будзем гаварыць,—сказаў сам сабе Швэйк, робячы «кругом». Але тут умяшалася жанчына.

— Пачакайце! А ты яго ня муч. Станьце вось гэтак, як вы стаялі і адказвайце палкоўніку: «Здравія желаю ваше высокаблагородіе».

— Здра-жла-ва-ска-бродзь!—гукнуў Швэйк, як гэта ён чуў ад расійскіх салдат, і паклоўнік літасьціва ўсьміхнуўся яму і сказаў:

— Вось як трэба адказваць на прывітаньне! Значыцца, ты прышоў мяне пагаліць? А хіба ў вас начальства ня вітаюць? Што-ж у вас робяць у дачыненьні да начальства?—гаварыў ён, паказваючы Швэйку на крэсла, якое паставіў Швэйк насупроць царскага партрэту. Швэйк прадэманстраваў тое, што ад яго патрабавалася і растлумачыў:

— Вось як у нас вітаюць начальства. Але гаварыць пры тэтым ня можна, і яно таксама нічога не гаворыць.

— Гэта значыцца,—зьняважліва сказаў палкоўнік,—што афіцэры ў вас жывёла і абыходзяцца з вамі па-сьвінску!

Швэйк, намыліўшы палкоўніцкія шчокі, накіраваў брытву і некалькімі ўзмахамі выгаліў іх, у той час як дзяншчык падрыхтоўваў ваду, каб мыцца. Палкоўнік сунуў руку ў кішэню і выцягнуў адтуль трохрублёўку.

— Два рублі здачы! У цябе знойдзецца?

— Ня знойдзецца, ваша высокаблагародзьдзе,—адказаў Швэйк, шнарачы ў кішэні.—Толькі адзін рубель.

— Аляксандра Аляксеевіч, — умяшалася ў гаворку дамачка,—любенькі, учора вы мне казалі, што ў вас ні капейкі, а ў самога тры рублі! Ну, а мне трэба купіць пудры і яна каштуе чатыры. Чаму вы мне не даеце грошай?

Палкоўнік у нерашучасьці спыніўся. Пасьля ён узяў з Швэйкавых рук рублёўку і перадаў яе разам з трохрублёўкаю жанчыне, пагардліва кінуўшы цырульніку:

— Ну вось, я пазычу ў цябе гэты рубель. Мне якраз нехапае рубля. Значыцца, я табе вінен цяпер два. У наступны раз, калі ты прыдзеш галіць мяне, будзе ўжо тры, і я аддам усё зараз.

Вярнуўшыся ў барак, Швэйк глянуў у лазарэт і паведаміў сваіх таварышоў:

— Добрую штучку прыслалі! І з ім яшчэ нейкая дзеўка!

Але стары Галавацэнка зрабіў на дружыну добрае ўражаньне. Ён загадаў ёй выстраіцца і зьвярнуўся да яе з цікаваю абяцанкаю не пасылаць людзей на работу, пакуль інжынэры не дакляруюць плаціць ім па дваццаць капеек у суткі, як трэба паводле закону. А калі інжынэры не захочуць плаціць, дык няхай робяць самі. Ён-жа будзе абараняць інтарэсы сваіх палонных да апошняй кроплі крыві. І ён стрымаў сваё слова і выгнаў з канцылярыі дзесятнікаў, што прышлі прасіць яго пасылаць палонных на пабудову.

Назаўтра зранку па вёсцы пашоў урачысты голас палкоўніка, што склікаў сваіх падначаленых:

— Адзявайцеся, хлопчыкі! Грошы вы атрымаеце! Інжынэр згадзіўся і прыслаў паведамленьне.

Цяпер было ўжо куды прыямней ісьці на работу. Рабілася цёпла, поле падсыхала, на бярозах зьявіліся пупышкі. І над расчаткаю будоўляю чыгункі весела пралятаві жоравы і плавалі нямецкія «таўбэ».

У тыя дні шмат салдат накіроўвалася на фронт. Сьвежыя, маладыя, здаровыя, ішлі яны на захад, адкуль праз некалькі дзён санітарныя цягнікі вязьлі іх разьбітых і скалечаных. Расійцы рыхтаваліся да наступу.

Газэты падрыхтоўвалі сваіх чытачоў да нязвычайных падзей. Марэк і Ванэк гадзінамі чыталі газэты і абменьваліся меркаваньнямі пра тое, як скончацца ваенныя опэрацыі і сярод палонных распаўсюдзілася думка, што гэта—апошні год вайны, што цяпер нарэшце надышоў рашучы момант. І вось у адзін вечар расійцы пад прыкрыцьцем сваее артылерыі, сапраўды рушылі наперад. Далягляд гарэў ад гранат і шрапнеляй, што з таго, і з дру-

гога боку сыпаліся туды. Зямля дрыжала, і дзынкалі шыбы. У ва ўсёй вёсцы ніхто не заплюшчыў вачэй.

— Ну, цяпер Габзбургскай дынастыі капут!—заўважыў Гаршына.—Цяпер рускія раней. Вечы ня спыняцца. Яны яе зоймуць яшчэ раней за Бэрлін.

— Ды ім даўно ўжо трэба было быць там!—падхапіў Пісклязы.—Даўно ўжо трэба было ім выгнаць адтуль гэтую сволач!.. Ды дзе там! З усёй гэтай гісторыі таксама нічога ня выйдзе. Толькі рэволюцыя можа дапамагчы народам! Паўстаньні, з якіх родзяцца рэспублікі!

Гарматы раўлі, як у дзень страшнага суда. Усе напружана слухалі. Стрэлы набліжаліся і льга было ўжо распазнаць дробны сокат кулямётаў. Гаршына ўздыхнуў:

— Ой, браткі, дрэнная справа! Б'юць! Аб што ў заклад, што мы пабяжымо!

Ён пачаў зьбіраць свае рэчы. Але артылерыйская стральба пакрысе пачала заціхаць, а пасьля і зусім сьціхла; неўзабаве яна аднавілася дзесьці далёка. Рускія, відаць, з посьпехам разьвівалі наступ. Марэк прышоў у барак зусім прыбянтэжаны.

— У гэтую хвіліну, браткі,—сказаў ён,—паварочваецца калясо гісторыі. Або яно ўзьнімае нас на ўзвышша, або мы пападдом пад яго і яно нас раздушыць. Як ты думаеш, Швэйк?

Але адказу ня было, бо Швэйк спаў пад гукі канонады моцна і нявінна, як дзіцянё.

Энэргія, з якой палкоўнік Галазаценка сыскваў плату за работу ваеннапалонных, была патрачана не дарма. Ён сапраўды атрымаў грошы.

Інжынэры мерыліся былі выплаціць грошы непасрэдна палонным, але палкоўнік на гэта не згадзіўся. Ён раскапаў недзе артыкул закону, які забараняў выдаваць грошы на рукі палонным, і заявіў, што будзе загадваць гэтымі грашыма да таго часу, пакуль аўстрыякі паедуць пасьля вайны дадому.

Ён зьнік на тыдзень, на працягу якога займаўся нейкімі таемнымі справамі ў Пецярбургу, і прывёз адтуль некалькі скрынь з жаноцкім адзеньнем, капялюшамі і ўсялякаю драбязою. Аўгіньня Васільлеўна, што жыла з ім, пачала франціць у раскошным убраньні.

Палкоўнік купіў сабе каня, купіў каня і Аўгіньні Васільлеўне, і яны вечарамі выяжджалі насустрэчу галодным палонным, якія ледзь перасоўвалі ногі пасьля цяжкае работы; і маладая жанчына кожны раз прымушала іх расступіцца і выстраіцца шпалерамі па бакох дарогі.

У канцылярскім памяшканьні адбываліся папойкі, у якіх удзельнічалі спачатку толькі інжынэры, а пасьля і афіцэры суседніх часьцей. Аўгіньня Васільлеўна ўсім адкрывала сваё сэрца і свае абнімкі і разьяжджала па гасьцёх; тут яе часамі праводзіў цэлы гурт, не саромячыся панурых, раззлаваных салдат, што накіроўваліся ў перадавыя акопы, дзе ім было суджана скласьці свае галовы. Дайходзіла да таго, што з тэй ці іншай групы ніжэйшых чыноў кідаліся ўсьлед бліскучай кавалькадзе злосныя выклікі і заўвагі. Салдаты бурчэлі: «Панове афіцэры тут з дзейкамі блядуюць, а ты ідзе за радзіму ўміраць!» Або: «Бач, як яны бацькаўшчыне верай і праўдай служаць!» А адзін раз хтосьці папусьціў у Аўгіньню Васільлеўну каменем, і палкоўніку, што ўздумаў быў за яе заступіцца, не засталося нічога іншага, як адразу падацца назад, калі ён не хацеў падпасьці пад немалую небясьпеку. Салдаты лаяліся ўсё мацней, і ў Аўгіньню Васільлеўну паляцела яшчэ некалькі каменьняў.

— Пачакайце, Расія не абыдзецца без рэволюцыі,—заўважыў з гэтага выпадку Марэк.

Пісклявы весела ляпнуў сябе па ляжках.

— Браткі,—гукнуў ён,—дык гэта-ж яшчэ толькі ўвэртура. А вось вы зьдзівіцеся, як сапраўдная музыка пачнецца! Увесь сьвет яе пачне слухаць, і ў ва ўсіх буржуяў на зямной кулі звон у вушшу стаяць будзе!

— Няхай сабе граюць, што хочуць, абы нам быць да таго часу дома,—сказаў, пачухваючы сьпіну, Гаршына.—Дрэнна нам прыйдзецца, калі нас прымусяць да тэй музыкі падыгрываць.

— Кожны робіць толькі тое, што можа і на што яго вучылі,—абазваўся задумёна Швэйк.—Кожная штука ў што-небудзь ды абходзіцца, а людзі заўсёды спрабуюць, ці ня можа той, хто зьнізу, выбрацца нагару. Праўда, тут любяць пагаварыць, паразважаць, але ўсё-ж доўга не важдаюцца. Ды гэтак яно і павінна быць. Выказаць усё адразу і справе канец! Вось як гэтыя

Ісгеры ў Лібушы. Стары рабіў дома, а сын вучыўся ва ўнівэрсытэце ў Празе. Праўду сказаць, ён найбольш гуляў, як вучыўся, і ўсё пісаў дадому каб яму прысылалі грошай. А стары, добры гэтакі, усе слаў ды слаў, а пра сына ўсім гаварыў гэтак: «Дорага мне каштуе весьці гаспадарку, але даражэй за ўсё абыходзіцца трымаць асла». І вось раз гэты сынок зноў гуляў цэлую ноч з таварышамі, а калі ў іх пад раніцу не хапіла грошай расплаціцца з гаспадаром таго месца, дзе яны гулялі, дык, каб ён іх не затрымаў, паслаў старому тэлеграму: «Егану Іегеру. Лібуш. Грошай. Сын». Праз гадзіну прыходзіць адказ: «Францу Іегеру. Прага. Дуля. Бацька».

— У цябе заўсёды нейкія дзіўныя параўнаньні,—заўважыў «доктар» Ванэк.—Нашто з-за гэтае штукі забіваць людзей? Ёсьць-жа і іншыя спосабы. Можна, напрыклад, скардзіцца.

— Калі я яшчэ адбываў вайсковую павіннасьць,—сказаў Швэйк,—у нас у палку радавы Прахаска задумаў паскардзіцца на фэльдфэбеля Бляшэка. Справа ў тым, што фэльдфэбель выцяў яго нагою ў жывот нібы за тое, што ён дрэнна вымыў падлогу. Ну, Прахаска вырашыў дакласьціся ротнаму. Стаіць ён на самым флянгу, а як ротны падышоў, Прахаска выступіў наперад, рукі па швох, і кажа па-чэску: «Так што, пане ротны, дазвольце далажыць, я скарджуся на тое, што пан фэльдфэбель Бляшэк убрыкнуў мяне нагою ў жывот».

Ротны яму на гэта: «Скажэце,—кажа,—гэта самае па-нямецку!»

Але Прахаска па-нямецку ня ўмеў, дык ротны на яго як накінецца: «Па-нямецку ня ўмееце, а дакладвацца ўмееце? А што гэта завецца начышчаная бляха? А што—вычышчаныя боты?» І—трах яму ў зубы! Той пашоў дакладвацца батальённаму. Але батальённы і слова яму ня даў вымавіць. «Хіба гэтак чэсьць аддаюць?—раўнуў ён на яго.—Чэсьць аддаваць ня ўмееце, а паклёпнічаць умееце? Нягоднік, смаркач, падла гэтакая! Што-ж, начальства гэтакага ўжо і пальцам не крані? Я не ахвотнік да жорсткіх пакараньняў, але за гэтакую нахабнасьць атрымайце трыццаць сутак арышту пры казарме». Пасьля гэтага Прахаска нікуды больш скардзіцца не хадзіў, але праз некалькі дзён у піў-

ніцы нейкія цывільныя гэтак зьбілі фэльдфэбеля Бляшэка, што на ім жывога месца не засталося, а калі выкідалі яго адтуль вон на вуліцу, дык сказалі: «Гэта табе за тое, што салдат нагамі б'еш!» А ротнаму нейк уночы пад аркадамі закацілі гэтакую аплявуху, што ў яго выскачыла шэсьць зубоў і ён ня мог нават гукнуць «гвалт», бо ў той-жа момант выявілася, што ў яго вывіхнена сківіца... Так, усялякія ў людзей бываюць спосабы,—скончыў сваё апавяданьне Швэйк,—і справядлівасьць бярэ верх нечыя аднолькава. Што-ж, правасудзьдзе, кажуць, сьляпое, дык яго і абходзяць то так, то гэтак.

З прычыны жорсткіх рэпрэсыйных захадаў, баявы дух расійскай арміі і адданасьці ніжэйшых чыноў сваім афіцэрам узрасьлі нагэтулькі, што афіцэры не адважваліся больш выходзіць увечары і ўночы з дому, або езьдзіць па адным. Раз-по-разу зачаліся выпадкі нападу на сёстраў міласэрднасьці, і нават Аўгіньня Васільлеўна, жанчына не баязьлівая, што прайшла агонь і ваду і медзяныя трубы, была вельмі ўстрывожаная і неадступна прыставала да свайго старога каханка, каб ён пастараўся перавесьціся з рабочай дружынай куды-небудзь глыбей у тыл, дзе было сьмялей.

Палкоўнік Галавацэнка таксама пачуў, што паветра тут ня чыстае ад шкодных здароўю мікробаў, і калі кавалак чыгункі быў зусім скончаны і грошы ваеннапалонных перайшлі ў яго кішэню, ён паехаў у Віцебск з рапартам, што дружына яго стаіць без работы, і што яе варта было-б перавесьці ў іншае месца, каб палонныя маглі зноў крыху падзарабіць.

Ад'язджаючы, ён перадаў загадваньне канцылярыяй Аўгіньні Васільлеўне, і яго гэтая сяброўка, сапсаваная, распусная, дадумалася пабыць палонным замест маці. Цяпер, калі яны не працавалі, яна пачала хадзіць з хаты ў хату, наглядаючы, як яны мыюць сабе кашулі, пішуць лісты, спрачаюцца пра вычытанае ў газэтах. Пасьля ёй раптам здалося, што «дактары» ня вельмі добра даглядаюць хворых і абыходзяцца з імі груба, дык яна загадала, каб раніцы прыём хворых адбываўся ў яе, бо на ёй ляжыць абавязак сачыць за здароўем людзей і ахоўваць іх ад усялякіх захворваньняў.

Зранку Ванэк і Марэк, у белых халатах, явіліся ў канцылярыю, дзе засталі Аўгіньню Васільлеўну за працаю: яна канчала свой туалет.

— Добрае раніцы,—ласкава прывітала яна іх.—А я ўсю ноч ня спала. Ах, якія страхі мне сьніліся! Палкоўнік ня едзе і ня едзе, і нават ня піша. Гэта ён усё дзеля вас стараецца, дзеля вас працуе. Што, сёньня шмат хворых?

І яна з цікавасьцю пачала глядзець, як абодва «вучоныя» выстуквалі, абмацвалі і выслухоўвалі хворых. А пасьля яна паклікала людзей да сябе бліжэй:

— Ну, падыдзеце, я вас таксама агледжу. Сёе-тое і я разумею ў хваробах; я-ж вучылася на мэдычных курсах у Маскве. Пачакай, галубок, ты кажаш, што ў цябе сэрца баліць, што табе дыхаць цяжка? Дыхай, галубок, я цябе выслухаю.

Яна абняла яго за стан і прыклала вуха да яго брудных грудзей, казлычучы яго сваімі пасмамі валасоў.

— Глупства, просты катар. Нічога страшнага. Прыдзеш дадому, жонка пакладзе цябе ў цёплую пасьцель, напоіць чаем, ты прапацееш і ўстанеш, як нічога ня было. Ну, а што ў цябе?

Яна бяз упынку балбатала, думаючы, што гэта ёй да твару. І хоць у яе з роту патыхала салолам і яшчэ чымсьці няпрыемным, яна як мае быць паблісквала вочкамі перад палоннымі і гаварыла да «дактароў»:

— От бачыце. Я і парашкоў ім не давала, і ёдам іх ня мазала, а вылячыла іх толькі маім мяккім жаноцкім сэрцам. Хіба гэта ня дзіва, доктар? Доктар, ды скажэце-ж, хіба я не найлепшая дапаможніца?

— Найлепшая!—сьмяючыся адказаў Ванэк, а Марэк прамармытаў:

— Гэтакая добрая, што пакрысе ўся дружына пачне цягацца сюды дзеля сьмеху.

І Аўгіньня Васільлеўна не пакідала абмінаць хворых, нічога не баючыся і ня сьпыняючыся перад гэтакімі рэчамі, якіх другая жанчына, з больш слабымі нэрвамі, ня вытрымала-б.

У той час сярод ваеннапалонных раптам зьявілася кароста; ад яе, як скардзіліся палонныя, быў страшэнны сьверб, вельмі-ж у прамежнасьцях і на ляжках, і Ванэк заявіў Аўгіньні Васіль-

леўне, што ён адмаўляецца аглядаць сваіх пацыентаў пры жанчыне. Але тая зазлавала і рашуча адказала яму:

— Чаму гэта? Вы начальнік дружыны ці я? Памятайце, што я павінна ведаць пра ўсё, што да палонных. А што калі яны заразіліся ад усялякіх патаскух? Гэта часта бывае, у нас у Расіі ўсё можа быць.

І, падфарбаваўшы сабе губы нейкаю парфумай, яна напудравала нос і катэгарычна заявіла:

— Заўтра зранку я ўсіх агледжу сама. Я люблю іх як сваіх дзяцей. Я-ж не дзяўчынка, якая ніколі ня бачыла мужчыны.

Дык Ванэк паслаў Швэйка па хатах з загадам, каб ўсе, што нядаўна захварэлі на каросту, а таксама і тыя, што ўжо лечацца сваімі сродкамі, напрыклад, мыюцца сваёю мачою, або націраюцца каламазьзю ці газаю,—зьявіліся назаўтра зранку ў канцылярыю на агляд. А з тэй прычыны, што Швэйк не забыўся пaveredаміць, што аглядаць іх будзе дамачка, у канцылярыю ў вызначаны час прышла ўся дружына.

Аўгіньня Васільлеўна яшчэ спала. Калі дзяншчык далажыў ёй, што хворыя ўжо чакаюць, яна адразу адзелася і, праціраючы вочы, загадала:

— Упусьці іх. А дактаром скажы, каб яны прышлі сюды. Гэткая хвароба—ня дзіцячыя цацкі. Тут патрэбна консультацыя.

— Добры дзень!—кінула яна «дактаром», калі тыя апынуліся ля яе.—Загадайце людзям разьдзецца. Я сама агляджу іх, а пасьля паеду ў Будслаў да старшага доктара, каб ён выпісаў нам якога-небудзь добрага лякарства.

— Першае аддзяленьне, слухай!—скамандаваў Ванэк.—штаны—далоў!—Па парадку падходзь!

Людзі, ледзь стрымліваліся, каб не зарагатаць, пачалі падыходзіць. Аўгіньня Васільлеўна абмацвала іхныя ляжкі, расьціпала пухіркі і выконвала ўсялякія маніпуляцыі, абсыпаючы пацыента пытаньнямі:

— Раскажы, як было? Дзе пачало перш за ўсё сьвярбець? Паміж пальцаў?

— Паміж пальцаў,—адказваў пацыент.

— А пасьля? Ляжкі балелі, га?

— Балелі.

— А цяпер таксама баліць? Усё яшчэ сьвярбіць?

Усе страшэнна весяліліся, а Аўгіньня Васільлеўна, закончваючы агляд і перайходзячы да наступнага, гульліва гаварыла:

— Нічога, браце, неўзабаве вайна скончыцца, і ты паедзеш дадому. Жонцы яшчэ даволі застанецца... Ну, добра, ідзі... А што ў цябе? Раскажы, як была справа. Дзе пачало перш за ўсё сьвярбець?

Пачынаючы ў соценны раз спачатку гэтую валаводзіў, яна матывавала сваю шчырасьць гэтак:

— Здароўе—самае добрае з усяго, што ёсьць на сьвеце. Трэба заўсёды пра яго клапаціцца. Калі, напрыклад, чалавеку адарве руку або нагу знарадам, дык ён вернецца дадому з крыжам, або з мэдалем, і жонка будзе ганарыцца гэтакім героем. А калі чалавек вернецца дадому з прычыны хваробы, дык з яго пачнуць сьмяяцца ўсе, а жонка яго кіне.

У адказ ёй грануў агульны рогат. Яна таксама засьмяялася, а пасьля гаварыла далей:

— Каб зьменшыць ваенныя бядоты, кожны павінен рабіць усё, на што мае сілы. Калі мужчыны ваююць, дык жанчыны павінны быць, прынамсі, салідарныя паміж сабою... Ну, далей. Раскажы, як была справа, галубок?

У яе спосабах аглядаць хворых і ўстанаўляць падрабязнасьці кожнага выпадку было гэтулькі навіны, што ніхто ня мог стрымацца. Людзі, у якіх каросты яшчэ ня было, прыходзілі да яе і скардзіліся, што ў іх таксама сьвярбяць ляжкі. Аўгіньня Васільлеўна дзівілася:

— Бачыш, якая гэта дзіўная хвароба. Пухіркоў няма, скура не разьедзена, а ўсё-такі сьвярбіць. Ну, а як у цябе тут? Нічога? Усё ў парадку? Ну, ідзі.

Гэтыя агляды былі для ваеннапалонных гэткаю добраю разрыўкаю, што некаторыя з іх не задавальняліся адным разам, а заварочваліся ля дзьвярэй назад і спускалі нагавіцы, каб яшчэ раз даць аглядзець. Але тут Аўгіньня Васільлеўна выяўляла дзіўную памяць. Ня ўзьнімаючы вачэй, і ня гледзячы палоннаму

ў твар, яна толькі кідала вокам на тыя месцы, якія ў яго сьвярбелі, а таксама і на цэнтральнае месца і казала:

— Ты ў мяне ўжо быў. Ня дурыся, я ўсё памятаю!

— Чаму ты прыходзіш трэці раз?—запытала яна Швэйка, які палічыў парэбным узяць яе памяць пад досьлед.—Сьмяешся з мяне, ці што? Доктар, паклічце старшага ўнтэр-афіцэра!

— Так што, дазвольце далажыць,—адказаў Швэйк,—я павінен быў зьявіцца. Я адчуваю, як кажуць, бязьлітаснае імкненьне, бо яно гэтак прыемна казлычыцца і...

— Добра, добра!—кінула Аўгіньня Васільлеўна і загадала расійскаму унтэр-афіцэру, што ўвайшоў у канцылярыю:—Насып у ранец роўна два пуды пяску і дай вось гэтаму чалавеку прастаяць з ім кожны дзень па дзьве гадзіны. А ты,—зьвярнулася яна з сьмехам да Швэйка,—прыходзь да мяне праз тыдзень пасьля таго, як скончыш адбываць кару і раскажаш, як цябе пры гэтым прыемна казытала.

Значыцца, Швэйк стаяў пасьля абеду на выцяжку перад вокнамі канцылярыі; у ранцы ў яго было насыпана добрых трыццаць два кілё пяску. Навокал яго стаялі натоўпам, выскаляючы зубы, таварышы, а Аўгіньня Васільлеўна, падкучараўленая і напарфумленая, выглядала з акна, вельмі здаволеная сабою, сваёю справядлівасьцю і сваім умельствам трымаць у руках цэлую дружыну. Але Швэйк стаяў як каменны статуй, і гэта ёй хутка надакучыла. Яна загадала асядлаць каня і заявіла, што паедзе ў Будслаў да старшага доктара парадзіцца і па мэдыкамэнты.

Ужо седзячы ў сядле, яна яшчэ ўсё аддавала загады ўнтэр-афіцэру, які з пашанаю слухаў яе. Ён выправадзіў яе за вёску і, убачыўшы, што яна сапраўды паехала ў кірунку да будслаўскай царквы, што бялела на сонцы, проста накіраваўся да пакаранага аўстрыяка.

— Ну, браце, кідай пясок,—сказаў ён да Швэйка.—Я чалавек праваслаўны і ня буду мучыць палонных з-за гэткае сьцервы. Яна, сьвіньня тупарылая, заўтра ўжо і ня ўспомніць пра гэта. А калі і ўспомніць, дык я накладу табе ў ранец сена, каб у цябе плечы не балелі. Ідзі чай піць, брацішка.

У ТЫЛУ РАСІЙСКАЕ АРМІІ

Палкоўнік Галавацёнка вярнуўся з Віцебску з добрымі весткамі. Ён атрымаў загад перавесьці рабочую дружыну ў вёску Вітунішкі, дзе другая партыя інжынэраў была занятая папраўкаю шашы і дарог. Пад загад гэтай партыі ён і павінен быў перадаць дружыну, каб яна магла ўзяцца там за работу.

Аднак палкоўнік не сьпяшаў адразу выконваць загад. Яго дама паведаміла яго, што ўся дружына хворая на каросту і што доктар, якога яна прасіла прыехаць з Будслава, дакляраваў прыслаць мазь і вылячыць хворых. Аўгіньня Васільлеўна адзначыла, што без належнага лячэньня кароста гэтак-бы пашыралася, што людзей давялося-б накіраваць у шпіталь, адтуль іх больш-бы ўжо не вярнулі ў дружыну, і палкоўнік, такім чынам, страціў-бы крыніцу сваіх прыбыткаў. Таму яна прапанавала даць дружыне яшчэ крыху адпачыць, а сама ўзяла на сябе нагляд, каб пацыенты няўхільна і як мае быць націраліся чорнаю, сьмярдзючаю мазьзю, якую нарэшце прыслалі з Будславу.

Тымчасам палкоўнік адзін паехаў у Вітунішкі, каб дагаварыцца з інжынэрамі пра заработную плату. Ён вярнуўся ў ружовым настроі, бо там плацілі па паўрубля за дзень на чалавека, і з радасьці адважыўся адразу пабудзіць сваю даму.

— Жэня, паслухай! Там плацяць паўрубель! Я буду пасылаць кожны дзень дзьвесьце чалавек на работу, а гэта значыцца, што ў нашу кішэню кожны дзень будзе класьціся сто рублёў. Эх, добра мы з табою пажывём! Дай божа, каб вайна яшчэ цягнулася дзесяць год!

Нарэшце, аднойчы, з Астраўкоў пацягнуўся цэлы караван. Наперадзе ехаў конна палкоўнік з дзьвёхвёрсткай у руках, з шашкаю на баку і з рэвальвэрам за поясам. Поруч з ім, таксама конна і таксама з дзьвёхвёрсткаю і рэвальвэрам падскаквала на кані ў чаркесцы Аўгіньня Васільлеўна. За імі тарахцелі некалькі фурманак, што былі нагружаны чамаданамі і пакункамі, і ішоў узвод расійскіх салдат, за якімі, як працэсія старцоў, цягнуліся па чатыры чалавекі ў рад ваеннапалонныя, абарваныя, босыя, аброслыя валасамі, няголеныя і нямытыя. У кожнага за плячыма

тырчэў ранец з усялякаю драбязою; у руках у ва ўсіх былі калы з платоў, ці выразаныя з ядлоўцу кіі.

«Вяршкі» ваеннапалонных ішлі па самым задзе колёны: гэта былі абодва «дактары», Пісклявы, Гаршына і Швэйк. Марэк расказваў, што ён прачытаў у газэце «Чэхо-славяне», якую яму прыслалі з Кіеву, пра перамогі генэрала Брусілава на фронце, і паведаміў, што рускія зноў глыбока падаліся ў Галіцыю.

— Ну, цяпер, вядома, канец!—стала абазваўся Ванэк.—Зімою больш ваяваць ужо ня будуць. Гэтага-ж ня вытрымае ніводная дзяржава. Нават калі Нямеччына і вытрымае, Аўстрыя няйначай здасьцы!

— Добра было-б, каб мы маглі дапамагчы расійцам,—сказаў Марэк.—«Чэхо-славяне» вельмі-ж агітуюць за ўступленьне ў чэскі легіён.

Ён выцягнуў з кішэні газэту і прачытаў голасна артыкул пра тое, якою папулярнасьцю карыстаюцца ў Кіеве чэскія легіянэры, якія прыгожыя яны ў сваёй новенькай форме, якім посьпехам яны карыстаюцца ў паненак і як ахвотна гэтыя паненкі ходзяць з імі гуляць у парк. Гэта быў гэтакі спакусьлівы артыкул, якія звычайна былі прамовы вярбоўшчыкаў у армію ў тыя часы, калі маладых людзей прываблівалі ў армію віном і грашыма, і лёгкаю перамогаю над жанчынамі.

— Я так думаю,—уставіў сваё слова Швэйк, калі Марэк скончыў—што нам варта было-б туды падацца. Бо крыху вайсковае славы—гэта рэч добрая! І вельмі нават вядома, што яны сябе расхвальваюць, калі форма прыгожая.

— Тут справа ідзе не пра форму,—сумна заявіў Марэк,—а пра чэскую армію. І мы павінны з свайго боку што-небудзь зрабіць, каб гэтая вайна была апошняя. Да-душы, я ахвотна падаўся-б у чэскі легіён. Тут-жа можна падохнуць з нуды. З дня на дзень усё адно: нуда, пустэча. Зусім ясна, што віны ў вайне цэнтральныя дзяржавы. Дык чаму-ж ня ўзяць удзелу ў змаганьні, у якім яны павінны быць разьбітыя, каб гэтая вайна была апошняя?

— У «Флека»,—абазваўся Швэйк,—я спатыкаў аднаго суб'екта, які заўсёды разыгрываў у лётарэю скрынку нейкіх ласункаў. Ён прадаў ужо, напрыклад, дзевяноста білетаў, але ўсё

хадзіў ад століка да століка і прадаваў «апошні» білет. «Пакуль яго не прадам,—казаў ён,—не магу разыграць латарэю». І адразу-ж выцягаў яшчэ білет, і гэты быў у яго зноў «апошні», і гэтак без канца. Гэта было да вайны, калі людзі былі куды больш паважныя. Усё-такі, выходзіць, і тады было шмат жулікаў на сьвеце.

— Не, як хочаце, а ў стары час было лепш,—стала заўважыў Гаршына.—У тыя часы льга было яшчэ верыць людзям. А цяпер унь у газэтах пішуць, якая ў нас дарагоўля на ўсё: піва каштуе ўжо шэсьцьдзесят хэльлераў, мяса не дастаць, а падноскі пачалі рабіць з дрэва. От, мусіць, стукаюць яны ў часе танцаў!

— Мой бацька таксама заўсёды хваліў стары час,—пацьвердзіў Швэйк.—Ну, а мой дзед, калі пачынаў, бывала, успамінаць бывальшчыну, дык ледзь ня плакаў. Ён часта расказваў мне, што тады было за жыцьцё. Ня жыцьцё, а маліна! Вось ён, напрыклад, служыў у гаспадара і паехалі яны раз на коні ў Прагу, і мой дзед купіў сабе там на адзін крэйцар, гэта значыцца, на два хэльлеры, булку і кілбасу на сьняданьне. Калі яны выехалі за заставу, дзед мой разламаў булку і глядзіць, што ў ёй запечана. Выявілася—кажушок, і як дзед быў рад! Справа-ж была ўжо ў кастрычніку, і падыходзілі халады. Ды што гаварыць! У тыя часы булкі былі куды большыя ад цяперашніх... Або зноў-жа, мая бабуня купіла мужу фуфайку, добрую фуфайку, за дзьве кроны сорак хэльлераў на нашы грошы. Яна была дзеду повяліка, а калі яе вымылі, яна яшчэ выцягнулася, так што прышлося адрэзаць кавалак і з яго вышла цэлая спадніца. Калі памылі фуфайку яшчэ раз, прышлося адрэзаць яшчэ кавалак, і з яго баба пашыла дзьве коўдры, ды майму бацьку асталося яшчэ на гарнітурчык, хоць дзеду фуфайка была ўсё яшчэ даволі вялікая... Так, так, даўней было лепш. Тавар тады выраблаўся куды лепшы...

Марэк замахаў на яго рукою.

— Ты вярзеш ліха цябе ведае што! А я,—гукнуў ён, і роспач пачуўся ў яго голасе,—я яшчэ крышку пагляджу, куды ўсё пойдзе, а тады падамся ў легіён. Бо ад нашага жыцьця толькі трэба хіба павесіцца: чай, каша, хлеб; хлеб, каша, чай...

— Унь у газэтах пішуць, што легіянеры атрымліваюць на абед гуляш,—з зайздрасьцю сказаў Піскляны,—а кожную нядзелю смажаную гусь з капустаю і яблыкамі і добры мясны крупнік з рысам. Калі не давядзецца мне адказваць сваёю галавою, дык я туды падамся.

— Мне таксама вельмі абрыдзела гэтая гульня ў доктара,—горача сказаў Ванэк,—Але вы чулі, што ў Аўстрыі канфіскуюць маемасьць легіянераў. Езус-Марыя, гэта можа быць! У мяне-ж у Кралупах гандаль аптакарскімі таварамі.

— Ты мог-бы астацца ў Расіі,—парадзіў яму Марэк,—і выпісаць сюды жонку. Тут твая справа таксама пашла-б!

Але Ванэк з жахам глянуў на яго.

— Як? Перабрацца на край сьвету? Гэта ніяк ня можна! У мяне мэбля палітураваная, а пры перавозцы яе ўсю-б падрапалі. А ўмывальнік белы, з мрамарнаю дошкаю. А што калі зломяць дошку?

Заместа адказу, Швэйк адно плюнуў і, гледзячы сабе па ногі, сказаў:

— Унь да нас сам палкоўнік едзе. Можа ён нам скажа штонебудзь добрае?

Так яно і здарылася. Палкоўнік сказаў ім, каб яны паддалі ходу, бо да таго месца, дзе будуць начаваць, яшчэ дваццаць вёрст, так што прыйсьці туды можна не раней вечару. З гэтае прычыны не пасьпеюць прыгатаваць абеду, і абеду ў гэты дзень ня будзе. Таксама ня будзе і хлеба, бо ў інтэндантстве хлеба ня выдалі. Але затое, калі палонныя прыдуць на месца, ім будзе выдана трайная порцыя ўсяго, што ім належыць.

Гэтая прамова была спаткана жудаснаю маўчанкаю. Колёна ня ішла, а ледзьве-ледзьве цягнулася наперад, і палкоўнік паехаў поруч з ёю, стараючыся падбадзёрыць людзей:

— Расія—цудоўная краіна! Вось ужо два гады, як нашы адважныя ваякі ваююць за яе. Мы пераможам немцаў, а вашага Франца мы прывядзем на вяроўцы перад ясныя вочы нашага бацюшкі-цара. У гэтым будзе частка і вашых заслуг. Вось, бачыце, гэта—справа рук вашых братоў, ваеннапалонных!

І ён паказаў рукою направа, дзе ішла пад гору вуліца.

Там было выкапана восем радоў акопаў; на дзевяты палонныя раскопвалі зямлю, а ў дзесятым насыпалі бруствэр, у той час як іншыя нацягвалі паміж каламі калючы дрот. Людзі, што працавалі, калі заўважылі колёну, якая прайходзіла паўз іх, кінулі рыдлёўкі і дрот і пабеглі, кідаючы нагамі нібы павукі, ёй на спатканьне.

Калі дружына палкоўніка Галавацэнкі падобна была да натоўпу басякоў, дык тым небаракам, што цяпер да яе набліжаліся, наогул няма назвы на чалавечай мове. Хутчэй малпы—чым чалавека-падобныя істоты зьмяшаліся з людзьмі 208-й дружыны, распытваючы, адкуль тыя прышлі, і выпрошваючы ў іх скарынку хлеба, або на раз закурыць тутуню. Яны выглядалі гэтакімі няшчаснымі і абшарпанымі, гэтакімі змучанымі і хворымі, што шмат хто з дружыны, падумаўшы сабе, што можна абыйсьціся адзін дзень і бяз хлеба, цягнуў ціхенька акрайчык з ранца і аддаваў яе галоднаму земляку. Той прагна накідаўся на хлеб і гаварыў:

— Ведаеш, у нас тут гэтакі голад, што мы нават асьлеплі. Гэта ўжо больш ня чысьцец, а сапраўднае пекла! У сібіру, у лягэры, напроці гэтага быў рай зямны! .

— А вам плацяць?—запытаў Пісклявы.

— Яшчэ што скажы! Ты-ж ведаеш, як нам плацяць!—засьмяяўся палонны.—От глядзі!

Ён зьняў шапку і паказаў гузы на галаве.

— Мы працуем зьдзельна. Адзін пагонны сажань трэба выкапаць да абеду і адзін да вечара. А калі ня справішся, дык цябе вось як аддзякуюць.

Ён правёў рукою па гузох, узлажыў на галаву шапку і, уздыхнуўшы, сказаў:

— Калі-б льга было, прынамсі, падзьмухаць сабе на галаву... Ведаеце, браткі, я малюся богу, каб нас тут захапіў немец, каб я мог помсьціцца за ўсё... Я—добры чэх і «сакол», але каб мне яшчэ раз давялося ісьці на фронт, я перастраляў-бы гэтых «братоў-славян» з гарматы або з кулямёту... Пабіць-бы іх усіх, гадаў, разам з іхнім паршыўцам царом!—з жорсткасьцю скончыў ён.

Але тут стары славянін, палкоўнік Галаваценка, прыўзьняўшыся на стрымёнах, зноў пачаў гаварыць:

— Браты-славяне, паглядзеце, як вашы браты будуюць умацаваньне супроць нямецкага находу! Аб гэтае ўмацаваньне зломіць сабе зубы Гіндэнбург! А Вільгешку мы загонім у сібірскую тайгу!... Браты, усе—за Расію, усе—за бацькаўшчыну!

— Бач, як ён разьліваецца,—скрыпнуў зубамі палонны.—Мусіць, таксама здарава крадзе! Чым больш нам тут плятуць пра славянскае братэрства і заміласьваньне, тым больш нас абкрадваюць! Наш начальнік дружыны цюцелька ў цюцельку гэтакі-ж! Кліча нас няйначай як «браты-славяне», на вялікдзень хрыстосаваўся з намі і заўсёды чытае нам газэты, якія ў цара наконт нас намеры, калі ён зойме Чэхію. Але есьці ён нам не дае, а ўсё прапускае з бабамі, як і ваш стары гэты падла. Ён зьняў з нас і прадаў боты; ён прадае нават выданую нам цыбулю. Я, таварыш, з Прагі, з Вышаграду, але гэтакае сволачы, як тут, я не спатыкаў нават у Аўстрыі.

— Ну, калі ты з Вышаграду, хлопец,—заявіў Швэйк,—дык вось табе яшчэ акраец хлеба. Мы з табою, значыцца, землякі. Я жыву на вуліцы «На Боішчы». Ты, мусіць, з 28-га палка?

— Але, я з тэтага паскуднага палка, які сам здаўся рускім у Карпатах. А яны перавялі нас у лягер у Краснаярск і назначылі да нас камэнданта з немцаў, які паказаў нам, дзе ракі зімуюць. Браткі,— гукнуў ён, заламаўшы рукі,—няўжо-ж гэта праўда, што існуе чэскі легіён, які змагаецца за тое, каб расійскі цар увайшоў у Градшын? Вы нічога пра гэта ня чулі? Езус-Марыя, што-б ён з намі зрабіў! Ён-жа пачаў-бы з нашых сьпін рамяні вырэзваць.

Марэк выцягнуў з-за пазухі нумар «Чэха-славян», але ў вачох палоннага адлюстравалася гэтулькі шчырага жаху, а таксама і роспачы, што Марэку стала нядобра. Ён схаваў газэту і нехаця адказаў:

— Кажуць. Але хто ведае, наколькі гэта праўда і хто гэтым усім арудуе?.. А пасьля, расійскі ўрад, можа, нават і не падазрае, як тут з намі абыходзяцца.

— Што-ж, вельмі можа быць, што тут ёсьць нейкае непаразуменьне,—умяшаўся ў гаворку Швэйк.—Расійскі ўрад паслаў

нас на работу, каб нам было лепш, а гэтыя панове зразумелі гэтак, каб нам было горш.

— Будзе, хлопцы, нагаварыліся!—гукнуў у гэты момант палкоўнік Галавацэнка.—Марш далей! Наперад, марш!

А Аўгіньня Васільлеўна, заўважыўшы, што вочы ўсіх накіраваны на яе, праехала ўздоўж паўз колёну, ветліва запрашаючы:

— Ну, хлопчыкі, падымайцеся! Хутка прыдзем у вёску і нап'емся чаю!

Палонныя пашлі далей, спрачаючыся пра Расію і палітыку. І адно Марэк думаў сваю думу і ўпарта маўчаў.

*

Праца, што чакала палонных у Вітунішках, як сваёю мэтаю, таксама і сваёю практычнаю організацыяй, мала чым адрозьнівалася ад тэй, якою яны займаліся на пабудове чыгункі. Яны павінны былі папраўляць дарогі, што ішлі берагам ракі праз лясы і бяздонныя нетры балот.

У вёску яны прышлі ўночы. Палкоўнік прывёў іх да памяшканьня, што стаяла наводшыбе і сам адчыніў дзьверы вялікага хлява; праз дзіравую страху туды заглядвалі месяц і зоры.

— От добрае памяшканьне!—пахваліў палкоўнік.—Тут вам велымі добра будзе спаць. Паветра чыстае і сьвежае, і горача вам тут таксама ня будзе.

— Гад, мы тут усе памерзьнем,—ляснуў у яго за плячыма зубамі Піскліўы, бо ноч была сапраўды халодная. А Швэйк, з выглядам знаўцы паглядваючы праз шчыліны ў страсе на ўкрытае зорамі неба, сказаў:

— Нічога, мы цяпла насапом.

Змучаныя ўтомаю, палонныя кінуліся на раскіданую па хляве гарохавую салому і адразу заснулі. Пад раніцу яны прачнуліся з холаду і пачалі бегаць навыперадкі з расійскімі салдатамі, якія таксама праклінаі палкоўніка, мацюгаліся і абложвалі яго самымі страшнымі словамі.

Хтосьці прапанаваў раскласьці агонь; адразу за дваром быў лес, дзе лому было колькі хочаш. У адну хвіліну туды зьбегала

чалавек дваццаць і нацягнулі дроў, сукоў і нават цэлых невялікіх дрэў. Усё гэта склалі за хлявом, і агонь запалаў. Палонныя разьмясьціліся навокал яго і пачалі гаварыць пра свае справы і лаяць Расію. Раптам у гутарку ўмяшаўся голас, якога раней ніхто ня чуў:

— Але, браткі, мне давялося пабыць ва ўсім сьвеце, але гэтакіх парадкаў, як тут, я нідзе ня бачыў. Гэтая Расія—сапраўдны вар'яцкі дом. Праклятая банда! Чаго толькі не давялося мне выцерпець у акопах!

— Правільна, таварыш,—падхапіў Швэйк.—Але толькі скажы мне, будзь ласкаў, адкуль ты да нас папаў? Я цябе яшчэ ні разу ня бачыў у нашай дружыне.

— Ды ты і ня мог мяне бачыць, бо я працаваў у тэй, што капала акопы. Ну, але як вы мне спадабаліся, дык я і пашоў з вамі.

Заўважыўшы, што ўсе з цікавасьцю глядзяць на яго, навічок засьпяшаўся растлумачыць:

— Гэта-ж так проста! Што адзін сабака, што другі, і што палонны, што другі! Дадому мне ня было па што хадзіць, бо мы заўсёды бралі ўсё з сабою, усёадно няйначай хто-небудзь украў-бы апошняе. Ах, як мы там галадалі, браткі! Бывала, нам цэлы тыдзень не выдавалі хлеба, а цукру і званьня ня было,—забылі нават, як ён выглядае! Вось я і падумаў: а ці не паспрабаваць у гэтай дружыне, можа, тут будзе лепш? А калі не спадабаецца, я яшчэ куды-небудзь пайду. Я ўжо з самай зімы так гуляю, але добрага нічога не знайшоў.

— А ну, ўстань, браце,—сказаў яму Гаршына,—каб мы бачылі, які ты ёсьць. Паводле гаворкі твае, ты як-бы хлопец спрытны.

Незнаёмец падняўся з месца і стаў гэтак, каб яго асьвятліла полымя ад вогнішча. Гэта быў абарванец, які з выгляду цявызычайна абкапцанеў, але ня ў трантах, бо гарнітур яго складаўся з тысячы лат. Маленькія, вялікія, усялякіх колераў і ўсялякага матэрыялаў, яны ляпіліся адна на адну, як бранявыя пліты на лінейным караблі. Больш-жа—дык ні ў яго твары, ні ў постаці ня было нічога адмысловага, чым-бы ён адрозьніваўся ад іншых.

Відаць ён валодаў тумарам. Ён здагадаўся, што яго латы абуджаюць цікаўнасьць тых, з якіх лахманы зьвісалі, як жалобныя сьцягі, і сказаў:

— Я таксама хадзіў раней гэтакім абарванцам, а пасьля пачаў прыстаўляць латкі. Браткі, гэтая вайна працягнецца яшчэ дзесяць год. Яна скончыцца толькі тады, калі нідзе больш ня будзе ні лыжкі бульбы, ні голкі, ні кавалачка палатна і ні абрэзку скуры. Людзі будуць хадзіць голыя, як сабакі, будуць граць на сваіх рэбрах, як на клявішох, і каму пашэнціць прыкрыць свае цела старым мяшком, той будзе ганарыста паглядаць на ўсіх іншых. І тады...

— Ведаю, гэта—прароцтва «Сьляпога хлопчыка», якому ў нас у Празе пастаўлен статуй,—перарваў яго Швэйк.

— ...тады вайна скончыцца,—ня слыняў гаворкі той, не бянтэжачыся,—тады народы зразумеюць, якія яны дурныя, іададуць перцу сваім урадам. Вось чаму я і стаўлю латы, каб не саромецца таго, што я голы.

Голас гэтага чалавека гучэў па-прароцку, і слухачы ў роспачы, замахалі рукамі.

— Езус-Марыя, яшчэ дзесяць год! Ды ты ўзвар'яцеў, ці што! Валі яго, браткі, у агонь!

Але гэтага чалавека ня гэтак лёгка было прымусіць змоўкнуць. Ён дадаў некалькі пераканаўчых довадаў, што вайна будзе цягнуцца да поўнага ўпадку Эўропы. Нарэшце яму пачалі верыць, і, калі ён заўважыў, што да яго ўсё больш і больш прыслухоўваюцца, ён заявіў, што надышоў час узьняць мяцеж і вярнуцца дадому, перабіўшы ўсіх, хто-б гэтаму праціўіўся.

Ён увайшоў у настрой і пачаў тупаць нагамі і крычаць:

— От убачыце, што мае словы спраўдзяцца. Гэта праўда, як тое, што маё прозьвішча—Смачок! Я чалавек з вышэйшаю асьветаю і мог-бы быць цяпер ужо за маёра. Але я аддаўся п'янству і плюю на ўсіх «сталых» людзей. Усе яны сволачы! Я будаваў чыгункі ў Вэнгрыі, удзельнічаў у пабудове Сімпленскага тунэлю... І вось я вам кажу: перш трэба пабіць усю гэтую сволач! Няхай паможа нам у гэтым бог-айцец, бог-сын, бог-дух сьвяты!

Эфэктны канец яго прамовы выклікаў авацыі, падтрыманыя расійскімі салдатамі. Ён зноў зьвярнуўся да сваіх таварышаў:

— Спадзяюся, браткі, вы-ж будзеце маўчаць, што я перайшоў да вас? На поліўцы я вас не аб'ём, а хлеба я сабе на першы час як-небудзь прыстараюся.

Пасьля гэтага ён выцягнуў ногі да агню і да раніцы не сказаў больш ані слова.

А шостай гадзіне ў хлеў прышоў палкоўнік Галавацэнка, а з ім і Аўгіньня Васільлеўна, што хацела пазнаёміцца з інжынэрамі. Палкоўнік быў салодкі, як цукер; яго дама, ўсёадно як мёду дала, пацікавілася:

— Ну, як вы спалі, хлопчыкі? Добра. Зьмерзьлі? Ну, нічога, нічога. Неўзабаве надыйдзе лета, і тады ад гарачыні ўночы не заснуць. Чаю ўжо напіліся, га? Гэта добра! А цяпер пара за работу брацца. Інжынэры чакаюць вас у сем гадзін. Станавецеся адно ў шэрагі, хлопчыкі.

Грозная маўчанка, якою было спаткана ў часе паходу начальніцкае паведамленьне, што палонным ня будзе выдана ў дарозе ні хлеба, ні абеду, набыла цяпер больш выразную форму. Палонныя пачалі шушукацца, а Смачок гукнуў:

— Давайце, выберам пяць чалавек, якія будуць гаварыць ад імя ўсёй дружыны. Але толькі ўся дружына, як адзін чалавек, павінна іх падтрымліваць.

— Гэй, хлопцы, цяпер ня час бібікі біць,—пачаў падганяць іх палкоўнік.—Дзьвесьце чалавек павінны накіравацца на работу! Начальства гэтак загадала. Я тут ні прычым. І нашы-ж працуюць у вас, і ім яшчэ горш, як вам. Іх там запрагаюць у плугі, а вы тут адно рыдлёўкамі калупаецеся. А вы,—зьвярнуўся ён да канваіраў,—выстрайце іх, сучыных дзяцей, у шэрагі, каб я іх мог падлічыць. Гэй, браты-славяне, на работу! Гэтак загадвае закон!

— Праваліся ты з сваім законам!—гукнула ў адзін голас амаль уся дружына, і да палкоўніка вышлі пяць дэлегатаў, якія заявілі:

— На работу мы ня пойдзем да таго часу, пакуль нам не дадуць хлеба і абеду. А таксама і за тыя дні, што мы былі ў

дарозе. Інтэндантства выплачвае вам грошы за ўвесь час, так што мы павінны іх атрымаць. Вось што напісана ў законе!

— Значыцца, вы—бунтаваць?—гукнуў палкоўнік, пабялеўшы.—Адмаўленьне падначальвацца, мяцеж? Расстраляю кожнага пятага! Сам пушчу яму кулю ў лоб!

Ён з прывычкі хапіўся за кабуру, але яна была пустая. Тады ён крыкнуў да канвойных:

— Патроны ў вас ёсьць? Закладвай у стрэльбы. Гэй, аўстрыякі, сучыны дзеці, зараз страляць будзем!

Канвойныя нарыхтавалі стрэльбы і тупа ўтаропіліся на ўзводнага. Той пацiснуў плячыма і шапнуў палкоўніку:

— Ваша высокаблагародзьдзе, вам самім страляць ня можна. Вы павінны спачатку прасіць па начальству, каб сюды прыслалі камісію дасьледаваць справу. А, апроч таго, у нас усяго па два патроны на чалавека. Калі мы іх выстраляем, нас заб'юць як сабак.

— Набівай!—скамандваў палкоўнік і стаў глядзець, як няспрытна засоўвалі салдаты патроны ў стрэльбы. Пасьля ён зьвярнуўся да дружыны:

— Хто аднадумец з гэтымі людзьмі, з гэтымі пацерма? Хто ня хоча ісьці на працу? Выходзь наперад! Будзеце расстраляны разам з імі!

Шэрагі захісталіся. Кожны паглядваў на іншага. Раптам пачуўся швэйкаў голас:

— Таварышы, няхай нас расстраляюць, каб мы памерлі як салдаты!—І Швэйк цьвёрда выступіў наперад і заявіў:—Так што, дазвольце далажыць, я хачу загінуць ад кулі, а ня здохнуць як старая баба.

— Браткі,—крыкнуў сваім высокім голасам кравец,—ня здрадзім-жа мы сваім таварышам. Выходзьце ўсе!

Шэрагі як-бы разарваліся, калі то тут, то там выступіла некалькі груп. І тады загрымеў Смочакаў бас:

— Чаго вы баіцеся, ліха на вас? Няхай нас расстраляюць! Няўжо вы думаеце, што гэта будзе горш, чым здохнуць з го-

ладу! Хіба вы ня ведаеце, што гэты стары абармот нас абкрадвае? Салдаты вы, ліха на вас, ці не? Кожная шлюха сьмялей за вас!

Гэта памагло. Уся дружына выступіла наперад.

Да палкоўніка кінулася перапалоханая Аўгіньня Васільлеўна.

— Дарагі мой, любы,—зашаптала яна,—не расстрэльвай іх. Каго-ж ты тады будзеш слаць на работу! Сам-жа ты не зарабляеш гэтулькі грошай, колькі нам трэба! Дакляруй ім хлеба, мяса, нават тутуню ты ім можаш паабяцаць. Яны добрыя, яны пойдуць на работу. А ты памятаеш, што абяцаў мне сто рублёў у дзень?

Здавалася, што яна вось-вось упадзе перад ім на калені. З вачэй яе цяклі сьлёзы і Смочак крыкнуў:

— Ды вы адно паглядзеце на яго, на гэтага гада! Ён нават наш заработак хоча скруціць! Але мы да таго часу ня пойдзем на работу, пакуль інжынэры не гарантуюць нам, што грошы будуць выдавацца нам на рукі.

Палкоўнік, узнэрваваны, пабег у хлеў, а за ім сьледам—яго дама, уся ў сьлёзах. Нарэшце ён вярнуўся з салодкаю ўсьмешкаю на твары і сказаў:

— Нашто гэта ўсё, галубочкі? Нібы вы не франтавікі і самі ня ведаеце, што часамі нават, пры ўсім жаданьні, нельга мець усяго што трэба... Падумаеш, якое гора: ўчора ня было хлеба і сёньня яго ня будзе! Затое заўтра хлеба прывязуць, колькі захочаце, слова гонару! Так што сёньня вы адпачывайце, напецеся чаю, памыйце сабе кашулі...

Ён узяў Аўгіньню Васільлеўну пад-руку і пашоў, як-бы нічога і ня здарылася. Як толькі ён пашоў, была выбрана новая дэлегацыя, каб паведаміць інжынэраў, што заработная плата павінна выплачвацца палонным непасрэдна ім на рукі і што яны буду працаваць толькі пры ўмове, што гэта будзе ім гарантавана.

Гэта ім сапраўды абяцалі і нават пацьвердзілі словам гонару, бо па ўсёй Расіі кожны татоў быў дакляроўваць і гарантаваць другому ўсё, што толькі хочаш, хоць-бы нумараванае месца з правае рукі бога на небе.

11
А КАЛІ НАДЫШЛА ВОСЕНЬ

Старшы інжынэр ваенна-інжынэрнага кіраўніцтва, якое рамантавала дарогі за лініяй фронту, быў чалавек сумленны. Раз ён дакляраваў выдаць палонным іх заработак на рукі, ён не хацеў, каб казалі, што ён ня стрымаў слова. Дык ён згаварыўся з сваім братам, артылерыйскім капітанам, што стаяў у той момант у Менску, каб той у суботу (у гэты дзень палкоўнік Галавашенка быў запрошаны з Аўгіньняй Васільлеўнай на банкецік у штаб суседняга палка) прыехаў да яго ў аўтомобілі, і, чакаючы яго прыезду, загадаў падрыхтаваць грошы і выплатныя ведамасьці і занесьці іх, разам з невялікім столікам, у лес, каля якога працавалі палонныя.

У гэты дзень палонныя зноў зрабілі дзіўную працу. Дарога была ўжо выслана жэрдкамі і маладымі дрэўцамі, на якія насыпалі пясок. Але з тэй прычыны, што з-пад іх і з-пад калёс пырскамі разьляталася балотная вада, інжынэр загадаў выслаць усю дарогу хваёвымі лапкамі, і от паўтары сотні чалавек рэзала ў лесе гэтыя галінкі, а пяцьдзесят чалавек шчыльна раскладвалі іх па дарозе.

Старшы інжынэр рабіў выгляд, нібы ўся справа ў тым, каб ельнік быў раскладзены ў роўнай адлегласьці галінка ад галінкі. Ён усё нагінаўся і штосьці папраўляў на дарозе, у той-жа час няспынна аглядаючыся на край лесу. Нарэшце там завыў аўтомобільны гудок, і неўзабаве пад'ехала машына. Інжынэр паволі пашоў на спатканьне двум афіцэрам, што вышлі з машыны і цырамонліва з імі прывітаўся. Пасьля ён сабраў палонных і паведаміў, што прыехала вышэйшае начальства на рэвізію і што палонныя могуць заявіць яму ўсе свае скаргі і пажаданьні. Артылерыйскі капітан сказаў:

— Ваеннапалонным жывецца ў Расіі кепска, і расійскаму ўраду гэта вядома. Каб зьмяніць гэта ў лепшы бок, было створана адмысловае кіраўніцтва па справах ваеннапалонных. Гэтая ўстанова прымае ў схованьне усё, што зарабляюць ваеннапалонныя і што ім пасылаецца з дому; яно кіруе іхняю маемасьцю бескарысна і выплаціць ім усё, што ім належыць, пасьля вайны, да канца якое, цяпер ужо, будзем спадзявацца, недалёка. А з тэй

прычыны, што разрахунак з вамі робіцца па суботах, і вы працуеце ў гэтым раёне, дык я і прыехаў, каб сваімі рукамі прынясць грошы.

Пасьля гэтай прамовы ён вельмі суха і практычна прапанаваў брату распачаць выдачу. Другі афіцэр выцягнуў з кішэні два лісты, пераклаў іх капіравальнаю папераю, адвастрыў алавок і паклаў усё гэта на столік. Інжынэр, бязьлітасна крывячы прозьвішчы, пачаў выклікаць палонных па сьпісу:

— Маравэк Антанін! Шэсьць рублёў!

Афіцэр запісваў прозьвішча і ставіў насупроць яе лічбу 6. Пасьля ён гаварыў палоннаму:

— Расьпішэцеся, што грошы атрымалі.

А інжынэр выклікаў далей:

— Тума Яраслаў. Шэсьць рублёў... Швамбэрг Ёсіф. Шэсьць рублёў. Ваверка Францішак. Шэсьць рублёў...

Усе расьпісваліся, што атрымалі грошы. Пасьля афіцэр падвёў суму, інжынэр сабраў палонных навокал сябе, каб паказаць ім, што грошы сапраўды выплачваюцца, і афіцэр схаваў іх у пуім, што грошы сапраўды выплачваюцца, і афіцэр схаваў іх у пуларэс да расьпісак, копію якіх ён перадаў інжынэру. Капітан таварова разьвітаўся, інжынэр правёў яго да машыны, і там капітан прапанаваў яму:

— Ці ня трэба вам у вёску? Садзецеся, мы вас падвязём.

І раней, чым гэтая тройца даехала да вёскі, палова грошай зноў апынулася ў інжынэравай кішэні.

Калі ў панядзелак палкоўнік даведаўся, што палонным ужо заплацілі за работу, ён пабег да інжынэра.

— Каму вы заплацілі грошы?

— Кіраўніцтву па справах ваеннапалонных,— з тонарам адказаў інжынэр.

— Што гэта там яшчэ за кіраўніцтва!— прашыпеў палкоўнік. У вас ёсьць на гэта грашовыя дакуманты?

— Вось, калі ласка.

І інжынэр працягнуў яму складзеную копію расьпісак. Той праўцом паглядзеў на яго.

— А чые гэта подпісы? Што гэта за бланка? Дзе пячатка?

Інжынэр адно паціснуў плячыма. Палкоўнік ня вытрымаў і гукнуў:

— Злодзей, круцель! Абакраў маіх людзей! Які-небудзь ваш колега, гэтакі-ж самы круцель, як і вы, зграб гэтыя грошы! Добра-ж, я палонных на работу больш не пашлю! Я не дазволю абармочваць людзей на сваю карысьць! Ня пушчу іх, і няхай усе генэралы на гэтых дарогах сабе ногі паломяць! Ашуканец, ашуканец! У беднякоў, у самых сапраўдных старцоў апошняе ўкраў!

Ён кінуўся да хлява.

— Хлопцы, сёньня на работу ня пойдзеце,—узбуджана заявіў ён.—Грошай гэтых вы ня ўбачыце, прапалі вашы грошы!.. Але я да гэтага больш не дапушчу. Хутчэй вы ў мяне да канца вайны праляжыце на баку, чым я дазволю, каб у вас хоць капейку ўкралі.

Прайшоў дзень, прайшоў другі. Інжынэр так і ня прыходзіў па іх, палкоўнік усё яшчэ быў узвар'яваны, а палонным пачало надакучаць гультайства і яны пачалі цягацца па вёсках навокал Вітунішак.

У гэтых мясцох палонныя ня былі яшчэ звычайнаю справаю, і таму іх усюды спатыкалі ахвотна. Насельнікі, сярод якіх было ня мала палякоў, пыталіся ў іх ці не каталікі яны, і тады выявілася, што агульнасьць веравызнаньня можа дапамагчы латвей даступіцца да жаночага сэрца.

— Вось-бы дзе Худзечку была лафа!—заўважыў нейк раз Пісклявы, вярнуўшыся ў вёску.—Тут ён знайшоў-бы выпадак наладжваць рэлігійныя гутаркі. Разумееце, толькі таму што я каталік, я «маліўся» сёньня з войтаваю дачкою. І за ўсю гэтую «духоўную ўцеху» я даў ёй кавалачак мыла.

— А ў якой ты вёсцы быў?—запытала адразу дзесяткі два галасоў.

Піскляві няпэўна махнуў рукою ў кірунку да лесу:

— Унь там, у Глінішках. Там шмат салдатак—народ усё бойкі, пракіткі.

Вынаходзтва Глінішак з гэтакімі асаблівасьцямі іх насельнiц мела за свой вынік тое, што ў бліжэйшую нядзелю ўсе мылі свае кашулі бяз мыла. Толькі ў «дактароў» асталося яшчэ два кавалкі мыла, што былі выданы як паёк. На іх з зайздрасьцю пазіралі ўсе палонныя.

— Бач, у іх ящчэ цэлы кавалак, а я сваё ўжо змыліў,—казалі тыя, у каго ўжо ня было мыла.

— Або, праўдзівей сказаць, спусьціў,—папраўляў іх Швэйк.

З тэй прычыны, што дружына не працавала, палкоўнік, каб людзі не патаўсьцелі, пашырыў постныя дні, калі на абед давалася толькі сьмярдзючыя тараны, з серады і пятніцы, на ўвесь тыдзень і пачаў карміць палонных адnымі гэтымі таранамі. Гэта выносіла таньней, і, апроч таго, ён лічыў гэтакую яду вельмі карыснай.

Але з палонных ніхто не хацеў яе есьці. Спачатку яны гэтымі таранамі кідалі адзін у аднаго, а пасьля пачалі разьвешваць іх на хвоях. А аднойчы Смачок пацiху пазьбіраў усю рыбу і кудысьці прапаў з ёю.

— Куды ён яе панёс?—запытаў Гаршына, бачачы, як пільна той аглядваўся па бакох.

— Прадаваць мужыком, мусіць,—адазваўся Пісклявы.

Сам Смачок на ўсе запытаньні ўпарта маўчаў, і некалькі дзён нікому і не ўдалося дазнацца, што ён робіць з таранамі. Але калі нейк зноў зайшла гаворка пра гэта, Швэйк, паміж іншага, заўважыў:

— Маладзец, Смачок! Цягне рыбу на той бераг рэчкі. Там у яго завялася нейкая кабецінка, якая дае яму за гэта «духоўную ўцеху».

На другі дзень упяршыню за ўвесь час ня лаялі сушаную рыбу. Смачок дарэмна шукаў таго месца, дзе дагэтуль кідалі рыбу, і дарэмна глядзеў людзям у рукі, ці не дадуць яму яе. Кожны загарнуў сваю рыбіну ў анучу з боту і схаваў у мяшок, узрадаваўшыся пра сябе:

— У нядзелю я наладжу сабе за яе «духоўную ўцеху».

Тараны зрабіліся новым сродкам выплаты. За адну рыбку людзі мылі адзін аднаму кашулі, за дзьве—аддавалі сваю порцыю тутуню, чаю, ці цукру. І мяшкі ператварыліся ў сэйфы, дзе захоўваліся гэтыя капіталы.

Праз два тыдні палонныя ўбачылі палкоўніка і інжынэра, якія сьпярша заўзята пра штосьці спрачаліся, а пасьля пададіся ў мірную, відаць, гутарку. А ў панядзелак, як тараны былі адда-

ны ў дар Ванэры і ад усёй працадуры асталіся толькі прыемныя ўспаміны і салодкая млосьць па ўсім целе, прышоў палкоўнік і сказаў:

— Ну, хлопцы, апранайцеся на работу. Інжынэр нарэшце дакляраваў плаціць за работу грошы на рукі. Я яго такі ўгаварыў.

На гэта Смачок, з сумам паглядаючы на пусты мяшок, у задуменьні сказаў:

— Абодва хлопцы згаварыліся разам абкрадаць нас. Эх, халера на іх!

Цяпер пачалі правіць дарогі ў другі бок, у кірунку да Гарадка. Гэта ў значнай меры ўзьняло сапсаваны настрой. І было яшчэ весялей, калі даведаліся, што пясок будуць вазіць гарадоцкія жанкі.

Дружына падзялілася. Палова накідала пясок на вазы, другая ссыпала яго і роўнамерна рассыпала па тракце. А бабы паганялі коняй, і дзеўкі вішчалі ад вясёлага абыходжаньня з імі палонных. Па дарозе праходжваўся ўзад і ўперад інжынэр і падбадзёрваў работнікаў:

— Што-ж, работа ідзе. Але толькі трэба шпарчэй, хлопцы. Хутка мір будзе.

Ён падганяў іх, хваліў і частаваў папяросамі. Нарэшце ён запрапанаваў:

— От што, хлопцы! Давайце гэтак: скончым кавалак унь да таго вялікага дрэва, а пасьля па хатах. Згодны? Давайце працаваць зьдзельна. Нашто, сапраўды, калупацца, цэлы дзень! Зробім сваё і пойдзем спаць. Ну як? Добра?

Каб працаваць нормальна, работы хапіла-б на два дні. Але пэрспэктыва пайсьці пасьля з таранамі, якія выдадуць на абед, з дзеўкамі і жанкамі ў лес, ці ў вёску, дзейнічала на людзей, як нагайка. Яны згадзіліся на прапанову інжынэра і вазы пачалі трашчаць пад цяжарам грузу, жанкі бажыліся, што коні падарвуцца, атрад па дарозе рассыпаў пясок гэтак, што небу рабілася горача. Інжынэр весела сьмяяўся. Яшчэ да таго як пад'ехалі кухні, праца была скончана. Садзючыся на каня, інжынэр сказаў:

— А заўтра мы возьмем унь той кавалак пад горкаю. Добра. Многа? Нічога! Лепш пастарацца, а пасьля як мае быць адплачыць!

Палонныя згадзіліся. Ён быў вельмі задаволены. Гэтае работы хапіла-б на чатыры дні, а цяпер ён быў упэўнены, што на яе пойдзе нават менш як адзін дзень.

Тракт быў вельмі людны. Раз-по-разу праяжджалі аўтомобілі з вышэйшымі вайсковымі чынамі; афіцэры часта загадвалі спыніць машыну каля палонных і распытвалі іх пра іх жыцьцё. Уважліва слухаючы, яны пакручвалі вусы і казалі:

— Дрэнна жывецца? А нашым салдатам у вас яшчэ горш. Нашых людзей вы запрагаеце ў плугі і араце на іх. Так, так, добрых спраў нарабіла вайна, але нічога не папішаш! Вайна ёсьць вайна, і даводзіцца цярпець.

І яны рабілі знак шофэру ехаць далей.

Каб запыталі яны ўдалага ваяку Швэйка, што ён думае наконт іхніх запытаньняў, ён ім адказаў-бы:

— Вы ўсе—якраз як тыя судзьдзі, што прыгаварылі цыгана Ружычку на шыбеніцу за тое, што ён засек аднаго яўрэя сякерою. Асуджанага пасадзілі ў адзіночку і прыставілі да яго нарадача, каб той туляў з ім у карты і наогул усяляк забаўляў яго, каб таму ня было нудна. Кожны дзень да яго прысылалі доктара, які яго пытаўся: «У вас галава не баліць?» або «Як вы сябе адчуваеце? Здаровы?» і тры разы ў дзень мераў яму тэмпэратуру і лічыў пульс. Яму паставілі плёмбы на зубох, зрэзалі мазалі на нагах, рабілі яму маніккюр, купілі яму вежэталю на валасы і крэм ад рабаценьня, а нарэшце сказалі яму: «Сёньня можаце заказаць сабе на абед усё, чаго ваша душа хоча. Пашкодзіць вам нічога ня можа, бо кат ужо тут, і заўтра зранку ён вас павесіць». З гэтакімі ўцехамі ён і пашоў на шыбеніцу.

Але Швэйка ня пыталі пра яго думкі, дык ён іх і ня выказваў.

Жыцьцё аднастайна цякло з дня ў дзень, хіба што весялела абменам на тараны, або асьвяжалася гвалтам, які няйначай адбываўся, калі якая-небудзь жанчына прымала рыбу адразу ад двух «кавалераў», ці ўзрушвалася весткаю, што «дактары» зноў каго-небудзь накіроўвалі з венэрычнаю хваробаю ў лазарэт.

Затое дачыненьні паміж вясковымі жанкамі і палоннымі зрабіліся за той месяц, калі аўстрыякі працавалі ў гэтых мясцох, гэтакія сардэчныя, што, абы толькі хто-небудзь з палонных увайходзіў у хату, дзе гаспадыня, або дачка была адна дома, раней за ўсё задавалася пытаньне:

— А што ты прынёс? Мыла ці тараноў? Пакажы адно, дзе ў цябе мыла, дзе ў цябе тараны?

Дарога была нарэшце папраўлена, сярод балот красаваліся новыя драўляныя масты, жыта прыбрана, і аднае раніцы інжынэр сам прышоў у хлеў і заявіў.

— Грошы за работу я выплаціў вашаму начальніку. Дзякую вам, вы добра працавалі. Вось вам ад мяне асобна на тутунь.

І, паціснуўшы кожнаму руку, ён раздаў усім па папяровым рублі.

У гэты дзень палонныя асталіся ў хляве. Інжынэр і будаўнічая кантора паехалі на фурманках, на якія напрузілі ўсю маемасьць, а палкоўнік, перадаўшы загадваньне дружынаю зноў Аўгіньні Васільлеўне, накіраваўся ў Віцебск даведацца, што яму рабіць з сваімі людзьмі.

12

СЕМ КАР ЭГІПЭЦКІХ

У Пачэпаве, куды палонныя зьявіліся ў пачатку верасьня, іх чакала вялічэзная праца: ім давялося пракладваць праз балота грэблю на шэсьць кілёмэтраў даўжынёю.

Гэтаю справаю быў заняты ўжо вялікі лік людзей, але работа дрэнна ішла наперад. Грэбля была ў раёне абстрэлу нямецкіх батарэй, і гэтак-жа сумленна, як рускія працавалі над ёю ўдзень, немцы разносілі яе па бервяне ўночы, каб расійцы не сумавалі.

Тут, відаць, стыкнуліся супрацьлежныя інтарэсы. Рускім, відаць, было важна зрабіць гэтую грэблю, а немцам, відаць, было ня менш важна не дапусьціць гэтага. Значыцца, калі расійцы пачалі гнаць туды ўсё больш і больш людзей, каб дайсьці шпаркэй да вынікаў, немцы пачалі слаць туды і ўдзень знарады і самалёты, што абстрэльвалі работнікаў з кулямётаў.

Тады рускія прыдумалі ўдалы ход: яны зьнялі з гэтай работы сваіх салдат і паслалі туды палонных аўстрыякаў, паведаміўшы нямецкае камандаваньне, што ў выпадку абстрэлу падцерпяць іхнія-ж саюзьнікі і падданыя. На другі дзень немцы пастараліся ўзяць верх над сваімі працаўнікамі тым, што скінулі з самалёту лістоўкі, у якіх гаварылася, што кулямёты будуць цэліцца толькі ў расійскіх інжынэраў, кіраўнікоў работы, а з прычыны гэтага палонным ня раіцца трымацца блізка ля іх, а зараз-жа адыходзіць, як толькі зьявіцца нямецкі «таубэ»; у праціўным выпадку, нямецкае камандаваньне здымае з сябе ўсялякую адказнасьць перад імі за ўсю шкоду і страты, што могуць быць ад выпадковага нападаньня.

Гэтую пагрозу палонныя прынялі гэтак блізка да сэрца, што, толькі пачуўшы дзе-небудзь у небе гул мотору, хоць-бы нават і расійскага самалёту, адразу-ж разьбягалася ва ўсе бакі і, седзячы ў лесе, церабіліся ад вошай, або рэзаліся ў карты, пакуль канвой не зганяў іх зноў да грэблі.

Гэтая валаводзіна давала, відаць, вялікую асалоду нямецкім лётнікам. Кожны нямецкі самалёт, варочаючыся з выведкі над расійскімі позыцыямі, меў як-бы за абавязак няйначай завярнуць сюды. Ён кружыўся над месцам работ, спускаўся зусім нізка, як-бы зьдзекуючыся з палявых гармат, што абстрэльвалі яго шрапнеляю, і скідаў, нарэшце, заместа візытнае карткі бомбу. Пасьля ён чакаў, каб людзі разьбегліся, і толькі на тых, што асталіся, наводзіў свой кулямёт: та-та-та-та...

І як толькі салдаты зганялі палонных да забітых у балотную глебу паляў, зноў чуваць было адмысловы шып скінёнае бомбы, і той, хто першы яго чуў, камандаваў:

— Ну, браткі, ногі ў рукі! Наш саюзьнік зноў прылящеў!

Пачэпава, дзе разьмясьцілася 208-я рабочая дружына, была бедная, брудная вёсачка, у ёй толькі дзе-ні-дзе захаваліся хаты: усе іншыя былі спалены нямецкімі знарадамі. У хлявох было ўжо холадна; дык палонныя налазілі ў хаты, як селядцы ў бочку, і спалі адзін на адным.

Палкоўнік Галаваценка пачаў наводзіць ашчаднасьць, бо меркаваў, што вайна скончыцца зімою, і ён пасьпее забагацець як мае быць. Ён зьменшыў хлебны паёк, выдаваў менш цукру і за-

гадаў варыць крупнік ня з рыбы, а з бацьвіньня, якое прывозілі на конях з нейкага маёнтку, за два дні дарогі ад месца іхняе стаянкі.

Нямецкія самалёты налятылі кожнадзенна, нібы мухі, і кружыліся над грэбляю. Палонныя сядзелі ў лесе і, з прычыны халоднага надвор'я, раскладалі агонь. Хтосьці дастаў мяшок бульбы і пёк яго ў прысаку. Бачачы гэта, усе іншыя адразу-ж заварушыліся і неўзабаве вярнуліся самі з бульбаю; яе яны нацягалі з поля пачэпаўскае бедноты.

— Мы іх аб'ядаем, мужыкоў,—мэлянхолічна заўважыў Гаршына.—Зімою яны ўсе падохнуць з голаду, і мы разам з імі.

— Я,—цьвёрда заявіў Піскляры,—я тут на зіму не астануся. Я падаюся ў легіён. Мне ўсё адно—забіць мяне могуць як там, так і тут, але там я, прынамсі, ня буду галодны.

— Калі-б я не прысягаў яго вялікасьці нашаму імпэратару,—абазваўся Швэйк, чысьцячы бульбу,—я таксама падаўся-б у легіён. Але-ж я дакляраваў служыць толькі яму, так што я ўжо лепш буду красьці бульбу. Абавязак кожнага салдата—усюды зьнішчаць ворага і рабіць яму як мага больш шкоды.

Гэтая заўвага выклікала бурнае спачуваньне, а спачуваньне адразу падмацавалі адпаведнымі ўчынкамі. Жанкі гэта заўважылі і з крыкам, і з енкам, пабеглі скардзіцца ў хату, дзе была палкоўніцкая канцылярыя.

Аўгіньня Васільлеўна спаткала жанок ласкава, паведаміўшы, што палкоўнік зараз вернецца, бо ён толькі на хвілінку вышаў з-за неадкладнае справы; а калі тыя заявілі, што палонныя спустошваюць іх бульбяное поле, яна сумна адказала:

— Што-ж, гэта можа быць. Мусіць яны галодныя. Вось ты, любая,—зьвярнулася яна да бліжэйшай старое, узяўшы яе за руку,—што-б ты рабіла, каб была галодная і прайходзіла паўз бульбяное поле? Чалавек—слабая істота і ня думае пра грэх. Ты-б таксама бульбу выкапала, зварыла і зьела-б. Гэтак ужо на сьвеце йдзецца, што чалавек павінен есьці, калі ён галодны.

— Дык хіба-ж я іх у Расію паклікала, хіба-ж я іх у палон брала? Нашто-ж я іх карміць буду?—пачала крычаць старая, адпіхаючы Аўгіньню Васільлеўну.—Вы іх і кармеце. Казна вам

грошы за іх плаціць, а вы куды іх дзеяце? Адно людзей галадам морыце!

— Ня крычы,—уся ўзгарэўшыся, закрычала Аўгіньня Васільлеўна,—а то—кепска будзе!

— Ой, даражэнькія, што-ж гэта робіцца! Мы па праўду да начальніка прышлі, а на нас тут нейкая навалач крычыць,—завішчала старая, гатовая ўчапіцца той у валасы.

Узьняўся страшэнны гвалт. Аўгіньня Васільлеўна закрычала гэтак праразьліва, што палкоўнік прыбег, не пасьпеўшы яшчэ як належыць зашпіліцца.

Некалькімі махамі кулака ён разагнаў раззлаваных баб і, патрэсаючы рэвальвэрам, накінуўся на іх:

— Нашто вы яе крыўдзілі, га?

— Мы прышлі скардзіцца на палонных, што яны наша поле грабяць,—гуртам заталасілі бабы,—а яна ў іхнюю дудку грае! Аўстрыякі ў нас усю бульбу выкапалі! А што мы самі будзем зімою есьці, чым жывёлу карміць будзем?

Палкоўнік схаваў рэвальвэр.

— Эх, вы, дурні!—сказаў ён.—Аўстрыякі ў вас некалькі бульбін выкапалі, дык вы скардзіцца бяжыце. А немец, гарманец праклятый, зараз прыдзе і ў вас усё чыста забярэ. Бога вы не баіцеся—з-за бульбы жанчыну крыўдзіце! Прыдзе, кажу я, сюды немец, дык ён ні то што бульбу—кароўку ў вас апошнюю адбярэ, а саміх вас у палон возьме... Ідзеце вы адсюль, пакуль ціха. Ну? Марш, марш!

Ён зноў дастаў рэвальвэр і навёў яго на баб. Тыя задам падаліся з хаты, мармычучы:

— Бач, які злосны!.. Вось кажуць, наша армія—лепшая за ўсе, а ён нас немцам палохае... Вось гад, адпусьці божа граха! Пазабіваць-бы іх усіх, каторыя гэтакія...

На палкоўнікаву радасьць, у гэты час з поля вярнулася якраз дружына. Неўзабаве ён наогул пакінуў выдаваць хлеб, а на дэманстрацыі, якія наладжвалі яму пад вакном бабы, пагражаючы паскардзіцца на яго самому бацьку-цару, ён пагардліва адказваў:

— А вы чуеце, як немец страляе? Зараз ён тут будзе і ўсё ад вас адбярэ.

Тымчасам голад у дружыне ўсё ўзмацняўся, а з голадам узростала і нахабнасьць у адшуканьні яды. Палонныя кралі сапраўды ўсё, што пападалася ім на вочы. Яны цягалі хлеб з клунь, грабілі клеці і сьвіронкі, лавілі курэй, а нарэшце пакінулі акідаць і катоў і сабак.

Смачок першы распачаў паляваньне на гэтую жывёлу; ён дастаў дзесьці кавалак дроту і паставіў ля хлява сіло... Уночы ўсе прачнуліся ад немага енку ката, што папаўся туды. Ён мяўкаў, пішчаў і енчыў, як тузін дзяцей у выхаваўчым доме. Як толькі пачало разьвідняцца, Смачок зацятнуў пятлю і з усіх сіл кінуўся да свае ахвяры. Кот, што папаўся ў сіло галавою, яшчэ трапятаўся.

— Пачакай, доўга мучыцца табе не давядзецца,—пацяшаў яго Смачок.—Зараз усё будзе скончана.

Ён раздушыў кату галаву абцасам і выцягнуў яго за заднія лапы. Штосьці ў ім храбуснула; паляўнічы абмацаў яго і самаздаволена засьмяяўся:

— Нічога сабе, сыты. Дзякуй богу, што мне гэтак пашанцавала.

Я-ж з голаду нават цалюткі тыдзень да ветру не хадзіў.

Тое, што палонныя ядуць катоў, стала адразу вядома на вёсцы, і сымпатыі яе насельнікаў да палонных ад гэтага не павялічыліся. Праваслаўныя людзі, якія ня елі галубоў, бо баяліся праглынуць у іх частачку сьвятога духу, і гадзіліся зайцоў, бо думалі што заяц распаўсюджвае пранцы, не маглі зразумець, што можна есьці, хваліць прыгатаваную з часныком кашэчыну. Цяпер, спатыкаючыся, палоннымі, яны пачалі адплёўвацца, як ад нячыстае сілы; ніхто ні за якія грошы ня даў-бы палонным свае конаўкі напіцца, а іхнім нажом ніхто ня крояў-бы свайго хлеба.

Калі таго часу Швэйк пранюхаў, што за суседняю вёскай у памешчыцы-ўдавы ёсьць цэлая чарада сабачак-такс.

— Гэтакія яны адкормленыя,—расказваў ён Гаршыне,—што ўсе круглыя, як галкі, нават лапак іх ня відаць, дальбог. А сала з іх нацякло-б па пяць літраў з кожнага. Скварак з аднаго нам хапіла-б на цэлы тыдзень. Няўжо табе ня хочацца іх паспрабаваць?

— Вось гэта дык пытаньне, ці хацелася-б мне!—уздыхнуўшы адказаў былы обэр-кэльнер.—Мне давялося за свой век паесьці і омараў, і устрыц, і бульлёну з чарапахі, і фаршыраваных сьлімакоў, і ластавічыных гнёздаў у Ліппэрта ў Празе пакаштаваць, і ананасаў, і ўсялякіх заморскіх фруктаў, але сабак ня ямчэ ня еў. А толькі мне здаецца, што мяса з іх павінна быць найлепшае. Так што мне вельмі хацелася-б паспрабаваць.

— Ну, а ты гатоў на ахвяры дзеля задаваленьня тваіх жаданьняў?—дапытліва запытаў Швэйк. Гаршына, нібы на прысягу, падняў два пальцы правай рукі:

— Гатоў ахвяраваць дваццацю гадамі майго жыцьця дзеля добрага філе з сабачкі. Калі хочаш, д'ябал, я напішу табе расьпіску чырвонай крывёю майго сэрца.

— Не, гэтага ня трэба,—адказаў Швэйк:—але я хачу, каб ты накіраваўся са мною заўтра ў маёнтак і забавіў старую гаворкаю, пакуль я спраўлюся.

У наступны дзень шаноўная ўдава, абкружаная сваімі сабачкамі, была вельмі зьдзіўлена ад візыты двух палонных аўстрыякаў, з якіх—адзін трымаў пад пахаю пусты мяшок, а другі бойка гаварыў па-француску. Яны адрэкомэндаваліся пані, і той, што гаварыў па-француску, сыпануў комплімэнты:

— Мы чулі, што вы высокаадукаваная дама, што вы выхоўваліся ў Парыжы. Нам вельмі хацелася пазнаёміцца з расійскай дамай, якая валодае гэтакім розумам і эрудыцыяй. Я сам доўгі час жыў у Францыі, а мой таварыш эльзасец.

— Можа вы галодныя?—стрымана адказала пані.—У такім выпадку, я папрашу вас на кухню. Мне вельмі шкода, але я павінна праз паўгадзіны паехаць, і мне трэба яшчэ пераапрануцца.

Яна адчыніла дзьверы, і калі яны падняліся на балькон, яна падалася ў кухню, каб сказаць чым частаваць гасьцей.

Палонныя засталіся адны з сабачкамі; таксы даверліва глядзелі на іх сваімі ласкавымі вачыма, нібы пытаючыся, чаго яны прышлі, і без усялякага страху церліся аб іх калені.

— Як ты думаеш, яны ня будуць бурчэць?—шэптам запытаў Гаршына.

— Не. Яны так спалохаюцца, што і апамятацца не пасьпеюць,—гэтак-жа шэптам адказаў Швэйк і намерыўся з мяшком.

Пасьля ён хапіў за заднія лапкі самага сытага, махнуў ім некалькі разоў над сваёю галавою і сунуў зьбянтэжанага сабаку ў мяшок. За ім адразу-ж пашоў туды другі, у той час як іншыя, памахваючы хвастамі, з цікаўнасьцю глядзелі, што будзе далей.

У адзін момант Швэйк ускінуў мяшок за плечы і шмаргануў з двара. Пані адно толькі адным вокам заўважыла яго на двары сярод сабачак, якіх ён дэманстрацыйна адганяў.

— Майму таварышу, на жаль, давялося сьпешна вярнуцца дадому,—растлумачыў Гаршына, бачачы зьдзіўленую гаспадыню.—Ён раптам успомніў, што яму яшчэ трэба паслаць з гэтаю поштаю ліст на радзіму.

— Шкада,—абазвалася пані.—Удваіх вам было-б весялей. Дык вось, прайдзеце, калі ласка, у кухню, а мяне прабачайце.

Яна пашла. У цёмнай кухні Гаршыну спаткала старая, вельмі брыдкая на выгляд жанчына заўвагаю, што цяпер, значыцца, усялякі народ тут цягаецца і ўсё стараецца пад'есьці нашармака і сьцягнуць што-дзе навідавоку ляжыць. Нарэшце яна паставіла перад ім талерку пракіслае, пратухлае, ліха ведае колькі раз грэтае, пшоннае кашы.

Праз дзесяць хвілін ён ужо спаткаўся ў лесе з Швэйкам, які тымчасам забіў сабачак дубінкаю па носе і нават выпатрашыў іх, каб не цягнуць дарэмна лішні груз.

— А яна-ж,—сказаў Швэйк,—відаць, вельмі ветлівая і рада была, што мы прышлі, калі яна была гэтакая далікатная з намі. Зусім як мадам Яноўшэк у Будэновіцах, у якое муж, прайходзячы цораз рынак, спаткаў нейкага Каганэка з Прагі, з якім ён хадзіў разам вучыцца ў школу і якога ня бачыў больш за дваццаць год. Яноўшэк гэтак узрадаваўся, што пачаў клікаць свайго былога таварыша да сябе на абед. Каганэк сьпярша доўга не згаджаўся, бо ня меў ніякае ахвоты есьці, але Яноўшэк не паддаваўся. «Ты зразумей,—гаварыў ён,—што раз ты мой стары таварыш, мая жонка таксама рада будзе з табою пазнаёміцца. Хадзем! Слова гонару, хатнія абеды куды лепшыя за тыя, што ў рэсторане, і ты ўбачыш, як добра быць жанатым і якая ў мяне слаўная жоначка». Ну, значыцца, Каганэк даў сябе ўгаварыць і яны пашлі. Дома Яноўшэк пазнаёміў таварыша з сваёю жонкаю. «Гэта,—кажа,—мой найлепшы друг. А ну, падавай на стол што

бог даў». А тая якраз пералівала крупнік. Павярнулася яна да гасьця і кажа да мужа: «Ну хіба-ж ты ня стары дурань! Самім жэрці няма чаго, а ты тут ўсялякую шушамець вядзеш, якую ліха цябе ведае дзе знайшоў». А пасьля гэтак ветліва і далікатна сказала да пана Катанэка: «Калі ласка, вельмі рада! Будзьце як дома. Мы людзі простыя, у нас саромецца ня можна».

Швэйкава здабыча стварыла ў вёсцы сэнсацыю. Калі Швэйк павесіў першага сабачку на грушу перад хатаю і ўзяўся лупіць з яго скуру, навокал сабраўся цэлы натоўп таварышаў, якія не шкадавалі парадаў, што рабіць, каб смажэньне вышла як мага смачнейшае. Нарэшце Гаршына рашуча заявіў:

— От што: аднаго мы сасмажым, а другога пакладзем у салёную ваду, з воцатам і цыбулькаю, так што будзе смак як ад самае далікатнае дзічыны.

І ён адразу-ж пашоў у гарод, карыстаючыся тым, што гаспадароў якраз ня было, каб узяць адтуль якую пару цыбулін.

Доўгія нарады ваеннапалонных пад грушаю прыцягнулі ўвагу насельнікаў. Сьпярша прышло некалькі хлапчукоў, і калі яны заўважылі на галінах аблупленага сабачку, яны паімчаліся ў вёску паведаміць пра вялікую навіну. З усіх хат зьбегліся бабы, узбуджана гаворачы пра тое, што трэба няйначай папярэдзіць Аўдоцю, якая працуе на полі, што робяць гэтыя паганцы аўстрыякі з яе грушаю.

Зараз-жа па яе кінуліся тыя-ж хлапчукі, каб сказаць ёй, што палонныя апаганілі яе дрэва.

Швэйк ледзь пасьпеў злупіць скуру з другога сабачкі, як зьявілася Аўдоця. Размахваючы грасаю, яна разагнала палонных, лаючыся на чым сьвет стаіць. Пасьля яна кінулася ў хлеў, зараз-жа вярнулася і пачала секчы дрэва, крычучы на ўсю вуліцу:

— Мужчынкі, родненькія, вы адно падумайце: ну хіба я магла-б узяць у рот грушу з дрэва, якое апаганена сабачаю крывёю? А божа мой! Усё, усё гэта давядзецца выкінуць!

Тымчасам Швэйк спакойна запаліў у печы і паставіў сабачку смажыцца ў вялікай бляшанцы з-пад патронаў, што была яму замест скаварады.

— Ён у мяне сам у роце будзе раставаць! А скваркі з яго будуць гэтакія, як з самае лепшае парасяціны,—пахваліўся ён.

За ім сядзеў на карачках Гаршына, лятуценна паглядаючы ў агонь і жуючы сухую скарынку заплесьнелага хлеба, які палонныя атрымлівалі пад маркай «сухары». Чакаючы таго моманту, калі яны паласуюцца як Швэйк зьніме смажэньне з агню, ён аблізваўся па самыя вушы.

Нарэшце сухі трэск паведаміў, што грушу сьсеклі, і Швэйк кінуў свайму таварышу:

— Пайдзі прынясі пару галін лому, каб у нас дайшло смажэньне. Ды бяры тыя, якія сушэйшыя, каб лепш гарэлі.

Верны друг яшчэ раз аблізаўся і прынёс цэлае бярэмя лому, які і кінуў Швэйку пад ногі. Сьледам за ім у хату ўбегла Аўдоця. Кінуўшы вокам на тое, што смажылася ў печы, яна нема заенчыла. Яна гэтак саўганула Швэйка, што ён, каб не зваліцца з ног, адскочыў далёка ўбок, а пасьля, скавычучы, хапіла яна голымі рукамі бляшанку і выкінула яе, з усім што ў ёй было, за дзьверы. Тады схапіла сякеру і пачала наступаць з ёю на аўстрыякаў.

У момант і яны апынуліся на вуліцы, і ласкавая Аўдоця, падобная ў гэтую хвіліну больш на расьцьвеленую львіцу, выкінула ўсьлед ім іхнія ранцы. Пасьля гэтага, у прыпадку гадлівасьці і раздражненасьці, яна зьбегала ў хлеў па лом, і пачала разьбіваць печ, асыпаючы жудаснымі праклёнамі ненавідных аўстрыякаў, якія ператварылі краіну ў пекла.

Не пакідаючы лаяцца, яна вынесла цэглы на двор, прычым спачувальныя суседкі, што памагалі ёй самым бязглуздым чынам, паддавалі ёй ахвоты. Нарэшце яна пабегла да палкоўніка скардзіцца.

Пакуль той яе цешыў, што гэта глупства, што ўсё-адно прыдуць немцы, якія зьядуць сабаку, пасьсякаюць усе грушы і паломяць усе печы, Швэйк і Гаршына цягаліся па вёсцы ў пошуках новага прытулку. Пад леваю пахаю Швэйк цягнуў смажанага, а Гаршына—марынаванага, сабаку, а ў правай руцэ у іх былі ранцы.

Яны пабрадзілі з сваімі ласункамі пад пахамі да позьняга вечару, і нідзе іх ня прымалі. А на ўсе дакляраваньні, што іх

пусьцяць калі яны выкінуць сабачыну, Швэйк катэгарычна адказваў:

— Ні за што на сьвеце! Гэта—дэлікатэс!

Ледзь толькі зусім сьцямнела, яны вырашылі дасмажыць свайго сабаку за аселіцаю і перабыць ноч на вольным паветры ля агню. На раніцу палкоўнік няйначай усяліць іх куды-небудзь у прымусовым парадку.

Яны сасмажылі сабаку і падчысьцілі яго да апошняй касьці. А калі яны зьлівалі тое, што асталося, сала ў бляшанку з пад кансэрваў, над вёскай раптам разарвалася шрапнэль. За ёю была другая, трэцяя, а пасьля далі і гранаты.

Праз некалькі хвілін загрымела па ўсім фронце, і грук гарматаў зьліўся ў адну грозную сымфонію. Уся вёска асьвяцілася праменьнямі пражэктараў, і на яе пасыпаўся град шрапнэлі і знарадаў.

То тут, то там успыхвалі пажары. З аднэй страхі агонь шпарка перакідаўся на другую. Раптам невядома адкуль у вёску прымчаўся невялікі атрад казакоў.

— Гэй, праваслаўныя, гэй, аўстрыякі, уцякайце! Немцы прарвалі наш фронт!

Яны імчаліся на фоне ружавага агню, яны былі ахоплены рухавымі шчупальцамі пражэктароў, і, падганяючы нагайкамі зьбянтэжаных насельнікаў і палонных, на ўвесь голас крычалі:

— Ратуйся, бяжы на ўсе застаўкі. Немцы, у бога маць, зараз будуць тут!

Страшэннае цемрыва за вёскаю было поўна ўжо людзей. Людзі беглі. Усюды чуваць было як раўла жывёла, як плакалі дзеці, як лаяліся салдаты над пераверненымі ўгару калясьмі, вазамі і скрынкамі ад набояў. Гарматы грымелі цяпер толькі з нямецкага боку, і ланцугі салдат, што адстрэльваліся з стрэльбаў, падыходзілі гэтак шпарка, што месцамі зьмешваліся з натоўпам уцекачоў.

І раптам у гэтым рэйле зьявіліся адзін ля аднаго постаці двух коньнікаў. Першая постаць голасам адважнага палкоўніка Галаваценкі гукнула:

— Паддай, паддай, хлопцы! Ходу! Зварочвай з дарогі, бяжы нацянькі, каб не папасьціся пад артылерыю!

А перапалоханы жаночы голас пішчэў:

— А грошы ты захапіў? Скрынку з капялюшамі на лінейку паклаў? Ах, божа мой, сваю добрую пудру я на акне забыла!

Доўга беглі ўсе ў страшэнным цемрыве, сярод жудаснай цішыні поля, адчуваючы толькі, што побач з імі таксама перапалоханыя людзі, і чуючы як яны з сьвістам дыхалі. І раптам цемень прарэзаў сноп ясных праменьняў, і ў полі зрабілася ясна як удзень.

А ў гэтым ясным сьвятле пачуўся заклапочаны голас удалага ваякі Швэйка:

— Гаршына, я тут, з табою! Глядзі-ж, ня згубі адно сабачку! Бяжы з ім туды, дзе цямней, каб нас не зачапіла знарадам. Пільнуйся сабачкі як сваіх вачэй. Што нам асталося-б на сьнеданьне, каб гэтакая шальмаватая граната выбіла яго з тваіх рук?

13

У ГЛЫБОКІМ ТЫЛУ

Швэйкаў афорызм: «Мы якраз як праскія вэтэраны, калі яны разварушацца: нішто ня можа іх тады стрымаць, апроч як моцная сьцяна»—афорызм, які ён выказаў назаўтра пасьля тэй памятнай ночы, калі яны бязупынна беглі,—правільна, відаць, вызначыў тое, што было.

Уся армія нястрымана бегла, хоць ня чуваць было ніводнага стрэлу.

На фронце пачалася паніка, якую салдаты, зьбянтэжаныя тым, што ня відаць канца вайне, і ня вельмі ўзрадаваныя тым, што давядзецца трэцюю зіму мерзнуць у акопах, ахвотна падтрымлівалі. Расійская армія, бяз ведама яе галоўнакамандуючага, выкінула лёзунг: «Разыходзься па хатах!»

Толькі на трэці дзень «дзікая дывізія», што была кінута на спатканьне гэтаму стыхійнаму руху, спыніла бягуноў. Яна прымусіла салдат павярнуцца на фронт, сформавала іх у палкі і пагнала назад у балоты, куды немцы не адважыліся за імі рушыць.

Наконт ваеннапалонных з 208-й рабочай дружыны «дзікая дывізія» не атрымала аніякіх дырэктыў. Дык калі палкоўнік Галаваценка запытаўся ў казачага афіцэра, што рабіць і куды накіраваць палонных, той адказаў:

— А куды хочаце. Хоць чорту на рогі.

Тады палкоўнік, парадзіўшыся з Аўгіньняй Васільлеўнай, вырашыў выканаць яе далейшае жаданьне і рушыў з сваімі людзьмі як можна глыбей у тыл, дзе-б ня гэтак хутка знайшлася вайсковая ўстанова, што цікавіцца справамі ваеннапалонных.

Дружына рушыла на ўсход. Марынаваны сабака Гаршыны быў даўно зьедзены. За журботным Мірэкам мірна паддаваў ходу Швэйк, а Смачок трымаў ў руцэ падгарэлую костку і пасмоктваў яе заместа люлькі. Ззаду за імі Гаршына расказваў, што ён будзе рабіць, калі яны дзе-небудзь спыняцца на доўгі час, ці назаўсёды.

— Я адчыню чайную,—гаварыў ён,—і, можа, вазьму туды некалькі жанчын. Жаночае слугаваньне ў гэтакіх мясцох— вялікая справа! Праўду я кажу, хлопцы: дадому мы наўрад ці калінебудзь трапім. І кожнаму з нас давядзецца падумаць пра тое, каб стварыць сабе тут жыцьцё. Ня можам-жа мы вечна бадзяцца гэтак. Не, ня можам і ня будзем!—у роспачы яшчэ сказаў ён, пхнуўшы Смачка ў бок. Той, ня вымаючы з роту косткі, прамармытаў:

— Гэтакі сабачка куды смачнейшы за зайца. Сытая такса ў сьмятане—проста любата! Эх, каб хоць здохлага каня дзе знайсьці, ці што!

І Смачок, штосьці мармычучы пра сябе, доўгім позіркам сачыў за канём, на якім ехала Аўгіньня Васільлеўна.

— Увесь сьвет цяпер перавярнуўся дагары нагамі,—заўважыў Швэйк:—і ніхто ня ведае, што будзе і як будзе. Людзі проста такі зусім пашалелі ад гэтакага жыцьця. Дый то сказаць, адкуль чалавеку ведаць, што яму рабіць, калі нават начальства гэтага ня ведае? А начальства-ж усё—людзі вучоныя, адукаваныя, трасца іх матары!

— Ня бойся, гэтыя людзі як ня трэба лепш ведаюць, што рабіць!—напаў на яго Пісклявы.—Яны дык ужо як мае быць вывучылі ўсё, як лепш народ туманіць. А народ заўсёды бродзіць

у цемені. Заўсёды дае сябе аблытаць, ашукаць і стаіць як дурань, не разьбіраючыся, што робіцца навокал яго і нашто ўсё гэта. Народ заўсёды адчувае толькі вынікі. А прычын ён ніколі ня бачыць і не разумее.

— Гэта, мусіць, праўда,—згадзіўся Швэйк.—Ты праўду кажаш. Людзі не разумеюць, хто ім што робіць, і чаму і як ён гэта робіць. Вось тое, што ты кажаш, нагадвае мне нейкага Вомачку з Буланкі, які пашоў на кірмаш у Коўршым купляць казу. Гэта, па-мойму, якраз гэтакі-ж выпадак, як цяпер з народам.

Пасьля гэтага палітычнага выступленьня, ён з хвіліну памаўчаў, а пасьля гаварыў далей:

— Гэты Вомачка быў муляр, добры чалавек, але на выпіўку быў майстар. Ну вось, купіў ён на кірмашы ў Коўршыме ў аднаго тамашняга чалавека казу і пашоў з ім у карчму барыша выпіць. Выпілі яны некалькі конавак піва і разышліся. Прадавец накіраваўся дадому, а Вомачка павёў казу ў Буланку. Каза ідзе з ім, як з добрым знаёмым, і так яны дайшлі да карчмы ў Буланцы. А там сядзіць бургамістар, адзін хлопец, што на прозьвішча Заруба, і два музыкі, і бачаць праз акно, як Вомачка шпарыць з казою па рынку. Вось гаспадар і кажа: «Бач ты, я думаў, што ён вядзе майго казла. Каза гэтая як дзьве кроплі вады падобна на яго». Тады Заруба, вялікі жартаўнік і ўрвіцель, выбег Вомачку на сустрэчу і крычыць: «Пане Вомачка, зайдзеце на хвілінку выпіць з намі шклянку. Ды заходзьце-ж, не саромцеся, я сёньня частую, а казу вашу мы паставім пад паветку». Вомачка сапраўды даў сябе ўгаварыць; яго пачаставалі півам, пацешылі гаворкаю, а тымчасам гаспадар прывязаў пад паветкаю казла свайго, а яго казу павёў у хлеў. Калі ўжо цямнець пачало, Вомачка сабраўся ісьці дадому і пашоў пад паветку па казу. Вядома, нельга патрабаваць, каб чалавек добра разьбіраўся, калі ён ледзь стаіць на нагах. Вомачка, значыцца, адвязаў казла і кажа: «Ну пойдзем, козачка, пойдзем, любенькая». А казёл упіраецца ўсімі чатырма нагамі, а Вомачка яго ўгаворвае: «Чаго-ж ты, дурненькая. Дагэтуль ішла як у танцах, а гэта раптам заматурылася». Але ўсе словы былі ні да чога, дык Вомачка перакінуў вяроўку цераз плячо і пацягнуў казла сілком.

Так ён яго дацягнуў дадому і замкнуў у хляве. Тут прыходзіць з рынку жонка і пытае: «Ну што, купіў? Ты ўжо яе падаіў?» Вомачка на гэта ні бэ, ні мэ, бо язык у яго зусім не варочаўся. Ну, жонка ўзяла дайніцу і пашла даіць казу, каб у яе вымя не зацьвярдзела. Раптам яна як выскачыць з хлява, як куля, ды на Вомачку: «П'яная твая храпа!—крычыць яна,—што ты нарабіў! Гэта-ж не каза, а казёл!» І трах яго дайніцаю па галаве. А Вомачка вылупіў на яе вочы, як дурны, і балбоча: «Казёл? Каза? Казёл? А божачка мой, я-ж сам бачыў што ў яе вымя, дык гэта каза!» Так яны і спрачаліся, пакуль жонка не абліла яго халоднаю вадою, каб ён працьверазіўся, і ён тады прызнаў, што гэта сапраўды казёл, і ўсю ноч ня спаў з гора, дый галава трашчала ад дайніцы. Ледзь разьвіднела назаўтра, жонка яго будзіць і кажа «Уставай, абібок, і вядзі гэтага д'ябла назад. Ды глядзі, без казы лепш і ня прыходзь!» От ён і пашоў, небарак, сумны гэтакі, як прыбіты, і цягне за сабою казла. А ў карчме гаспадыня якраз адчыняла вакеніцы і, як убачыла, пабегла да мужа і кажа: «Уставай, стары. Вомачка казла прывёў». Той на хуткую руку адзеўся, выходзіць, як-бы ён нічога і ня ведае, і пытае: «Куды гэта вы з казою гэтак рана выбраліся, пане Вомачка. Хіба яна вашай жонцы не спадабалася?»—«Ды мне ў Коўршыме падсунулі заместа казы казла, а я п'яны і не заўважыў»,—мармыгнуў Вомачка, а гаспадар яго кліча: зайдзеце кажа,—выпіце шкляначку для апэтыту. Што і казаць, абармотлівы пашоў цяпер народ». Ну, Вомачка зайшоў і выпіў шкляначку горкае, а гаспадар тымчасам зноў падмяніў казла ў яго і прывязаў на яго месца казу. А Вомачка ў карчме гэтак накінуўся на ўвесь сьвет і на ўсіх брыдкіх людзей, што прапіў і грошы, і гадзіньнік і толькі к абеду пасьпеў з сваёю казою да таго коўршымца, у якога ён яе ўчора купіў і адразу пачаў лаяцца: «Каб на цябе халера, як гэта ты мне казла падсунуў! Здаецца, каб прымеў, дык і задавіў-бы цябе, гада печанага, сваімі рукамі!» А той склікае людзей: «Патлядзеце, людзі добрыя, Вомачка ўзвар'яцеў. Ён на казу думае, што гэта казёл!» Але Вомачка трымаўся свайго, усё казаў, што гэта казёл і адно ўсё цёр сабе вочы. Пасьля ён справіў гвалт і лез біцца, дык паліцэйскі павёў яго ў ратушу. І толькі там Вомачка паверыў, што

ў яго каза і што ў яе ёсьць вымя, калі пан бургамістар, як службовая асоба, і пан дэкан, як духоўная асоба, яму гэта афіцыйна пацьвердзілі. Так што ён сваю казу зноў павёў дадому і кажа дома жонцы: «Далібог, за ўсё жыцьцё я ня бачыў гэтакае дурніцы. Нават мне, старому муляру, яна галаву задурыла, што гэтая каза—казёл, а казёл—каза». І даў ёй гэтакіх пляскачоў, што яна ад яго ўцякла і яму дагэтуль даводзіцца жыць аднаму і самому сабе гатаваць абед.

— І вось, з народам будзе на вайне калі-небудзь якраз гэтакая-ж гісторыя!—вельмі да рэчы скончыў Швэйк сваё апавяданьне, бо палкоўнік, што ехаў на чале, спыніўся і гукнуў:

— Стой, хлопцы! Рэчка! А мосту няма!

Перад імі нейкая невядомая рака гнала сваю каламутную жоўтую ваду сярод парыжэлага сухога чароту. Палкоўнік у непаразуменьні ўнурыў галаву ў грудзі.

— Як-жа нам перабрацца на той бераг? Дзе тут мост? Праклятая рака! Што-ж далей?—зьвярнуўся ён да Аўгіньні Васільлеўны. Тая, глянуўшы ўгару па плыні, ня доўга думаючы, адказала:

— Там, па правай руцэ, павінна быць вёска. Я заўважыла, што дарога адыходзіць у той бок. Ну, а дзе ёсьць вёска, там будзе і мост. Хадзем туды; людзі там адпачнуць, высьпяцца, а на раніцу рушым далей.

Бліжэйшае месца, дзе жылі людзі, да якога яны дацягліся толькі ўвечары, ня была нават вёска. Гэта было некалькі паразьбіваных знарадамі, абгарэлых і страшэнна брудных халупак, у якіх варушыліся нейкія чалавекападобныя істоты, што назвалі сябе ўцекачамі-галічанамі. Гэтыя людзі спаткалі дружыну, што шукала ў іх прытулку на ноч, вельмі суха:

— Няма хлеба, няма дроў, нічога няма.

Мосту і тут ня было, і пераправа адбывалася на хісткім плыце. І палкоўнік, даведаўшыся, што мост ёсьць толькі за сорак вёрст адсюль, пагнаў сваіх людзей у халупкі, кажучы:

— Кладзецеся і адпачнеце. А раніцаю відаць будзе, што рабіць.

Палонныя, спатканыя ня вельмі ласкава, паналазілі ў халупкі і вельмі хутка паснулі. Чуцён быў яшчэ палкоўніцкі голас,

які загадваў камусьці паставіць коняй у хлеў і даць ім сена, а пасьля ўсё сьціхла.

Праз некаторы час, калі Марэк ужо спаў, а Піскляві і Гаршына як мае быць храплі, нібы стараючыся ўзяць у гэтым верх адзін над адным, Швэйк адчуў, што Смачок, які ляжаў поплеч з ім, заварушыўся, а пасьля ціхенька ўстаў і яшчэ цішэй выбраўся на двор. Вярнуўся ён з сукаватаю дубінкаю, паставіў яе ў кут і зноў лёг.

— Ці не баішся ты, што цябе апрабяць?—шэптам запытаў яго Швэйк.

— Не,—гэтак-жа ціха адказаў той,—я баюся голаду. Трэба будзе як-небудзь растарацца мяса. Ты ўмееш трымаць язык за зубамі?

— Як сьвяты Непамук!—урачыста сказаў Швэйк, на што Смачок яму коратка адрэзаў:

— Ну, дык прытрымай яго заўтра зранку. Ня бачыў, значыцца, нічога і ня чуў.

Зранку палкоўнік сам явіўся іх будзіць. Ён выказаў жаль, што тут няма дзе чаго дастаць і што з гэтай прычыны давядзецца пагаладаць, і, адводзячы іх да ўсіх на зборны пункт, заявіў:

— Выслухайце мяне, хлопцы, уважліва. Мосту мы шукаць ня будзем і пералазіць на той бераг таксама ня будзем. Адсюль уніз па рацэ ёсьць горад Мазыр. Дастаньце лодку і пасадзеце туды народу, колькі ўлезе. Рэшта пойдуць берагам пеша, а калі будуць таміцца, дык будуць мяняцца з тымі, хто едзе ў лодцы. Такім чынам, мы за тры-чатыры дні будзем на месцы. Зразумелі?

— Так точна, зразумелі, вашскабродзь!— хорам гаркнулі палонныя, узрадаваныя пэрспэктывай фантастычнага падарожжа.

— Лодку вы рэквізуйце,— дадаў палкоўнік,—а калі будуць праціўіцца, дык дайце раз па мордзе. Па мордзе і справе канец!

Палкоўнік вельмі задаволены гэтакім добрым вырашэньнем крызісу, пашоў па коні. Але ля хлява яму насустрачу бегла Аўгіньня Васільлеўна і залілася гістэрычнымі сьлязьмі і крычала:

— У майго каня зломана нага. Коні пачалі брыкацца і твой конь перабіў майму нагу.

Палкоўнік пасьпяшыў у хлеў. Яго конь, увесь зьбіты і ўвесь у дрыжыках, стаяў у кутку, а вараны ляжаў на баку і стагнаў. З яго задняй нагі выпірала праз скуру зламаная косьць.

— Што-ж, на тое божыя воля!—пачаў цешыць палкоўнік сваю каханку.—Яны пабрыкаліся, і мой конь скалечыў твайго. Тут ужо нічым не дапаможаш. Застаецца толькі скончыць яе пакуты.

І, абняўшы леваю рукою маладую жанчыну за стан, ён правай дастаў з кішэні рэвальвэр, прыставіў да вуха каню і два разы стрэліў. Прагрымелі адзін за адным два стрэлы; небарак конь перасмыкнуўся ўсім целам, закінуў назад галаву, а пасьля сударгавата выцягнуў ногі. Аўгіньня Васільлеўна з плачам стала ля яго на калені.

Палонныя абкружылі іх шчыльнай сьцяною, бо навіна, што конь зламаў сабе нагу, шпарка распаўсюдзілася сярод іх. У натоўпе быў і Смачок, ён нэрвова і неспакойна пераходзіў з месца на месца. Нарэшце ён зьвярнуўся да палкоўніка:

— Ваша высокаблагародзьдзе, ці не дазволіце нам яго зьесьці. Мы гэтакія галодныя, і было-б шкода кінуць марна гэтакае добрае мяса.

Палкоўнік у зьбянтэжаньні паціснуў плячыма. Аўгіньня Васільлеўна праўцом зірнула ў Смочакаў твар, вочы якога гарэлі, як у галоднага ваўка, і раптам крыкнула, нібы прачытала ў іхнім агні ўсю праўду:

— Гэта ён зламаў яму нагу! Конь ня сам гэта зрабіў! Ён яго скалечыў, каб было што жэрці! Ах, дай мне рэвальвэр, я яго заб'ю!

Яна заядла кінулася на Смочака і ўелася яму пазногцямі ў аблічча. Тай з сілаю адпіхнуў яе, тады яна, выхапіўшы ў палкоўніка рэвальвэр, стрэліла ў яго. На шчасьце, хтосьці пасьпеў даць ёй па руце і куля прасьвістала паўз Смочака. Палкоўніку з вялікімі цяжкасьцямі ўдалося вывесьці ашалелую жанчыну з хлява. Скрозь сьціснутыя зубы яна мармытала:

— Кулю яму ў лоб... Кулю ў лоб... Як майму каньку!.. Любы, застрэль і яго...

Над целам небаракі варанога працавалі ў гэты момант дваццаць нажоў у тысячу раз большых небаракаў за гэтага каня лю-

дзей, але Смочака сярод іх ня было. Куля яго мінула, але ён уцёк і, засеўшы ў высокім чароце на беразе рэчкі, заядла пагражаў небу кулакамі і запрашаў бога і ўсіх сьвятых спусьціцца на зямлю і на свае вочы ўбачыць, што робіцца на зямлі і як людзі церпяць голад і бядоты, сьцякаюць крывёю і пакутуюць...

Пачуцьцё самаахоўы падказала палонным накіравацца ў далейшую дарогу адным, не чакаючы свайго начальства. Неўзабаве пасьля апісанае тут сцэны яны дасталі лодкі, і ўсе, пахаваўшы скрываўленыя конскія астаткі па ранцах, рушылі ў паход.

Іхняя хада нагадвала малюнак з эпохі вялікага перасяленьня народаў. Па рацэ плылі чаўны, нагружаныя да поўнага, круцячыся ў вірох і сунучыся па плыткіх месцах з дапамогаю жэрдак. А берагам, абходзячы вадзяныя завіліны і хлюпаючы па дрыгве сярод чаротаў, валокся натоўп абадранцаў, нібы ваўкі, што вышлі шукаць сабе здабычы.

У наступную ноч палонныя спыніліся ў вёсцы, дзе стараста быў нагэтулькі разумны, што загадаў мужыком даць ім бульбы і хлеба і не заводзіць сваркі з-за якое-небудзь курыцы. Сам ён угрунь паімчаўся ў Мазыр паведаміць вайсковую ўладу, што па рацэ набліжаецца атрад ворагаў і што атрад гэты рэквізуе чаўны, крадзе гусей, адкручвае галовы пеўням і курам, ломіцца ў клуні і адбірае бульбу. Каб пахваліцца, што ён стрымлівае ворага сваімі малымі сіламі, комэндант даў адпаведнае паведамленьне па тэлефоне ў штаб брыгады, што была ў вёсцы за Мазыром. Яго тэлефонограму прыняў стары фэльдфэбель, які ўсё пераблытаў і далажыў свайму начальніку, што з Мазыру па тэлефоне патрабуюць падмацаваньняў супроць немцаў, якія падступаюць да гораду з флётам і падводнымі лодкамі. Начальнік брыгады загадаў зараз-жа выступаць. І такім чынам здарылася, што Швэйк, седзячы ў чоўне непадалёку ад галоўнае лодкі, і разважаючы пра хараство сонечнага захаду, раптам заўважыў салдат, што мітусіліся ўзад і ўперад па беразе, капалі акопы і забівалі калы на калючы дрот. Пасьля ўжо і ўсе ўбачылі, што на беразе, пад прыкрыцьцём кулямётнае роты, зьявілася батарэя, і што гэтыя сьмертаносныя гарматы накіраваны якраз на іх. А калі яны падплылі бліжэй, пачулі як хтосьці зарыкаў:

— Рукі ўгару! Здавайся! А калі не, дык усіх перастраляем і патопім!

— Мне здаецца, што я трэці раз буду здавацца ў палон,— з усьмешкаю сказаў Гаршыны Швэйк, паднімаючы рукі.— Нездарма кажуць, што бог тройцу любіць.

Голас усё яшчэ рыкаў:

— Паварочвай к берагу! А калі хто возьмецца за зброю, я дам залп з усіх гармат.

Чаўны, якія падпіхалі жэрдкамі, падплылі да самага берагу, дзе іх спачатку адважны генэрал. Жоралы гармат, што сачылі за кожным рухам флётыліі, замерлі ў нярухомасьці, і заместа іх на палонных былі наведзены дзьве рулі кулямётаў і штыхі.

— Здаяцеся?—гаркнуў генэрал.

— Вядома,—пачуліся з лодак журботныя галасы.

— Давай сюды трох заложнікаў!—скамандаваў рускі стратэг, і Швэйк, які стаяў бліжэй за ўсіх, адным махам апынуўся ля яго. Сьледам за Швэйкам падышлі Пісклявы і Марэк.

— Вы належыце да складу нямецкай арміі? Якое часьці?— пачаў дапытваць іх з глыбокадумным выглядам генэрал.—За вамі ідуць значныя сілы, так?

Увесь штаб абкружыў узятых у палон абадранцаў, абменьваючыся сваімі ўражаньнямі.

— От бачыце, як у іх наладжана выведка. Гэта проста пераапранёныя шпёны, што залезьлі ў тыл вадзянымі шляхамі. Ну што-ж, цяпер ім ня соладка давядзецца.

Палонныя не разумелі, што ўсё гэта значыць. Але калі генэрал яшчэ раз сказаў сваё запытаньне, Марэку раптам стала ясна, што тут, відаць, выйшла нейкае непаразуменьне, і ён пастараўся растлумачыць генэралу сапраўдны стан справы.

— Мы ваеннапалонныя аўстрыякі і ўцякаем ад немцаў з фронту.

Генэрал недаверліва паківаў галавою і разьзявіў быў нават рот для запытаньня. Але не пасьпеў ён перавесьці дух, як перад ім выцягнуўся ўдалы ваяка Швэйк і з ясным тварам заявіў:

— Так што, дазвольце далажыць, мы з 208-й рабочай дружыны. Мы явіліся сюды бяз нашага начальніка, бо ў пана пал-

коўніка захварэла яго, так сказаць, жонка, і ён паслаў нас уперад. А на лодках мы едзем таму, што нам ужо надакучыла заўсёды хадзіць пеша. І так што дазвольце прасіць выдаць нам паёк і ўсё што трэба.

І Швэйк павярнуўся да генэрала сьпіною, каб той мог разгледзець намаляваную на ёй лічбу; пасьля ён запрапанаваў абадранцам з чаўноў зрабіць тое-ж самае, пасьля, для спакою, дадаў, бачачы як выцягнулася генэралава аблічча:

— На вайне гэткія выпадкі заўсёды могуць здарыцца, што выходзіш з бубнам на зайцоў, а з гарматамі на вераб'ёў. Вось, калі я яшчэ быў на фронце, у нас таксама быў падобны выпадак. Паднімаюць нейк наш батальён у трывогу, каб...

— Маўчаць!—раўнуў генэрал голасам раззлаванае тыгры. А пасьля, паказваючы на флётылію, загадаў сваім салдатам:— Абкружыць іх і абгледзець, ці няма пры іх бомбаў або зброі! Я іх усіх пад суд упяку! Даставіць іх у штаб! Вы адказваеце за іх сваімі галовамі!

Зьбянтэжанае начальства адразу-ж зьнікла і аўстрыякі апынуліся ў коле добрадушна настроеных ніжэйшых чыноў, якія пачаставалі палонных тутунём, сухарамі і хлебам, весела пасьміхваючыся:

— Зноў, значыцца, нашаму старому не пашэньціла. А заўтра ў газэтах будуць пісаць, што пад Мазыром мы ўзялі ў палон сто тысяч немцаў.

У Вертаве палонных загналі ў баракі і абкружылі падвойным колам варты. Пасьля, паводле загаду начальніка варты, які не хаваў свае злое радасьці, што з штабам здарыўся камуфлет, ім падалі чаю і хлеба.

Гарачы чай і поўныя жываты крыху ўзьнялі настрой. Пачалі выказвацца оптымістычныя думкі і меркаваньні, што нічога за гэта ня будзе і што ўсё будзе добра. А ўвечары варта некалькі разоў чула сьпеў чэскага народнага гімну «Гдзе домув мой». За ім ішла харавая песьня, і пры словах: «Там адно Чэхія, родная маці», рускія салдатыківалі галовамі і сказалі:

— Бач ты, і ў іх толькі адны бабы асталіся, а мужыкоў усіх вывелі і народ перабілі.

Пасьля барак пакрысе стаў заціхаць, і праз соннае пасьвістваньне і моцныя ўздыхі, хтосьці адзін засьпяваў :

Калі-б сказаў мне хто наперад
Калі я, небарак, памру,
Я дошчак сам-бы ўзяў адмераў
Сабе на цесную труну.
І на маю тады магілу
Вянок нясуць хай. на клады,
Каб ведаў кожны што загінуў
І пахаваны малады.

Гэта ўдалы ваяка Швэйк закалыхваў сябе гэтакаю песьняю. Вартавыя салдаты з асалодаю слухалі павольную мэлёдыю, а калі пераканаліся, што блізка няма нікога з начальства, прапанавалі сьпеваку выйсьці да іх.

— А ну, засьпявай нам што-небудзь весялейшае. А не, дык навучы нас сьпяваць па-аўстрыяцку.

Яны далі яму папярос і некалькі кавалкаў цукру, і ён, расчулены ад іхняе ўвагі, пачаў напінаць сваю памяць у пошуках песьні, якая як мае быць узнагародзіла-б іх сваёю прыгожасьцю. Нарэшце ён адкашляўся і пачаў:

Ва Ўршавіцы аднойчы быў на фэсьце я
І з[illegible]яўчынай увесь час быў як ёсьць я.
Стромкая, белая як цукер, віртлівая як зьмяя
Пусьці паспаць з табою, бо так сумую я.

Ён прасьпяваў гэта з гэтакім задорам і песьня яго гэтак спадабалася вартавым салдатам, што яму прышлося некалькі разоў яе прасьпяваць. І калі на небе заясьнела ранішняя зара, а з рэчкі пацягнула сьвежым ранішнім ветрыкам, расійскія салдаты ўжо сьпявалі разам з Швэйкам:

Стромкая белая як цукер, віртлявая як зьмяя,
Пусьці паспаць з табою, бо так сумую я.

Мы адзначаем у гэтай кнізе гэтую здольнасьць расійскага народу пераймаць на тое, каб зьбіральнік старадаўніх народных песень, які пападзе можа год праз пяцьдзесят у Расію і пачуе дзе-небудзь за Уралам, як стары вэтэран сусьветнае вайны

сьпявае «Стромкая, белая...», каб гэты зьбіральнік песень не падумаў, што гэта вынік артыстычнага турнэ Сьпявацкага таварыства праскіх настаўнікаў. Не, гэта проста водгук дзейнасьці ўдалага ваякі Швэйка сярод расійскага народу і жывая памяць таго вялікага пачуцьцёвага ўплыву, якім ён умеў дзейнічаць на простыя, несапсаваныя сэрцы адважных расійскіх салдат...

14

УСЕ ПАКІДАЮЦЬ ШВЭЙКА

Тое, што здарылася з 208-й рабочай дружынай, было—нячуваная падзея нават у звыклай да ўсяго Расіі. Палкоўнік Галаваценка сваю дружыну так і не дагнаў, і палонныя яго больш ніколі ня бачылі. Пад суд, як пагражаў генэрал, іх таксама не аддалі. Генэрал, відаць, баяўся агалашэньня гэтае справы, як ён з цэлай брыгадай выступіў супроць свае-ж рабочай дружыны, і таму вырашыў інакш: ён заявіў, што гэта—палонныя, якіх затрымалі, калі яны ўцякалі з фронту, з розных часьцей войск, і накіраваў іх пад аховаю ў тылавую этапную часьць у Гомель.

Калі палонныя вышлі там з цягніка, усё пашло звыклым парадкам: ніхто не пацікавіўся даведацца, хто яны і адкуль, і нікому ня было справы да іх. Канвой завёў іх у прасторны гліна-бітны барак, у якім толькі страха ўзвышалася над зямлёю, здаў іх фэльдфэбелю, каб той залічыў іх на паёк і яго: «добра, слухаю» было канец усёй працадуры, якой яны гэтак баяліся.

Барак быў ужо напалову повен палоннымі, якія з цікаўнасьцю паглядалі на новых гасьцей. І Швэйк, верны свайму прынцыпу, што чалавек павінен быць знаёмы з усім што навокал яго, адразу-ж падышоў да іх, каб па-прыяцельску пагаварыць.

— Адкуль вы, браткі?—запытаў ён іх сваім прыемным галасам.—Ці даўно ўжо тут? Ці ня чувань чаго-небудзь новенькага пра мір?

У адказ пачулася толькі кароткая, але даволі такі выразная лаянка. Швэйк, не бянтэжачыся, яшчэ раз запытаў тое самае. Тады тыя, што сядзелі на верхніх нарах, плюнулі і сказалі пачэску:

— Эй, ты, аўстрыяцкі найміт, які нават у палоне трымаецца імпэрскае цэшкі на шапцы, да нас ня лезь. Мы ня хочам гутарыць з кожным сабакам. У морду хочаш? Валі ад нас!

— Вельмі добра вы гэта сказалі,—спачувальна заўважыў Швэйк.

— Гэтак яно і павінна быць. Прынамсі адразу ведаеш, у чым справа.

І, не бяручы на ўвагу іхнюю лаянку і злоснае паплёўваньне, ён палез на нары да тутэйшых тубыльцаў.

Гэта былі басьнякі. Убачыўшы, што ў яго самыя мірныя намеры і што ён ня зьбіраецца іх абкрасьці, яны далі яму гаварыць. Выявілася, што яны таксама былі на рабоце, але цяпер яны запісаліся ў «Сербскі легіён» і чакалі тут калі іх накіруюць на фронт. І, паведамляючы яму пра гэта, яны паважна пакіўвалі галовамі:

— Мы будзем ваяваць за караля Пятра.

— Але, але, браткі,—падтрымаў іх Швэйк,—кожны павінен ваяваць за свайго караля. Калі ідзе вайна, трэба ваяваць, а ня біць бібікаў у лягерах. Каралёў на сьвеце—колькі хочаш, і кожнаму з іх прыемна, што дзеля яго людзі забіваюць адзін аднаго.

Басьнякі былі надзвычай расчулены тым, што Швэйк іх пахваліў; яны пачаставалі Швэйка чаем і, абнімаючы яго за шыю, усё гаварылі:

— Мы будзем ваяваць за караля Пятра. Хадзем, браце, ваяваць з намі за караля Пятра.

— Дык я-ж ужо ваяваў за імпэратара Францa-Юзафа!—шчыра прызнаўся Швэйк.—Цяпер даволі, хопіць! Здаецца, я ня мала папрацаваў! Мне гэта не дае больш аніякае асалоды!

— Слухай, аўстрыяцкі ідыёт!—зароў з верхніх нар той самы голас, што перад гэтым назваў яго наймітам.—Ты тут ня кружыся! Глядзі, спушчуся ўніз і разарву табе хайла да самага вуха.

— Гэта чэхі,—растлумачылі басьнякі, паказваючы на гару.—Яны таксама будуць ваяваць за караля Пятра.

У гэтым хавалася невялікае непаразуменьне, бо чэхі запісаліся ў «Чэскі легіён». Але энтузіязм басьнякоў быў гэтакі вялікі, што ім было-б вельмі прыемна, каб усе ваявалі за іх.

— Трэба глянуць, што робяць мае землякі,—сказаў Швэйк і адразу палез на гару.

Там яго спаткалі няветліва.

— Чаго табе?

— Люблю землякоў, браткі,—прызнаўся Швэйк.—Я ўпэўнены, што знайду сярод вас знаёмых. Ці няма тут каго-небудзь з Прагі?

— Не!—адказалі ўсе разам.

— Шкада!—сумна сказаў Швэйк.

Той, што яго аблаяў, сказаў:

— Ну, цяпер вымятайся. У нашай кампаніі табе няма чаго рабіць. Прыходзь, калі ў цябе ў мазгох паясьнее. А не, дык ураз зубоў не далічышся!

— З гэтымі зубамі,—ласкава падаў голас Швэйк,—ты мне нагадваеш фэльдфэбеля Боўжэка з 6-й роты. Той таксама гаварыў з радавымі: «Ну, зьлічыў? Лічы, лічы рэбры, а не, я іх у цябе пералічу!» Ці ня быў ты часамі за фэльдфэбеля ў аўстрыяцкай арміі, браце?

У адказ на гэтае пытаньне Швэйка на карачках спусьцілі з нар. А той, у каго ён пытаўся, грозна гукнуў:

— Сказалі табе, ня лезь да нас, ганебны падзёншчык. У нас усё толькі інтэлігенцыя! Пачакай адно, прыдзем у Прагу, тады з вашым братам расправімся.

*

Калі Швэйк вярнуўся да сваіх таварышоў, ён паведаміў:

— Тут сядзяць басьнякі, з якімі я пагаварыў сардэчна, і чэхі, з якімі я ніяк ня мог згаварыцца.

Калі жыцьцё не дае чалавеку ніякіх радасьцяй, ён робіцца апатычны і гультаяваты. А з тэй прычыны, што ў палонных адзін дзень быў больш шэры і аднастайны за другі, яны пачалі нарэшце гэтак абыякава глядзець на ўсё наваколльнае, што набылі здольнасьць дваццаць чатыры гадзіны ў суткі ляжаць на нарах і тупа глядзець у столь. І чым вышэйшы быў грамадзкі стан, які займаў палонны, чым больш адукаваны ён сам быў, тым больш апатычны і гультаяваты ён рабіўся. У той час як былыя рабочыя, рамізьнікі, рамесьнікі і сяляне вырэзвалі сьцізорыкамі

шахматныя фігуры, табакеркі, партабакі і веера, інтэлігенты ляжалі на баку. Уся інтэлігенцыя як чэская, гэтак і нямецкая, гніла ў палоне зажыва. Фізычнаю працаю яна таньбавала, а разумовае ня было. Інтэлігенты цэлымі днямі валяліся на нарах, лічачы за вялікую працу пайсьці па чай, за цяжкую неабходнасьць пайсьці і пасядзець у ўборнай і за нячуваны геройскі ўчынак—біць на сабе вошы. З гэтай прычыны сярод палонных лёгка льга было распазнаць чалавека з інтэлігенцыі: гэта былі самыя вашывыя з усіх. І востры народны розум стварыў, на грунце гэтых нагляданьняў, афорызм: «Чым большая адукаванасьць, тым большыя на ім вошы».

Паводле гэтага, у некаторых лягерах вошы разьмяркоўваліся па разрадах. Іх называлі, гледзячы на велічыню, «мужычымі», «настаўніцкімі», «профэсарскімі», «афіцэрскімі» і «генэральскімі». І хто лавіў на сабе дзьве «генэральскія», упэўніваў, што будзе запрагаць іх у фаэтон.

Але да самагубства з прычыны празьмернага задаваленьня жыцьцём справа амаль не дайходзіла. Людзі проста прывыкалі да гэтакага нуднага жыцьця, або пускаліся ў самыя дурныя авантуры. Яны заводзілі інтрыгі наконт каханьня, якія канчаліся звычайна вэнэрычнымі захворваньнямі, наладжвалі бойкі, займаліся плёткамі і апалосквыньнем чужых касьцей—страшныя адзнакі і вынікі вымушанага гультайства і таго, што людзі псуюцца. Жыцьцё страшна ажывёлілася, цела зрабілася вялае і слабое. Ніхто не хацеў палец аб палец стукнуць, а з прычыны таго, што вольнапісаныя і унтэр-афіцэры былі вызвалены ад працы, дык зьявілася шмат фальшывых, насьпех сфабрыкаваных чыноў. За два тыдні, у бараку, куды зьмясьцілі адных радавых, усе ўвабраліся ў зоркі і ў жоўтыя нашыўкі... А нарэшце, калі нават гультайства ўсім дадзела, людзі пачалі запісвацца дабравольцамі ва ўсялякія «легіёны», абы толькі мець новыя ўражаньні, кінуцца ў авантуру, паспрабаваць чагосьці гэтакага, пра што яшчэ ня было вядома, як яно будзе. Але фармаваньне гэтакіх «легіёнаў» крыху замарудзела, дык хто запісаўся ў іх за дабравольцаў, асталіся гнісьці ў бараках і толькі ў кожным выпадку падкрэсьлівалі, што яны інтэлігенты і таму могуць і не працаваць.

*

Прапаршчык Вараб'ёў, камэндант баракаў для ваеннапалонных у Гомелі, быў з немцаў: яго продак перасяліўся ў Расію пры Пятры I, і, хоць нашчадкі нагэтуль абруселі, што нават зьмянілі прозьвішча «Шпэрлінг» на «Вараб'ёвы», усё-ж у прапаршчыка захавалася разам з нямецкай крывёю чыста нямецкая дасьціпнасьць. Бачачы тое, як апушчана, брудна і гадка навокал баракаў, ён пачаў прыдумоўваць, якім-бы чынам прыцягнуць людзей да работы. Пагнаць на яе насельнікаў баракаў ён ня меў права; яны былі запісаны дабравольцамі ў «легіёны», і прапаршчык, ненавідзячы іх ад усяе душы, дарэмна стараўся знайсьці гэтакае выйсьце, каб, з аднаго боку, прымусіць «паноў вольнапісаных» працаваць, а з другога—не парушыць пастановаў закону.

Матэрыял, што быў ім атрыманы ў асобе расформаванай 208-й рабочай дружыны, абсалютна ні на што ня быў годны. На дварэ былі ўжо марозы, а гэтыя людзі былі босыя і голыя. Салдат, якога ён пасылаў па людзей з мётламі і лапатамі, варочаўся кожны раз з аднолькавым адказам:

— Так што ніяк нельга, ваша благародзьдзе. Памерзнуць.

І, на яшчэ большую прыкрасьць прапаршчыку, салдат дадаваў, што, калі прайходзіў па шэрагах ваеннапалонных, адно і чуваць было:

— Я унтэр-афіцэр, я вольнапісаны; мы працаваць ня будзем.

У той час, чакаючы прыезду нейкага важнага саноўніка з чырвонага крыжу, прапаршчык дайходзіў да поўнае роспачы. Басьнякі заняліся гэшэфтмахерствам. Яны куплялі на рынку сьвініну, смажылі яе і прадавалі кавалачкамі ў іншыя баракі.

— Сьвініна смажаная, сьвініна! Каму сьвініны! Сьвін!..

Басьняку гэтак і ня прышлося дагаварыць. Нечакана, нібы з неба, на галаву яму ўпала цэгла. Басьняк выпусьціў з рук скараду, пабег, абліваючыся крывёю, да сваіх і расказаў ім, што аўстрыякі хацелі яго забіць і адабраць ад яго сьвініну.

Сапраўды, мяса кудысьці зьнікла, і ў бараку пачалася бойка. Басьнякі распачалі наступ ня толькі на аўстрыякаў, але і на чэхаў, што зьмяшчаліся над імі, якіх яны вінавацілі ў здрадзе

і ўдзеле ў нападзе на іх. Ва ўсе бакі ляцелі кавалкі цэглы, пустыя бочкі з глухім звонам стукаліся аб моцныя галовы, і жалезная скаварада замяняла набой з 42-сантымэтравае гарматы. А пасьля ў справу ўмяшаліся канвойныя салдаты, спрабуючы разагнаць раздражненых байцоў.

Але басьнякі біліся, як львы, і вольнапісаныя—чэхі павярнулі свой фронт нават супроць расійцаў. Іх адціснулі і нават зьлёгку павалтузілі, так што ўзводны пабег да прапаршчыка па інструкцыі, што далей рабіць.

— Плюнь ты на іх!—адмахнуўся ад яго прапаршчык.— Заўтра я з імі сам пагавару, а каго трэба—аддам пад расстрэл. А цяпер з-за гэтых гадаў ня варта зноў абуваць боты.

З самага ранку прапаршчыкявіўся ў барак сьвежа-выгалены, ветлівы, з прыемнай усьмешачкай на твары. За ім увайшлі чалавек дванаццаць казакоў з натайкамі, але бяз стрэльбаў, і прапаршчык соладзенька сказаў:

— Вы, галубочкі, учора тут бунтаваць уздумалі? Ну, нічога! Вы-ж тут гультуеце, і ў вас кроў гуляе. Ведаю, ведаю, панове, што вы ўсе—людзі інтэлігентныя, людзі, так сказаць, з інтэлігентнага сьвет... Дык вось прашу выйсьці на двор. Прашу, панове ўнтэр-афіцэры!

Зьдзіўленыя ад гэтакае ветлівасьці, палонныя вышлі на двор, а прапаршчык зьвярнуўся да наступнае групы ваеннапалонных:

— І вы таксама калі ласка на хвілінку на двор. Я упэўнены, што і сярод вас ня мала інтэлігентаў і унтэр-афіцэраў.

Калі ўсе гэтакім чынам вышлі з баракаў, прапаршчык зноў далікатна сказаў:

— Усіх адукаваных і ўсіх, хто мае які-небудзь унтэр-афіцэрскі чын, я прашу, будзьце ласкавы, перайсьці сюды, на левы бок.

Нават калі-б у ваеннапалонных ня было прычын меракваць, што іх, як інтэлігентаў і адукаваных, не пашлюць на работу і не пакараюць, усё-ж холад быў гэтакі люты, што яны ўсе пасьпяшылі перайсьці на паказанае месца, дзе ня гэтак дзьмуў вецер. Яны рушылі ўсёй грамадою, і на старым месцы астаўся, як пень у лесе, адзін удалы ваяка Швэйк.

Да яго падышоў прапаршчык і запытаў:

— Чаму ты не пашоў з сваімі таварышамі? Чаму ты не за адно з інтэлігенцыяй.

А ўдалы ваяка Швэйк прыклаў руку да казырка і прастадушна адказаў:

— Так, што дазвольце далажыць, ніяк не магу. Я слабога розуму. Зусім слабога! Сапраўдны дурань,—растлумачыў ён прапаршчыку, калі той праўцом пачаў глядзець на яго.—Я тут ні прычым; у мяне ёсьць афіцыйная папера з вайсковай службы, што я—слабога розуму.

— Ну, тады, браце, ідзі ў барак,—нечакана сказаў прапаршчык,—ідзі адпачні.

Прапаршчык глядзеў яму ўсьлед, пакуль той ня зьнік за дзьвярыма, якія адчыніў перад ім вартавы; а пасьля ён вярнуўся да палонных, што выстраіліся ў шэраг.

— Значыцца, вы думаеце, што вы—інтэлігенты? Ну, дык я вам скажу, што вы такое! Сьвіньня вы, сьвіньня! Пацяруха сабачая—от вы што!—узбуджана гукнуў ён, з нянавісьцю гледзячы на іх.—Вы думаеце, што раз вы яфрэйтар, або унтэр-афіцэр, або студэнт, дык вам ня трэба працаваць? У сарцір вы больш ня ходзіце, а паскудзіце тут-жа, ля баракаў, топіцеся ў сваім уласным гнаі, і хутчэй згодзіцеся зьмерзнуць, як накалоць сабе дроў? Вы—палонныя, а хочаце жыць у нас, як дзеці ў нянькі! Вы—людзі адукаваныя, інтэлігентныя, але глядзеце, не перабярэце цераз край! Вось, бачыце: дзьвесьці чалавек заявілі, што яны—адукаваныя і унтэр-афіцэры, а чаму? Таму што яны гультаі і абібокі. І сярод вас знайшоўся толькі адзін, які не баіцца работы... Але я вас навучу працаваць—не сваім голасам гаркнуў ён,—бо кожны чалавек павінен працаваць. Няўжо вы, дзьвесьце чалавек, чакаеце, што на вас будуць рабіць двое, ці трое?!

— Гэй, хлопцы!—гукнуў ён да казакоў.—Палавіне з іх выдаць лапаты і мётлы, а другая палавіна будзе калоць і цягаць дровы. І каб у мяне ўвечары тут ня было ні пылінкі, каб уборныя былі вычышчаныя і пасыпаныя пяском, а унь тыя дровы,—ён паказаў на вялікую сьцірту ля самай дарогі,—каб былі паколаты і складзены ля баракаў. А хто ня будзе працаваць, таго на маю адказнасьць лупцаваць нагайкамі!

Прапаршчык крута павярнуўся і пашоў, а яму ўсьлед зазьвінелі рыдлёўкі, зашаргацелі мётлы, завішчалі пілы.

Калі палонныя вярнуліся ўвечары ў барак, ніхто не гаварыў з Швэйкам, і адно Гаршына шапнуў яму:

— Вось табе кавалачак смажанае кілбасы. Я пасьпеў зьбегаць у горад. Там ёсьць гасьцініцы і рэстораны, і мы зноў крыху падзаробім... Ну і замучылі-ж нас сёньня.

Назаўтра прапаршчык зноў зьявіўся ў барак.

— Сёньня, хлопцы, працаваць ня будзем,—заявіў ён.—Вы чай пілі ўжо? Ну і добра. Вазьмеце кожны па мяшку, і казакі завядуць вас вёрст за шэсьць адсюль, дзе ёсьць пясок. Там вы набераце ў мяшкі чыстага пяску, прынясяце яго сюды і пасыплеце ім навокал баракаў. За дзень сходзіце туды і назад па два разы.

Палонныя прышлі дадому перамерзлыя і ўтомленыя, а Швэйк у гэты час сядзеў з расійскім салдатам ля печы і гуляў у карты. Усе крывіліся ў яго бок. Пісклявы не гаварыў з ім, Марэк абыходзіў яго, і адно Гаршына ціхенька запытаў яго, чаму таварышы кінулі яго. На гэта Швэйк рашуча адказаў:

— На сьвеце бываюць гэтакія выпадкі, што ніхто ня ведае і не разумее, як і чаму. Людзі зьмяняюцца, здраджваюць і ня маюць сталасьці. Напрыклад, я ведаў нейкага Перглера, музыку, які быў найлепшы друг Мацея Труларша, таксама музыкі. Гэтакія ўжо былі прыяцелі, што, здаецца, іх вадою не разьліць. І вось Перглеру яго дзяўчынка падаравала на ўгодкі яго нараджэньня ножык—цудоўны ножык, з касьцяным тронкам. Перглер гэтым ножыкам вельмі ганарыўся і ўсім яго паказваў. Раз ішлі абодва прыяцелі дадому з Матошына, дзе ім давялося граць на вечарынцы; раптам Мацей глядзіць—ляжыць у рове здохлая жаба, і ні з таго, ні з сяго кажа да Перглера: «Дай адно мне твайго ножыка»—«Нашто?»—пытае той. «Давай, патрэбен мне. Пасьля будзеш ведаць. Дай, будзь ласкаў!»—не пакідае прасіць. Ну, той выцягнуў ножык з кішэні, нават сам адчыніў і даў прыяцелю. А Мацей разрэзаў сьмярдзючую здыхліну на дзьве палавіны дый кажа: «Каб ты бачыў, які я табе друг, можаш выбраць сабе якую сам хочаш». Тут Перглер як дасьць яму ў зубы, і абодва прыяцелі гэтак біліся, што чуваць было

ў самым Матошыне. Людзі зьбегліся паглядзець, што там гэтакае робіцца, і ніхто ня мог зразумець, чаго старыя прыяцелі гэтак б'юцца, што аж пух ляціць... Вось гэтак-жа без усялякае прычыны таварышы пакрыўдзіліся на мяне,—горна ўздыхнуўшы, скончыў Швэйк. Праз некалькі дзён у барак зьявіліся эмісары, што павінны былі накіраваць дабраахвотнікаў у запаведныя легіёны. Уночы яны паехалі, і з былой 208-й рабочай дружыны з імі паехала некалькі чалавек, у тым ліку Марэк і Пісклявы.



Пасьля гэтых падзей, асталявалася раньняя, але даволі мяккая зіма. Гаршына бадзяўся па рэсторанах і карчмах, паказваючы сваё ўмельства жонгляваньня, а Швэйк, які выходзіў толькі на рынак прадаваць пярсьцёнкі, вырабляць якія ён зноў пачаў, сядзеў тымчасам у бараку, нецярпліва чакаючы, калі яго прыяцель вернецца з мяшком, поўным хлеба і астаткамі патраў, якія яму давалі афіцыянты і кухары.

Такім чынам, яны харчаваліся нішто і нават патаўсьцелі. Гаршына прыносіў расійскія газэты і вечарамі чытаў Швэйку тэлеграмы, якія паведамлялі, што на фронце бяз зьмен і што казачы разьезд траха не захапіў у палон самога Вільгельма, якому ўдалося выратавацца адно з тэй прычыны, што ўкруціўся ў белае прасьцірадла і казакі, гэтакім чынам, згубілі яго з вачэй сярод сьнягоў. А Швэйк, шліфуючы цьвікам пярсьцёнак, дадаў:

— Бач ты, здагадаўся захапіць з сабою прасьцірадла, і гэта выратавала яму жыцьцё. А вось калі я служыў, адбываючы вайсковую павіннасьць, дык адзін радавы павесіўся на прасьціградле. Ён яго парваў, зьвіў у вужышча і павесіўся на дзьверах. Відаць, ня кожная рэч дзейнічае на ўсіх роўна.

— У немцаў,—чытаў далей Гаршына,—тэкстыльная прамысловасьць нагэтулькі разьвіта, і выпрацоўвае гэтак многа белага матэрыялу, што ўвесь нямецкі фронт зацягнены белымі прасьціградламі, дык нямецкіх акопаў і ня відаць, што, вядома, перашкаджае працаваць нашай артылерыі.

— А калі там чалавек накіроўваецца на фронт,—перабіў яго Швэйк,—каханая жонка, праводзячы яго, кажа: «Ну, з богам, ідзі ўміраць за бацькаўшчыну. Стрэльбу ўзяў? Патроны так-

сама? Ах, божачка мой, я-ж зусім забыла даць табе белае прасьціраддла!» Забабонныя жонкі даюць мужу прасьціраддла, якое было паслана ў іх у шлюбную ноч.

З прычыны гэтакага чытаньня, разумовы кругагляд Швэйка вельмі вырас. Ён быў у курсе кожнай ваеннай опэрацыі, кожнага дыплёматычнага выступленьня, кожнага кроку папы рымскага, што быў накіраваны на стварэньне міру і кожны раз, калі яго сьвятасьць зьвяртаўся з пастырскім пасланьнем да ўсіх, што ваююць, каб спакласьці канец бойцы, якая не давала ніякай выгады служкам царквы, бо забітых закопвалі без царкоўнае адправы і пахавальнага звону,—Швэйк уздыхаў:

— Ах, якое ў сьвятога айца добрае сэрца! А як-жа, гэта-ж ня глупства! Ён-жа адказвае перад богам за ўсё, што тут адбываецца. Калі ён памрэ і ўзьнясецца на неба, яго запытаюць: «Як гэта ты дапусьціў, каб ля нябеснае брамы, адбываўся гэтакі гармідар! Хіба ты ня ведаў, раз ты бязгрэшны, што ў нас на небе няма месца на гэтакі натоўп народу! Што мы цяпер будзем рабіць з усімі гэтымі людзьмі? У нас будзе сапраўды нябесна-кватэрны крызіс!

Нейк увечары Гаршына як віхор уляцеў у барак, размахваючы газэтай. Разгарнуўшы перад носам у Швэйка «Русское слово», ён коратка сказаў:

— Неўзабаве мір! Франц-Юзэф памёр!

— Езус-Марыя!—гукнуў Швэйк.—Ня можа быць! Як гэта ён адважыўся кінуць сваіх вернападданых у гэтакі цяжкі час! Гэта, мусіць, памылка!

Гаршына паказаў пальцам на чорны шрыфт тэлеграмы: «Парыж. Паводле атрыманага з Цурыху паведамленьня, сёньня ўночы памёр, пасьля доўгае хваробы, аўстрыяцкі імпэратар Франц-Юзэф».

— Небарак!—спачувальна сказаў Швэйк.—Значыцца, і ён супакоіўся ў абрамавым лоне. І нават не дажыў да таго, каб убачыць як мы выграем вайну! Я так думаю, што гэта яму, калі ён уміраў, было крыўдней за ўсё. А як-жа пачаць гэтакую вялікую, слаўную справу і не дачакацца, чым яна скончыцца! Значыцца, мы цяпер сіроты, і ня можам нават пасьці на пахаваньне нашага цара. Гэта яму таксама ня вельмі будзе прыемна.

Швэйк палез на нары, узяў газэту і пачаў высьлібізоўваць тэлеграму.

— Але, мусіць, яно гэтак і ёсьць,—сказаў ён праз некалькі хвілін.—Раз тэлеграма з Цурыху, дык яна праўдзівая. Цурых—гэта-ж Швэйцарыя, а ў Швэйцарыі ня хлусяць. Значыцца, наш старэнькі сапраўды ўзяў дый памёр. Што-ж, пахаваньне ў яго будзе шыкоўнае. Вянкоў і кветак будуць, мусіць, цэлая горы.

Швэйк зусім засумаваў, і калі салдаты паклікалі яго гуляць з імі ў карты, ён ціха адказаў з нар:

— Не, ня буду. Учора вы абабралі мяне да апошняй капеечкі, а сёньня я не прадаў аніводнага пярсьцёнка. А, апроч таго, у мяне жалоба: памёр наш імпэратар.

— Бач ты, здох, славач, разгэтак яго маць!—выказалі свае спачуваньне расійскія салдаты.—А наш цар-бацюшка ўсё яшчэ жывы...

Гэта гучэла і так, і гэтак, дык і нельга было зразумець, ці жадалі яны свайму цару доўгага жыцьця, ці як найхутчэй яму памерці...

Праз некалькі дзён Швэйк накіраваўся з сваімі пярсьцёнкамі на рынак. Рыначны пляц быў повен народу. Жанчыны гандлявалі гуталінам, грабянцамі і ўсялякай дробязою, мужчыны—мясам і сланечнікам, а салдаты—бялізнаю і парусінаю. Часамі яны мянялі боты, аддаючы свае новыя за прыплату некалькіх рублёў і тут-жа нацягваючы старыя і парваныя. Раз-по-разу на рынку зьяўляліся вайсковыя пікеты, што лавілі салдат, якія прадавалі казённую маемасьць.

Швэйк прыпыніўся, пазвоньваючы нанізанымі на шнурочак пярсьцёнкамі. Навокал яго сабраўся натоўп і пачаў выбіраць і таргавацца, мяркуючы заплаціць за адзін пярсьцёнак, а два ўкрасьці. Раптам натоўп расступіўся, даючы дарогу тоўстаму барадатаму папу, што ішоў проста на Швэйка.

— Ён мусіць хоча падараваць парачку сваім дзецям,—сам сабе сказаў Швэйк і пачаў размахваць пярсьцёнкамі ў яго перад вачыма. Бацюшка ўзяў іх у рукі і пачаў уважліва разглядаць. Швэйк заўважыў, што ён адклаў убок тыя, у якія былі ўстаўлены каменчыкі з чырвонага цэльлюлёіду ў выглядзе крыжыка, і, думаючы, што бацюшка зьбіраецца купіць толькі пярсьцёнкі

з крыжыкамі, выцягнуў цэлае вясло гэтакіх пярсьцёнкаў з кішэні.

— Добра, добра!—пахваліў бацюшка.—Вось я іх усе ў цябе і адбяру. Гэтакімі гандляваць забараняецца.

— Чаму? Што такое?—запытаў Швэйк, бачачы, што бацюшка хавае пярсьцёнкі ў расу, нават не запытаўшыся пра цану на іх.

— Няможна, няможна,—яшчэ раз сказаў поп.—На іх ёсьць сьвяты крыж, а ты прадаеш іх ніжэйшым чыном. А ты ведаеш, што яны з імі робяць? Яны ўскладаюць іх на палец, а пасьля расшпільваюць сабе гэтакаю рукою штаны, калі йдуць даветру.

Салдаты, што стаялі навокал, зарагаталі. Бацюшка пачырванеў.

— І яшчэ горш таго: мацаюць баб рукамі, на якіх вось гэтыя самыя пярсьцёнкі.

Рогат грунуў яшчэ мацнейшы. Поп, нібы раззлаваны індык, хацеў быў пайсьці, але салдаты, як-бы згаварыўшыся, загарадзілі яму дарогу.

— Бацюшка, аддайце аўстрыяку пярсьцёнкі, або заплацеце,— сказаў адзін з іх.—Няможна-ж чалавеку дарэмна працаваць! Аддай, чуеш?

— Аўстрыяк не чалавек, а наш забойца,—узгарэўшыся, адказаў поп.—Хто яму дазволіў гандляваць пярсьцёнкамі? Бач, прыехаў сюды наш рускі хлеб есьці! Усю Расію, яны, паганыя, аб'елі! Ды яшчэ пярсьцёнкі майструе, праваслаўную веру зьневажае!

Пасьля яго слоў у натоўпе пачуўся спачувальны гул. Бацюшка зачапіў слабую струнку гэтых людзей; мужыкі і бабы адчулі прыліў патрыётызму, але салдаты ўпарта дамагаліся свайго:

— Гэта, бацюшка, справа ня вашага розуму... Мы яго ў палон узялі... Дык з якога права вы ў яго яго дабро адбіраеце. Ён салдат, значыцца—наш брат вайсковы. Значыцца, яму паводле нашых законаў і адказваць.

— Ды чаго на яго глядзець. Бі яго, калі ён бяз дай прычыны чалавека крыўдзіць!—провокацыйна гукнуў хтосьці ў задніх шэрагах, ад чаго ўпартасьць у салдат яшчэ павялічылася.

Яны, зьлёгку насядаючы на папа, прымусілі яго падыйсьці шчыльна да Швэйка, гаворачы:

— Аддайце, бацюшка, пярсьцёнкі, або плацеце грошы. Эй, чуеш, аддайце!..

Да папа з пагрозаю працягнуць з два дзесяткі рук. Тады ён палез у кішэню расы, але дастаў адтуль не пярсьцёнкі, а нумар «Биржевых ведомостей». Разгарнуўшы яго, ён салодкім голасам запытаў Швэйка, паказваючы на портрэт:

— Хто гэта? Ты яго ведаеш?

— Гэта наш нябожчык імпэратар,—спакойна адказаў Швэйк.

— Так, так,—згодзіўся поп,—гэта ваш цар. Ён памёр. Чаму-ж ты ня молішся ў царкве за яго душу, а гандлюеш на рынку пярсьцёнкамі? Чаму ты ня носіш жалобы па ім?

Усе навокал прыціхлі. Справа пачынала быць цікаваю. Бацюшка, упэўнены што ён перамог, паказаў на зьмешчаны побач портрэт:

— Ну, а гэтага ведаеш?

— А як-жа! Гэта кандыдат на трон, эргэрцог Карл,—сказаў Швэйк і неабдумана дадаў:—Ён мне сваімі рукамі начапіў мэдаль, так што нават усе грудзі мне пакалоў.

— Значыцца, ён падараваў табе мэдаль за тое, што ты ў нашых страляў?—з адмысловым націскам сказаў бацюшка, хітра падміргнуўшы салдатам.—За каго-ж ты цяпер стаіш? За Франца-Юзафа, ці за Карла?

— За Карла,—простадушна адказаў Швэйк.—Кожны салдат павінен стаяць за свайго цара.

Бацюшка, убачыўшы, што мужыкі гатовы павалтузіць Швэйка за бакі, урачыста тыкнуў пальцаў у адно месца ў газэце і крыкнуў:

— От бачыце, хлопцы! Ён стаіць за свайго цара Карла, які хоча ваяваць з намі пакуль не пераможа нас. Пра гэта ў газэце пішуць.

Хтосьці добра даў Швэйку ззаду па карку. Бацюшка пачаў ціснуцца праз натоўп, мяркуючы, што Швэйк застанецца адзін расхлёбваць кашу, якую ён заварыў. Але ў гэты момант пачуўся Швэйкаў голас:

— Бацюшка, га бацюшка, вы-ж хлусіце! У газэце пішуць зусім ня гэтак, але толькі я не магу прачытаць што.

— А я-ж вам казаў, што трэба біць доўтагрывых!—зноў гукнуў, выскачыўшы наперад перад бацюшкам, той самы хлопец, што ўжо раз прапанаваў гэтакі спосаб узьдзейнічаньня.—Чаму ён паказвае чалавеку, які ня ўмее чытаць, газэту? Глядзі, хлопцы, гэты аўстрыяк па-расійску ня ўмее чытаць, а поп яму кулі залівае... Аддавай пярсьцёнкі, а не дык!..

І ён моцна рвануў бацюшку за руку.

— Ой, праваслаўныя! Ой, б'юць, забіваюць! Гвалт!— заенчыў бацюшка. Кірмаш заварушыўся, і людзі, не разабраўшыся, што за справа тут, палезьлі адзін на аднаго з кулакамі. Бабы зьбілі Швэйка з ног, лаючыся на чым сьвет стаіць, а салдаты атакавалі баб і прымусілі іх уцякаць. Падасьпела паліцыя і разагнала натоўп і затрымала тых, праз каго пачаўся гвалт.

Добра такі натузанага бацюшку, у сінякох і гузох, пасадзілі на рамізьніка, які заўважыўшы, што з бацюшкавае кішэні тырчаць пярсьцёнкі, не пасаромеўся іх прысвоіць. А ўдалага ваяку Швэйка завялі проста пад аховаю штыкоў у канцылярыю да прапаршчыка Вараб'ёва.

Прапаршчык, які працаваў да прызваў за інжынэра на адной з фабрык у Варшаве, зацікавіўся швэйкаваю справаю. Ён загадаў яму падрабязна расказаць, як усё было, што сказаў бацюшка, як трымалі сябе салдаты і што яны крычалі да таго, калі пачалі біць папа, і чаму, як думае Швэйк, яго наогул білі. Нарэшце ён запытаў Швэйка:

— А як ты думаеш, чаму цябе самога не пабілі?

— Не магу знаць, ваша благародзьдзе,—адказаў Швэйк фразаю, якую чуў ад расійскіх салдат,—але думаю, што яны мяне ня білі таму, што хочуць жыць з намі мірна. Яны ня любяць начальства, бо ведаюць, што хто стаіць над імі, той з іх зьдзекуецца. У нас, дазвольце далажыць, гэтых дармаедаў папоў таксама ня любяць.

Прапаршчык глянуў на Швэйка павесялелымі вачыма і сказаў па-нямецку:

— Можаш ісьці. А здорава цябе бабы патузалі.

Пасьля ён упаў у доўгі одум і, здавалася, зусім не заўважаў Швэйка, які стаяў перад ім. І толькі калі той грукнуў цяжкімі ботамі і ўдала аддаў чэсьць, прапаршчык сказаў:

— Ну, ідзі.

У сенцах Швэйк спыніўся і прыслухаўся: прапаршчык высьвістваў «Марсэльезу».

На запытаньне Гаршыны, хто яго гэтак згвалтузіў, Швэйк адказаў:

— Тут у нас зноў адбылося маленькае непаразуменьне, гэта значыцца, у мяне з адным папом, што хацеў паказаць мне сваю інтэлігентнасьць. Ён уздумаў украсьці ў мяне пярсьцёнкі і адгаворваўся тым, што на іх ёсьць крыжыкі. А я яму растлумачыў, што ня ўмею чытаць, што я няпісьменны; ну, бабы мяне за гэта і памялі. Але затое папу паказалі салдаты, што такое інтэлігентнасьць. Калі я працаваў у шахтах, там таксама здарылася штосьці падобнае. Наогул, на сьвеце ёсьць шмат такога, што вельмі падобна адно на адно, але толькі па-рознаму завецца. І кожны называе гэта так, як умее.

Швэйк падзьмуў на сваю падзёртую руку і гаварыў:

— Прыехаў нейк да нас на работы старшы інжынэр з адным вышэйшым чыноўнікам з судзейскіх і пачаў паказваць яму шахту. А калі прайходзілі паўз стайні, інжынэр і кажа: «Давайце, зойдзем сюды. Я пакажу вам нязвычайна інтэлігентнага каня». Былі там усялякія коні і між іншага побач у праварынах—вараны і сівая кабыла. «Дайце кабыле сена. Кіньце сена па падлогу»—кажа інжынэр да канюха. Той кінуў бярэмя, і кабыла пачала есьці. Але тут вараны прасунуў нагу пад перагародку і да тых часоў згрэбаў сена, пакуль яно не апынулася ў яго; тады пачаў жаваць яго, а кабыла толькі тупа паглядвала. «Сапраўды, якая здагадлівая жывёла»,—сказаў судзейскі, а інжынэр дадаў: «Так, наш вараны, можна сказаць, інтэлігентная жывёліна». Канюх Франц Фрушэк на гэта скрывіўся, і ён дазволіў сабе зьвярнуцца да судзейскага з маленькаю заўвагаю: «Але, вараны заўсёды гэтак робіць, і мы лічым яго за гэта проста за спрытнага злодзея. А вось цяпер я першы раз чую, што гэта інтэлігентны ўчынак. Ну, а што пане райца, калі я выцягну ў вас гадзіньнік, вы таксама скажаце пра мяне, што я выявіў вялікую

здагадліваcьць, або пашляце па паліцыю і запатрабуеце пасадзіць круцяля і злодзея за краты?» І выйшла пасьля з гэтага цэлая гісторыя, якое табе з тваімі дурнымі мазгамі ніколі не зразумець,—скончыў Швэйк.—Напрыклад, калі шахцёр цягнуў да сябе дадому крадзены вугаль, ён сьмяючыся, казаў: «Гэта ў мяне выявілася інтэлігентнасьць!» Або калі контролёр патрабаваў хабару, дык пра яго казалі, што ён вельмі «інтэлігентны» чалавек. І нарэшце слова гэтае стала там за самую апошнюю лаянку. Бургамістрава дачка падала ў суд на жандарскага вахмістра, бо ён у лісьце, у якім рабіў ёй прапанову пайсьці за яго, напісаў: «Я вельмі захапляюся вамі, вы гэтакая інтэлігентная дзяўчына». А з карчмы выкінулі аднаго комівояжэра, які, хочучы прадаць гаспадару цынтрыфугу, сказаў: «Купеце сабе гэтакую штуку, я вам раджу. Паверце, наша марка—лепш за ўсё, я вам кажу гэта як інтэлігентнаму чалавеку».

— Швэйк, чым далей, тым ты робішся разумнейшы,—пахваліў яго Гаршына.—Гэта праўда, што людзі лаюцца між сабою па-рознаму. У мяне самога была кватэрная гаспадыня, якая клікала сваю дачку, калі лаялася з ёю, «філярмонічнай сымфоніяй». А дачка варочалася дадому звычайна толькі пад раніцу і адказвала маці гэтак: «Паважнай дзяўчыне сапраўды даводзіцца чырванець, што ў яе гэтакая «суконная» маці».

— Што-ж, гэта бывае,—згадзіўся Швэйк,—што людзі блытаюць словы. Гэтакі выпадак быў у нас у 91-м палку. Стаю я нейк за днявальнага ля брамы казармаў, і раптам прыходзіць да мяне нейкая старэнькая, гэтакая сапраўдная цёмная вёска, і кажа, што ў яе тут у палку ёсьць сын, Нозак па прозьвішча і каб я яго выклікаў. Я ёй растлумачваю, што гэта будзе цяжкавата, боНовакаў у нас як сабак нярэзаных, у аднэй нашай роце іх сямнаццаць чалавек. А яна нават ня ведала ў якой ён роце і балбоча ўсё адно: «Ну але, пакліч, сынок, Венцаслава Новака. Ён гэтакі сабе русы, і на мяне падобны». А калі я ёй нарэшце дакляраваў яго пашукаць, яна раптам успомніла, што ён на вайсковай службе ў вялікім чыне і ўсе яго слухаюць. Я пачаў ёй пералічваць: генэрал-лейтэнант, генэрал-маёр, палкоўнік, маёр, капітан, паручнік, падпаручнік, прапаршчык, а яна ўсё трасе галавою, што гэта ня тое. Тады я называю ёй унтэр-афіцэрскія чыны:

фэльдфэбель, узводны, капрал, яфрэйтар. Тут яна ўжо зусім засумавала і шэпча: «Не, не, ня тое». Нарэшце я з роспачы кажу: «Можа ён барабаншчык або гарніст?» Дык яна як гукне: «Вось, вось, гэта самае! Ён нам гэтак і пісаў,—што ён гарніст».

Швэйк разьлёгся на нарах і глыбока ўздыхнуў:

— Эх, каб чалавеку ведаць, што яго чакае і чаго ён ня міне!

15

ШВЭЙК РОБІЦЬ РЭВОЛЮЦЫЮ

Я нагэтулькі сьмелы, што дазволю сабе сьцьвярджаць вось што: аўтары падручнікаў, на якіх вучыліся мы і наша пакаленьне, былі фэномэнальныя ідыёты. У жыцьці ўсё выходзіць іначай, ніж тое, што вычытваюць дзеці з кніг, напісаных мудрымі старымі і акадэмікамі, для асьветы юнацтва і на славу айчыны і дынастыі.

Напрыклад, у той час, калі я вучыўся ў пачатковай школе, у нашай хрэстаматыі было апавяданьне пад загалоўкам: «Сотня глупстваў замучыла асла да сьмерці».

Гэтае апавяданьне напісаў няйначай куды большы асёл за таго, пра якога ішла гутарка; а тымчасам, за аўтара яго быў даволі выдатны пэдагог. Сюжэт быў гэтакі: гаспадар павёз на сваім асьле продукты на рынак. Па дарозе знаходзіць шмат рэчаў, якія здаюцца яму патрэбнымі для продажу. Ён зьбірае іх і нагружае на асла, прыгаворваючы: «Гэта-ж глупства гэтага мой асёл нават і не адчуе». Нарэшце гэтая сотня глупстваў давяла да таго, што асёл пад цяжарам іх упаў і здох.

Відаць, аўтар гэтага навучальнага апавяданьня ніколі не спатыкаў сапраўдных, чатырохногіх аслоў, або думаў, што ўсе вучні будуць з цягам часу за чыноўнікаў падатковага кіраўніцтва, якія будуць душыць народ непасільнымі падаткамі. А можа ён хацеў папярэдзіць іх, што яны самі ператворацца ў выплатнікаў падатку, і даць ім прыклад, як яны павінны будуць пакорліва і моўчкі нясьці на сабе падатковы цяжар, пакуль не ўпадуць і ня здохнуць?.. Словам, і так, і гэтак—надзвычай узвышаная тэндэнцыя, мараль якое павінна быць захаванай у памяці.

Чалавек, што сапраўды меў справу з асламі, апісаў-бы гэта зусім іначай і куды больш праўдзівей: як асёл, адчуўшы на сабе залішне вялікі цяжар, спыняецца, і ня ідзе далей, як ён пачынае брыкацца, калі яго пачынаюць вельмі паганяць кіем, і як ён, нарэшце, налаўчыўшыся, б'е свайго гаспадара капытамі між вачэй, скідае з сябе груз і ўцякае ў поле.

Дачыненьне народаў і армій да вайны было якраз тэтакае-ж, як у асла ў хрэстаматыі да грузаў, які ўсё зноў і зноў накладалі на яго. Гэта таксама былі ўсе нібы «глупствы», але іх прымалі далёка не спакойна. Пасьля пяцьдзесятага «глупства» эўрапэйскі асёл занатурыўся. І перш за ўсё ў Расіі, бо там ня было гэтак многа соцыял-дэмакратаў, якія ўзялі-б асла за павады і пачалі-б яго ўгаворваць ісьці далей, бо яго цяжар яму вельмі да твару і выгода яго гаспадара ёсьць і яго выгода, бо калі гаспадар заробіць, дык пабольшыць жменю сена і свайму аслу. Там, у Расіі, асёл ішоў толькі з сваім кармільцам-гаспадаром, царскім урадам, які не шкадаваў кія, як толькі заўважаў, што асёл зьменшвае крок. Уся бяда для расійскага ўраду была ў тым, што ён ня здолеў штучна разьвесьці ў сябе пароду соцыял-дэмакратаў. Калі-б ён здагадаўся вывесьці іх, як куранят у інкубатары, Мікалай II і цяпер спакойна панаваў-бы ў славу божыю і на шчасьце свайго народу.

А ўся рэшта Расіі была-б тым аслом, які здыхае.

*

Забойства Распуціна, чалавека, што, дзякуючы свайму сьцьвярджэньню, нібы яму зьявіўся бог, зрабіўся за фаворыта царыцы і яе пяці дачок і за духоўнага ўцяшальніка ўсіх прыдворных дам, дух якіх ён узносіў да нябёс прынцыпіяльна толькі ў пасьцелі, ускалыхнула ўсю Расію, як буйны віхор калыша магутны дуб з падгнілымі каранямі. Гэта здарылася якраз у тую зіму, калі Швэйк, што быў пакінены ўсімі сваімі таварышамі, заядла выраблляў алюміневыя пярсьцёнкі. Няпісьменныя расійскія салдаты зьбіраліся вечарамі навокал Гаршыны, які прыносіў ім газэты. Ён чытаў ім голасна доўгія артыкулы наконт забойства гэтага чалавека, якога вызнавалі каб траха дык за сьвятога, чытаў усе гэтыя здогадкі і меркаваньні пра матывы забойства,

і расійскія мужыкі, падпёршы рукою шчокі, уважліва слухалі, устаўляючы сягды-тагды свае заўвагі.

— Вось дык начальства ў нас, мацъ яго!..

— Ён, падла, забаўляецца, а людзі за яго на фронце ўмірай!..

— Бач ты! А яшчэ царыца! Немка праклятая, каб на яе халера!

— Вось, вось! У Пецярбурзе шашні разводзяць, а цябе тут у акопах вошы ядуць!

— Не, трэба канчаць вайну! Перабіць усё начальства і пайсьці дадому!

Праўда, гэтак салдаты гаварылі толькі паміж сабою, не паказваючы і выгляду перад унтэрамі або афіцэрамі. А пасьля гэтакіх тутарак яны ішлі ў барак і сьпявалі народны гімн. Унтэр-афіцэр Ананьін, пад начальствам якога была варта, што займала разам з палоннымі адзін барак, быў вельмі набожны і адданы свайму монарху.

Ён прызнаваў толькі сьпірытус, гадзячыся паліторы, і марыў пра тое, што неўзабаве зноў дазволяць продаж гарэлкі і можна будзе напівацца да самага нельга, каб адчуваць сябе добра на сьвеце. У хвіліны асаблівага ўзьнятага настрою, ён стараўся дастаць хоць-бы бутэльку саматону, які ён піў проста з горла. І тады, ня гледзячы на ўсю сваю адданасьць цару, ён ня мог утрымацца, каб не падумаць сам сабе: «А толькі дарма ён вайну ўздумаў і гарэлку забараніў, мацъ яго разтак».

Расійскія газэты пачалі пісаць усё вастрэй і сьмялей. У арміі тлеў дух абуранасьці і газэты яго падтрымлівалі. Аднойчы, калі Гаршына чытаў голасна артыкул, што патрабаваў перадачы ўсёй улады народнаму прадстаўніцтву, і салдаты паставіліся спачувальна да гэтае думкі, у барак увайшоў прапаршчык Вараб'ёў.

Паглыбіўшыся ў газэту, ніхто яго не заўважыў. Ён спыніўся ззаду за салдатамі і прыслухаўся да заўваг, што падаваліся на гаршынаву чытанку.

— Бач, гад які выявіўся, Сухамлінаў, мацъ яго!..

— Ну, але кажуць, цяпер хутка вайне канец. Усё немцам прададзена.

— Вядуць нас проста як жывёлу ў разьніцу!

— Трэба перабіць усё начальства і сказаць немцам, каб яны таксама сваіх афіцэраў пабілі!

— З-за гэтакае курвы, з-за немкі, нашага брата па мордзе лупяць!

— Усюды, значыцца, тая-ж песьня,—сказаў сам сабе прапаршчык, па-ціху выходзячы з барака, і, наняўшы рамізьніка, паехаў да сябе на кватэру. Там ён замкнуўся ў сваім пакоі, дастаў з шуфляды паперу і пачаў штосьці пісаць. Падумаўшы, ён шпарка накідаў некалькі радкоў і толькі тады вывеў над імі: «Т а в а р ы ш ы».



— Сёньня я іду на рынак,—сказаў праз некалькі дзён Швэйк да Гаршыны, які зноў зьбіраўся зрабіць візыту сваім колегам офіцыянтам, што кармілі яго з пачуцьця солідарнасьці.—Тавару ў мяне нарыхтавана шмат, і ён падае ў цане. А хлеб усё даражае, сала—таксама, і чым далей, тым цяжэй будзе што-небудзь купіць.

— Добра, прадавай,—мудра заўважыў Гаршына,—але глядзі, язык трымай за зубамі. Учора ўвечары ў рэсторане расказвалі, нібы ў Петраградзе ўспыхнула рэволюцыя. Офіцыянты штосьці гэтакае чулі, нібы там стралялі і цяпер яшчэ страляюць. Можа быць, там адбываецца галодны бунт?

— Тут таксама ўсё варушыцца,—адазваўся Швэйк.—Невялікая заваруха магла-б пачацца і тут. Ну, але я ўмешвацца ні ў вошта ня буду, буду трымаць нэўтралітэт. Пачакай, я пайду з табою разам.

Яны пашлі поплеч у горад па гразкай дарозе, на якой раставалі кучы сьнегу.

— Так што, калі што здарыцца, пастарайся ня ўлопацца ў гісторыю,—зноў пачаў Гаршына пераконваць Швэйка, бачачы казачыя разьезды, якіх дагэтуль у горадзе ня было.

— Ну, я-ж ня тэтакі дурань, і розуму ў мяне ў самога на гэта хопіць,—адказаў яму Швэйк.—Я табе кажу, што буду нэўтральны. Можа-ж са мною ня здарыцца гэтак, як з нейкім Губачакам, якога я спатыкаў у Кашыршы ў карчме «Млын». Нейк раз пасправачаліся між сабою ў гэтай самай карчме Губа-

чакаў сын, яго зяць і зяцяў швагер; спачатку паспрачаліся, а потым і пабіліся, ды гэтак, што аж пух ляцеў. Ну, людзі паклікалі старога Губачака, каб ён прышоў разьвёў іх, бо гэта яго сваякі і павінны яго слухаць, а ён кажа: «Што мне да таго, што яны паміж сабою не паладзілі. Няхай як знаюць, так і робяць. А я трымаю нэўтралітэт». Нарэшце давялося выклікаць Сьміпаліцыю, якая гэтых эбойцаў затрымала і пасадзіла пры Сьміхаўскім арыштанскім доме. Вярнуліся яны дадому толькі на чацьвертыя суткі і давай удваіх лупцаваць старога: «Чорт яго ведае што такое,—крычыць адзін,—вы мой цесьць, а дазваляеце, каб мяне біў гэтакі смаркач, як ваш сын». А сын крычыць: «Дальбог, з аднэй мы сям'і, аднэй мы крыві, а ты нават і не паспрабаваў мяне абараніць, калі мяне павялі пад арышт». І гэтак яны старога аддубасілі, што давялося накіраваць яго ў больніцу, і там ён з сьлязьмі сказаў дактаром, якія прыкладвалі яму лёд і ўсялякія прымочкі: «Маладыя людзі, дзеля ўсяго сьвятога на сьвеце, паслухайце мяне старога: калі дзе пачынаецца бойка, дык не заставайцеся нэўтральнымі, а будзьце радыкальнымі. Будзеце вы на тым баку ці на гэтым, гэта ўсёадно, але—беце. А калі будзеце нэўтральнымі, дык вас узгрэюць і тыя і гэтыя. Вось усе гэтыя сінякі і гузы ў мяне ад нэўтралітэту, каб на яго халера!»

Праз гадзіну Швэйку прышлося пераканацца, што спагадная для яго тавару кон'юнктура мінулася. Справа пашла дрэнна; ніхто нічога ня купляў. Людзі шумелі і спрачаліся:

— Гэта сумысьля тэлеграму затрымалі. А ён проста з Піцера прыехаў...

— Але-ж камэндант тэлеграму атрымаў! Чаму-ж ён не прачытаў яе салдатам?

— На ўсіх заводах забастоўка... Учора прыяжджаў адзін чалавек з Петраграду, каб, значыцца, і тут баставалі. Кажуць, там—рэволюцыя.

— Чулі? Кажуць цара больш няма ў нас!

— Як няма? Хіба можна без цара?

— Дурань! Бяз хлеба, сапраўды нельга. А на якое табе ліха той цар!

Швэйк зразумеў, што тут рыхтуецца штосьці грандыёзнае і схаваў пярсьцёнкі ў кішэню. Пасьля ён павярнуў з рынку на галоўную вуліцу, насустрэчу натоўпу, што рынуў да камэндантуры.

Казачыя патрулі і пікеты прайходзілі і праяжджалі ва ўсе бакі, нібы нікога і нічога не заўважаючы; гарадавыя стаялі па дваіх і па траіх на вулічных скрыжаваньнях, з страхам і непакоем чагосьці чакаючы.

І раптам з бакавое вуліцы вышла група забастоўшчыкаў-рабочых, пасярод іх хваляваўся чырвоны сьцяг. Гарадавыя кінуліся адбіраць сьцяг. Але натоўп абкружыў іх шчыльным колам, так што яны не маглі нават абараняцца сваімі шашкамі. І не пасьпелі гарадавыя зьнікнуць, нібы лясчынкі ў вялікім натоўпе, як адусюль чувацЬ сталі выгукі:

— Няхай жыве рэволюцыя! Бі гарадавых, бі фараонаў!

Над натоўпам заварушыліся кулакі і кіі, і град udараў сыпануўся на гарадавых. Стараючыся закрыць галаву рукамі, яны ледзьве выбраліся на волю і ўцяклі.

Вайсковыя часьці ўсё яшчэ бязьдзейнічалі. Раптам аднекуль зьявілася рота салдат, з чырвонымі стужачкамі на грудзях. На чале іх ішоў прапаршчык Вараб'ёў. Перад будынкам камэндантуры салдаты паднялі яго на плечы, і ён, размахваючы шапкаю, гукнуў:

— Таварышы, салдаты і рабочыя! У Петраградзе пачалася рэволюцыя. Цара прымусілі адрачыся трону, і стары ўрад скінены. Цяпер там улада ў руках савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў! Улада паліцыі і адміністрацыі адменена і тут, і цяпер адбываюцца выбары ў наш мясцовы савет, які будзе тут усім кіраваць. Таварышы, вайне будзе зроблены канец. Зямля будзе аддадзена сялянам, а фабрыкі і заводы будуць належаць да саміх рабочых. Няхай жыве рэволюцыя! Няхай жывуць рэволюцыйная армія і рэволюцыйны пролетарыят!

З якогасьці акна грунула некалькі стрэлаў; кулі папалі ў сьцяну насупроць, і натоўп абурыўся.

— Гэта гарадавыя страляюць! Сволачы! Пабіць іх!—чуваць было з усіх бакоў.

Натоўп рынуў на гарадавых, якія кінуліся ўцякаць. Надышла на іх горкая хвіліна. Хоць яны і пасьпяшылі паскідаць з сябе шапкі і цэшкі, усё-ж іх пазнавалі па сініх форменных нагавіцах і з імі бязьлітасна распраўляліся. Ведаючы, што нагавіцы могуць заўсёды пашкодзіць ім цяпер, гарадавыя стараліся ўсялякімі спосабамі схаваць іх.

Такім чынам здарылася, што Швэйк убачыў у падваротні нейкага чалавека, які стаяў у адных сподніках і дрыжаў усім целам з холаду і страху. Швэйк здагадаўся, што гэта гарадавы, бо яго сінія нагавіцы віселі на круку ў браме.

— Ці ня зьбіраецеся вы тут класьціся спаць?—з цікавасьцю запытаў Швэйк.—Я-б вам ня радзіў. Тут вельмі дзьме, а вам тым больш тут будзе зусім нядобра.

Сьмешна і праціўна было глядзець, як трасьліся ў гарадавога калені і як ён курчыўся і нагінаўся да зямлі, каб яго не заўважылі. І з сваім нязьменным дабрадушшам Швэйк гаварыў далей:

— Мне здаецца, у вас крышку ногі дрыжаць, але вы пра гэта ня дбайце, гэта пройдзе. Наагул, вам тут ня так ужо і кепска. Унь на рынку забілі шэсьць чалавек гарадавых, дык ім куды горш. Што за карысьць, калі пра іх скажаш, што з імі ўжо нічога ня можа больш здарыцца, а што лёс іншых яшчэ невядомы? А ўнь у тым завулку аднаго гарадавога жыўцом пасадзілі на кол. Сядзіць ён цяпер з колам у задзе і сьпявае: «Боже, царя храни». А вы гэтую песьню таксама сьпяваеце?—нечакана дадаў ён, дапытліва глянуўшы на гарадавога.

— Забыў яе, зусім забыў, і ўспамінаць не хачу,—заікаючыся пралепятаў гарадавы, і зубы ў яго гэтак ляскалі, што Швэйк сказаў:

— Здаецца, вам холадна. У вас зубы ляскаюць, як у сабакі калі яна ловіць скочкі на сабе. Ці, можа, вы баіцёся таго, што вас чакае і няйначай з вамі здарыцца? Ня бойцеся, тут вас таксама знойдуць, хоць і не адразу, але затое напэўна. Валасы на галаве ў гарадавога падняліся старчма ад жаху. Ён кінуўся перад Швэйкам на калені і загаласіў:

— Выратуй мяне, добры чалавек, у імя ўсяго сьвятога на сьвеце—выратуй мяне! Што я гэтакае зрабіў! Я служыў—так,

я служыў. Мне загадвалі, а я павінен быў слухаць. Ах, што цяпер мне рабіць. Жонка ў мяне, дзеці. Небаракі, мае дзеткі, сіроткі мае!

Гарадавы заплакаў і пачаў рваць на сабе валасы, божкаючы і прысягаючы, што нікога ніколі ня крыўдзіў з уласнага жаданьня, а толькі выконваў загад начальства. Нарэшце ён хапіўся за кішэню.

— Вось, добры чалавек, ёсьць у мяне тут шэсьцьдзесят рублёў,—у роспачы гукнуў ён.—Вазьмі іх сабе і аддай мне свае нагавіцы. У прыдачу вазьмі яшчэ і мае сінія. Яны—з добрага сукна. Зрабі гэта дзеля збаўленьня свае душы, захавай бацьку нявінным дзецям.

— Добра, для дзяцей тваіх я цябе пашкадую,—паволі сказаў Швэйк, працягваючы руку па дзесяцірублёўкі.—Май на ўвазе, я раблю гэта толькі адно з свае добрасьці.

Ён адшпіліў папругу, і здымаючы нагавіцы, навучальна сказаў:

—Як-бы злодзей ня краў, а пугі ня міне. Бачыш, галубок, сёньня я табе памог, а заўтра ты мне. Дрэнныя вашаму брату прышлі часы. Тваё шчасьце, што ты не ганяў мяне з маімі пярсьцёнкамі ■ рынку. Каб ня гэта, дык я нават у гэтакім стане паказаў-бы табе, дзе ракі зімуюць.

Гарадавы шпарка як маланка нацягнуў на сябе швэйкавы нагавіцы, горача пацiснуў яму руку і з пачуцьцём сказаў:

— Дай божа, каб зноў надышлі ранейшыя часы і я мог-бы аддзякаваць цябе... Паслухай, ты-ж разумны чалавек. Дык вось, у гімназіі, на Аляксееўскай вуліцы засела шмат нашых. Пралезь як туды, пазабірай у іх сінія нагавіцы і пазанось іхнім жанкам па кватэрах, а табе за гэта шмат трошай дадуць. Зробіш? Добра? А калі вернецца ўсё на стары лад, мы табе нават дазволім сала красьці на рынку. Як кажуць: рука руку мые. Шчасьліва заставацца.

Гарадавы, азіраючыся, вышаў за браму і пашоў ціхенька паўз сьцены дамоў, а пасьля адным махам апынуўся на вуліцы пасярод натоўпу. Цяпер ужо нельга было яго пазнаць, ён выратаваўся. І Швэйк, зашпільваючы новыя нагавіцы, якія яму былі залішне шырокія і ўсё звальваліся, прамармытаў сабе пад нос:

— Ну і адкормлены-ж быў ён! Сапраўдны фараон! Пачакай, цяпер чэраза ў цябе спадзе!

Ён вышаў за браму і пашоў шукаць гімназіі. Людзі паказалі яму дарогу і нават паказалі самы будынак. Гэта быў дом на рагу, перад якім была зроблена даволі высокая барыкада з выцягненых з гімназіі вучнёўскіх сталоў і лавак, шафаў, дошчак і нават бляшанак, з засьпіртаванымі зьмяямі і іншымі гадамі.

— Адно глядзі, блізка не падыходзь,—крыкнула Швэйку нейкая старая, паказваючы на гэтую прыстройку.—Адтуль страляюць.

Яна ня схлусіла. Як толькі яна схавалася ў пад'езд і Швэйк адзін прайшоў некалькі крокаў далей, з-за барыкады грунула некалькі стрэлаў з стрэльбаў і кулі сьвіснулі паўз яго вушы. Ён таксама шмыгануў у пад'езд, лаючыся:

— Бач, сволачы! На мне сінія нагавіцы, а яны страляюць! Гэтак чалавека адразу забіць льга!

Тады, цьвёрда задумаўшы дайсьці мэты, ён зьняў нагавіцы і, размахваючы імі нібы сьцягам, пабег пасярод вуліцы да барыкады. Гэта памагло, і ніхто ня даў аніводнага стрэлу. І толькі калі ён быў ля тых вучнёўскіх лавак і палез на бліжэйшую шафу, каб адтуль пералезьці цераз гору мэблі, на яго нацэлілася некалькі стрэльбавых руляў, і нечы праразьлівы голас запытаў:

— Ты хто?

— Я адзін з нашых,—каратка адказаў Швэйк, прытрымліваючы рукою нагавіцы.

— А што табе тут трэба, аўстрыяк?

— Я хачу, вам дапамагчы,—таемна шапнуў Швэйк. Стрэльбы спусьціліся ўніз; пасьля кароткае нарады Швэйку было перададзена:

— Ну што-ж, лезь.

Чалавек трыццаць гарадавых было на барыкадзе, і чалавек сто, разам з прыставам і акалотачным, былі ў сярэдзіне будынку. У ва ўсіх было, апроч рэвальвэраў, яшчэ па стрэльбе, а з-за барыкады на другім баку вуліцы выглядваў нават кулямёт.

— Ну, панове, так вы ніколі дадому і ня трапіце,—без усялякіх раздумваньняў заявіў Швэйк.—Усюды зьбіваюць гарадавых і прымушаюць іх, небаракаў, сьпяваць, уміраючы, «Боже, царя

храни». Я сам аднаго з іх выратаваў, аддаўшы яму свае нагавіцы замест сініх. Дык ён мяне паслаў да вас, каб вы пааддавалі мне сінія нагавіцы, а я прынёс вам з дому іншага колеру, каб вы былі падобны да салдат.

— Гэта ня кепская думка,—заўважылі некаторыя і павялі Швэйка да прыстава, якому ён яшчэ раз сказаў свой плян. Прыстаў лачухаў у сябе за вухам і запытаў:

— Ну, а што чуваць у вас там у горадзе?

— Як што! Усё войска таксама робіць рэволюцыю,—паведаміў Швэйк. Прыстаў страшна пабялеў, але тут-жа схапіўся за саломіну:

— Мы выклічам вайсковыя часьці з фронту, губарнатар пашле сюды надзейнае войска.

— Вам больш нават сам бог не паможа, галубок,—заявіў Швэйк,—калі я не працягну вам сваю руку.

І ён расказаў, што падыходзіць ужо цяжкая артылерыя, што за горадам выстаўлены батарэі і што рулі іхнія наведзены проста на будынак гімназіі.

— Адзін залп, і ад вас толькі мокранька будзе, гаварыў ён.—А калі хто выпадкова і выратуецца, дык яго ўзарвуць у паветра мінамі. Я на свае вочы бачыў, як саперы вялі сюды падкоп з сутарэньня на суседняй вуліцы. Да вечара ў іх усё будзе гатова, і ўночы вы ўсе ўзьляціце ўгару. Гэта будзе вельмі прыгожы малюнак, сёньня якраз месяц поўны.

Прыстаў пры ўспамінаньні гэтага хараства нават пазелянеў. Пасьля ён расшпіліў аслабелымі раптам рукамі нагавіцы і сказаў:

— Атрымаеш сто рублёў, калі прынясеш мне іншыя. І кулю ў лоб, калі ня прынясеш і не перадасі маёй жонцы—вось табе яе адрас—што я жыў і здароў і неўзабаве буду дома. І няхай паставяць самавар... Кулю ў лоб!

Акалодачныя ўжо разьдзеліся. Швэйк браў у іх разам з запіскамі нагавіцы, а калі ён выходзіў з гімназічнага будынку, усе гарадавыя на барыкадзе стаялі ў адных споднiках і соўвалі яму ў рукі свае нагавіцы. Швэйк сьціпла адмаўляўся:

— Ды дзе-ж я ўсё гэта адразу занясу! Пасьля мне на вуліцу кінеце!

Ён скочыў з шафы на брук, і сінія нагавіцы паляцелі яму ўсьлед, нібы абрыўкі нябеснага блакіту. Унізе ён пазьбіраў іх і перацягнуў у пад'езд.

— Зараз я пачну іх разносіць,—гукнуў ён да гарадавых, паднімаючы з зямлі новую кучу нагавіц, як раптам у вуліцу ўехалі дзьве фурманкі з саломаю. Яны займалі ўсю шырыню вуліцы, і ніхто іх не цягнуў, бо ў іх ня было запрэжана ні коняй, ні валоў. Іх падпіхалі ззаду і яны грозна насоўваліся на занятую паліцыяй барыкаду, і абаронцы яе пачалі адразу-ж праразьліва крычаць і страляць.

Вазы падсунуліся да пад'езду, дзе Швэйк зьвязваў нагавіцы ў жмуты, і студэнты і салдаты, што ішлі за вазамі, пачалі прымацоўваць лескі і ўстанаўляць на дошках, што ляжалі паверх саломы, кулямёты.

— Сёньня я занясу іх у барак, а на рынак выйду з імі калі зноў усё паспакайнее,—мармыгнуў са мсабе Швэйк, захапіўшыся працаю.

— Тут сорак пар, па дзесяці рублёў за пару мне заўсёды дадуць... Усяго, значыцца, чатырыста рублёў...

— Вы, таварыш, што тут робіце?—запытаў яго студэнт, што чагосьці ўбег у пад'езд і заўважыў Швэйка. І, не чакаючы адказу, гукнуў:—Ды яшчэ ў паліцэйскіх нагавіцах! Дзе ты іх узяў?

— А мне гарадавыя кінулі іх з барыкады, каб я іх у горадзе прадаў,—растлумачыў Швэйк. Змрочна глянуўшы на яго, студэнт загадаў:

— Злажы іх на воз, бо ў вечары нам будзе холадна!

Такім чынам Швэйк, сам ня ведаючы як, апынуўся раптам на возе, на які ён пачаў цягаць бярвеньне і дошкі, у той час як прыкрытыя саломай кулямёты абстрэльвалі варожыя барыкады, а адтуль адказвалі стралянінаю з стрэльбаў.

Гэтак цягнулася да самага змроку, бяз выніку на тым ці гэтым баку. А як зьмеркла, сладаты і студэнты падвязьлі дзьве трохдзюймовыя гарматы, адцягнулі ўбок адзін воз і ўстанавілі гарматы, замаскаваўшы іх дошкамі. І раптам з аднэй гарматы над барыкадай разарвалася шрапнэль, а з другое знарад папаў

у верхні, што ўзвышаўся над суседнімі дамкамі, паверх гімназіі. Агонь за барыкадай адразу сьціх. Далі яшчэ залп, і на барыкадзе ўзьнялася ў змроку пара спаднікаў, што замяняла белы сьцяг.

— Мы возьмем іх жыўцом,—вырашыў студэнт, які камандваў нападам на барыкаду, і азірнуўся, прычым зірк яго спыніўся на Швэйку, які адпачываў на сваёй зьвязцы нагавіц.—Таварыш, падыйдзі адно сюды бліжэй. Ты за каго стаіш? За цара, ці за рэволюцыю?

— Так што, дазвольце далажыць,—рашуча заявіў Швэйк,—я стаяў за свайго імпэратара, але ён памёр, і таму я цяпер павінен стаяць за рэволюцыю. Раз няма Франца-Юзафа, дык няхай ужо ня будзе і Мікалая.

— Добра,—усьміхнуўся студэнт.—У такім выпадку вазьмі стрэльбу і вартуй тут, каб нічога не падпалілі.

І ў той час як салдаты выводзілі палонных гарадавых, якія трасьліся ад холаду у адных спадніках, Швэйк сядзеў на клунках свае ваеннае здабычы і філёзофстваваў:

— Цяпер, дык ужо мусіць гэта ня хутка скончыцца. Цяпер будуць ваяваць да самага канца сьвету.

Раніцаю зьбегліся абывателі паглядзець на тэатр ваенных падзей, што адбываліся ў тэтую ноч. Натоўп найбольш цікавіўся барыкадамі. На аднэй з іх нудна матлялася пара парваных, брудных спаднікаў, а на другой хваляваўся чырвоны сьцяг. І народ, рабочыя і салдаты, шумна выказвалі сваю радасьць, гледзячы на гэтую рэволюцыйную эмблему.

Пад чырвоным гэтым сьцягам сформавалася дэмонстрацыя, якая пашла па горадам паведаміць пра рэволюцыйную перамогу. Як толькі яна рушыла наперад, натоўп пачаў сьпяваць, і ў сьвежым, чыстым паветры паплылі гарачыя словы рэволюцыйнага гімну. Словы гэтыя падхапілі тысячы салдацкіх галасоў:

Уставай на ўладзеяў, на сабак, на багатых,
На гада-вампіра-цара...
Бі, зьнішчай іх, гадаў праклятых.
Лепшай долі ўвыходзіць зара.

За гэтым адбылося сьпяваньне «Інтэрнацыяналу». А калі дэманстрацыя павярнула з галоўнае вуліцы на пляц, з барыкады пачулася, як хтосьці жудасна зароў:

Грукат бомбы як з-пад хмар:
Паляцеў у паветра цар.
Хочаш быць ты за цара,
Груне на цябе гара.

Гэта ўдалы ваяка Швэйк сьпяваў пад чырвоным сьцягам, узваліўшы на плечы спадчыннасьць старога сьвету, каб прадаць яе пры першай магчымасьці на рынку.

16

АПОШНІ ЭТАП УДАЛАГА ВАЯКІ

Калі ў Расіі поўніліся здабытаю воляй, дык ваеннапалонныя ёю проста захлёбваліся. Жаданьне, каб вайна спынілася, наблізалася да свайго зьдзейсьненьня; дысцыпліна аслабела, і паняцьце «ваеннапалонны» распылілася ў першыя-ж тыдні. Народ у Расіі кіпеў у катле рэволюцыі, і ні на што іншае не хапала часу. Гультаяваць ня было калі, дык ня было каму больш прыдумляць новых пакутаў сваім блізкім; усе чакалі, што адбудзецца штосьці вялікае і вызваліць увесь сьвет ад зла.

Гаршына з запалам чытаў прамовы новых міністраў, стараючыся правільна зразумець велічыню гэтых падзей. У першы час маніфэстацыі ўздымалі настрой, але, неўзабаве, праз месяц ужо яны пачалі гучэць пуста і фальшыва, выклікаючы на салдацкіх тварах кплівую ўсьмешку.

Прапаршчык Вараб'ёў прыходзіў да палонных усё больш рэдка, аддаўшы іх пад нагляд Ананьняву, а той хадзіў гэтакі-ж п'яны, як і ў часы царызму, і казаў:

— Эх, добра жыць за часовым урадам. Валі цяпер біць расійцаў, хлопцы!

— У той дзень, як я прадаў нагавіцы аднаму анучніку оптам па пяць рублёў за штуку, каб не важдацца з павольным продажам,—расказваў Швэйк Гаршыне,—я папаў у гэтую карчму толькі ўвечары. Там быў і прапаршчык Ананьнін, п'яны ў дошку, так што таварышом даводзілася падтрымліваць яго, каб ён не

паваліўся, зьняў з сьцяны абраз, уставіўся вачыма на яго, як баран на новую браму, і раптам як гыркане: «Слухай, хлопцы,— няма ў нас больш цара, маць яго гэтак!»

— Гэты суб'ект зьменьвае сваю ахварбоўку, як хамелеон,— заўважыў Гаршына, а Швэйк заклапочана дадаў:

— Каб толькі яму не зьмяніць яшчэ раз! Езус-Марыя, якую-б валтузьню ён-бы нам тады задаў!

— Гэтага ня здарыцца,—сказаў Гаршына.—Рэволюцыя ня мае небясьпекі. Керанскі творыць цуды? Вось гэта дык міністр! Якія прамовы гаворыць, га!?

— А што нам за карысьць,—скрывіўся Швэйк.—Тут справа не ў прамовах. Прамоваў ён гаворыць даволі. Але мне здаецца, што калі пасьля гэтакае рэволюцыі ў нас ня будзе тлусьцейшае капусты, дык навошта было яе і рабіць?

Увечары Ананьнін выклікаў Швэйка да сябе. Яму прышоў ліст з Кіеву.

— Гаршына, таварышы мне ліст прыслалі!—гукнуў ён да свайго прыяцеля.—Значыцца, яны ня зусім мяне забыліся. Бачыш, ліст які доўгі.

Ліст гэты быў вынікам колектыўнае творчасьці Марэка і Пісклявага. Яны пісалі:

„Дарагі друг і таварыш Швэйк!

Ну вось, мы зноў на ўсе сілы цягнем лямку, зноў салдаты, як мае быць. Жывем мы тут, у Кіеве, ва унівэрсытэце. Гэта—вялікі чырвоны будынак з садам; усюды ў аўдыторыях і ў карыдорах пастаўлены ложкі, на якіх мы сьпімо, мы—дабраволыцы чэскага легіёну, і сьпяваем сакольскі марш“. „Браты, сьмела наперад“.

— Гэта прыгожая песьня. Шкада толькі, што яе ўсе дзяруць. Яе належала-б сьпяваць з пачуцьцём, як калыханку,—заўважыў Швэйк, і чытаў далей:

„Таго энтузіязму, пра які мы чыталі ў Чехо-славянах“ і „Чехо-словаке“ тут, праўду сказаць, няма анізваньня. Як заўсёды, выявілася, што тэорыя— адно, а практыка—другое. Тут ніхто ня марыць пра прыгожы Градшын, над якім вялікасна плывуць воблакі, нібы велічэзныя лебедзі з раскінутымі беласьнежнымі скрыдламі, а кожны клапоціцца толькі пра тое, як-бы пад'есьці ўволю. Ніхто тут ня цікавіцца, ці ваюе ён за каралеўства, ці за рэспубліку, а ўсе думкі занятыя адно тым, калі і дзе будуць даваць чай, цукер і тытунь— галоўным чынам тытунь.

— Я заўсёды казаў пра гэтага ненаеднага Балуна ў нас у палку, што абжорства—гэта чалавечая рыса,—палічыў патрэбным уставіць наконт гэтага Швэйк.

„Тут ёсьць ня мала людзей, якія толькі і думаюць пра тое, як-бы ўварваць два пайкі. Атрымаць заместа аднаго два палотнішчы на палатку—вышэйшы ідэал, бо тады можна адно з іх загнаць на рынку. З нашага палка тут ёсьць фэльдфэбель Насакла, той самы, які цябе дапякаў сваімі стральбатымі прыёмамі. Ён наглядае ля дзьвярэй за тым: хто што нясе і што ў каго за пазухаю, каб нашы хлопцы ня гэтак многа кралі. Ён, каб выпрабаваць вартаўнічых, час-ад-часу наўмысьля пасылае каго-небудзь з ніжэйшых чыноў вынясьці палотнішча, або шынель. Часам вартаўнічыя сапраўды нічога не заўважаць, і салдат сапраўды зьнікае з гэтымі рэчамі. Я сам пранёс гэтакім спосабам два палотнішчы, бо ён мала аддаваў мне свае ўвагі.

— Вось гэта жыцьцё!—уздыхнуў Гаршына.—Вось дзе-б мне таксама хацелася-б быць!

На гэтым тыдні сюды прыехалі дабравольцы з Сібіру, і адзін з іх—з 91-га палка. Як толькі ён убачыў Насаклу, ён наскочыў на яго і адразу заляпіў яму некалькі аплявух. Выявілася, што Насакла за два дні да таго, як расійцы ўзялі яго ў палон, загадаў падвязаць яго на дзьве гадзіны за тое, што ў яго ня было поўнага камплекту патронаў. Сам ведаеш, як нас за гэта грэлі! Ну, нашы афіцэры сталі на бок пабітага, але ўсе хлопцы стаяць за таго, хто біў, так што яшчэ невядома, чым гатая гісторыя скончыцца.

А вось ты заўсёды хваліўся, што ведаешь усіх праскіх філераў. Тут з намі ёсьць нейкі Калоус, пра якога кажуць, нібы ён служыў у Празе ў ахранцы. Апроч таго, кажуць, ён вядомы як провокатар у Кладне і Бруксе, дзе ён „працаваў“ сярод шахцінскіх рабочых. Ён вялікі хвалько і пляткар. У яго чорныя валасы і ангельскія вусы. Калі ты пра яго што-небудзь ведаеш, дык паведамі нас. Цяпер ён выдае сябе за нацыянальна-соцыялістычнага правадыра і кажа, што ён спэцыяліст ўва ўсякіх ваенных і спортыўных справах“.

— Гэтакага я штосьці не памятаю,—задумённа сказаў Швэйк.—А ўрэшце, усе провокатары брэшуць адно і тое. Шкада, шкада. А то я-б ім ад душы напісаў-бы, а ўжо там з ім расправіліся-б як належыць. Гэтых паразітаў ўсюды зьнішчаць трэба.

За нашага ротнага камандзіра тут нехта Лінбарб, маленькага росту афіцэрык, якога ўсе чамусьці клічуць „Махорка“. Пра яго расказваюць, што ён жанаты на дачцэ генэрала, якую ён памылкова, служачы ў гэтага генэрала за шофэра, накачаў заместа аўтомобільнае шыны, пасьля чаго яго прымусілі яе ўзяць замуж. Ён таксама „сакол“, і з тэй прычыны, што тут ва

ўнівэрсытэце ўсім кіруе капітан Чыла, гарачы прыхільнік сакольскае гімнастыкі, мы цалюткі дзень толькі ею і займаемся. Кормяць нас галушкамі, бульбаю і часамі гуляшом...

— Я-ж кажу, што мне трэба было-б таксама быць там,— зноў не ўтрымаўся ад заўвагі Гаршына.

„Больш за ўсё ў нашым легіёне, вядома, ваеннапалонных. Але ёсьць і некалькі сыноў расійскіх чэхаў. Гэтым дык жывецца найлепш; яны езьдзяць дадому па яйца і па куры для афіцэраў і іх пасылаюць па сена. Дома яны пакідаюць выдадзеныя ім новыя боты і абуваюць старыя. За курыцу ім даюць мэдаль, а за вэнджаную шынку—георгіеўскі крыж".

— У нас у Аўстрыі,—сказаў Швэйк,—давалі мэдаль таму, хто ўмее гатаваць чорную каву. А я, напрыклад, атрымаў малы срэбраны за тое, што нацёр паручніка Лукаша мазяю ад вошай.

„Цяпер, калі адбылася рэволюцыя, сюды прыехала вельмі шмат нашых аўстрыйскіх афіцэраў; усё гэта ваеннапалонныя, якія таксама імкнуцца ў легіён. Кажуць, што ў пецярбурскім савеце нейкі бальшавік прапануе выдаваць ваеннапалонным афіцэрам з казны гэтулькі на ўтрыманьне як і радавым, каб яны хоць у палоне адчулі, што такое ёсьць вайна. Таму яны раптам парабіліся за патрыётаў і пруцца ў легіён.

Наагул, тут гэтакая неразьбярыха, як і ўва ўсім сьвеце. Ёсьць сярод нас даволі шмат людзей шчырых, сумленных і наіўных, якія вераць, што мы ідзем ваяваць за вялікую, справядлівую справу. Але найбольш тут людзей з-за тых мотываў, з-за якіх мы зьменьвалі ў Омску сваю веру і падаваліся там у праваслаўную дружыну. Калі-б ты быў тут, у цябе было-б куды пусьціць сваю філёзофію, і ты напэўна знайшоў-бы тут удалае параўнаньне.

Назаўбаве нас накіруюць на фронт. Кажуць, што Керанскі давёў армію да баязадольнага стану. Але, як мы думаем, яму самому было-б ня шкодна памазаць сабе пяты заячым салам... Ну і добра! Мы будзем ваяваць за гонар нашае нацыі да канца, каб ён бачыў, што ёсьць яшчэ на сьвеце тыя, што гатовы ахвяроўваць сабою, хоць яго ўласнаму войску—пляваць на гэта. Дык вельмі можа быць, што мы загінем у бойцы. Адшукай тады нашы магілы, таварыш, і пасей на іх моркаўку і пятрушку, каб тым салдатам, што будуць жыць пасьля нас, хапіла на добры крупнік, калі нават не застанецца на сьвеце ні кавалачка мяса. Мы абодва цалуем цябе ў кончык вуха.

Марэк і І. П.".

— Значыцца, гэтыя слаўныя хлопцы паслалі мне гэты ліст, як сваю апошнюю волю,—усхліпнуў Швэйк, і сьлёзы яго скаціліся на паперу. Доўга сядзеў ён, нярухома гледзячы на крывыя радкі. Нарэшце ён загаварыў да Гаршыны:

— Здаецца мне, што ў гэтым легіёне адбываецца тая-ж гісторыя, як з тым яўрэем, які хацеў перайсьці ў праваслаўе. Гэта мне на рынку расказвалі. Расійцы, як вядома, яўрэяў ня вельмі далюблівалі, а ён хацеў выйсьці ў людзі, бо вельмі-ж ужо яму дадзела гараваць. Трымаў ён дробную крамку, а каб справы ішлі лепш, узяў сабе ў хаўрус праваслаўнага. Але калі і гэта не памагло, пашоў ён да папа хрысьціцца. Поп яму і кажа: «Пачакай, гэтак хутка ня можна. Спачатку я павінен навучыць цябе праваслаўнай веры. Ты будзеш прыходзіць да мяне і плаціць па пяць рублёў за гадзіну». Ну, яўрэй стаў хадзіць да папа і вывучаць катахізму. Нарэшце надыходзіць дзень, калі яго трэба хрысьціць. Напярэдадні ён прыходзіць апошні раз да папа і пытае, ці можа ён прыйсьці на хрышчэньне з сваім хаўрусьнікам, бо фірма ў іх «Пінхус і Петухов» і яны абавязаны рабіць усё агульна. У нядзелю ў царкве ідзе ўрачыстая адправа, бо ніхто не памятаў выпадку, каб гэтакі стары яўрэй пераходзіў у праваслаўе. Наехала духавенства з гораду, хрышчоны бацька, хрышчоная маці і народу процьма. І вось выходзіць яўрэй з сваім хаўрусьнікам да купэлі і поп пачынае яго пытаць: «Ці веруеш, што хрыстос быў бог і чалавек у аднэй асобе?» А ён адказвае: «Верую, што ён быў чалавек, а што ён быў бог—верыць мой хаўрусьнік». Поп яго зноў: «Ці веруеш, што хрыстос раздаў пяці тысячам чалавек пяць хлябоў і накарміў іх?» А ён адказвае: «Верую, што ён іх раздаў, а што ён накарміў імі людзей—верыць мой хаўрусьнік!» Тут поп трэці раз паспрабаваў: «Ці верыш, што хрыстос памёр на крыжы, каб выкупіць цябе сваёю сьмерцю?» А яўрэй усё гэтак-жа спакойненька: «Што ён памёр на крыжы, я веру, а ўва ўсё іншае верыць мой хаўрусьнік. На што-ж нам і быць хаўрусьнікамі?!» І скончылася яно тым, што абодвых выгналі з царквы... Вось гэтак, відаць, будзе і ў легіёне, адно што там гэтага ня кажуць так адкрыта, і таму ня так лёгка здагадацца... А калі Марэка заб'юць, дык і я больш не хачу жыць. Лепш ужо я знайду яго і раскажу яму, што было з яўрэем. Тады ён запатрабуе, каб яму гэтую справу як належыць вытлумачылі.

— Ці ня хочаш ты пакінуць мяне тут зусім аднаго?—сумна вацягнуў Гаршына.—Што я буду рабіць без цябе!

Тады Швэйк выцер вочы і ўрачыста дэкляраваў:

— Не, я гэтага не дапушчу. Мы-ж тады сталі-б расьсеянымі па ўсім сьвеце як цыганы. Не! Мы з табою разам давядзем гэтую вайну да канца!

Але з гэтага дня Швэйк засумаваў. Ён ня туляў больш у карты, ня слухаў, калі чыталі газэту, а ўсё толькі штосьці ўпарта абдумоўваў. Былі атрыманы паведамленьні пра вялікую сутычку на фронце і пра бліскучую перамогу пры Зборове, пра перамогу, якая праз два дніператварылася ў «нячуваную катастрофу пад Тарнопалем», і нейкія няясныя весткі пра зьнішчэньне ці здачу ў палон «чэскага легіёну». Казалі, што ўся расійская армія ў паніцы бяжыць і што ў Петраградзе адбываецца бальшавіцкае паўстаньне... А Швэйк зусім бязудзельна сядзеў на нарах, гойдаючы нагамі і прыгаворваючы:

— Маё шчасьце, што я слабога розуму. Каб я ня быў слабога розуму, я-б тое, што творыцца навокал і што робяць з людзьмі, разумеў-бы і ад гэтага даўно сядзеў у вар'яцкім доме. А так са мною нічога ня можа здарыцца—я ведаць ня ведаю, у чым справа.

— Слухай, таварыш,—сказаў яму аднойчы Гаршына,—так мы тут заставацца ня можам. Невядома, што тут яшчэ будзе і ці будзе казна наогул клапаціцца пра нас. З заўтрашняга дня будуць выдаваць толькі па адным фунце хлеба на чалавека. Я гаварыў у карчме з адным селянінам, у якога за сто вёрст адтэтуль вялікі хутар, і ён згадзіўся ўзяць нас за пастухоў. На зіму ён выдасьць нам цёплую вопратку, а гэта было-б ой як добра! Мы перазімуем у яго, а да вясны павінна-ж нарэшце ўся гэтая калатуша скончыцца, і мы з табою рушым дадому. Ну што, згодзен пайсьці да таго мужыка?

— Згодзен,—проста абазваўся Швэйк.—З асламі я даволі знаёмы, дык што цяпер можна заняцца і каровамі.

Праз тыдзень яны пасьвілі на полі жывёлу. Гаршына, па прыкладзе амэрыканскіх каўбояў, тросься навокал чарады на кані. А Швэйк ляжаў у траве, і моўчкі і сумна глядзеў у яснае неба.

— Дай адно мне бачок,—сказаў ён надвечар да Гаршыны,—я пайду падаю унь тую пярэстую карову. Ува мне ўсё гарыць і

вельмі піць хочацца.

Але карова ўцякла ад Швэйка ў стэп, і Швэйк пагнаўся за ёю. Яна была ўжо гэтак далёка, што Гаршына бачыў толькі дзьве чорныя кропкі ў зялёным моры травы; яны рабіліся ўсё меншыя і меншыя і, нарэшце, зусім зьнікл і.

Уночы карова вярнулася да свае чарады адна, а Швэйк бяз сьледу згінуў, нібы ў зямлю праваліўся. І Гаршына адзначыў у сваёй кніжцы: «З 26-га жнівеня 1917 году Швэйк невядома дзе».

*

Гэта было ў брыдкі лютаўскі дзень 1920 году. Прага ўпрыгожылася сьцягамі, па вуліцах хадзілі, ня гледзячы на дождж, прыгожыя дзяўчаты ў нацыянальных гарнітурах, на тратуарах ціснуліся цікаўныя, і з вуснаў у вусны перадавалася:

— Ідуць? Яны?

На рагу Венцаслаўскага пляцу стаяў высокага росту ўкормлены пан і расказваў другому, які якраз узяў яго пад руку:

— Я быў на біржы і сумысьля крыху затрымаўся, каб іх убачыць. Ну, і дарагоўля-ж тут у вас! А ўрэшце, наш брат, мельнік, можа сабе цяпер сёе-тое дазволіць, а мне хочацца расказаць дома, як выглядаюць легіянеры. Праўду кажучы, мне зусім ня гэтак ужо цікава глянуць на іх, але са мною на фронце быў нейкі Швэйк, які таксама папаўся да расійцаў у палон. А я яго якраз сёньня гэтак жыва сасьніў, і штосьці падказвае мне, што ён будзе сярод іх. Гэта быў такі прыемны, добры чалавек. Яго клікалі Швэйкам, Ёсіфам... Як вы думаеце, мы пасьпелі-б яшчэ пасьнедаць?

— Езус-Марыя!—сказала нейкая стараватая жанчына, павярнуўшыся да іх.—Значыцца, вы таксама ведаеце майго пана? Я—фрау Мюльлер, удава, і да вайны служыла за найлепшую служанку ў пана Швэйка. Як добра, што мы спаткаліся! Ён сапраўды прыяжджае сёньня. Я атрымала ад яго тэлеграму з Трыесту.

І яна працягнула тоўстаму пану тэлеграму. Той паціснуў фрау Мюльлер руку і адрэкамэндаваўся:

— Балун, мельнік з Табору.

— А я табе кажу, Палівец, што было-б лепш спаткаць яго ля самага вагзалу,—амаль у тую-ж хвіліну гаварыў за два крокі ад іх прысадзісты і праставаты на выгляд мужчына да кароценькага чалавечка ў кацялку.

— А ну гэты дождж сабаку пад хвост!—далікатна адазваўся той.—Сёньня павінна сьвяціць сонца, каб і ганддлёваму чалавеку сёе-тое папалася-б. Не, не, ты ўжо мяне нікуды не цягні, Вадзічка. Калі мы яго нават і не ўбачым цяпер, дык ён напэўна вечарам зойдзе ў «Поўны Келіх». Гэ, яны ўжо ідуць!

З боку музэю пачуліся бурныя гукі «Слава». На пляцу зьявіліся, нібы букет кветак з поля, дзяўчаты ў нацыянальных гарнітурах. За імі выступалі «саколы» ў чырвоных рубашках, за якімі ішлі, з некалькімі афіцэрамі на чале, мернаю, выразнаю хадою салдаты ў зялёных мундзірах і з стрэльбамі на плячах. Штыхі блішчэлі нават пры гэтакім шэранькім, цьмяным асьвятленьні. Асфальтовы брук гуў пад стукам салдацкіх падэшваў. Салдаты адбівалі бадзёры крок. Яны якраз заварочвалі на Калаўротавую вуліцу, як раптам таўсматы ўкормлены пан гукнуў да афіцэра, што крочыў побач з сваім аддзяленьнем:

— Маці божая Клакоцкая, гэта-ж пан паручнік Лукаш! Пане паручнік, а ці памятаеце Балуна, які быў у вас пяць год таму назад за дзяншчыка?

Затрыманы гэтак нечакана паручнік засьмяяўся і зрабіў Балуну знак далучыцца да гэтае хады. У той-жа момант з шэрагаў пачуўся нечый сакаўны, мужны голас:

— Марэк, глядзі адно—таўстун Балун! Што ты тут робіш?

Мельнік павярнуў галаву, каб адказаць, але не пасьпеў ён і роту разьзявіць, як да таго салдата, што гукаў на яго, з плачам кінулася фраў Мюльлер:

— Езус-Марыя, якое шчасьце! Мой пан вярнуўся з вайны да-дому. Пане, ідзеце хутчэй, я вам і ваду гарачую нарыхтавала, і лёкая на боты скідаць, і бялізну сьвежую паслала, каб вам адпачыць добра. Вы-ж сучасны крыжаносец, пане! Так пісалі ўчора у «Палітыцы».

— Ідзеце ў сарцір, старая божая, і не расчульвайцеся!—сказаў хтосьці, далікатна адпіхаючы фраў Мюльлер.—З прыездам цябе, Пеперль, здароў будзь! Ты-ж прыедзеш сёньня вечарам да нас на шклянку піва? У мяне сьміхаўскае. Яго зноў ужо можна піць.

— Вядома, прыду, браце Палівец,—з гонарам адказаў Швэйк,—а ты ўсё-ж гэтакі грубіян. Што-ж, на вайне мы ўсе агрубелі.

— Дайце мне стрэльбу, я вам яе панясу,—пачала прасіць фраў Мюльлер, спрабуючы сьцягнуць стрэльбу з швэйкавага пляча, але тут на яе гукнуў нечы новы голас:

— Пакінуць, зараз-жа! Хіба вы ня ведаеце, што на гэта ёсьць у ваенным кодэксе артыкул. Яго нават могуць расстраляць за такую штуку. А ты, Швэйк, глядзі, не спазьніся ў «Поўны Келіх». Памятаеш, ты яшчэ ў Кіральхідзе ў Вэнгрыі дэкляраваў мне быць там роўна а палове сёмае.

— Не, я сказаў у шэсьць, і ў шэсьць я буду на мейсцы,—адказаў Швэйк, атульваючы сапёра ласкавым позіркам.

Натоўп ішоў з імі і за імі, наперадзе грымелі крыкі «слава», і «на-здар», хваляваліся хусткі і ўсьміхаліся прыгожыя дзяўчаты, і ўдалы ваяка Швэйк з задаваленьнем адзначыў:

— Каб не вайна, я нават на сваім пахаваньні не дажыўся-б да гэтакага ўшанаваньня.

— Швэйк, мы ўжо згаварыліся пра ўсё з панам паручнікам,—зьвярнуўся да яго Балун:—Ты павінен прыехаць у наступную нядзелю разам з ім да мяне ў госьці. Я закалю сьвінку. Сьвінка ў мяне невялікая, усяго на якія-небудзь дзьвесьце кілё, але ты, калі ласка, не саромься, таварыш. Нашаму брату, мельніку, вайна пашла на карысьць—рука божая не бяднела.

— Значыцца, вырашана: я прыеду,—заявіў Швэйк,—каб паглядзець, колькі ты, прорва, можаш зьесьці, пакуль табе ня будзе даволі.

Яны дайшлі да Старога рынку. Ля помніка Гусу іх чакалі вышэйшыя прадстаўнікі грамадзянскае і вайсковае ўлады. Перад ратушаю была зроблена трыбуна. Герояў віталі міністры, гава-

рылі ім прамовы дэпутаты, і ўгару ляцелі важнецкія фразы пра сьвятыя правы чэскага народу, пра змаганьне за гэтыя правы і пра зьдзейсьненьне трыстагадовай думкі пра волю.

А ўдалы ваяка Швэйк, слухачы гэтыя прамовы, глядзеў на маленькую сучачку, якую вяла на ланцужку фарсіста ўбраная дама, што шчыра махала легіянерам хустачкаю, і з цікавасьцю наглядаў, як да гэтае сучачкі падбег сабачка тэй-жа пароды, далікатна абнюхаў яе і, пакруціўшыся навокал сваё выбраньніцы, атрымаў ад яе, нарэшце, поўную ўзаемнасьць.

Уласьніца сучачкі густа пачырванела ад сарамлівасьці; а ў наступную хвіліну, калі хтосьці з вайсковых, адчыканьваючы кожнае слова, коратка адказваў прафэсіянальным парлямэнцкім гаваруном і балбатуном, што «народ можа ўзмацоўвацца і разьвівацца толькі тады, калі ўсе яго члены будуць дзейнічаць сумленна і шчыра», зрабіў адмысловы націск на слове «ўсе»,— Швэйк шапнуў да Вадзічкі:

— Запытайся унь у тае дамачкі яе адрас. Шчанята ад гэтае пары будуць цудоўныя. Я заўтра-ж пайду і заяўлю, што гатоў купіць. Трэба зноў пачаць працаваць.

Прамовы скончыліся. Загрукацелі барабаны, і зычны камандзіраў голас разрэзаў паветра:

— Слухай! Наперад—марш! Раўнаваньне направа!

Колёна праходзіла цырымоніяльным маршам перед вышэйшымі чыноўнікамі краіны. Але яшчэ да таго, як чарга дайшла да Швэйкавае роты, ён запытаў:

— Значыцца, у шэсьць, у «Поўным Келіху»? А цёмнае ў цябе ёсьць?

— Пытаеш! абазваўся Палівец.

— А пулька будзе?

Тут за Палівца адказаў Вадзічка:

— Ня бойся! Партыя—першы сорт!

— Сьмірна!—гыркнуў паручнік Лукаш.—Наперад—марш! Раўнаваньне на-права!

Швэйк, адбіваючы: левй, левай—у пошні раз гукнуў:

— Вельмі, вельмі рад! Вось будзе што расказаць! Уся вайна з яе бойкамі, прамовамі і парадамі—паскудства, сабачая пацяруха з-пад хваста!

— Значыцца, у шэсьць?—кінуў яму наўздагон Вадзічка, але адказу ўжо не атрымаў.

І калі ўдалы ваяка Швэйк выходзіў з Старога рынку, над ім панура зьвісалі мокрыя сьцягі, і сеяўся дробны, халодны дождж...

ЗЬМЕСТ

Стар.

Добрае сэрца чырвонага крыжу 3
Прэч каталіцтва! 22
Швэйк служыць у Сібіры 28
Што рабіць? 41
Праца на абарону 48
Рабуй і не саромся 56
Неконцэсыйныя прадпрыемствы 68
За лініяй фронту 73
Пад новым начальнікам 84
У тылу расійскае арміі 96
А калі надышла восень 108
Сем кар эгіпэцкіх 114
У глыбокім тылу 124
Усе пакідаюць Швэйка 135
Швэйк робіць рэвалюцыю 151
Апошні этап удалага ваякі 163